П.А. Гуд

# ТЭХНАЛОГІЯ СТВАРЭННЯ СВЯТА



Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь
Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў

**П.А.Гуд**

# ТЭХНАЛОГІЯ СТВАРЭННЯ СВЯТА

*Вучэбны дапаможнік*

Мінск 2008

УДК 79(476) (075)
ББК 85.34 (4Беи)я7
Г 935

**Рэцэнзенты**

*У.А.Мішчанчук*, дэкан тэатральнага факультэта Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў, заслужаны артыст РБ, прафесар

*Ю.М. Чарняк,* кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт кафедры рэжысуры абрадаў і свят Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры

Рэкамендаваны да друку прэзідыумам вучэбна-метадычнай рады Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры

**Гуд, П.А.**

Г935 Тэхналогія стварэння свята: вучэб. дапам. / П.А.Гуд. – 2-е выд., стэрэатып. – Мн.: Бел. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2008. – 224 с.

ISBN 985-6798-34-5 .

Вучэбны дапаможнік адпавядае праграме курса "Арганізацыйны план свята". У ім разглядаюцца арганізацыйныя, вытворчыя, матэрыяльна-тэхнічныя, фінансавыя і іншыя аспекты ўвасаблення святочных дзеянняў.

Для студэнтаў і педагогаў ВНУ культуры і мастацтваў, усіх, хто займаецца пытаннямі падрыхтоўкі і правядзення свят.

ББК 85.34 (4Беи)я7

ISBN 985-6798-34-5

© П.А.Гуд, 2004
© П.А.Гуд, 2008

# ПРАДМОВА

У нашай краіне заўсёды надавалася ўвага развіццю новай святочнай культуры і святочных абрадаў, якія адлюстроўваюць этнічную спецыфіку і мастацкія традыцыі беларускага народа. Сёння мы з упэўненасцю можам сказаць, што гэта праблема ў многім вырашана. Па-першае, у краіне склаліся ўстойлівыя традыцыі правядзення народных свят каляндарнага цыкла, такіх як Каляды, Масленіца, Вялікдзень, Купалле, Дажынкі. Штогод ва ўсіх раёнах праводзяцца святочныя кірмашы як абрадава-гульнёвая форма завяршэння сельгасработ. Па-другое, шырокае распаўсюджанне атрымалі святы мастацтваў рэгіянальнага і рэспубліканскага ўзроўняў, а такія, як “Славянскі базар” (Віцебск), “Сожскі карагод” (Гомель), “Музычная восень” (Мінск), “Залаты шлягер” (Магілёў ), “Звіняць цымбалы і гармонік” (Паставы) і іншыя, набылі міжнародны статус, шырокавядомы ў нас і за мяжой. Па-трэцяе, у выніку самаадданай творчай работы дзеячаў культуры і мастацтва з’явіліся новыя унікальныя святочныя формаўтварэнні: Свята беларускага пісьменства (Полацк, Тураў, Навагрудак, Орша, Заслаўе, Мір), Дзень незалежнасці, Дажынкі, Свята нацыянальных культур Беларусі (Гродна), Усебеларускае свята народнага гумару ў Аўцюках, святы народных рамёстваў, фестывалі ў гонар юбілеяў выдатных дзеячаў беларускай літаратуры, культуры і мастацтва і інш. Пачалося станаўленне хрысціянскіх містэрый і духоўных свят, новай студэнцкай абраднасці (дзень ведаў, інаўгурацыя ВНУ, святы выпускнікоў). Вялікай папулярнасцю карыстаюцца святы гарадоў і вёсак, феерверкі, пабудаваныя на піратэхнічных традыцыях XVII—XVIII стст.

Усё гэта сведчыць, што святочная культура Беларусі жыве і развіваецца. Плённая работа Міністэрства культуры РБ, Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры, Саюза фалькларыстаў Беларусі, Беларускага інстытута праблем культуры,

абласных навукова-метадычных і раённых цэнтраў культуры садзейнічае вырашэнню многіх задач творчага характару.

Але ў працэсе станаўлення новай святочнай культуры разам са шматлікімі творчымі знаходкамі выявіўся і шэраг тэхналагічных праблем, звязаных з матэрыяльна-тэхнічным, адміністрацыйным і фінансавым забеспячэннем свята. Новыя эканамічныя ўмовы патрабуюць і новых падыходаў да ўвасаблення свята. У адрозненне ад практыкі мінулых гадоў зараз любая творчая задума можа быць рэалізавана толькі тады, калі мае значную эканамічную базу. Рэжысёр сёння выступае не толькі ў якасці творцы, як гэта было раней, але і ў значнай ступені ў ролі арганізатара, эканаміста, адміністратара, які павінен умець суадносіць маштаб творчай задумы з рэаліямі матэрыяльна-тэхнічных і фінансавых сродкаў, выдзеленых на пастаноўку.

Аналіз паказвае, што пераважная большасць рэжысёраў свят краіны не валодаюць або слаба знаёмы з ведамі ў галіне арганізацыі свята. На гэтую тэму творчыя семінары, на жаль, не праводзяцца ніводнай дзяржаўнай структурай. Курс "Арганізацыйны план падрыхтоўкі свята", які чытаецца на кафедры рэжысуры абрадаў і свят Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры, забяспечвае толькі невялікую колькасць будучых рэжысёраў і не можа пакуль што вырашыць пастаўленую задачу ў масштабе ўсёй дзяржавы.

Між тым якасць свят у многім змяншаецца з-за няведання рэжысёрамі функцыянальных абавязкаў членаў структурных падраздзяленняў аргкамітэта, спосабаў стварэння перадсвяточнай атмасферы, адсутнасці навыкаў арганізацыйна-вытворчага аналізу сцэнарыя і стварэння на гэтай аснове рабочага плана падрыхтоўкі свята, яго творчага і матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння. У многіх раёнах святы літаральна "правальваюцца" з прычыны недакладнага вырашэння вытворчых аспектаў арганізацыі абслугоўвання запрошаных гасцей і творчых калектываў, рэкламы свята, работы дапа-

можных службаў, дрэннага гукавога і мастацка-дэкаратыўнага афармлення.

Таму ў бліжэйшыя гады вышэйшым і сярэднім навучальным установам культуры і мастацтва, метадычным падраздзяленням сістэмы Міністэрства культуры Беларусі трэба звярнуць увагу на распрацоўку методыкі арганізацыі свята і шляхам пастаянна дзеючых семінараў узбагаціць гэтымі ведамі работнікаў культуры і мастацтва краіны.

Аўтар дапаможніка "Тэхналогія стварэння свята" прапануе шляхі вырашэння арганізацыйных, матэрыяльна-тэхнічных, фінансавых і асобных творчых аспектаў увасаблення святочнага дзеяння. Кніга пабудавана на матэрыялах разнастайных літаратурных крыніц, нарматыўных актаў і дакументаў, уласным 40-гадовым творчым вопыце аўтара па пастаноўцы больш за 400 свят, тэатралізаваных прадстаўленняў, відовішчаў, абрадаў і канцэртаў. Паколькі на сучасным этапе многія святы набылі міжнародны і рэспубліканскі статус, матэрыялы дапаможніка раскрываюць найбольш складаныя пытанні рознабаковага характару, а пры неабходнасці набытыя веды можна спраектаваць і на меншыя па маштабе святочныя дзеі.

"Тэхналогія стварэння свята" — першы ў нашай краіне дапаможнік па названай тэме. Важна, каб работнікі культуры і мастацтва, студэнты і навучэнцы, усе, хто цікавіцца арганізацыяй свята, прааналізаваўшы матэрыялы кнігі, змаглі не толькі выкарыстаць іх у сваёй працы, але і творча пераасэнсаваць, выявіць новыя перспектыўныя кірункі ў вырашэнні праблем далейшага развіцця святочнай культуры з улікам уласнага вопыту.

# І. ПАЧАТКОВЫ ЭТАП ПАДРЫХТОЎКІ ДА СВЯТА

Нараджэнне свята можа адбывацца па-рознаму: з сацыяльнага ці прыватнага заказу, абумоўленага неабходнасцю адлюстравання падзеі ў жыцці грамадства, калектыву, асобы; са з'яўлення новай аўтарскай ідэі, у якой прапануюцца святочныя формаўтварэнні або новыя рашэнні і творчыя падыходы да ўжо існуючых святочных дзеянняў. Але ў любым выпадку на пачатковым этапе перад яго ініцыятарамі паўстае шэраг арганізацыйных пытанняў. Перш за ўсё гэта стварэнне ініцыятыўнай групы з ліку творчых работнікаў і заказчыкаў (або прадстаўнікоў арганізацыі, прадпрыемства, дзе мяркуецца ўвасобіць прапануемую ўрачыстасць), якія ў далейшым будуць займацца распрацоўкай, арганізацыяй і правядзеннем свята.

Работа любой ініцыятыўнай групы, незалежна ад маштабу ўвасабляемай дзеі, складаецца з абгрунтавання выбранай тэмы, распрацоўкі агульнай канцэпцыі свята (творчай заяўкі), а таксама пастаноўкі агульных задач яе рэалізацыі.

Творчая заяўка на правядзенне свята раскрывае наступнае:

1) актуальнасць і сацыяльную значнасць адзначаемай падзеі;

2) мэту і задачу свята;

3) навізну (або пераемнасць) у творчым адлюстраванні дзей;

4) праграму, састаўныя фрагменты або разгорнуты план ці агульны сцэнарый свята;

5) агульны план або пералік задач творчага, матэрыяльна-тэхнічнага, арганізацыйнага і фінансавага забеспячэння свята.

На аснове творчай заяўкі члены ініцыятыўнай групы распрацоўваюць палажэнне аб правядзенні свята. У палажэнні вызначаюцца мэты і задачы свята, умовы яго правядзення, склад аргкамітэта з пералікам галоўных адказных асоб. Часам у палажэнне ўключаюць комплекс заданняў, якія неабходна вырашыць вызначаным арганізацыям, установам і прадпрыемствам.

Калі святочнае дзеянне праводзіцца ў форме фестывалю або ў структуры свята ёсць конкурсы пэўнай накіраванасці, то ў палажэнні павінны знайсці адлюстраванне крытэрыі ацэнак выступлення ўдзельнікаў, а таксама склад журы. У журы неабходна ўключаць найбольш аўтарытэтных спецыялістаў у тым жанры мастацтваў або відзе народных рамёстваў, спорту, конкурсаў прафесійнага майстэрства, па якіх праводзіцца спаборніцтва ўдзельнікаў. Гэта неабходна для таго, каб выніковае рашэнне аб пераможцах было максімальна аб'ектыўным і не выклікала спрэчных пытанняў.

Самай цяжкай справай з'яўляецца складанне каштарыса выдаткаў на правядзенне свята. У тым выпадку, калі каштарыс складаецца "пад сцэнарый" (гэта значыць спачатку вызначаюцца ўсе аспекты фінансавання, што з'яўляецца найлепшым варыянтам), а затым выдзяляюцца сродкі для творчага, вытворчага, матэрыяльна-тэхнічнага і арганізацыйнага забеспячэння свята, члены аргкамітэта ў першую чаргу праводзяць арганізацыйна-вытворчы аналіз сцэнарыя, каб можна было задаволіць усе патрэбы падрыхтоўкі і правядзення свята. Затым фінансавыя пытанні зводзяць у агульны каштарыс, які зацвярджаецца яго заказчыкамі поўнасцю або з папраўкамі. У сучасных умовах з прычыны складанага эканамічнага становішча дзяржавы такі спосаб складання каштарыса свята ажыццяўляецца рэдка.

Звычайна выдзяляюць сродкі, загадзя распланаваныя Міністэрствам культуры РБ асобнымі сумамі на кожнае канкрэтнае свята, якое мяркуецца ўвасобіць на працягу фінансавага або каляндарнага года. Існуе практыка долевага ўдзелу ў святах, калі зацікаўленыя арганізацыі, установы, прадпрыемствы выдзяляюць на яго правядзенне пэўную суму грошай або фінансуюць у адпаведнасці з калектыўнай дамоўленасцю вызначаную частку работ.

Каштарыс выдаткаў уваходзіць асобным раздзелам у палажэнне аб правядзенні свята і складаецца з назвы выдаткаў, іх агульнага кошту, вызначэння адказных за аплату. Гэты

агульны каштарыс затым ( у працэсе падрыхтоўкі свята) дэталізуецца па асобных пазіцыях. Але пры такіх умовах фінансавання пры ўвасабленні свята сустракаюцца значныя цяжкасці, таму што творчыя ідэі даводзіцца рэалізоўваць у запланаваных рамках каштарыса.

Дэталёва распрацаванае палажэнне аб правядзенні свята члены ініцыятыўнай групы падаюць на разгляд адпаведных дзяржаўных органаў, устаноў, якія могуць вырашыць пытанні яго правядзення (калегіі розных міністэрстваў, абласныя, гарадскія або раённыя выканкамы, упраўленні культуры, грамадскія і прыватныя арганізацыі і інш.). На спецыяльным пасяджэнні такой дзяржаўнай, грамадскай ці прыватнай установы або арганізацыі абмяркоўваюць прапановы ініцыятыў-най групы, уносяць пэўныя папраўкі і дапаўненні (калі існуе неабходнасць) і зацвярджаюць палажэнне аб правядзенні свята.

У пісьмовым выглядзе палажэнне аб правядзенні свята даводзіцца да ведама ўсіх творчых, арганізацыйных, гаспадарчых і іншых структур, якія прыцягваюцца да правядзення свята. Затым распачынаецца работа над рэалізацыяй розных пытанняў увасаблення святочнага дзеяння.

## Літаратура

*Аўцюкі-2003.* 1V Усебеларускі фестываль народнага гумару. — Гомель: КИПУП “ Сож “, 2003.

*Звіняць* цымбалы і гармонік. Міжнародны фестываль народнай музыкі: Даведнік фестывалю. — Мн.: Чатыры чвэрці, 1998.

*Не старэюць* душой ветэраны. Трэці рэспубліканскі фестываль народнай творчасці ветэранскіх калектываў. — Мн.: РПКВ, 1977.

*Пад белым* крылом Беларусі. 1V Усебеларускі фестываль нацыянальных культур, Гродна, 7—8 чэрв. 2002 г. — Мн.: ТАА “Ковчег”, 2002.

*Сожскі карагод.* Второй международный фестиваль бальной хореографии. — Жлобин: Техническая книга, 1999.

# II. АРГАНІЗАЦЫЙНЫ КАМІТЭТ ПА ПАДРЫХТОЎЦЫ СВЯТА

## Склад аргкамітэта і яго структурных падраздзяленняў

Аргкамітэт свята — гэта часовае адміністрацыйна-творчае аб'яднанне, створанае па загадзе органаў дзяржаўнай улады або адміністрацыі грамадскай установы, арганізацыі ці прыватнай асобы для вырашэння задач творчага, матэрыяльна-тэхнічнага, арганізацыйнага і фінансавага забеспячэння свята ў перыяд яго падрыхтоўкі і правядзення. Галоўныя адказныя асобы аргкамітэта вызначаюцца ў палажэнні аб правядзенні свята. Яны каардынуюць і кантралююць выкананне пэўных блокаў пытанняў па арганізацыі і правядзенні свята і звычайна з'яўляюцца кіраўнікамі структурных падраздзяленняў.

Склад структурных падраздзяленняў аргкамітэта ў залежнасці ад маштабаў увасабляемага свята можа дасягаць ад некалькіх дзесяткаў да некалькіх соцень людзей.

Прапануемая арганізацыйная структура аргкамітэта адлюстроўвае пералік яго структурных падраздзяленняў, адказных асоб і супрацоўнікаў, неабходных пры падрыхтоўцы вялікага маштабнага свята міжнароднага або рэспубліканскага ўзроўню. У іншых святах, больш сціплых па аб'ёме падрыхтоўчых работ, такі пералік значна памяншаецца ў адпаведнасці з тымі творчымі задачамі, якія вырашаюцца ў свяце, і матэрыяльнымі магчымасцямі, якія ёсць у распараджэнні аргкамітэта.

Але ў любым выпадку агульная схема пабудовы аргкамітэта, сістэма падпарадкавання, пералік і задачы структурных падраздзяленняў свята застаюцца нязменнымі.

Арганізацыйны камітэт па падрыхтоўцы свята складаецца са *штаба*, куды ўваходзяць старшыня аргкамітэта, намеснікі старшыні аргкамітэта, кіраўнікі структурных падраздзяленняў, сакратар; *пастановачнай групы* (мастацкі кіраўнік свята, аўтар сцэнарыя або сцэнарная група, галоўны рэжысёр, га-

лоўны мастак, музычны кіраўнік, галоўны балетмайстар, гукарэжысёр, рэжысёры-пастаноўшчыкі розных святочных мерапрыемстваў, дзей, нумароў); *творчай групы* (памочнік або асістэнт галоўнага рэжысёра, рэжысёры, балетмайстры, хармайстры, дырыжоры, мастак-дэкаратар, мастак-бутафор, мастак-рэквізітар, мастак па грыму, кіраўнікі творчых калектываў, асістэнты рэжысёраў-пастаноўшчыкаў, трэнеры спартыўных калектываў, асобныя выканаўцы: вядучыя, дыктары, артысты розных жанраў, культарганізатары, удзельнікі груп тэатралізаванай рэкламы на вазах, аўтамабілях, трамваях, цеплаходах і інш.); *мастацка-пастановачнай часткі* (машыніст сцэны, калі ёсць неабходнасць, гукааператары, аператары святлатэхнікі, інжынер па разліку канструкцый і дэкаратыўных аб'ёмаў, рэквізітар, касцюмер, грымёр, бутафор, рабочыя сцэны); *упраўлення па матэрыяльна-тэхнічным забеспячэнні* (намеснік старшыні аргкамітэта або дырэктар свята, кіраўнікі або адказныя прадстаўнікі арганізацый, прадпрыемстваў, устаноў, якія ўдзельнічаюць у падрыхтоўцы свята, дырэкцыя кірмашу, аддзел арганізацыі харчавання ўдзельнікаў свята: прадпрыемствы харчовай прамысловасці, харчгандлю, грамадскага харчавання; транспартны аддзел: камунгас, ПМК, аўтабазы, трамвайна-тралейбусныя паркі, спартыўна-тэхнічныя таварыствы, аўтасродкі воінскіх і ваенізаваных падраздзяленняў); *арганізацыйнага аддзела* (адміністратар свята, жыллёвая гаспадарка: гасцініцы, інтэрнаты, здраўніцы, турбазы, палатачныя гарадкі; група рэкламы свята: прэса, радыё, тэлебачанне, друкарня; служба бяспекі руху; транспартная служба; медыцынская служба свята; служба пажарнай бяспекі; служба аховы парадку: міліцыя, падраздзяленні ўнутраных войск, добраахвотныя дружыны аховы парадку); *бухгалтэрыі свята* (галоўны бухгалтар, бухгалтар, касір).

## Функцыянальныя абавязкі членаў аргкамітэта

Пры распрацоўцы структуры аддзелаў і службаў аргкамітэта важна ведаць не толькі сістэму падпарадкавання, але і дакладна вызначыць функцыянальныя абавязкі іх супрацоўнікаў. Веданне функцыянальных абавязкаў супрацоўнікаў дае магчымасць кампетэнтна абгрунтаваць аплату тых ці іншых відаў работ, уключыўшы іх пералік у канкрэтнае працоўнае пагадненне або дагавор.

У кожным свяце ў залежнасці ад яго маштабу функцыянальныя абавязкі членаў структурных падраздзяленняў могуць вызначацца ў большым ці меншым аб'ёме, але галоўныя моманты іх дзейнасці застаюцца нязменнымі.

Ужо ў палажэнні аб правядзенні свята ў складзе яго штаба вызначаюцца галоўныя адказныя асобы: старшыня аргкамітэта і яго намеснікі, галоўны рэжысёр, дырэктар свята, а таксама кіраўнікі падраздзяленняў, якія будуць кіраваць іх работай і дэталізаваць заданні супрацоўнікам.

*Старшыня аргкамітэта* звычайна прызначаецца з ліку адказных адміністрацыйных асоб, здольных вырашыць пытанні арганізацыі свята на любым узроўні. У рамках раёна, вобласці, горада старшынёй аргкамітэта, як правіла, становіцца старшыня мясцовага выканкама або яго намеснік ці загадчык аддзела культуры; у невялікіх святах мясцовага характару такія функцыі можа выконваць дырэктар пэўнай арганізацыі, прадпрыемства, кіраўнік установы; у свяце, якое наладжваецца міністэрствам пэўнай галіны, старшынёй аргкамітэта прызначаюць намесніка міністра, а ў вялікіх міжнародных святах узначаліць такое часовае аб'яднанне можа кіраўнік пэўнай дзяржаўнай структуры.

Задача старшыні аргкамітэта — здзяйсненне агульнага кіраўніцтва і каардынацыя работ усіх структурных падраздзяленняў, перыядычнае правядзенне агульных пасяджэнняў аргкамітэта, на якіх заслухоўваецца і аналізуецца ход пад-

рыхтоўкі свята, вырашаюцца найбольш вострыя арганізацыйныя праблемы і спрэчныя пытанні.

*Намеснік старшыні аргкамітэта* — гэта прадстаўнік дзяржаўных органаў (або арганізацыі, прадпрыемства, установы), які практычна вядзе пастаянны кантроль работы ўсіх структурных падраздзяленняў і перыядычна робіць справаздачы свайму кіраўніку. У лік намеснікаў старшыні аргкамітэта даволі часта (асабліва пры ўвасабленні свят мясцовага ўзроўню) уваходзяць дырэктар свята і галоўны рэжысёр.

*Дырэктар свята* вядзе практычную работу па кіраўніцтве і кантролі за дзейнасцю гаспадарчых, арганізацыйнай і фінансавай структур аргкамітэта. У асобных святах, увасабленне якіх звязана з выкананнем вялікага аб'ёму работ, у склад супрацоўнікаў аргкамітэта могуць быць уведзены пасады генеральнага і выканаўчага дырэктараў, якія паміж сабой дзеляць абавязкі па падрыхтоўцы і правядзенні свята.

Асобнае месца ў кіраўнічым звяне аргкамітэта займае *галоўны рэжысёр* (або мастацкі кіраўнік). Справа ў тым, што гэтая асоба нясе асабістую адказнасць за якасць творчага ўвасаблення свята. Таму дырэктар свята па ўсіх кардынальных пытаннях і ў тых выпадках, калі існуе неабходнасць, раіцца з галоўным рэжысёрам, выконвае яго рэкамендацыі, парады. Пры ўзнікненні спрэчных момантаў або розных пазіцый на спосаб вырашэння таго ці іншага пытання яны звяртаюцца да старшыні аргкамітэта, які і выносіць канчатковае рашэнне.

### ***Пастановачная група свята***

Пастановачная група — гэта часовае творчае аб'яднанне, створанае для дэталёвай распрацоўкі творчай канцэпцыі свята і яе ўвасаблення ў літаратурным аспекце, пластычным, мастацка-дэкаратыўным, музычным рашэннях.

Стварэнне пастановачнай групы свята — прэрагатыва галоўнага рэжысёра (або мастацкага кіраўніка); у залежнасці ад

аб'ёму творчых работ вар'іруецца і колькасны склад пастановачнай групы або пастановачных груп.

У сучаснай святочнай культуры Беларусі праводзіцца шэраг свят, якія могуць працягвацца некалькі тыдняў, месяцаў і нават гадоў. Арганізатары такіх святочных марафонаў, як, напрыклад, Свята нацыянальных культур Беларусі, Усебеларускае свята народнага гумару, міжнароднае свята народнай музыкі "Звіняць цымбалы і гармонік", на працягу аднаго—двух гадоў наладжваюць у рамках сваіх праграм святы розных раёнаў і абласцей, грамадскіх аб'яднанняў (дзе ажыццяўляюцца папярэдні прагляд і адбор творчых калектываў), а затым запрашаюць на фінальнае святочнае мерапрыемства ў загадзя вызначаным горадзе лепшыя творчыя калектывы і асобных выканаўцаў.

На такіх святах (фестывалі мастацтваў, народных рамёстваў, народнай творчасці, спартыўных святах і да т.п.) на пачатковым этапе ў кожнай мясцовасці ствараюцца свае пастановачныя групы, якія займаюцца ўвасабленнем святочных дзей.

Падрыхтоўка грандыёзных па маштабу свят патрабуе стварэння цэнтральнай і тэрытарыяльных пастановачных груп. У гэтых выпадках з мэтай каардынацыі іх дзейнасці, дакладнага выканання ўсіх творчых задач у структуру цэнтральнай пастановачнай групы можа быць уведзена пасада мастацкага кіраўніка. Такая ж адзінка можа быць і ў складзе пастановачных груп іншых свят, увасабленнем якіх займаюцца пастаноўшчыкі, якія маюць невялікі творчы вопыт.

*Мастацкі кіраўнік* — самы дасведчаны спецыяліст пэўнага жанру мастацтва ў структуры арганізацыйнага камітэта свята, творчыя распрацоўкі, парады і рэкамендацыі якога аказваюць істотны ўплыў на якасць падрыхтоўкі і правядзення свята.

Пасада мастацкага кіраўніка ўводзіцца ў склад пастановачных груп буйнамаштабных свят, якія маюць міжнародны, рэспубліканскі, рэгіянальны статус і патрабуюць паэтапнага ўвасаблення (спачатку ў рамках раёна, вобласці і, нарэшце,

на месцы правядзення заключнага мерапрыемства). Прыкладам такіх свят у нашай краіне могуць быць міжнароднае свята народнай музыкі "Звіняць цымбалы і гармонік", Свята нацыянальных культур Беларусі, рэспубліканскія святы-конкурсы народных рамёстваў, народнага гумару, фестываль народнай гульні " Карнавал весялосці" і інш.

Мастацкі кіраўнік адказвае за творчы працэс падрыхтоўкі свята. У яго функцыянальныя абавязкі ўваходзіць наступнае:

— стварэнне агульнай канцэптуальнай асновы, у якой прапануецца ўвасабленне новых святочных формаўтварэнняў або новых рашэнняў і творчых падыходаў да ўжо існуючых святочных дзей ці захаванне і развіццё старадаўніх народных святочных традыцый;

— складанне агульнай праграмы свята;

— распрацоўка агульных праграм (або сцэнарных планаў) рэгіянальных, абласных, раённых свят, якія ўваходзяць у структуру буйнамаштабнага свята з улікам мясцовых асаблівасцей і адрозненняў;

— удзел у распрацоўцы палажэння аб правядзенні свята, у якім вызначаюцца яго мэты і задачы, умовы правядзення, склад аргкамітэта і журы з пералікам галоўных адказных асоб; уключэнне ў палажэнне агульнага комплексу заданняў, якія неабходна выращыць вызначаным арганізацыям, установам і прадпрыемствам у перыяд падрыхтоўкі і правядзення свята; удзел у складанні каштарыса свята;

— правядзенне творчых кансультацый з рэжысёрамі-пастаноўшчыкамі, мастакамі, харэографамі, хормайстрамі, мастакамі па святлу, піратэхнікамі, гукарэжысёрамі, кіраўнікамі творчых і трэнерамі спартыўных калектываў, якія заняты ў арганізацыі і ўвасабленні пэўных фрагментаў свята або яго асобных нумароў;

— аналіз і зацвярджэнне літаратурных сцэнарыяў і рэжысёрскіх распрацовак разнастайных святочных дзей (урачыстае адкрыццё і закрыццё свята, тэатралізаванае прад-

стаўленне, абрад, канцэрт, конкурс, гульнёвыя, спартыўныя і відовішчныя праграмы);

— удзел у распрацоўцы рабочага плана падрыхтоўкі свята;

— правядзенне пасяджэнняў пастановачных груп свята, на якіх абмяркоўваюцца і вырашаюцца разнастайныя пытанні яго ўвасаблення;

— агульнае кіраўніцтва работай пастановачных груп рэгіянальных свят;

— кантроль за ходам падрыхтоўкі і аналіз правядзення свят у розных раёнах;

— асабістае кіраўніцтва работай пастановачнай групы заключных мерапрыемстваў свята;

— аналіз арганізацыі і правядзення свята на выніковым пасяджэнні арганізацыйнага камітэта, вызначэнне творчых знаходак, удалых рашэнняў, выяўленне пралікаў у творчых, арганізацыйных, матэрыяльна-тэхнічных і фінансавых аспектах увасаблення свята, распрацоўка і прапанова практычных рэкамендацый па пераадоленні вызначаных недахопаў і далейшым удасканаленні свята.

*Галоўны рэжысёр свята* — гэта адзіная ў структуры арганізацыйнага камітэта асоба, якая вядзе і накіроўвае ўвесь комплекс пытанняў, звязаных з творчым увасабленнем свята.

Функцыянальныя абавязкі галоўнага рэжысёра наступныя:

— стварэнне ім асабіста або ў сааўтарстве агульнай канцэпцыі свята;

— правядзенне гісторыка-рэтраспектыўнага аналізу развіцця свята, якое будзе ўвасабляцца, выдзяленне яго агульнанацыянальных рыс, а таксама тэрытарыяльных і мясцовых адметнасцей і асаблівасцей;

— распрацоўка агульнага сцэнарнага плана і літаратурнага сцэнарыя цэнтральных святочных мерапрыемстваў (урачыстае адкрыццё, урачыстае закрыццё свята, галоўная святочная дзея — тэатралізаванае прадстаўленне, абрад, відовішча, шоу, конкурс і да т.п.);

— падрыхтоўка пастановачнага плана свята;

— здзяйсненне кантролю за распрацоўкамі аўтараў іншых святочных дзей;

— кіраўніцтва работай рэжысёраў-пастаноўшчыкаў асобных мерапрыемстваў;

— пастаноўка задач і кантроль за ходам практычнай падрыхтоўкі асобных нумароў, атракцыёнаў, спартыўных, піратэхнічных, харэаграфічных, музычных, масава-гульнёвых і іншых дзей, якія здзяйсняюць рэжысёры, хормайстры, балетмайстры, дырыжоры і кіраўнікі іншых калектываў;

— вызначэнне з галоўным мастаком прасторавага і вобразнага вырашэння свята, зацвярджэнне эскізаў і чарцяжоў канструктыўных элементаў, малых формаў дэкаратыўнага афармлення і здзяйсненне агульнага кантролю за іх вырабам;

— вызначэнне з галоўным балетмайстрам прасторавага і вобразнага вырашэння пластычных сцэн і кантроль за іх пастаноўкай;

— вызначэнне з музычным кіраўніком прынцыпаў музычнага афармлення, кантроль за падборам музычных нумароў;

— вызначэнне з гукарэжысёрам прынцыпаў гукавога афармлення свята, запіс, перазапіс і мантаж фанаграм свята сумесна з гукарэжысёрам і гукааператарам;

— распрацоўка творча-тэхнічнай дакументацыі (партытура рэжысёра, музычная партытура, партытура асвятлення, выпіскі на рэквізіт, бутафорыю, касцюмы і абутак, парыкі і грым, мэблю, партытура тэхнічных перастановак, графік правядзення рэпетыцый);

— работа з творчымі калектывамі і асобнымі выканаўцамі па ўвасабленні святочных дзей;

— правядзенне застольных, планіровачных, мантажных, прагонных, зводных і генеральных рэпетыцый, а таксама свята;

— здзяйсненне сумесна з дырэктарам свята перыядычнага кантролю работы ўсіх службаў, непасрэдна звязаных з творчым, матэрыяльна-тэхнічным, арганізацыйным і фінансавым забеспячэннем свята;

— удзел у пасяджэннях арганізацыйнага камітэта свята.

*Сцэнарная група* — гэта аб'яднанне творцаў, якія ўносяць свой погляд і сваё бачанне ў распрацоўку аб'яднаных адной канцэпцыяй разнастайных мерапрыемстваў, што дае вялікі плён, таму што свята ўзбагачаецца фантазіяй многіх асоб і ўжо на пачатковым этапе становіцца праявай калектыўнай творчасці. На жаль, стварэнне сцэнарных груп у сучасных умовах — з'ява далёка не паўсюдная. Гэта тлумачыцца рознымі прычынамі. Па-першае, цяжкае эканамічнае становішча часта не дазваляе знайсці неабходныя сродкі для аплаты такой групы, а па-другое, адсутнасць у навучальных установах спецыялізацыі "сцэнарыст свят" вельмі абмяжоўвае пералік такіх спецыялістаў. Таму пры правядзенні пераважнай большасці сучасных свят у краіне, нягледзячы на іх маштаб, узровень і колькасць мерапрыемстваў, распрацоўкай сцэнарыя звычайна займаецца галоўны рэжысёр, які адначасова становіцца аўтарам, інтэрпрэтатарам і творчым арганізатарам святочнага дзеяння.

*Пастаноўшчыкі святочных дзей.* Арганізацыя свята звязана з увасабленнем разнастайных па тэматыцы і форме абрадава-рытуальных, тэатралізаваных, відовішчных і імправізацыйных масава-гульнёвых дзей, аб'яднаных адной ідэяй. Таму важнейшай задачай галоўнага рэжысёра з'яўляецца вызначэнне таго кола пастаноўшчыкаў, якія маглі б на высокапрафесійным узроўні ажыццявіць творчую задуму, распрацаваць і ўвасобіць пэўнае мерапрыемства, эпізод, нумар.

У рэжысёрскую групу ўваходзяць як пастаноўшчыкі цэлага блока святочных мерапрыемстваў у пэўнай зоне святочнага дзеяння, якія па сутнасці з'яўляюцца святам у свяце (кірмаш, спартыўная зона, дзіцячая зона і інш.) і якія, як правіла, працуюць па аўтаномнай праграме, так і рэжысёры асобных мерапрыемстваў, нумароў, атракцыёнаў.

Але, нягледзячы на аб'ём увасабляемай дзеі, перад усімі рэжысёрамі-пастаноўшчыкамі паўстае задача выканання наступных функцыянальных абавязкаў:

— стварэнне сцэнарнай і рэжысёрскай распрацоўкі вызначанай святочнай дзеі і зацвярджэнне яе на сустрэчы з галоўным рэжысёрам або мастацкім кіраўніком свята;

— падбор творчых калектываў і асобных выканаўцаў для ўвасаблення распрацаванага дзеяння;

— арганізацыя і правядзенне рэпетыцый;

— здзяйсненне кантролю за творчым і матэрыяльна-тэхнічным забеспячэннем увасабляемай дзеі;

— удзел у пасяджэннях пастановачнай групы і аргкамітэта;

— правядзенне ўвасабляемага мерапрыемства ў дзень свята.

У тым выпадку, калі рэжысёр запрошаны ў якасці пастаноўшчыка нумара ці атракцыёна, яго абавязкі могуць быць абмежаваны абмяркоўваннем творчай задумы з галоўным рэжысёрам, творчай распрацоўкай, увасабленнем і здачай зацверджанага дзеяння, а ўжо выпуск і правядзенне гэтага нумара ўскладаюцца на асістэнта рэжысёра і выканаўцаў.

Падобныя функцыянальныя абавязкі ўскладаюцца, але ўжо з улікам спецыфікі асобных відаў мастацтва, на балетмайстраў, хормайстраў, дырыжораў.

*Галоўны мастак свята.* Стварэнне мастацка-дэкаратыўнага афармлення — адно з кардынальных пытанняў арганізацыі свята, якое звязана з агульным планам дэкарыравання святочнай тэрыторыі, пабудовай разнастайных канструкцый аказіянальнай часовай архітэктуры — сцэнічныя пляцоўкі, гандлёвыя пабудовы, статычныя і дынамічныя канструктыўныя элементы афармлення і да т.п. Мастацка-дэкаратыўнае афармленне павінна ў яскравай, вобразна-сімвалічнай форме адлюстроўваць ідэю свята, несці ў сабе пазнавальную і інфарматыўную накіраванасць.

Здзяйсненнем задумы і кантролю за вырабам мастацка-дэкаратыўнага афармлення займаецца галоўны мастак, які павінен:

— азнаёміцца з агульным сцэнарыем свята і сцэнарыямі яго асобных фрагментаў, творчай канцэпцыяй галоўнага рэжысёра і рэжысёраў-пастаноўшчыкаў;

— распрацаваць агульны план дэкарыравання мясцовасці, дзе адбываецца свята;

— удакладніць з галоўным рэжысёрам і распрацаваць план размяшчэння зон святочнага дзеяння і іх апорных пунктаў;

— распрацаваць вобразнае вырашэнне свята з улікам яго тэматыкі, жанравых, стылёвых і нацыянальных асаблівасцей;

— распрацаваць эскізы мастацка-дэкаратыўнага афармлення (розных статычных і дынамічных установак, светлавога афармлення, касцюмаў і грыму, рэквізіту і бутафорыі, піратэхнічных фігур і буйнамаштабных лялек і да т.п.);

— падабраць мастакоў і дэкаратараў, мастака-бутафора, мастака-рэквізітара, мастака-грымёра і мастака па асвятленні, якія будуць выконваць адпаведныя віды работ;

— праводзіць пастаянны кантроль за ходам усіх этапаў работ па вырабе мастацка-дэкаратыўнага афармлення;

— правесці нагляд мантажу мастацка-дэкаратыўнага афармлення на ўсіх пляцоўках кожнай зоны святочнага дзеяння;

— прымаць удзел у пасяджэннях пастановачнай групы і аргкамітэта, а таксама ў правядзенні мантажнай, прагоннай і генеральнай рэпетыцый;

— назіраць за ходам мантажных работ у час правядзення свята.

На ўсіх этапах работы галоўны мастак праводзіць кансультацыі з галоўным рэжысёрам з мэтай выпрацоўкі аптымальнага варыянта вырашэння пытанняў мастацка-дэкаратыўнага афармлення свята.

*Музычны кіраўнік свята.* На святах рознай тэматычнай і жанравай накіраванасці, асабліва такіх, як фестывалі народнай, духавой, камернай, эстраднай музыкі, свята песні і іншых, дзе музыка з'яўляецца асноўным выразным сродкам,

важная роля належыць музычнаму кіраўніку, перад якім ставяцца наступныя функцыянальныя патрабаванні:

— азнаёміцца са сцэнарыем свята і характарам музыкі той эпохі, якая адлюстравана ў свяце;

— распрацаваць музычны вобраз свята ці мелодыю-лейтматыў, якая будзе праходзіць скрозь асноўныя фрагменты дзеяння;

— вырашыць прынцыпы музычнага афармлення (ілюстрацыйны, кантрастны і інш.), а таксама асноўныя спосабы падачы музычнага матэрыялу (механічны запіс — фанаграма, "жывы гук" у выкананні музычных, харавых калектываў і асобных выканаўцаў або яднанне гэтых двух спосабаў);

— зрабіць падбор музычных нумароў, якія б не толькі характарызавалі эпоху, але і спрыялі паглыбленню рэжысёрскай задумы свята, узмацнялі эмацыянальны ўплыў на гледача;

— пры неабходнасці вызначыць кампазітара, які зможа напісаць неабходную для свята музыку.

У сучасных умовах вельмі часта функцыянальныя абавязкі музычнага кіраўніка ўскладаюцца на галоўнага дырыжора або гэтыя задачы вырашае галоўны рэжысёр сумесна з гукарэжысёрам.

*Гукарэжысёр свята.* Сучаснае свята не абыходзіцца без гукаўзмацнення, асабліва гэта датычыцца свят на адкрытым паветры, дзе зоны дзеяння размешчаны на вялікай тэрыторыі, а сцэнічныя пляцоўкі знаходзяцца на значнай адлегласці ад гледачоў. Работа па гукавым афармленні свята мае спецыфічныя асаблівасці, звязана з пэўнымі творчымі, арганізацыйнымі і тэхнічнымі цяжкасцямі.

Перад гукарэжысёрам у працэсе падрыхтоўкі і правядзення свята ставяцца наступныя функцыянальныя патрабаванні:

— на аснове выяўлення прасторавага вырашэння, ландшафтных і архітэктурных асаблівасцей месца святочнага дзеяння вызначыць сістэмы агучвання і аб'ём гучання цэнтральнага мізансцэнічнага пункта свята, а таксама дадатковых сцэнічных і масава-гульнёвых пляцовак;

— высветліць тыя тэхнічныя магчымасці, якія ёсць у дадзенай мясцовасці для агучвання ўсёй тэрыторыі свята і асобных пляцовак;

— на аснове аналізу сцэнарыя здзейсніць падбор неабходных музычных, шумавых і гукавых нумароў і зацвердзіць іх у галоўнага рэжысёра;

— распрацаваць партытуру музыкі і шумаў і вызначыць у адпаведнасці з патрабаваннямі дзеі хранаметраж кожнага нумара;

— зрабіць запіс, перазапіс і мантаж фанаграм свята;

— кантраляваць мантаж тэхнічнай апаратуры на ўсіх сцэнічных і масава-гульнёвых пляцоўках;

— здзейсніць гукавое суправаджэнне рэпетыцый і самога свята;

— прыняць удзел у рабоце пастановачнай групы і аргкамітэта.

У працэсе работы над гукавым афармленнем гукарэжысёру дапамагае гукааператар або гукааператары, асабліва на этапе гукатэхнічнага афармлення і суправаджэння свята. Але канчатковае рашэнне па ўсіх пытаннях гукавога афармлення прымае галоўны рэжысёр.

### *Абавязкі членаў творчай групы*

Творчая група свята — гэта ўдзельнікі будучых святочных дзей, запрошаныя для выканання канкрэтных відаў творчых работ: прафесіянальныя і самадзейныя калектывы, спартыўныя таварыствы і вайсковыя часці, Дамы мадэляў і піратэхнічныя фірмы, сярэднія і вышэйшыя навучальныя ўстановы, Палацы дзяцінства і інш.

Практычнай падрыхтоўкай да ўдзелу ў свяце мноства калектываў займаецца шэраг спецыялістаў, аб'яднаных у творчую групу. Сюды ўваходзяць кіраўнікі творчых калектываў і асобныя выканаўцы, якія падпарадкоўваюцца пэўнаму члену пастановачнай групы згодна са сваёй спецыялізацыяй. На-

прыклад, кіраўнікі харэаграфічных калектываў працуюць пад кіраўніцтвам галоўнага балетмайстра, харавымі і музычнымі калектывамі кіруе галоўны дырыжор або музычны кіраўнік і інш.

Члены творчай групы выконваюць заданні пастаноўшчыкаў. У працэсе ўсяго перыяду падрыхтоўкі свята члены пастановачнай групы кантралююць работу калектываў творчай групы і абмяркоўваюць ход падрыхтоўкі на спецыяльных пасяджэннях.

Асобнае месца ў структуры творчай групы займае *памочнік рэжысёра*, які з'яўляецца звязуючым звяном паміж галоўным рэжысёрам і членамі творчай і пастановачнай груп.

Памочнік (асістэнт) — гэта непасрэдны паплечнік галоўнага рэжысёра перш за ўсё па творчай, а затым па тэхнічна-арганізацыйнай лініі. У яго функцыі ўваходзіць наступнае:

— удзельнічаць ва ўсім працэсе падрыхтоўкі свята, пачынаючы з абмеркавання з галоўным рэжысёрам пастановачнага плана і заканчваючы выпускам самога свята;

— правесці па даручэнні галоўнага рэжысёра рэпетыцыі з асобнымі калектывамі і выканаўцамі;

— кантраляваць работу розных тэхнічных службаў;

— праводзіць работу па арганізацыі рэпетыцый:

а) інфармаваць калектывы і выканаўцаў, усе неабходныя службы аб графіку рэпетыцыйнага працэсу;

б) падрыхтаваць на сцэне згодна з рэжысёрскай планіроўкай выгарадку мастацка-дэкаратыўнага афармлення;

в) пракантраляваць мантаж і гатоўнасць да работы гукаўзмацняльнай і гукааднаўляльнай апаратуры;

г) праверыць гатоўнасць касцюмаў, рэквізіту і бутафорыі;

д) у час рэпетыцый і святочнага дзеяння кантраляваць ход дзеі, своечасова абвяшчаць выканаўцам і калектывам аб іх выхадзе на сцэну; згодна партытур музыкі і шумаў, святла, тэхнічных перастановак кіраваць работай асвятляльнікаў, гукаапэратара і рабочых сцэны;

ж) выконваць усе творчыя і арганізацыйныя даручэнні галоўнага рэжысёра па каардынацыі пытанняў увасаблення свята.

Памочнік (асістэнт) рэжысёра з'яўляецца кіраўніком-каардынатарам творчай групы, праз якога ўсе творчыя і арганізацыйныя пытанні асобных выканаўцаў і калектываў даводзяцца да галоўнага рэжысёра і дырэктара свята і атрымліваюць канчатковае вырашэнне.

### *Мастацка-пастановачная частка свята*

Для здзяйснення свята патрэбны пэўныя ўмовы, у якіх будуць дзейнічаць выканаўцы. Да пачатку ўрачыстасцей дзеля стварэння такіх умоў вядзецца велізарная работа па выпуску свята. Стварэнне знешняй формы свята ўключае шэраг разнастайных відаў работ творчага і вытворчага характару, якой займаецца мастацка-пастановачная частка свята. Гэта структурнае падраздзяленне аргкамітэта ўзначальвае спецыяльная адказная асоба — загадчык мастацка-пастановачнай часткі. Але ў тым выпадку, калі наладжваемае свята з'яўляецца невялікім па маштабе або ў каштарысе выдаткаў па розных прычынах не прадугледжана адзінка загадчыка мастацка-пастановачнай часткі, яго задачы выконвае дырэктар свята.

*Загадчык мастацка-пастановачнай часткі* працуе ў пастаянным кантакце з галоўным рэжысёрам і галоўным мастаком; яго работа складаецца з наступных функцыянальных абавязкаў:

— арганізацыя і правядзенне рабочых нарад мастацка-пастановачнай часткі;

— нагляд за матэрыяльна-тэхнічным забеспячэннем свята;

— рэгуляванне абавязкаў і раскладу работы членаў мастацка-пастановачнай часткі;

— кантроль за вырабам, арэндай або падборам усіх неабходных кампанентаў мастацка-дэкаратыўнага афармлення;

— кантроль за правядзеннем мантажу абсталявання ўсіх эстрадных і гульнёвых пляцовак свята;

— арганізацыя і правядзенне спецыяльных відаў рэпетыцый, якія наладжваюцца мастацка-пастановачнай часткай (падгоначныя, манціровачныя, па асвятленні, гукавыя);

— падрыхтоўка разам з пажарна-тэхнічнай камісіяй і інжынерам па тэхніцы бяспекі актаў здачы і прыёму мастацка-дэкаратыўнага афармлення, святлатэхнікі і разнастайных механізмаў з пункту гледжання захавання нормаў і правіл умоў працы і супрацьпажарнай бяспекі;

— удзел у рабоце аргкамітэта і каардынацыйная работа з членамі іншых структурных падраздзяленняў.

Пад кіраўніцтвам загадчыка мастацка-пастановачнай часткі працуюць спецыялісты рознага профілю, якія займаюцца канкрэтнай творчай і вытворчай дзейнасцю па стварэнні знешняй формы свята. Прапануемы пералік кіраўнікоў і членаў службаў мастацка-пастановачнай часткі, а таксама іх функцыянальныя абавязкі могуць памяншацца або павялічвацца ў адпаведнасці з аб'ёмам работы, якую трэба зрабіць пры падрыхтоўцы і правядзенні свята.

*Машыніст сцэны* на свяце даволі часта разам з рабочымі сцэны, брыгадамі будаўнікоў і электрыкаў абслугоўвае не толькі галоўную сцэну, але і дадатковыя пляцоўкі дзеяння, таму яго абавязкі значна шырэй, чым у тэатры:

— знаёмства са сцэнарыем свята, задумай рэжысёра і мастака, планіроўкай святочнай прасторы і тым аб'ёмам работ, які трэба выканаць яму і яго падначаленым;

— нагляд за будаўніцтвам часовых пабудоў свята ў адпаведнасці з эскізамі і чарцяжамі, якія распрацаваў галоўны мастак;

— замацаванне асобных зон дзеяння свята і дзялянак галоўнай сцэны за брыгадзірамі груп рабочых сцэны;

— арганізацыя для правядзення рэпетыцый з выканаўцамі ў рэпетыцыйным памяшканні і на сцэне выгарадак сцэнічнага

афармлення на аснове падбору станкоў, сцен, калон — усяго таго, што патрабуецца для імітацыі будучых дэкарацый;

— знаёмства з дэкарацыямі, асвойванне іх зборкі, устаноўкі і разборкі;

— падгонка і манціроўка сцэнічнага афармлення, занатаванне парадку і тэхнікі манціроўкі, планіроўкі і сігналаў для іх перамен у час дзеі;

— распрацоўка разам з загадчыкам пастановачнай часткі плана правядзення манціровачных рэпетыцый, у якім вызначаюцца аб'ём работ, паслядоўнасць аперацый і колькасць выкліканых работнікаў;

— тлумачэнне рабочым сцэны сэнсу і парадку правядзення манціровачных рэпетыцый і расстаноўка іх па асобных дзялянках;

— вызначэнне месцаў размяшчэння дэкарацый на сцэне, месца падрыхтоўкі мэблі і спосабу яе дастаўкі на сцэну ў адпаведнасці з парадкам змены дэкарацый;

— распрацоўка спосабу дастаўкі дэталяў дэкаратыўнага афармлення і мэблі з адной зоны дзеяння свята ў другую (у выпадку неабходнасці);

— фіксацыя планіроўкі ў кожнай зоне святочнага дзеяння;

— удзел у правядзенні прагонных, мантажных, зводных, генеральных рэпетыцый на ўсіх пляцоўках святочнага дзеяння, арганізацыя вытворчага працэсу рабочай групы на свяце;

— удзел у нарадах мастацка-пастановачнай часткі.

*Аператары светлавой тэхнікі.* У групу спецыялістаў, якія на свяце займаюцца ўвасабленнем светлавога рашэння, уваходзяць тэхнічныя работнікі рознага профілю: асвятляльнікі, дэманстратары калярова-музычнага жывапісу, аператары лазернай тэхнікі, праекцыйнай апаратуры (відэа, слайды, кіно). Пры ўсёй спецыфічнасці работы на тых ці іншых светлавых прыборах найбольш агульнымі абавязкамі гэтай групы супрацоўнікаў мастацка-пастановачнай часткі з'яўляюцца:

— знаёмства са сцэнарыем свята і дэталёвая прапрацоўка яго светлавой партытуры;

— распланаванне асноўных светлавых пунктаў, вызначэнне колькасці і характару светлавых праекцый і эфектаў;

— вымярэнне адлегласці ад месцаў размяшчэння стацыянарнай і пераноснай апаратуры да асвятляемых аб'ектаў;

— выяўленне прыбораў, якіх не хапае для ажыццяўлення рэжысёрскай задумы, і іх набыццё або канструяванне;

— вызначэнне прынцыпаў размеркавання асноўных светлавых мас, удакладненне светлавых пераходаў;

— здзяйсненне спробы праекцый, эфектаў і ўсіх астатніх спецпрыстасаванняў;

— правядзенне рэпетыцый па ўсталёўцы святла з улікам асноўных мізансцэн і праверка асветленасці выканаўцаў на фоне агульнай светлавой карціны;

— фіксацыя знойдзенага светлавога рашэння ў светлавой партытуры;

— удзел у правядзенні рэпетыцый і святочнага дзеяння, у нарадах мастацка-пастановачнай часткі.

*Касцюмер свята.* Вытворчай і эксплуатацыйнай дзейнасцю па забеспячэнні ўдзельнікаў свята касцюмамі займаецца касцюмерная частка свята, арганізацыйная структура якой залежыць ад колькаснага складу ўдзельнікаў і жанравай накіраванасці святочных дзей.

Аматарскіх і прафесійных артыстаў, якія выступаюць у складзе сваіх калектываў, касцюмамі забяспечвае камандзіруючая арганізацыя (тэатр, філармонія, Палац культуры, ПТВ, школа і інш.).

У мастацка-гістарычных і спартыўных святах частку касцюмаў рыхтуюць на аснове падбору ў касцюмерных установах культуры і мастацтваў, а частку шыюць у вытворчых майстэрнях. У гэтым выпадку ў склад касцюмернай уключаюць мадэльера, краўцоў, шаўцоў, якія працуюць у кантакце з мастаком. Непасрэдна на буйным свяце звычайна працуюць дзве брыгады касцюмераў-апранальшчыкаў па абслугоўванні жаночага і мужчынскага складу ўдзельнікаў. Гэтым калектывам

кіруе загадчык касцюмернай часткі або старшы касцюмер, які мае наступныя абавязкі:

— складае разам з мастаком апісанне ўсіх касцюмаў, абутку, галаўных убораў, а таксама касцюмнага рэквізіту (хустачкі, насоўкі, веера, ордэны, эмблемы, значкі і інш.), якія патрэбны для персанажаў святочнага дзеяння;

— вызначае пералік касцюмаў, якія належыць вырабіць, набыць або ўзяць у арэнду, а якія перарабіць;

— складае брыгаду касцюмераў-апранальшчыкаў па абслугоўванні ўдзельнікаў свята;

— вызначае месца складзіравання касцюмаў і забяспечвае іх захаванасць, належны выгляд;

— сочыць за чысцінёй сцэнічнай мэблі і дэталяў дэкарацый з мэтай захавання чысціні касцюмаў;

— выдае і прымае касцюмы пад асабістую распіску кожнага ўдзельніка за захаванасць касцюма;

— прымае ўдзел у нарадах мастацка-пастановачнай часткі.

*Мастак-грымёр.* У працэсе ўвасаблення свята з мэтай стварэння знешняга выгляду разнастайных персанажаў, асабліва партрэтнага грыму дзяржаўных дзеячаў, а таксама дзеячаў навукі, культуры, мастацтва і літаратуры розных эпох і стагоддзяў, у склад мастацка-пастановачнай часткі нярэдка запрашаюць мастака-грымёра. Асаблівасцю яго работы на свяце (у адрозненне ад тэатра, дзе ёсць майстры-пасціжоры, якія займаюцца вырабам парыкоў і наклеек) з'яўляецца тое, што мастак-грымёр свята здзяйсняе адначасова вытворчую і эксплуатацыйную дзейнасць. Але яго вытворчая работа па вырабе парыкоў адбываецца даволі рэдка, таму што значна танней ствараць знешні вобраз персанажаў на аснове пракату тых пасціжорных вырабаў, якія ёсць у грымёрных цэхах тэатраў, кінастудый і філармоній.

Мастак-грымёр у сваёй рабоце арыентуецца на выкананне грыму згодна эскізаў галоўнага мастака і мае наступныя функцыянальныя абавязкі:

— азнаямленне са сцэнарыем святочных дзей, дзе выкарыстоўваецца грым, і эскізамі грыму, створанымі галоўным мастаком;

— правядзенне гутарак з выканаўцамі, якія яму тлумачаць сваё бачанне знешняга аблічча персанажаў;

— вывучэнне іконаграфічнага матэрыялу (фотаздымкі, малюнкі, партрэты ўвасабляемай асобы);

— здзяйсненне спроб грыму ў індывідуальнай рабоце з выканаўцамі;

— зацвярджэнне канчатковага варыянта грыму (у галоўнага рэжысёра або рэжысёра-пастаноўшчыка);

— захаванне санітарна-гігіенічных правіл пры рабоце з грымам, парыкамі, наклейкамі;

— грыміраванне выканаўцаў у час правядзення рэпетыцый і свята;

— забеспячэнне выканаўцаў вазелінам, лігнінам, марляй і іншымі сродкамі для зняцця грыму;

— складанне акта спісання выкарыстанага грыму і сродкаў зняцця грыму і зацвярджэнне яго ў дырэктара свята або загадчыка пастановачнай часткі;

— удзел у нарадах мастацка-пастановачнай часткі.

### *Упраўленне па матэрыяльна-тэхнічным забеспячэнні*

Адным з вырашальных фактараў паспяховай арганізацыі і правядзення свята з'яўляецца станоўчае рашэнне рознабаковых пытанняў яго матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння.

У падрыхтоўцы матэрыяльнай базы будучага свята, якое праводзіцца ў рамках раёна, горада, краіны, прымаюць удзел не толькі дзяржаўныя арганізацыі, прадпрыемствы, установы, але і прыватныя фірмы. Узначальвае гэта самае вялікае структурнае падраздзяленне аргкамітэта дырэктар свята або намеснік старшыні аргкамітэта, які вядзе пастаянны кантроль за выкананнем запланаваных работ.

Кіраўнікамі ўсіх службаў упраўлення з'яўляюцца дырэктары прадпрыемстваў або іх намеснікі ці адказныя асобы, якія далучаюць падначаленых супрацоўнікаў да выканання работ.

Арганізацыйная структура ўпраўлення па матэрыяльна-тэхнічным забеспячэнні залежыць ад маштабу свята, аб'ёму вырашаемых пытанняў і ў кожным канкрэтным выпадку вызначаецца рабочым планам падрыхтоўкі святочных мерапрыемстваў.

У дапаможніку мы разглядаем найбольш агульныя структурныя падраздзяленні, якія характэрныя амаль для любога свята.

*Вытворчы аддзел*

У структуру вытворчага аддзела ўваходзяць прадпрыемствы і арганізацыі, якія непасрэдна займаюцца вырабам элементаў мастацка-дэкаратыўнага афармлення, касцюмаў, абутку, бутафорыі, рэквізіту, масак і лялек, арганізацыяй гандлёва-гульнёвых дзей (латарэй, аўкцыёнаў, гандлёвых атракцыёнаў), пабудовай спартыўных і дзіцячых гарадкоў і інш. Увесь комплекс функцыянальных абавязкаў па выкананні пастаўленых задач абумоўлены нормамі і правіламі, распрацаванымі на прадпрыемстве, якое ўвасабляе вызначаны аб'ём работ.

*Камунальны аддзел*

Напярэдадні свята вялікі падрыхтоўчы цыкл работ выконвае камунальны аддзел, структура якога складаецца з гарадской (раённай) камунальнай гаспадаркі, мясцовага лясгаса, архітэктурнага аддзела мясцовага выканкама, санэпідстанцыі, водаправодна-каналізацыйнай гаспадаркі і будаўнічых арганізацый.

Камунальны аддзел працуе ў цеснай сувязі з іншымі структурнымі падраздзяленнямі аргкамітэта і вырашае не толькі свае задачы, але і выконвае некаторыя іншыя віды работ, замацаваныя за вытворчым аддзелам і дырэкцыяй кірмашу.

Вядучую ролю ў камунальным аддзеле іграе гарадская (раённая) камунальная гаспадарка. У сферу яе функцыянальных абавязкаў уваходзіць вырашэнне наступных задач:

— правядзенне санітарна-гігіенічных мерапрыемстваў (уборка вуліц, дарог, паркаў, сквераў і інш.), касметычны рамонт забудоў (афарбоўка будынкаў, загарож, рамонт дахаў і інш.);

— выраб і мантаж мастацка-дэкаратыўнага афармлення;

— правядзенне дадатковых работ па асвятленні населенага пункта, падсвету будынкаў і ўпрыгожванні вуліц святочнай ілюмінацыяй;

— расклейка рэкламнай прадукцыі свята, размяшчэнне плакатаў-расцяжак;

— будаўніцтва сумесна з лясгасам часовых святочных забудоў (эстрадных і гульнёвых пляцовак, спартыўнага, гульнёвага гарадка, туалетаў і да т.п.);

— забеспячэнне часовым водаправодам, а пры неабходнасці і сістэмай каналізацыі гандлёвых пунктаў дзеяння свята;

— уборка тэрыторыі свята ў час яго правядзення і па яго завяршэнні.

*Дырэкцыя кірмашу*

У структуры пераважнай большасці сучасных свят важнае месца займае святочны гандаль, які дзейнічае як асобая творча-гаспадарчая зона. Для арганізацыі святочнага гандлю ўтвараецца дырэкцыя кірмашу, куды ўваходзяць прадстаўнікі гандлёвых арганізацый, сферы абслугоўвання, органаў культуры і спорта.

Узначальвае гэтае структурнае падраздзяленне аргкамітэта дырэктар кірмашу — звычайна начальнік ці загадчык упраўлення гандлю мясцовага выканкама; у тым выпадку, калі свята праводзіцца ў раённым цэнтры, — старшыня райспажыўсаюза.

Дырэктар кірмашу працуе ў пастаянным кантакце з галоўным рэжысёрам і дырэктарам свята з мэтай максімальна

поўнага ўвасаблення задумы пастаноўшчыкаў. У працэсе сваёй работы дырэктар кірмашу павінен:

— дэталёва азнаёміцца са сцэнарыем свята і асабліва з распрацоўкай святочнага гандлю;

— распрацаваць рабочы план падрыхтоўкі святочнага гандлю;

— сумесна з рэжысёрам і мастаком выбраць месца правядзення кірмашу, распланаваўшы яго тэрыторыю на гандлёвую, абслуговую і відовішчна-гульнёвую зоны;

— распланаваць гандлёвую зону на сектары дзяржаўнага, кааператыўнага і прыватнага гандлю, а тыя, у сваю чаргу, на дзялянкі прамысловых, бытавых, сельскагаспадарчых тавараў, вырабаў майстроў народных промыслаў, сферы бытавых паслуг;

— сумесна з прадстаўнікамі гандлёвых арганізацый вызначыць неабходны аб'ём і асартымент тавараў, колькасць гандлёвых пунктаў;

— сумесна з мясцовай санэпідэмстанцыяй арганізаваць правядзенне санітарнага абследавання аб'ектаў кірмашовага гандлю;

— распрацаваць праграму работы дапаможных службаў кірмашу (ахова парадку, пажарная бяспека, медыцынская дапамога);

— правесці работу з вызначанымі супрацоўнікамі аддзела культуры, спорткамітэта і аддзела народнай асветы па арганізацыі і правядзенні культурнай праграмы кірмашу (тэатралізаваныя, масава-гульнёвыя і спартыўныя дзеі);

— кіраваць усімі структурнымі падраздзяленнямі кірмашу.

Арганізацыйную структуру кірмашовай дырэкцыі складаюць:

— гандлёвы аддзел, які вырашае пытанні арганізацыі гандлю. У тым выпадку, калі святочны гандаль набывае міжрэгіянальны або міжнародны характар, пры гандлёвым аддзеле функцыянуе дагаворны аддзел для аператыўнага рашэння пытанняў, звязаных з афармленнем камерцыйных здзелак, дапамогі ўдзельнікам кірмашу рэалізаваць сваю пра-

дукцыю па дагаворных цэнах, а таксама для атрымання дазволу афіцыйных устаноў на права вывазу тавараў па зарэгістраваных дагаворах з Рэспублікі Беларусь. На міжнародных святочных гандлях у каардынацыйным цэнтры па рабоце з замежнымі ўдзельнікамі, які працуе ў складзе гандлёвага аддзела, спецыялісты ў галіне кан'юнктуры сусветнага рынку праводзяць кансультацыі па сярэднесусветных узроўнях цэн на розныя тавары і паслугі, дапамагаюць скласці кантракты, аформіць пратаколы аб намерах і мытную дэкларацыю;

— інфармацыйны аддзел, які дае камерцыйную інфармацыю аб таварах і паслугах, прапануемых на кірмашы, і даведачную інфармацыю аб удзельніках;

— радыёцэнтр кірмашу арганізуе трансляцыю радыёканцэртаў, рэкламных ролікаў вытворцаў і гандляроў, дае аб'явы аб таварах і паслугах, культурнай праграме святочнага гандлю;

— аддзел рэкламы праводзіць прэзентацыі прадпрыемстваў—удзельнікаў кірмашу, на якіх удзельнікі свята могуць атрымаць больш падрабязную інфармацыю аб прадукцыі прэзентантаў, іх магчымасцях, перспектыўных планах, патрэбах;

— аддзел культурных праграм займаецца ўвасабленнем мастацкіх, спартыўных і масава-гульнёвых мерапрыемстваў для ўсіх катэгорый насельніцтва;

— аддзел дапаможных службаў складаецца з брыгады грузчыкаў, транспартнай службы, медыка-санітарнай службы, інспекцыі пажарнай бяспекі, службы аховы парадку з адпаведным комплексам абавязкаў, якія вызначаны рабочым планам падрыхтоўкі кірмашу.

Усе пытанні арганізацыі і работы святочнага гандлю ўдакладняюцца і вырашаюцца на нарадах дырэкцыі кірмашу. Пры ўзнікненні праблем, непаразуменняў, якія немагчыма вырашыць на ўзроўні дырэкцыі кірмашу, канчатковае рашэнне прымае дырэктар свята, а ў найбольш складаных выпадках — старшыня аргкамітэта.

*Аддзел арганізацыі харчавання ўдзельнікаў свята*

У час правядзення святочных урачыстасцей, асабліва ў невялікіх гарадах і раённых цэнтрах, колькасць прысутных на відовішчна-гульнёвых дзеях, як правіла, у некалькі разоў перавышае колькасць насельніцтва горада ці пасёлка гарадского тыпу, бо на святкаванне збіраюцца жыхары навакольных паселішчаў.

З гэтай прычыны перад аргкамітэтам паўстае праблема арганізацыі харчавання гасцей, творчых калектываў і астатніх удзельнікаў свята, якая звязана з правядзеннем шэрага падрыхтоўчых работ.

Для вырашэння гэтай праблемы ў структуры ўпраўлення па матэрыяльна-тэхнічным забеспячэнні ствараецца аддзел арганізацыі харчавання ўдзельнікаў свята, у які ўваходзяць дзяржаўныя прадпрыемствы харчовай прамысловасці (хлебазаводы, бісквітныя і кандытарскія фабрыкі, заводы алкагольных і безалкагольных напояў, мясакамбінаты і рыбакомплексы), гарадскія ці раённыя ўстановы харчгандлю, прадпрыемствы грамадскага харчавання (сталовыя, кафэ, рэстараны, буфеты і інш.), а таксама прыватныя фірмы грамадскага харчавання.

Кіраўнікі або прадстаўнікі азначаных прадпрыемстваў, арганізацый і ўстаноў, працуючы ў кантакце з дырэкцыяй кірмашу і адміністрацыйнай групай, вырашаюць наступныя задачы:

— знаёмства са сцэнарным планам ці праграмай свята, асаблівасцямі арганізацыі харчавання ўдзельнікаў у зоне святочнага дзеяння, а таксама прагляд і аналіз эскізаў мастацкага афармлення пунктаў грамадскага харчавання і гандлю харчовымі прадуктамі;

— вызначэнне мяркуемай колькасці наведвальнікаў святочных мерапрыемстваў, творчых калектываў і дэлегацый гасцей;

— выяўленне неабходнай колькасці часовых пунктаў гандлю харчовымі прадуктамі, месца іх размяшчэння, асартыменту харчовых тавараў і меню святочных і абрадавых страў;

— нарыхтоўка неабходнай колькасці прадуктаў, а ў выпадку немагчымасці поўнага выканання гэтага пытання запрашэнне да ўдзелу ў свяце суседніх спажывецкіх і гандлёвых арганізацый;

— вызначэнне асобных пунктаў харчавання для гасцей свята і творчых калектываў, распрацоўка графіка наведвання гэтых пунктаў, а таксама колькасці прыёму ежы і складу меню;

— выраб і мантаж (згодна эскізаў галоўнага мастака) элементаў мастацка-дэкаратыўнага афармлення часовых пабудоў грамадскага харчавання на адкрытым паветры;

— распрацоўка графіка пазменнай работы на свяце кухараў, афіцыянтаў, прадаўцоў;

— наладжванне выпуску сувенірнай харчовай прадукцыі (напоі, кандытарскія вырабы);

— кантроль за захаваннем санітарна-гігіенічных нормаў і правіл, якія існуюць пры продажы харчовых прадуктаў;

— асаблівую ўвагу арганізацыя надае вырабу і продажу спецыфічных абрадавых і святочных страў, уласцівых культурна-бытавым традыцыям увасабляемага свята;

— распрацоўка графіка работы аўтатранспарту па дастаўцы і эвакуацыі харчовых тавараў.

У працэсе работы супрацоўнікі аддзела арганізацыі харчавання ўдзельнікаў свята падпарадкоўваюцца дырэктару свята або яго намесніку па гэтым аддзеле (у вялікіх гарадах — начальнік або загадчык упраўлення гандлем выканкама, у раёне — старшыня райспажыўсаюза).

*Транспартны аддзел*

Свята як масавае поліфанічнае дзеянне заўсёды звязана з разнастайнымі транспартнымі сродкамі, якія выкарыстоўваюцца як у творчых фрагментах, так і ў дапаможных мэтах.

Паколькі на свяце выкарыстоўваюцца гужавыя, аўтамабільныя, водныя, паветраныя і электратранспартныя сродкі, то ў арганізацыйную структуру транспартнага аддзела (па ўзгадненні з галоўным рэжысёрам і дырэктарам свята) уключаюцца наступныя арганізацыі: камунгас, аўтабазы, параходствы, трамвайна-тралейбусныя паркі, спартыўна-тэхнічныя таварыствы, аўтабазы воінскіх падраздзяленняў.

У кожным канкрэтным свяце спіс арганізацый, што ўдзельнічаюць у рабоце транспартнага аддзела, можа павялічвацца або памяншацца згодна патрэб, вызначаных рабочым планам падрыхтоўкі, але агульныя функцыянальныя задачы, як правіла, застаюцца нязменнымі. Гэта:

— азнаёміцца са сцэнарыем свята;

— вызначыць колькасць і маркі транспартных сродкаў, якія патрэбны, згодна з рабочым планам падрыхтоўкі свята, для ўвасаблення тэатралізаваных дзей;

— выявіць арганізацыі, якія будуць пастаўляць вызначаныя транспартныя сродкі;

— распрацаваць план і графік падрыхтоўкі транспартных сродкаў да рэпетыцый тэатралізаваных фрагментаў;

— здзейсніць мантаж мастацкага афармлення транспартных сродкаў згодна эскізаў, распрацаваных галоўным мастаком;

— засвоіць і выконваць вызначаную асістэнтам рэжысёра чарговасць і скорасць руху транспартных сродкаў у тэатралізаваных дзеях;

— забяспечыць правядзенне асобнай рэпетыцыі транспартных сродкаў, а таксама іх удзел у прагоннай, генеральнай рэпетыцыях і свяце;

— вызначыць арганізацыі, якія будуць забяспечваць транспартам выкананне розных гаспадарчых работ, падвоз і эвакуацыю творчых калектываў і гасцей свята;

— распрацаваць графік работы транспарту і дакладна яго выконваць;

— забяспечыць кожную адзінку службовага транспарту пропускам для руху па тэрыторыі свята (які завераны супрацоўнікамі аўтаінспекцыі);

— вызначыць месца размяшчэння аўтавакзала свята для службовага і ўласнага транспарту;

— выдзеліць транспарт для службовых патрэб аргкамітэта і асобна для пастановачнай групы, а таксама распрацаваць і выконваць графік яго работы.

### *Арганізацыйны аддзел*

Адным са структурных падраздзяленняў аргкамітэта з'яўляецца арганізацыйны аддзел, супрацоўнікі якога займаюцца распрацоўкай, узгадненнем і вырашэннем разнастайных пытанняў арганізацыйнага характару.

Узначальвае арганізацыйны аддзел галоўны адміністратар або дырэктар, які кіруе работай куратарскай групы, групы жыллёвай гаспадаркі, групы рэкламы свята, службай бяспекі дарожнага руху, медыцынскай дапамогі, службы пажарнай бяспекі, аховы парадку.

#### *Куратарская група*

На кожнае свята значнага маштабу ў месца яго правядзення прыбываюць дэлегацыі гасцей і запрошаныя творчыя калектывы. Для правядзення пастаяннай інфармацыйнай і суправаджальна-тлумачальнай работы сярод гэтага роду ўдзельнікаў свята ў структуры арганізацыйнага аддзела ствараецца куратарская група з ліку работнікаў культуры, народнай асветы, студэнтаў ВНУ і інш.

У задачы куратарскай групы ўваходзяць:

— вывучэнне сцэнарыя свята, знаёмства з членамі аргкамітэта;

— вызначэнне кожнаму куратару для далейшай работы канкрэтнага творчага калектыву, дэлегацыі гасцей або асобнага госця, якія прыбываюць на свята;

— своечасовае ўдакладненне з калектывам даты і часу прыезду, нумара цягніка і вагона і інфармаванне аб гэтым штаба свята;

— вызначэнне з адказным за транспарт нумара і маркі аўтобуса, які сустракае гасцей і абслугоўвае калектыў;

— вырашэнне пытанняў набыцця зваротных праязных білетаў;

— арганізацыя сустрэчы калектыву або дэлегацыі ў загадзя вызначаным месцы і пры ўмове, калі свята праводзіцца некалькі дзён, засяленне гасцей у атэль ці інтэрнат;

— давядзенне да ведама запрошаных гасцей праграмы свята, іх месца і ролі ў святочных дзеяннях, азнаямленне з месцам выступлення, графікам рэпетыцый, часам, месцам харчавання і інш.;

— суправаджэнне гасцей на канферэнцыі, рэпетыцыі, мерапрыемствы культурнай праграмы, у пункты харчавання, на месцы выступленняў і ўдзел у арганізацыі праводзін гасцей.

*Жыллёвая гаспадарка*

Для вырашэння пытання размяшчэння гасцей неабходна:

— узяць на ўлік усе гасцініцы, інтэрнаты і здраўніцы наваколля, якія маюць магчымасць у дадзены перыяд прыняць пэўную групу людзей;

— выявіць адпаведнасць гэтых устаноў санітарна-гігіенічным патрабаванням і пэўнаму камфорту ў час адпачынку;

— выявіць колькасць прыбываючых гасцей, а таксама мужчынскі і жаночы склад дэлегацый;

— правесці дамову з кіраўнікамі жыллёвых устаноў аб засяленні ў іх пэўнай колькасці людзей на вызначаны тэрмін;

— перавесці грошы на рахунак жыллёвай установы;

— размеркаваць па дамоўленасці з дырэктарам свята і давесці да куратараў месца засялення кожнай канкрэтнай дэлегацыі і колькасць адведзеных ёй пакояў;

— пракантраляваць працэс засялення, і ў тым выпадку, калі на свята прыбываюць госці з розных краін, засяліць дэлегацыі з улікам этнічнай сумяшчальнасці;

— арганізаваць штабны нумар у атэлі;

— паведаміць штабу свята тэлефон штабнога нумара ў атэлі;

— забяспечыць своечасовую адпраўку ўдзельнікаў свята з атэля;

— забяспечыць парадак пражывання ўдзельнікаў свята ў атэлі;

— пасля свята здзейсніць фактычны разлік з атэлем;

— сумесна з кіраўніком групы праінфармаваць удзельнікаў свята аб праграме іх знаходжання ў горадзе (вёсцы);

— забяспечыць кіраўнікоў групы інфармацыйным матэрыялам свята;

— інфармаваць штаб свята аб засяленні, пражыванні, харчаванні, культурнай праграме ўдзельнікаў свята, рабоце транспарту ў 10.00, 14.00, 18.00 гадзін штодзённа.

*Група рэкламы свята*

Адным з важнейшых аспектаў дзейнасці арганізацыйнага аддзела з'яўляецца падрыхтоўка жыхароў пэўнай мясцовасці да ўспрымання святочных дзей, таму велізарнае значэнне ў яго рабоце набывае рэклама свята.

Група рэкламы свята складаецца з прадстаўнікоў сродкаў масавай інфармацыі, друкарні ці паліграфічнага камбіната.

У кантакце з імі адміністратар свята:

— дамаўляецца з кіраўнікамі або прадстаўнікамі прэсы, радыё, тэлебачання аб перыядычным выпуску напярэдадні свята перадач ці публікацый аб будучай урачыстасці;

— наладжвае сустрэчы членаў аргкамітэта і пастановачнай групы з карэспандэнтамі;

— здзяйсняе папярэднюю дамову з друкарняй аб размяшчэнні заказу па выпуску друкаванай прадукцыі свята, якая

распрацавана галоўным мастаком і зацверджана на савеце аргкамітэта;

— падрыхтоўвае прэс-рэліз і перадае яго рэдакцыям газет, радыё і тэлебачання (магчыма правядзенне прэсканферэнцый з удзелам арганізатараў, адказных за правядзенне імпрэз);

— працуе з мастаком над падрыхтоўкай рэкламнай прадукцыі (афіш, запрашэнняў, буклетаў і інш.);

— арганізоўвае расклейку афіш і распаўсюджванне запрашэнняў;

— праводзіць кантроль выканання заказу па вырабе друкаванай прадукцыі ва ўстаноўленыя тэрміны;

— наладжвае распаўсюджванне друкаванай прадукцыі на тэрыторыі, дзе адбываецца свята, і па-за яе межамі;

— праводзіць акрэдытацыю журналістаў, якія будуць асвятляць свята ў сродках масавай інфармацыі, і запрашае іх на асобныя рэпетыцыі;

— арганізоўвае ва ўстановах, на прадпрыемствах папярэдні продаж білетаў разнастайных святочных камерцыйных дзей (шоу, канцэрты, відовішчы, латарэі, аўкцыён, гандлёвыя атракцыёны і інш.);

— дамаўляецца з рэдакцыяй мясцовай газеты і здзяйсняе кантроль друкавання поўнай праграмы свята ў апошнім перадсвяточным нумары;

— арганізоўвае дастаўку персанальных запрашэнняў на свята (па папярэдняй дамоўленасці са старшынёй аргкамітэта або дырэктарам свята);

— па ўзгадненні з дырэктарам і галоўным рэжысёрам вызначае колькасць глядацкіх месцаў для ганаровых гасцей свята на розных святочных мерапрыемствах;

— разам з мясцовымі культработнікамі арганізоўвае сустрэчу гасцей і праводзіны іх на ганаровыя месцы.

*Служба бяспекі дарожнага руху*

Адміністратар і супрацоўнікі мясцовай аўтаінспекцыі вырашаюць наступныя задачы:

— прымаюць меры для закрыцця праезду аўтатранспарту па тэрыторыі свята;

— наладжваюць выпуск спецыяльных пропускаў для руху кожнай адзінкі службовага транспарту ў вызначаныя зоны святочнага дзеяння;

— арганізоўваюць сустрэчу службовым транспартам ДАІ аўтобусаў з прыбываючымі дэлегацыямі гасцей і творчымі калектывамі, а таксама суправаджэнне іх на пэўныя месцы;

— вызначаюць месца функцыянавання святочнага аўтавакзала (для размяшчэння службовага і ўласнага транспарту) і наладжваюць арганізацыю яго работы;

— здзяйсняюць кантроль пастаяннага суправаджэння службовым транспартам ДАІ аўта-, матакалон, а таксама машын з выбуховымі і піратэхнічнымі сродкамі.

*Медыцынская служба свята*

Напярэдадні свята адміністратар заключае дагавор (на ўмовах фінансавання або грамадскіх пачатках) з медыцынскімі ўстановамі аб правядзенні санітарна-гігіенічнага і медыцынскага абслугоўвання свята ў ніжэйпералічаным аб'ёме работ:

— выдзеліць для кожнай зоны святочнага дзеяння паходную аптэчку з лекавымі і перавязачнымі сродкамі першай дапамогі;

— вызначыць персанал для работы медыцынскага пункта свята і забяспечыць наяўнасць неабходных медыкаментаў для аказання першай дапамогі;

— арганізаваць для аказання тэрміновай хуткай дапамогі на свяце дзяжурства мнагапрофільнай спецыялізаванай лінейнай брыгады;

— правесці напярэдадні свята санітарна-гігіенічнае абследаванне пунктаў грамадскага харчавання і пунктаў продажу

харчовых прадуктаў, а таксама здзяйсняць санітарна-гігіенічны кантроль за іх работай ў час свята.

*Служба пажарнай бяспекі*

Адміністратар свята ў час яго падрыхтоўкі вялікую ўвагу надае каардынацыі дзейнасці пажарнай аховы горада ці раёна з працаўнікамі іншых службаў, прадпрыемстваў, арганізацый, якія займаюцца выкананнем работ, звязаных з выкарыстаннем агню, піратэхнічных і электрычных вырабаў. Ён:

— арганізоўвае нараду інспектара пажарнай аховы з тэхнічнымі работнікамі (напярэдадні ці ў перыяд мантажу часовых электрычных ліній свята, электраасвятляльнай і гукаўзмацняльнай апаратуры) з мэтай выканання мер і правіл супрацьпажарнай бяспекі;

— з тымі ж мэтамі наладжвае нараду і з работнікамі гандлю харчовымі таварамі, якія ў час работы для падагрэву страў і напояў ужываюць электрапліткі і электрапечы;

— арганізоўвае правядзенне інструктажу творчых работнікаў, якія ў час свята звязаны з вогненнымі дзеямі;

— дамаўляецца з прадстаўнікамі службы пажарнай бяспекі аб пастаянным кантролі работы піратэхнікаў;

— дамаўляецца аб пастаноўцы на баявы пост нарада пажарнай аховы на месца правядзення фейерверку і здзяйсняе кантроль за выкананнем гэтай дамовы.

*Служба аховы парадку*

Важнае месца ў сістэме падрыхтоўкі свята займае арганізацыя работы службы аховы парадку, у якой удзельнічаюць падраздзяленні міліцыі, унутраных войск, добраахвотныя дружыны і інш.

Адміністратар свята з мэтай распрацоўкі і ўвасаблення праграмы аховы парадку ў час правядзення святочных дзеянняў здзяйсняе наступныя арганізацыйныя задачы:

— вызначае з галоўным рэжысёрам умовы аховы парадку на свяце, час, месца і аб'ём неабходных работ;

— арганізоўвае сустрэчы галоўнага рэжысёра і дырэктара свята з начальнікам або намеснікам начальніка гарадскога ці раённага аддзела ўнутраных спраў з мэтай азнаямлення яго са сцэнарным планам свята і планам дэталёвай распрацоўкі мерапрыемстваў па ахове парадку;

— дамаўляецца аб пастаноўцы на баявы пост нарадаў міліцыі, унутраных войск на пэўны перыяд у вызначаныя зоны правядзення свята (эстрадныя пляцоўкі, кірмаш, гульнёвыя гарадкі, аўтавакзал, піратэхнічнае поле і інш.) і іх ахову;

— арганізоўвае забеспячэнне членаў пастановачнай і творчай груп неабходнай колькасцю перагаворных устройстваў, якія ёсць у наяўнасці аддзела ўнутраных спраў (АУС);

— дамаўляецца з АУС аб замацаванні за штабам свята, галоўным рэжысёрам і радыёцэнтрам супрацоўнікаў міліцыі з мэтай прыняцця неадкладных мер у экстрэмальных сітуацыях;

— вядзе пастаянны кантроль за выкананнем пастаўленых задач.

### *Бухгалтэрыя свята*

Асобае месца ў структуры аргкамітэта займае бухгалтэрыя свята, якая праводзіць усе фінансавыя аперацыі, улік і кантроль расходавання грашовых сродкаў і матэрыяльных каштоўнасцей, афармляе працоўныя пагадненні і праводзіць аплату выканаўцаў разнастайных відаў работ.

Кіраўніком гэтага невялікага па штатным раскладзе падраздзялення з'яўляецца галоўны бухгалтар, а супрацоўнікамі — бухгалтар і бухгалтар-касір.

Бухгалтэрыя знаходзіцца ў падпарадкаванні дырэктара свята і выконвае яго распараджэнні па фінансавым забеспячэнні ўсіх аспектаў падрыхтоўкі і правядзення свята.

Звычайна работа бухгалтэрыі свята ўскладаецца на групу бухгалтараў той арганізацыі, якая адказвае за творчае ўвасабленне святочных дзей (раённы, гарадскі аддзел куль-

туры, абласное ўпраўленне культуры, навукова-метадычныя цэнтры, творчыя саюзы і інш.).

*Галоўны бухгалтар забяспечвае:*

— правільную пастаноўку бухгалтарскага ўліку, аператыўнасць і даставернасць уліку, кантроль за правільным расходаваннем грашовых сродкаў і матэрыяльных каштоўнасцей;

— правільны і своечасовы ўлік грашовых сродкаў, таварна-матэрыяльных каштоўнасцей, афармленне дакументаў і адлюстраванне на разліковых рахунках бухгалтарскіх аперацый, звязаных з рухам гэтых сродкаў;

— дакладнае захаванне касавай і разліковай дысцыпліны, парадак выпіскі чэкаў і захаванне чэкавых кніжак;

— правядзенне інвентарызацыі пасля свята, выяўленне вынікаў інвентарызацыі і адлюстраванне ў бухгалтарскім уліку;

— своечасовае афармленне матэрыялаў па недаліках, растратах грашовых сродкаў і матэрыяльных каштоўнасцей;

— састаўленне справаздачы пасля завяршэння свята на аснове пачатковых дакументаў; адпаведнасць бухгалтарскіх даных, своечасовае іх прадстаўленне вышэйстаячай арганізацыі;

— правядзенне інструктажу з матэрыяльна адказнымі асобамі па пытаннях уліку захавання каштоўнасцей;

— кантроль за вядзеннем касавых аперацый, вядзеннем кнігі рэгістрацыі прыходных і расходных касавых дакументаў;

— захаванне бухгалтарскіх дакументаў;

— кантроль за правільным складаннем працоўных пагадненняў з выканаўцамі розных відаў работ (творчых, гаспадарчых, адміністрацыйных і інш.);

— своечасовую выплату зарплаты;

— законнасць здзяйснення банкаўскіх аперацый і рэгістрацыю іх у журнале-ордэры; звярае астаткі з выпіскамі банка па рахунках;

— прыём, праверку і афармленне журнала-ордэра па касавых аперацыях;

— вядзенне на падставе дакументаў журнала-ордэра па разліку з пастаўшчыкамі;

— адказнасць за афармленне даверанасцей на атрыманне розных тавараў, завярае іх.

*Функцыянальныя абавязкі бухгалтара:*

— налічваць заработную плату па працоўным пагадненні (з улікам кампенсацыі і індэксіравання); здзяйсняць разлікі па камандзіроўках, а таксама ўсе ўтрыманні з заработнай платы;

— складаць агульную ведамасць даных па разліках з супрацоўнікамі аргкамітэта, прадпрыемствамі, арганізацыямі, установамі не пазней 7 чысла кожнага месяца;

— улік і справаздачнасць весці ў адпаведнасці з інструкцыяй па бухгалтарскім ўліку і іншымі нарматыўнымі актамі;

— здзяйсняць пастаянны кантроль за пералічэннем планавых плацяжоў і штомесячную зверку з арганізацыямі;

— складаць даверанасці на атрыманне розных тавараў;

— прымаць, правяраць і адлюстроўваць у “накопительной” ведамасці дакументы па прыходу і расходу тавараў, неабходных для ўвасаблення святочных дзеянняў;

— прымаць і правяраць авансавыя справаздачы ў матэрыяльна адказнай асобы;

— прымаць і звяраць з адміністрацыйным аддзелам звесткі аб прыбыцці і адбыцці творчых калектываў і дэлегацый гасцей свята;

— весці ўлік рэалізацыі паступіўшых тавараў;

— пры адсутнасці касіра выконваць абавязкі па вядзенні касавых аперацый;

— прымаць удзел у паслясвяточнай інвентарызацыі;

— несці поўную адказнасць за выкананне сваіх абавязкаў.

*Функцыянальныя абавязкі бухгалтара-касіра:*

— весці ўлік касавых аперацый;

— пасля атрымання або выдачы грашовых сродкаў падпісваць прыходныя і расходныя ордэры, а прыкладзеныя да іх дакументы пагашаць штампам “атрымана”, “аплачана” з указаннем даты, месца і года. Усе грашовыя паступленні і выдачы ўлічваць у касавай кнізе, якую трэба весці акуратна, без падчыстак і выпраўленняў. Запісы ў кнізе рабіць пасля атрымання і выдачы грошай;

— раз у тыдзень складаць касавыя справаздачы і здаваць галоўнаму бухгалтару;

— весці ўлік выдадзеных даверанасцей і здзяйсняць кантроль за іх праходжаннем;

— выпісваць расходныя дакументы на бензін і аўтамасла, атрыманыя па талонах;

— прымаць і апрацоўваць пуцявыя лісты ад шафёраў; складаць справаздачу па расходаванні бензіну і справаздачу па эксплуатацыі аўтатранспарту;

— выпісваць накладныя на атрыманне матэрыяльных каштоўнасцей са склада, касцюмернай, бутафорскай і інш.;

— прымаць, апрацоўваць справаздачу кладаўшчыка і прадстаўляць яе галоўнаму бухгалтару;

— прымаць удзел у паслясвяточнай інвентарызацыі;

— несці поўную адказнасць за выкананне сваіх абавязкаў.

## Арганізацыйна-вытворчы аналіз сцэнарыя свята

Адным з галоўнейшых этапаў і самым вырашальным на пачатковай стадыі стварэння знешняй формы свята з’яўляецца аналіз сцэнарыяў святочных дзей з пункту гледжання іх творчага, матэрыяльна-тэхнічнага, арганізацыйнага і фінансавага забеспячэння.

Ідэальным лічыцца той варыянт, калі арганізатары пры ўвасабленні свята імкнуцца выканаць усё, што закладзена ў сцэнарыі. Пры такім падыходзе не ўзнікае ніякіх праблем, бо ўсё, што задумана творцамі-сцэнарыстамі і пастаноўшчыкамі, падвяргаецца неадкладнаму вырашэнню і выка-

нанню па ўсіх аспектах забеспячэння. Але гэта здараецца даволі рэдка.

На сучасным этапе з прычыны цяжкіх эканамічных абставін краіны сродкі на вызначаны пералік свят плануюцца як Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь, так і яго падначаленымі структурнымі падраздзяленнямі на год наперад, прычым кошт кожнага канкрэтнага свята акрэсліваецца вельмі прыблізна. Як правіла, гэтых сродкаў не хапае, каб забяспечыць творчыя задумы пастаноўшчыкаў і работнікаў мастацтва і культуры. Таму прыходзіцца па некалькі разоў перарабляць сцэнарна-рэжысёрскія распрацоўкі.

Аднак нягледзячы на складаную сітуацыю (у любым варыянце ўвасаблення свята) этапы арганізацыйна-вытворчага аналізу застаюцца нязменнымі. Гэта:

1) творчае забеспячэнне;

2) матэрыяльна-тэхнічнае і арганізацыйнае забеспячэнне;

3) фінансаванне свята.

На ўсіх трох этапах сцэнарый разглядаецца з розных пазіцый і ва ўзаемасувязі, што дазваляе скласці дакладную карціну мер, якія неабходна прыняць для таго, каб адбылося свята.

### *Творчае забеспячэнне свята*

Першапачатковым, галоўным і вырашальным этапам арганізацыйна-вытворчага аналізу сцэнарыя з'яўляецца высвятленне пытанняў творчага забеспячэння свята, ад дэталёвай распрацоўкі якога залежыць лёс увасабляемых святочных дзей.

Такі аналіз праводзяць галоўны рэжысёр, галоўны мастак, рэжысёры-пастаноўшчыкі і гукарэжысёр. Ён ажыццяўляецца па наступных кірунках:

1. Вызначэнне калектываў (мастацкіх, спартыўных, гульнёвых, ваенна-паказальных і інш.), а таксама асобных выканаўцаў, якія будуць выступаць з гатовымі праграмамі.

Даволі часта ў сцэнарыі ўжо закладзены пералік калектываў-удзельнікаў, і іх назвы трэба толькі выпісаць для далей-

шых удакладненняў. Але калі такі пералік адсутнічае, пастаноўшчыкі павінны ўнесці свае прапановы.

Напрыклад, у сцэнарыі не закладзены пералік, а толькі занатавана, што фестываль мастацтваў на свяце працягваецца з 15.00 да 19.00 гадзін.

Рэжысёр, у сваю чаргу, зыходзячы з творчых меркаванняў, выступленне аднаго калектыву абмяжоўвае 30 мінутамі.

Падзяліўшы 4 гадзіны (агульны час правядзення фестывалю) на 30 мінут (час выступлення аднаго калектыву), пастаноўшчык атрымлівае лічбу **8**, якая і вызначае колькасць калектываў-удзельнікаў.

Затым рэжысёр на аснове дакладнага ведання мясцовых творчых сіл прапануе, якія канкрэтна калектывы, як мясцовыя, так і запрошаныя, павінны, на яго думку, прыняць удзел у фестывалі.

2. Выпіска новых пластычных нумароў, апісаных у сцэнарыі, якія трэба падрыхтаваць пры ўвасабленні абрадава-рытуальных, мастацкіх, гульнёвых і спартыўных дзей.

Высвятляючы гэту пазіцыю, пажадана, каб рэжысёры не толькі зрабілі пералік новых творчых распрацовак, але і іх інтэрпрэтатараў і выканаўцаў. Гэтым яны значна палегчаць далейшую работу дырэктара, адміністратара і бухгалтара свята.

3. Высвятленне нумароў музычна-гукавой партытуры свята.

Галоўны рэжысёр разам з музычным кіраўніком і гукарэжысёрам разглядаюць, якія, згодна са сцэнарыем, новыя песні, музычныя фрагменты неабходна стварыць для суправаджэння святочных дзей і якога кампазітара запрасіць для гэтых мэт. Падобная работа праводзіцца і ў адносінах да фанаграмы свята (якія музычныя і моўныя нумары павінны гучаць у эфіры з указаннем іх аўтараў, назваў і ў выкананні якіх калектываў і асобных выканаўцаў).

4. Выяўленне прапанаванага ў сцэнарыі вобразнага вырашэння свята ў архітэктурна-дэкаратыўным афармленні.

Галоўны мастак, прааналізаваўшы вобразную сістэму свята, пасля кансультацый з галоўным рэжысёрам распрацоўвае

прасторавае вырашэнне, план размяшчэння зон дзеяння, галоўны і дадатковыя мізансцэнічныя пункты і робіць папярэднія эскізы ўсіх аб'ектаў архітэктурна-дэкаратыўнага афармлення (часовых пабудоў, касцюмаў, рэквізіту і інш.).

5. Дэталёвая распрацоўка поўнага складу пастановачнай групы.

На аснове творчых патрэб, выяўленых у працэсе аналізу сцэнарыя, галоўны рэжысёр абгрунтоўвае склад пастановачнай групы, прытрымліваючыся наступных крытэрыяў:

— кожнае святочнае мерапрыемства, якое патрабуе творчай распрацоўкі і ўвасаблення, павінна мець свайго рэжысёра-пастаноўшчыка, паколькі галоўны рэжысёр займаецца агульным кіраваннем творчага працэсу і пастаноўкай цэнтральных вузлавых фрагментаў: адкрыццё, закрыццё і кульмінацыйная дзея свята;

— кожны новы нумар, які будзе ўведзены ў структуру святочных дзей, згодна з зацверджаным сцэнарыем, павінен увасабляць асобны пастаноўшчык адпаведнага жанру (балетмайстар, кампазітар, хормайстар, рэжысёр па спорту, гульнёвых, піратэхнічных дзей і інш.);

— у кожнай зоне свята пры рэжысёры-пастаноўшчыку павінна быць дапаможная творчая група (1—2 асістэнты рэжысёра, 1—2 вядучых або дыктараў);

— на кожным з гукавых пунктаў свята павінен працаваць асобны гукааператар.

Удакладніўшы і занатаваўшы на паперу ўсе вызначаныя пазіцыі, а таксама дадаўшы да іх спіс галоўных творчых асоб, зацверджаных палажэннем аб правядзенні свята, галоўны рэжысёр складае структуру пастановачна-творчай групы з пералікам адказных творчых асоб, іх пасад і званняў.

*Прыкладны склад пастановачна-творчай групы тэатралізаванага свята творчасці "Зоркі Нёманскага краю"*

| | Прозвішча, імя, імя па бацьку, званне |
|---|---|
| 1. Аўтар сцэнарыя | ______________________ |
| 2. Галоўны рэжысёр | ______________________ |
| 3. Галоўны мастак | ______________________ |
| 4. Галоўны балетмайстар | ______________________ |
| 5. Кампазітар | ______________________ |
| 6. Рэжысёр-пастаноўшчык спартыўных нумароў | ______________________ |
| 7. Рэжысёр-пастаноўшчык маладзёжнага балю | ______________________ |
| 8. Рэжысёр-пастаноўшчык піратэхнічнага прадстаўлення на вадзе | ______________________ |
| 9. Рэжысёр святочнага кірмашу | ______________________ |
| 10. Рэжысёр цыркавой праграмы | ______________________ |
| 11. Балетмайстар-пастаноўшчык | ______________________ |
| 12. Гукарэжысёр | ______________________ |
| 13. Гукааператары (пералік асоб) | ______________________ |
| 14. Асістэнты рэжысёраў (пералік асоб) | ______________________ |
| 15. Вядучыя | ______________________ |
| 16. Генеральны дырэктар свята | ______________________ |
| 17. Выканаўчы дырэктар свята | ______________________ |

Кожнаму члену пастановачнай групы вызначаецца мяркуемы памер грашовага ганарару за выкананне ўстаноўленага аб'ёму работ, згодна існуючых расцэнак ці па папярэдняй дамоўленасці.

### *Матэрыяльна-тэхнічнае і арганізацыйнае забеспячэнне*

Пасля выяўлення рознабаковых аспектаў творчага забеспячэння свята пачынаецца наступны этап арганізацыйна-вытворчага аналізу сцэнарыя — высвятленне пытанняў матэрыяльна-тэхнічнага і арганізацыйнага забеспячэння. Гэтую частку работы праводзяць дырэктар і адміністратар свята, якія пры ўзнікненні пэўных пытанняў кансультуюцца з бухгалтарам і галоўным рэжысёрам.

Аналіз грунтуецца на аснове глыбокага, удумлівага вывучэння сцэнарыя і плана творчага забеспячэння свята, які зацверджаны галоўным рэжысёрам.

Аналіз складаецца з ніжэйпералічаных аспектаў.

1. Арганізацыйна-вытворчае дасье на творчыя калектывы.

Разглядаючы пералік удзельнікаў свята, дырэктар і адміністратар асобна павінны правесці пэўны аб'ём папярэдніх інфармацыйна-даведачных работ аб кожным калектыве з мэтай складання арганізацыйна-вытворчага дасье, якое распрацоўваецца па наступных параметрах:

— дакладная, поўная назва калектыву, яго адрас, тэлефон, спіс удзельнікаў з поўным указаннем прозвішча, імя, імя па бацьку кожнага з іх;

— звесткі пра мастацкага кіраўніка калектыву з поўным указаннем прозвішча, імя, імя па бацьку, ганаровага звання, рэгалій (калі такія ёсць);

— анатацыя творчай дзейнасці калектыву;

— пералік нумароў мастацкай праграмы, з якой калектыў будзе выступаць на свяце, з указаннем назвы твора, яго аўтара і выканаўцаў;

— кошт аднаго выступлення калектыву;

— на які тэрмін для ўдзелу ў святочных дзеяннях запрашаецца калектыў (некалькі гадзін, адзін—два дні, тыдзень і г.д.);

— хто забяспечвае калектыў аўтатранспартам (калі транспарт аргкамітэта, даведацца дату, час і адрас, адкуль забіраць калектыў, куды даставіць і калі адвозіць дадому — дата, час і месца прызначэння. Калі калектыў сам забяспечвае аўтатранспарт, то неабходна прызначыць месца яго стаянкі пад аховай міліцыі ў начны час);

— прозвішча, імя, імя па бацьку, месца работы і тэлефон куратара творчага калектыву;

— мужчынскі і жаночы склад калектыву;

— месца размяшчэння калектыву на начлег;

— месца і час харчавання ўдзельнікаў калектыву;

— месца і час правядзення рэпетыцый і выступленняў калектыву;

— месца пераапранання калектыву ў час святочных дзеянняў (аўтатранспарт калектыву, палатка для пераапрананняў на адкрытым паветры або грымуборныя з указаннем іх нумароў);

— якая мэбля (крэслы, сталы, лавы і інш.) патрэбна калектыву для выступлення;

— колькі мікрафонаў і якая гукаапаратура (прайгравальнікі лазерных дыскаў, касетныя або лентачныя магнітафоны) патрэбны для тэхнічнага забеспячэння выступлення;

— месца захавання элементаў мастацка-дэкаратыўнага афармлення (касцюмаў, рэквізіту і інш.) калектыву;

— набыццё святочных сувеніраў калектыву і яго ўдзельнікам;

— забеспячэнне калектыву праграмай, афішамі і буклетамі свята;

— арганізацыя сустрэчы і суправаджэння аўтатранспарту калектыву спецыяльным аўтатранспартам ДАІ.

Арганізацыйна-вытворчае дасье на асобных выканаўцаў складаецца па такім жа прынцыпе.

Што тычыцца дасье дэлегацый гасцей свята, то тут інфармацыйна-даведачная работа абмяжоўваецца пайменным пералікам гасцей з указаннем іх пасад і ганаровых званняў, а таксама ўключае пытанні харчавання, пражывання, вызначэнне куратара групы і забеспячэнне гасцей аўтатранспартам, праграмай свята і сувенірнай прадукцыяй.

2. Матэрыяльна-тэхнічнае і арганізацыйнае забеспячэнне працэсу падрыхтоўкі новых нумароў.

Вызначаючы меры матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння нумара, які патрабуе спецыяльнай падрыхтоўкі, дырэктар і адміністратар спачатку выпісваюць з плана творчага забеспячэння пералік такіх дзей, а затым вывучаюць і аналізуюць сцэнарную распрацоўку, у якой кожны нумар мае арыенціровачнае апісанне.

Напрыклад, у сцэнарыі занатавана:

«На поле стадыёна выходзяць 600 гімнастак у белаблакітных спаднічках і блузках. У руках яны трымаюць двухбаковыя сіне-зялёныя шалікі і маленькія закрытыя парасончыкі. На фоне літаратурна-музычнай кампазіцыі гімнасткі робяць многафігурныя пабудовы беларускага нацыянальнага арнаменту, затым утвараюць “бягучую плынь ракі”. Па “рацэ” плывуць “лодкі”, з якіх дзяўчаты ў беларускіх нацыянальных строях (удзельніцы танцавальных калектываў) апускаюць у “раку” вянкі. Частка гімнастак, прысеўшы, накрывае сябе зялёнымі шалікамі і раскрывае парасончыкі-кветкі, утвараючы “кветкавае поле”. У цэнтры яго ўзнікае высокае полымя дэкаратыўнага вогнішча, вакол дзяўчаты—удзельніцы танцавальных калектываў (60 чалавек) — водзяць купальскі карагод».

Каб гэта маляўнічае відовішча змагло адбыцца, дырэктар і адміністратар у выніку аналізу апісанага дзеяння павінны прадугледзець наступнае:

— на базе якіх арганізацый і ўстаноў (школы, ПТВ, ВНУ і інш.) будуць фарміравацца групы ўдзельнікаў нумара;

— хто будзе ўвасабляць аналізуемы нумар (прозвішча, імя, імя па бацьку пастаноўшчыка);

— якую колькасць удзельнікаў можа прадставіць кожная вызначаная арганізацыя ці ўстанова;

— хто з прадстаўнікоў вызначаных устаноў будзе адказваць за арганізацыю і правядзенне рэпетыцый на сваіх мясцовых спортпляцоўках і ў танцавальных залах, за дастаўку ўдзельнікаў на зводныя рэпетыцыі, а таксама за кантроль і захаванне працоўнай дысцыпліны ў час рэпетыцыйнага працэсу і на свяце;

— якім чынам будзе здзейснена дастаўка ўдзельнікаў нумара на зводныя рэпетыцыі і свята (пехатой, на транспарце ўстановы ці на службовым транспарце свята);

— якіх памераў павінны быць вопратка, абутак і шкарпэткі для 600 гімнастак;

— якім чынам забяспечыць гімнастак вопраткай і абуткам (арэнда ці часовае дабрачыннае ахвяраванне ў спартыўных установах, калі там усё вызначанае ёсць у наяўнасці, або пашыў касцюмаў у вытворчых майстэрнях);

— колькі метраў матэрыялу трэба набыць у магазіне і колькі ён каштуе;

— хто будзе здзяйсняць заказ па вырабе вопраткі і абутку і колькі каштуе гэта работа;

— якая арганізацыя будзе вырабляць, згодна з распрацаванымі мастаком эскізамі, рэквізіт і бутафорыю нумара (двухбаковыя шалікі, парасончыкі, лодкі, вянкі, дэкарыраваную канструкцыю вогнішча);

— колькі будзе каштаваць выраб кожнай адзінкі рэквізіту і бутафорыі;

— у якім месцы будуць захоўваць касцюмы, абутак, рэквізіт і бутафорыю і хто будзе іх выдаваць і прымаць ад удзельнікаў нумара;

— на базе якой студыі будзе адбывацца гуказапіс фанаграмы музычна-літаратурнай кампазіцыі;

— колькі каштуе арэнда студыі гуказапісу і аплата работы артыстаў;

— хто будзе здзяйсняць работу гукааператара нумара на рэпетыцыях і свяце і колькі каштуе яго праца;

— якім чынам будзе ажыццяўляцца дастаўка гукаўзмацняльнай і гукааднаўляльнай апаратуры на рэпетыцыі і свята.

Такі або падобны арганізацыйна-вытворчы аналіз і канкрэтныя прапановы па вырашэнні праблем здзяйсняюцца па кожным новым нумары, які рыхтуецца ў праграме святочных дзеянняў.

3. Матэрыяльна-тэхнічнае і арганізацыйнае забеспячэнне падрыхтоўкі мастацка-дэкаратыўнага афармлення.

Дырэктар і адміністратар свята, грунтуючыся на эскізах мастацкага афармлення, распрацаваных галоўным мастаком і прадстаўленых у плане творчага забеспячэння, высвятляюць:

— колькі эстрадных, гульнёвых пляцовак, піратэхнічных канструкцый, гандлёвых і іншых часовых пабудоў неабходна вырабіць;

— з якога матэрыялу будзе выраблена кожная часовая пабудова і кошт гэтага матэрыялу;

— хто зможа ажыццявіць пастаўку неабходных матэрыялаў;

— якія арганізацыі будуць займацца вырабам пляцовак, агульны кошт іх вытворчых і мантажных работ;

— якія вытворчыя майстэрні будуць вырабляць элементы мастацка-дэкаратыўнага афармлення, які для гэтага патрабуецца аб’ём работ, іх кошт;

— каму зрабіць заказ на выраб бутафорыі і рэквізіту свята, колькі будзе каштаваць іх выраб;

— якая арганізацыя ажыццявіць дастаўку на пляцоўкі і мантаж вырабленага мастацкага афармлення святочнага дзеяння;

— якія часовыя электраліній трэба пабудаваць на тэрыторыі свята і хто будзе вырашаць гэта пытанне;

— якія арганізацыі паставяць святлоапаратуру свята (пражэктары, праекцыйныя апараты, лазерныя ўстаноўкі і інш.) і хто ажыццявіць іх мантаж;

— пералік і найменаванне адзінак мэблі, патрэбнай на сцэнічных пляцоўках (з якіх арганізацый можна яе ўзяць у часовае карыстанне);

— якім чынам будзе здзейснена касцюміраванне ўдзельнікаў свята (падбор з касцюмерных тэатраў і Палацаў культуры, арэнда ці выраб у майстэрнях), хто будзе вырашаць гэтае пытанне.

У кожным святе матэрыяльна-тэхнічнае і арганізацыйнае забеспячэнне, падрыхтоўка мастацкага афармлення маюць спецыфічныя асаблівасці і дэталізуюцца на аснове аналізу сцэнарыя і эскізаў мастака.

Паколькі мы асвятляем пытанні, найбольш характэрныя для ўсіх свят, этапы мастацка-дэкаратыўнага афармлення больш падрабязна будуць разгледжаны далей.

Трэба адзначыць, што дырэктар і адміністратар свята разам з занатаваннем агульных аспектаў і дэталізацыі асобных момантаў творчага, матэрыяльна-тэхнічнага і арганізацыйнага забеспячэння свята вызначаны аб'ём і кошт усіх работ перадаюць у бухгалтэрыю свята.

### *Фінансаванне свята*

Арганізацыйна-вытворчы аналіз сцэнарыя завяршаецца абагульненнем (з пункту гледжання фінансавання) разнастайных відаў работ.

На пачатковым этапе галоўны бухгалтар правярае дастаўвернасць уліку выяўленых работ і правільнасць расходу грашовых і матэрыяльных сродкаў згодна раскладак галоўнага рэжысёра, дырэктара і адміністратара свята. Кошт усіх відаў работ зводзіцца ў агульную ведамасць. Затым агульны кошт усіх відаў работ дырэктар і галоўны бухгалтар звяраюць з зацверджаным каштарысам свята, і пры ўмове, калі выдаткі не

перавышаюць агульную суму запланаваных грашовых сродкаў, пачынаецца наступны этап работы — распрацоўка рабочага плана падрыхтоўкі свята, заключэнне пагадненняў на выкананне ўсіх відаў работ і арганізацыя вытворчага працэсу.

У тым выпадку, калі праектны каштарыс свята перавышае запланаваны, дырэктар звяртаецца за дапамогай да старшыні аргкамітэта, які вырашае гэту праблему.

Фінансаванне такога праектнага каштарыса можа здзяйсняцца па наступных каналах:

— выдзяленне дадатковых грашовых сродкаў з дзяржаўнага бюджэту ці іншых праграм;

— за кошт памяншэння каштарыса іншых запланаваных свят;

— правядзенне дабрачыннага суботніка па добраўпарадкаванні тэрыторыі, сродкі ад якога будуць пералічаны на банкаўскі рахунак свята;

— збор добраахвотных ахвяраванняў. Напрыклад, прыняцце мясцовымі арганізацыямі, прадпрыемствамі, установамі на аснове перамоў з жыхарамі мясцовасці рашэння аб перадачы грашовых сродкаў аднаго рабочага дня ў фонд свята;

— дамова з кіраўнікамі прадпрыемстваў, арганізацый і ўстаноў аб выкананні часткі работ за кошт іх унутраных рэзерваў;

— пошук спонсараў свята з ліку прыватных фірмаў і асоб.

Пры немагчымасці забяспечыць фінансаванне работ праекта, калі перавышае вызначаны каштарыс, арганізатары звяртаюцца перш за ўсё да сцэнарыя і разглядаюць, якія яго фрагменты патрабуюць істотнай перапрацоўкі з мэтай памяншэння каштарыса, якія яго фрагменты можна не выкарыстоўваць у праграме свята. І гэта менш балюча адаб'ецца на адлюстраванні агульнай ідэйна-тэматычнай накіраванасці і ўспрыманні свята. Але зняцце задуманых аўтарамі дзей — самая крайняя мера, якая павінна прымацца ў выключных абставінах. На жаль, існуючая на многіх узроўнях практыка скарачэння сцэнарыяў з мэтай памяншэння каштарыса часта

прыводзіць да пэўнай нівеліроўкі свята, збядняе яго творчы патэнцыял, выхоўвае безыніцыятыўнасць, імкненне да ўжывання традыцыйна штампаваных рашэнняў — толькі б укласціся ў каштарыс.

Таму арганізатарам трэба прыкладаць усе намаганні для таго, каб задуманае аўтарамі і пастаноўшчыкамі свята адбылося ў рамках запланаваных святочных дзеянняў.

Такім чынам, арганізацыйна-вытворчы аналіз сцэнарыя дае магчымасць выявіць галоўныя пытанні ўвасаблення свята і намеціць шляхі іх вырашэння, што і з'явіцца падставай для распрацоўкі рабочага плана падрыхтоўкі свята.

## Агульныя звесткі аб рабоце штаба аргкамітэта

Падрыхтоўка свята — гэта самы важны і адказны працэс работы, які ахоплівае ўсе структурныя падраздзяленні аргкамітэта. Юрыдычная дзейнасць па ўвасабленні святочных дзей пачынаецца з зацвярджэння дзяржаўнымі органамі або грамадскімі арганізацыямі палажэння аб правядзенні свята, але фактычна пачатак работы адбываецца значна раней — са стварэння ініцыятыўнай групы, якая распрацоўвае творчую заяўку на правядзенне свята, прапануе склад аргкамітэта, журы, пастановачнай групы, агульны сцэнарый і інш.

Працэс стварэння знешняй формы свята падзяляецца на тры галоўныя этапы:

1. Стварэнне рабочага плана падрыхтоўкі свята на аснове дэталёвага аналізу сцэнарыяў разнастайных дзеянняў з пункту гледжання іх творчага, матэрыяльна-тэхнічнага, фінансавага і арганізацыйнага забеспячэння.

2. Вытворчы працэс падрыхтоўкі свята:

а) будаўніцтва эстрадных і гульнёвых пляцовак, гандлёвых і іншых часовых пабудоў;

б) выраб у вытворчых майстэрнях і на прадпрыемствах або арэнда элементаў мастацка-дэкаратыўнага, гукавога афармлення і іх мантаж у зонах святочнага дзеяння;

в) арганізацыя работы дапаможных службаў свята.

3. Правядзенне рэпетыцый і свята.

Увесь гэты працэс адбываецца ў вызначанай паслядоўнасці і ўзаемасувязі. Затрымка якога-небудзь этапу непазбежна адбіваецца на планамернасці развіцця іншых, парушае ўстаноўленыя рытмы, што ўрэшце можа адмоўна паўплываць на якасць свята. Таму супрацоўнікам аргкамітэта трэба звярнуць асаблівую ўвагу на дакладнасць выканання графіка ўсіх відаў работ, а таксама на дысцыпліну і адказнасць усіх удзельнікаў падрыхтоўкі святочных дзеянняў.

Для арганізацыі бягучай работы аргкамітэта і яго структурных падраздзяленняў ствараецца штаб свята, якому на ўвесь перыяд падрыхтоўкі выдзяляецца адзін або некалькі пакояў у памяшканні загадзя вызначанай установы ці арганізацыі (выканкам, аддзел культуры, Палац культуры і інш.). Штаб свята трэба забяспечыць асобным тэлефонам (для сувязі з рознымі арганізацыямі), ксераксам (для размнажэння службовай дакументацыі), тэлефаксам (калі існуе неабходнасць у гэтым). Разам з тым трэба прызначыць на часовую работу пры штабе сакратара з адпаведным колам функцыянальных абавязкаў.

У штабе свята для арганізацыйнага рашэння разнастайных пытанняў кожнае структурнае падраздзяленне аргкамітэта або збіраецца па меры патрэбы, або мэтанакіравана праводзіць заслухоўванне і абмеркаванне ходу работы па спецыяльным графіку (№ п/п, дата, месца правядзення, вырашаемае пытанне, дакладчык і хто выклікаецца на нараду).

У час падрыхтоўкі маштабнага свята, калі аргкамітэту даводзіцца разглядаць мноства пытанняў, нарады структурных падраздзяленняў могуць адначасова праводзіцца ў розных памяшканнях, спецыяльна вызначаных для гэтых мэт, або ў штабе на працягу тыдня вылучаюцца асобныя дні для арганізацыйных пасяджэнняў згодна распрацаванага графіка, напрыклад:

панядзелак — упраўленне па матэрыяльна-тэхнічным забеспячэнні;

аўторак — арганізацыйны аддзел;

серада — мастацка-пастановачная частка;

чацвер — пастановачная і творчая групы;

пятніца — кіраўнікі ўсіх структурных падраздзяленняў.

На гэтых нарадах разглядаюцца праблемы, ход работы і каардынацыя дзейнасці па арганізацыі і здзяйсненні вытворчага працэсу.

Перыядычна, звычайна ў пачатку, сярэдзіне і ў канцы тэрміну, адведзенага на ўвасабленне свята, старшыня аргкамітэта збірае ўсіх асоб, адказных за выкананне кожнага пункта рабочага плана падрыхтоўкі, для пастаноўкі канкрэтных задач, заслухоўвання, ажыццяўлення пэўных этапаў свята і, нарэшце, агульнай гатоўнасці да правядзення яго.

У святочныя дні месца размяшчэння штаба свята часта пераносіцца непасрэдна на тэрыторыю святочнага дзеяння — да цэнтральнага мізансцэнічнага пункта, вакол якога будуць разгортвацца асноўныя абрадава-рытуальныя, тэатралізаваныя і гульнёвыя фрагменты.

У вызначаным месцы для работы штаба ўстанаўліваюць вялікіх памераў палатку з пэўным наборам мэблі, праводзяць часовую тэлефонную сувязь для службовых кантактаў з рознымі арганізацыямі, установамі, прадпрыемствамі і прыватнымі асобамі, выдзяляюць месца для сакратара і мастакакаліграфа (які будзе займацца запаўненнем ганаровых грамат), сюды таксама праводзяць часовую электралінію для забеспячэння электраэнергіяй розных патрэб штаба свята (асвятленне памяшкання, падтрыманне неабходнай тэмпературы ў халодную пару года, прыгатаванне гарбаты, кавы і інш.).

Пасля правядзення свята ў загадзя вызначаны дзень аргкамітэт збіраецца на выніковае пасяджэнне. Тут абмяркоўваюцца станоўчыя і адмоўныя бакі святкавання, яго знаходкі і пралікі, выпрацоўваюцца канкрэтныя меры па перадоленні недахопаў у далейшым, а таксама вызначаюць і

ўзнагароджваюць лепшых работнікаў прэміямі, падарункамі, ганаровымі граматамі.

Свята скончана. Няхай жыве свята!

А працягваецца яго жыццё ў новай задуме пастаноўшчыкаў, якія ўзбагачаюць свята новымі творчымі ідэямі. Жыве свята, захоўваючы назапашаны вопыт мастацка-гістарычнай спадчыны, жыве і развіваецца ў яднанні традыцый і навацый.

## Літаратура


*Аксенов А.С.* Организация массовых праздников (1918—1920). — Л.: ЛГИК,1974.

*Генкин М.Д.* Массовые праздники. — М.: Просвещение, 1975.

*Глан Б.Н.* Праздник всегда с нами. — М.: СТД, 1988.

*Организация* Олимпийских игр / Пер. с англ. В.Дауме, С.Дункан и др. — М.: Орг. комитет Олимпийских игр, 1980.

*Организация* и методика художественно-массовой работы / Под ред. М.Д.Генкина. — М.: Просвещение, 1987.

*Петров Н.В.* 50 и 500. — М.: Просвещение, 1960.

*Петров Б.Н.* Массовые спортивно-художественные представления. Основы режиссуры, технологии, организации и методики. — М.: СпортАкадемПресс, 2001.

*Режиссура* и организация массовых зрелищ / Сост., ред., автор введения В.Н.Айзенштадт. — Харьков: ХГИК, 1973.

*Хавин Б.Н.* Все об Олимпийских играх. — 2-е изд., доп. — М.: Физкультура и спорт, 1979.

*Шамшур В.В.* Празднества революции. Организация и оформление советских массовых торжеств в Белоруссии. — Мн.: Наука и техника, 1989.

## III. СТВАРЭННЕ ПЕРАДСВЯТОЧНАЙ АТМАСФЕРЫ

Падрыхтоўка жыхароў горада і вёскі да актыўнага ўдзелу ў святочных дзеяннях — адзін з адказнейшых этапаў работы аргкамітэта.

У мэтах стварэння перадсвяточнай атмасферы, актывізацыі шырокіх колаў насельніцтва аргкамітэт распрацоўвае шэраг мерапрыемстваў, у выніку якіх людзям розных узроставых і сацыяльных катэгорый даецца магчымасць для дэманстрацыі свайго майстэрства ў разнастайных галінах матэрыяльнага і духоўнага быту. Безумоўна, што арганізацыя кожнага свята патрабуе распрацоўкі спецыфічных мерапрыемстваў, якія ствараюць перадсвяточную атмасферу, але ва ўсіх выпадках гэты аспект свята мае агульныя асноўныя напрамкі. Умоўна ўсе падрыхтоўчыя дзеі можна падзяліць на мерапрыемствы інфармацыйнага, агульнаарганізацыйнага, вытворча-конкурснага, а таксама мастацкага і мастацка-конкурснага характару.

Мы прапануем прасачыць працэс стварэння перадсвяточнай атмасферы на прыкладзе свята 500-годдзя г.Жлобіна Гомельскай вобласці. Многія з падрыхтоўчых мерапрыемстваў, запланаваных аргкамітэтам гэтага горада, могуць увайсці і ў іншыя святы, незалежна ад іх тэматычнай і жанравай накіраванасці.

### Інфармацыйныя мерапрыемствы

1. У газетах “Новы дзень”, “Металург”, “Футравік” увесці рубрыку “Насустрач 500-годдзю г.Жлобіна”. Сістэматычна друкаваць матэрыялы аб гісторыі горада, яго дасягненнях, перспектывах развіцця.

2. Выпусціць святочныя нумары газет “Новы дзень”, “Металург”, “Футравік”.

3. Выдаць буклет аб г.Жлобіне.

4. Падрыхтаваць:

— выпуск юбілейных сувенірных медалёў, прысвечаных 500-годдзю г.Жлобіна;

— выпуск юбілейных узнагародных значкоў, прысвечаных 500-годдзю горада;

— цыкл лекцый "Жлобіну—500" і арганізаваць іх правядзенне.

5. Вырабіць:

— вымпелы, канверты і блакноты з эмблемай г.Жлобіна;

— каляндар, прысвечаны 500-годдзю г.Жлобіна;

— сімволіку свята на транспарт агульнагарадскога прызначэння (аўтобусы, таксі, дызельныя паязды, гандлёвыя пункты, кінатэатры, ДК і інш.

— поліэтыленавыя пакеты з юбілейнай сімволікай;

— юбілейныя этыкеткі для тавараў, якія выпускаюць на прадпрыемствах г.Жлобіна.

6. Выдаць:

— серыю паштовак аб г.Жлобіне;

— буклеты аб прадпрыемствах горада.

7. Выпусціць марку, прысвечаную 500-годдзю г.Жлобіна.

8. Надрукаваць:

— запрашэнне на свята 500-годдзя г.Жлобіна;

— праграму свята, запрашэнне-пропуск;

— афішу свята;

— арганізаваць пастаяннадзеючыя перасоўныя фотавыстаўкі, прысвечаныя г.Жлобіну.

**Агульнаарганізацыйныя мерапрыемствы**

1. Правесці:

— аднаўленне і рэстаўрацыю фасадаў будынкаў;

— агульнагарадскі суботнік, зробленыя сродкі ад якога пойдуць у фонд свята.

2. Адкрыць спецрахунак у банку для арганізацыі і правядзення свята 500-годдзя г.Жлобіна.

3. Арганізаваць і правесці агульнагарадскую латарэю да 500-годдзя горада з папярэднім продажам латарэйных білетаў.

4. Распрацаваць планы-заданні калектывам прадпрыемстваў і ўстаноў горада па мастацка-дэкаратыўным афармленні.

5. Устанавіць памятны знак у гонар 500-годдзя горада.

6. Устанавіць мемарыяльную дошку на адным з будынкаў горада ў гонар 500-годдзя.

7. Закласці парк.

8. Прысвоіць адной з вуліц горада, арганізацыі, парку, плошчы імя 500-годдзя горада.

9. Правесці анкету з насельніцтвам па назве мікрараёна горада праз газету "Новы дзень". Прысвоіць назвы мікрараёнам.

10. Расправаць маршруты экскурсій по гораду і раёну ў сувязі з 500-годдзем горада.

11. Напісаць гісторыка-эканамічны нарыс аб горадзе.

12. Стварыць летапіс горада.

13. Стварыць гарадскі краязнаўчы музей.

14. Адкрыць музей баявой і працоўнай славы ў лакаматыўным дэпо.

15. Вырабіць юбілейныя граматы і вымпелы для ўзнагароджвання калектываў і жыхароў горада ў сувязі з 500-годдзем горада.

16. Распрацаваць тэхналогію фірменных страў.

## Вытворча-конкурсныя мерапрыемствы

1. Правесці выстаўку дасягненняў народнай гаспадаркі г.Жлобіна.

2. Арганізаваць конкурсы на:

— лепшую вуліцу прыватнай забудовы;

— лепшае ўтрыманне дома (прыватнага і дзяржаўнага);

— лепшую школу горада;

— лепшы дзіцячы садок;

— лепшае добраўпарадкаванне тэрыторыі і прамысловых прадпрыемстваў, арганізацый, устаноў і ўтрыманне замацаваных за імі тэрыторый у горадзе;

— лепшага цырульніка;

— лепшага кухара;

— лепшага мадэльера.

## Мерапрыемствы мастацкай і мастацка-конкурснай накіраванасці

Правесці ва ўстановах культуры, на прадпрыемствах, у школах, ГПТВ, дзіцячых дашкольных установах святочныя вечары, арганізаваць выстаўкі па прапагандзе дасягненняў г.Жлобіна, працоўнага і баявога мінулага.

Арганізаваць конкурс самадзейных паэтаў і кампазітараў па стварэнні песні, вершаў аб горадзе.

Акрамя гэтага, план па падрыхтоўцы свята прадугледжваў наступнае.

1. Архітэктурна-мастацкае афармленне горада.

2. Стварыць дакументальны і відэафільмы аб Жлобіне, яго людзях і свяце.

3. Правесці агляд-конкурс фотаработ, прысвечаных гораду.

4. Правесці конкурс па стварэнні герба і эмблемы горада.

5. Арганізаваць выстаўку дзіцячага малюнка "Горад Жлобін — вачыма дзяцей".

6. Арганізаваць агляд-конкурс і выставу мастакоў.

7. Правесці агляды-конкурсы і выставы розных парод сабак, кошак, галубоў і інш.

8. Арганізаваць выставу кветак і кветкавых пано.

9. Арганізаваць конкурсы:

— фальклорна-музычных ансамбляў;

— гарманістаў;

— выканаўцаў прыпевак;

— выканаўцаў беларускага гумару.

10. Правесці ў школах конкурс сачыненняў "Майму гораду — 500 гадоў".

11. Арганізаваць конкурс на лепшыя верш і апавяданне аб горадзе.

12. Правесці на прадпрыемствах, арганізацыях, у школах, ГПТВ, установах горада конкурс на лепшы карнавальны касцюм і абарону яго.

Такім чынам, дакладнае выкананне ўсіх распрацаваных мерапрыемстваў і пастаянны кантроль за тэрмінам іх здзяйснення дапамогуць стварыць мэтанакіраванае рэчышча, у якім будзе развівацца імправізацыйная творчасць жыхароў мясцовасці, дзе мае адбыцца свята. У выніку і будзе створана перадсвяточная атмасфера, у якой людзі самых розных узростаў і прафесій знойдуць прымяненне сваім здольнасцям, адчуць радасць творчага ўзаемадзеяння з астатнімі ўдзельнікамі свята.

# IV. АРГАНІЗАЦЫЙНЫЯ І ВЫТВОРЧЫЯ АСПЕКТЫ АРХІТЭКТУРНА-ДЭКАРАТЫЎНАГА АФАРМЛЕННЯ СВЯТА

Асаблівасцю архітэктурна-дэкаратыўнага афармлення свята з'яўляецца прасторавая свабода, магчымасць самых нечаканых сітуацый. Для свята "сцэнай" могуць стаць рака і лес, поле і гара, помнік і мемарыяльны комплекс, парк і гарадская плошча, вуліца... "У буйнамаштабных мерапрыемствах творчыя ідэі могуць быць увасоблены толькі тады, калі яны задумваюцца першапачаткова ў рэальных арганізацыйна-эканамічных формах.

На пераадольванне лавіны арганізацыйна-эканамічных цяжкасцей у стадыі рэалізацыі задумы ў мастака-пастаноўшчыка затрачваецца сіл у многа разоў больш, чым на рашэнне творчых праблем. Ні тэатр, ні кіно, ні іншыя віды мастацтва не ведаюць такой дыспрапорцыі паміж творчасцю і эканомікай. Гэта звязана з часовасцю пастановачных груп свят, разавым паказам мерапрыемстваў і поўнай адсутнасцю якой-небудзь пастаяннай вытворчай базы"[1].

## Генеральны план дэкарыравання свята

Ужо на эскізна-праектнай стадыі работы перад мастаком паўстае шэраг задач арганізацыйна-творчага характару. Пасля знаёмства са сцэнарыем і рэжысёрскай задумай свята мастак выязджае на месца яго правядзення. Тут ён дэталёва знаёміцца з архітэктурнымі і ландшафтнымі асаблівасцямі святочнай тэрыторыі, робіць папярэднія замалёўкі агульнага плана размяшчэння зон святочнага дзеяння і па магчымасці размеркаванне канкрэтных апорных пунктаў кожнай святочнай зоны. Для больш дэталёвай прапрацоўкі папярэдняй планіроўкі прасторавага вырашэння многія мастакі выкары-

---

[1] *Мальков А.* Театр под открытым небом // Художник и зрелище: Сб.ст. – М.: Сов. художник, 1990. – С.15.

стоўваюць чарцяжы плана-карты горада, якія звычайна знаходзяцца ў архітэктурных аддзелах выканкамаў. Часам мастакі фатаграфуюць ландшафтнае асяроддзе, асобныя забудовы, асабліва месцы размяшчэння галоўных мізансцэнічных пунктаў, для таго каб у далейшым можна было б у гэтыя дзялянкі святочнай прасторы арганічна ўпісаць элементы дэкору.

Прыступаючы да эскізна-праектнай работы, мастак перш за ўсё разглядае пытанні афармлення комплексна-ансамблевага ўбранства свята. Як адзначае расійскі мастак-даследчык А.У.Неміро, пераважнымі прынцыпамі арганізацыі асяроддзя святочнага горада сталі "перпендыкулярнасць", "вертыкальнасць" і "гарызантальнасць" размяшчэння дэкаратыўных элементаў на фасадах, сценах будынкаў і на плошчах. Для гэтай мэты служаць сцягі, перацяжкі, флажковыя сістэмы, дэкор асвятляльных апор, будаўнічых кранаў, дакладна чытаемая рытміка аб'ёмна-пластычных канструкцый на адкрытых прасторах. Да іх належаць выставы нагляднай агітацыі, трыбуны, сцэнічныя пляцоўкі, розныя прасторавыя забудовы, якія фарміруюць мікра- і макраасяроддзе святочнага горада.

Устойлівую групу афарміцельскіх сродкаў складаюць аб'ёмныя, статычныя (замацаваныя на месцах) і дынамічныя (рухомыя, пераносныя і інш.) элементы. Да першых належаць жывапісныя пано, плакаты, лозунгі, транспаранты, перацяжкі, фатаграфічныя элементы, дыяграмы, устаноўкі і канструкцыі, сцягі, традыцыйныя сродкі — флажковыя і зялёныя гірлянды, арыфламы, стужкі, кветкі. Да другіх — убранства святочных дэманстрацый, аўтаўстаноўкі, святлокінетычныя канструкцыі і ўстройствы.

Мастацкая якасць святочнага ўбранства сёння вызначаецца не толькі жывапісна-пластычнай культурай яго аўтара, але і яго веданнем прынцыпаў архітэктурнай пабудовы, уменнем зрабіць тэхнічны разлік[1].

---

[1] *Гл.: Немиро О.* Праздничный город. – Л.: Художник РСФСР, 1987. – С. 58–59.

У практыцы дэкаратыўнага афармлення выкарыстоўваюць і паветраныя шары, якія выконваюць не толькі задачы ўпрыгожвання святочнай прасторы, але і адлюстроўваюць ідэйна-тэматычную накіраванасць свята. Так, на адным са свят у г. Магілёве выява герба горада, зманціраваная на буйнамаштабным палатне, была паднята на некалькі сотняў метраў на зачаленым аэразондзе. Спецыяльны падсвет пражэктараў факусіраваў асвятленне выявы, пакідаючы ў цені сістэму ўмацаванняў. Стваралася ўражанне, што герб лунае ў паветры. У г.Мінску на Усебеларускім фестывалі моладзі над стадыёнам "Дынама" ў неба ўзняўся вымпел, падтрымліваемы аэрастатам. Для пад'ёму сцягоў, эмблем, вымпелаў, партрэтаў выкарыстоўваюцца не толькі аэрастаты, аэразонды, але і верталёты. Адзін з фрагментаў тэатралізаванага прадстаўлення на свяце г.Віцебска — парад верталётаў, якія адкрываюць свята і нясуць сцягі, партрэтныя выявы. У многіх гарадах святы адкрываюць рытуалам пад'ёму рознакаляровых шароў, надзьмутых геліем. Гэтыя шары запускаюць у вялікай колькасці паштучна або ў звязках, што аказвае на гледачоў моцнае ўражанне. Часам рознакаляровыя паветраныя шары, але ўжо надзьмутыя звычайным паветрам, у фінале святочнага дзеяння апускаюць у вялікай колькасці (напрыклад, са столі глядзельнай залы), на гледачоў, пакідаючы ў публіцы прыемны ўспамін аб свяце.

Правядзенне свята, як правіла, не абмяжоўваецца толькі дзённай часткай сутак, яно працягваецца вечарам і нават ноччу, людзей запрашаюць на тэатралізаваныя шэсці, канцэрты, балы, дыскатэкі, феерверкі і інш. З гэтай прычыны галоўнаму мастаку пры стварэнні комплекснага плана мастацка-дэкаратыўнага афармлення свята неабходна прадугледжваць светлавое афармленне горада, а таксама відовішчных і гульнёвых пляцовак.

Арганізаваць эстэтычнае асяроддзе горада, мястэчка ў вячэрні і начны час можна пры дапамозе розных сродкаў светлавой пластыкі.

Шырока выкарыстоўвае сучасная практыка электраілюмінацыю вуліц, плошчаў шматкаляровымі гірляндамі, размешчанымі ў некалькі радоў на расцяжках папярок вуліц, контурную ілюмінацыю карнізаў дамоў, рэльефаў мастоў, набярэжных, разнастайныя ілюмінацыйныя элементы, святлодынамічныя карціны, светлавыя фантаны, бягучыя светлавыя радкі, контурную і аб'ёмную ілюмінацыю дрэў. Даволі часта практыкуецца і ўвядзенне ў светлавое афармленне маштабных святлокінетычных устройстваў, комплексаў з экранамі, на якіх пры дапамозе кіна- або відэаролікаў дэманструюцца дакументальныя, мастацкія і мультыплікацыйныя фільмы. У многіх гарадах Беларусі наладжваюць работу кінатэатраў на адкрытым паветры, дзе гледачы праглядаюць кінастужкі па тэматыцы свята. У г. Дзяржынску Мінскай вобласці яскравым і эмацыянальна ўражвальным на свяце горада было феерычнае светлавое дзеянне — канцэрт каляровамузычнага жывапісу на фоне феерверкавых вырабаў.

Ва ўмовах скквераў, паркаў, зяленых зон патрабуецца не толькі падсвет зялёных насаджэнняў, але і фарміраванне адзінага комплекснага асвятлення відовішчнага асяроддзя на зямлі і вадзе. Так, у летнюю пару года ўражанне могуць аказаць шматкаляровыя падсветы вадзяной прасторы, вадзяных фантанаў, вадзяных заслон на паркавых плацінах. Прыкладам такога незвычайнага па сваёй выразнасці відовішча быў святловадзяны комплекс, створаны на свяце г.Бабруйска (1989). Тут пры дапамозе вадамётаў пажарных машын і пажарнага катэра на рацэ Бярэзіне быў створаны каскад, у склад якога ўвайшлі вадзяны экран, сорак восем шырокапалосных вертыкальных, веерных, зігзагападобных струменяў і два вадаспады. Святло ў спалучэнні з рухам вады давала непаўторную дынамічную ігру каляровай варыяцыі. Фантаны, вадаспады і струмені пад музыку пры дапамозе пражэктараў афарбоўваліся то ў адзін, то ў другі колер, а ў гэты час на вадзяны экран праецыравалі каляровамузычныя жывапісныя кампазіцыі і слайды.

Зімой у паркавай зоне прыкладам комплекснага афармлення з'яўляецца плошча масавага адпачынку ў форме снежнага гарадка. Дарогі да такога гарадка можна аформіць ілюмінаваннем ёлак і іншых дрэў, ілюмінаванымі гірляндамі падкрэсліць контуры катка, у цэнтры якога паставіць ілюмінаваную ёлку, а снегавыя скульптуры і лёд катка расквеціць рознакаляровымі падсветамі пражэктараў. Разам з тым на экране з лёду або снегу можна рабіць любыя светлавыя праекцыі. У спалучэнні з музыкай і словам яны аказваюць значнае эстэтычнае ўздзеянне на прысутных.

Цікавы прыём святлографічнага рашэння — падсвет архітэктурных збудаванняў або асвятленне іх заліваючым, контражурным, ажурным святлом, што падкрэслівае форму дэкарыруемага аб'екта. У многіх гарадах ужо стала традыцыяй здзяйсняць дэкаратыўны падсвет архітэктурна-мастацкіх і скульптурных помнікаў, асобных будынкаў. Разам з тым пры дапамозе ўнутранага архітэктурнага асвятлення будынкаў можна ствараць маштабны светлапіс: уключэнне ў вячэрні час па загадзя распрацаваным праекце святла ў пэўных пакоях дае магчымасць "маляваць" выдатна ўспрымаемыя на адлегласці асобныя словы, лічбы юбілейных дат.

Святлодэкаратыўныя задачы ў працэсе мастацкага афармлення свята галоўнаму мастаку дапамагае рашыць група спецыялістаў — архітэктары, дэкаратары, канструктары, інжынеры, электрыкі.

Вызначаючы месца правядзення ўрачыстасці, неабходна асабліваю ўвагу надаць дамінантам комплеснага афармлення, гэта значыць тым аб'ёмна-пластычным устаноўкам, статычным і дынамічным элементам, якія будуць адлюстроўваць вобразную сістэму свята, трансфармуючы тым самым вуліцу, плошчу, натуральнае і штучнае асяроддзе горада, вёскі.

Як паказвае практыка, існуюць розныя прыёмы і метады работы на эскізна-праектнай стадыі: планшэт, перспектыва-развёрстка, макетаванне ў штабе, фотамантажнае праектаванне з маляўнічымі элементамі, мантажом і падсветам.

Да работы над святочным афармленнем у вялікіх гарадах або ў вялікіх святах мэтазгодна далучаць многія групы мастакоў. Напрыклад, генеральны план-схема дэкарыравання г.Мінска на свяце горада ў 1986 г. (галоўны мастак В.Я.Семянько), над якім многа месяцаў працаваў калектыў мастакоў, архітэктараў і канструктараў, уключаў мноства праектаў і макетаў. Сюды ўвайшлі дзесяткі планшэтаў, фатаграфічных і графічных кампазіцый, перспектыў, не лічачы сотняў ракурсных фотаздымкаў, жывапісных эскізаў, тэхніка-канструктыўных разлікаў, аб'ёмна-пластычных устройстваў. Гэты калектыў, з'яўляючыся каардынатарам творчых груп дзевяці раёнаў горада, рэдагаваў сустрэчныя сцэнарыі афармлення раёнаў і тэматычных зон.

## Сцэнічныя пляцоўкі і іх віды

На адкрытых сцэнічных пляцоўках сучаснага свята ў акружэнні прыроднага ландшафта або на фоне старадаўніх і сучасных архітэктурных пабудоў наладжваюцца фестывалі фальклору, класічнай і эстраднай музыкі, тэматычныя канцэрты рознай накіраванасці, праводзяцца конкурсныя, пазнавальныя, гульнёвыя праграмы і інш.

Сцэнічныя пляцоўкі на адкрытым паветры дзеляцца на стацыянарныя, часовыя і перасоўныя.

Стацыянарных пляцовак у форме амфітэатральных збудаванняў у сучаснай Беларусі няшмат — у Віцебску і Паставах. Што тычыцца стацыянарных паркавых эстрадных пляцовак на адкрытым паветры, якіх часта з-за іх знешняй формы называюць ракавінкамі, то трэба адзначыць, што яны ёсць амаль у любым горадзе або мястэчку краіны. Стацыянарныя тэатры ў якасці сцэны выкарыстоўваюць як дзікую або добраўпарадкаваную дзялянку зямлі, так і спецыяльна пабудаваны памост.

Пануючай формай сцэнічнай святочнай прасторы з'яўляюцца часовыя пляцоўкі. Іх узводзяць на час правядзен-

ня фестывалю, свята або паказу разавай пастаноўкі. Як правіла, іх вырабляюць з лёгка збіраемых металічных канструкцый, да якіх мацуецца драўляны насціл. Тут пры розных прасторавых сітуацыях прымяняюцца разнастайныя сцэнаграфічныя прыёмы, каб наблізіць дзею да гледача. Для гэтых мэт служаць розных канфігурацый пераходныя масткі-сцэнічныя пляцоўкі, якія перакідваюць ад эстрады да гледачоў. Часовыя эстрадныя пляцоўкі збіраюць таксама на аснове вялікагрузных аўтамабіляў. Дзеля гэтага на месцы дзеяння шчыльна, адзін да аднаго, ставяць два—чатыры аўтамабілі кабінамі ў адзін бок. Калі падобная пляцоўка павінна быць невялікай па памеры, то можна выкарыстаць толькі два аўтамабілі (павёрнутыя кабінамі ў розныя бакі па гарызанталі ад глядзельнай залы) або адзін грузавік. Як у першым, так і ў другім варыянце, перш чым паставіць машыны адна да адной, апускаюць іх барты. Планшэт кузава аўтамабіля пакрываюць лістамі драўлянастружкавай пліты, каб стварыць роўную паверхню сцэны. У непагадзь, калі ідзе дождж, такія сцэны рэкамендуецца пакрываць поліэтыленавай плёнкай, каб драўлянастружкавыя пліты не ўспухлі, што будзе перашкаджаць або зробіць немагчымым выступленне творчых калектываў, асабліва харэаграфічных ансамбляў і пластычных груп.

Часовыя сцэнічныя пляцоўкі на аснове чыгуначных платформаў і баржаў пакрываюць такім жа чынам, як і на аснове аўтамабіляў.

Такія пляцоўкі, як правіла, не маюць механізмаў сцэны. Яны пазбаўлены механічных пад'ёмаў-штанкет, куліс, ланцугоў, паваротнага круга, наладжанага светлавога абсталявання і нават заслоны. Іх афармляюць у залежнасці ад аўтарскай ідэі і задумы мастака дэкарацыямі або дэкаратыўнымі элементамі, якія ўяўляюць вобразна-сімвалічнае адлюстраванне падзей, што адбываюцца.

Пры пабудове часовых сцэнічных пляцовак, дзе гледачы знаходзяцца з аднаго боку, мэтазгодна прадугледжваць уста-

ляванне глядацкіх месцаў. Часта на святах многія гледачы або дзеці з прычыны стамлення не ў стане доўга стаяць перад сцэнай. Неаднаразова прыходзілася назіраць, калі людзі шукаюць месца, дзе б прысесці, і, не знайшоўшы яго, разыходзяцца. Практыка паказвае, што на святах, дзе перад пляцоўкай пастаўлены некалькі радоў крэслаў або драўляных лавак, заўсёды ёсць гледачы, а ў адваротным выпадку іх вельмі мала. Прысутнасць малой колькасці гледачоў негатыўна ўплывае і на выступленне артыстаў, псуе іх настрой, што адбіваецца на якасці канцэртаў, і асабліва на правядзенні конкурсаў і гульнёвых праграм, дзе прысутнасць удзельнікаў неабходна. Гэтаму пытанню арганізатары павінны надаваць належную ўвагу.

Да перасоўных сцэнічных пляцовак належаць так званыя педжэнты — аб'ёмныя перасоўныя ўстаноўкі, для якіх выкарыстоўваюць трамваі, чыгуначныя платформы, павозкі, трактары, аўтамабілі, электракары, вела- і мотаплатформы, баржы, цеплаходы і інш. Галоўным сэнсавым зместам перасоўных пляцовак з'яўляюцца статычныя або дынамічныя пластычныя кампазіцыі, удзельнікі якіх пры дапамозе дэкарацый, касцюмаў, бутафорыі адлюстроўваюць пэўную тэму, увасабляюць пэўны эпізод прадстаўлення, святочнага шэсця. Педжэнты часцей за ўсё ўжываюцца як частка святочнага, карнавальнага шэсця, маніфестацыі, дэманстрацыі або як галоўны мастацкі сродак самастойнай шырокамаштабнай тэатралізаванай дзеі. Прыкладам такіх дзей могуць быць разнастайныя тэатралізаваныя прадстаўленні, якія адлюстроўваюць гістарычныя этапы жыцця краіны.

Распрацоўваючы тэматычнае афармленне педжэнтаў, мастакам неабходна вырашаць не толькі дэкаратыўныя і прасторава-пластычныя, але і тэхнічныя задачы. Рухальную аснову такіх педжэнтаў трэба перакрываць канструкцыямі з рэек, фанеры, матэрыі, прадугледжваць умацаванне дэкаратыўных аб'ёмаў, бутафорыі з такім разлікам, каб усё гэта не перашкаджала руху платформы. Разам з тым неабходна здзейсніць

інжынерныя разлікі нясучай часткі платформы, каб яна вытрымлівала вагу жывых удзельнікаў прадстаўлення. Устаноўкі размалёўваюць актыўнымі колерамі ў адпаведнасці з тэматыкай афармлення.

Асабліва цікавымі з'яўляюцца розныя варыянты стварэння падвешаных, дынамічных, здольных да перамяшчэння ў паветры пляцовак. Яны рухаюцца з дапамогай магутнай будаўнічай тэхнікі (пад'ёмных кранаў, тэлескапічных аўтавышак) або электрапад'ёмнікаў, размешчаных на столі.

Адна са старадаўніх формаў сцэнічнай пляцоўкі, якая існавала ў Беларусі і адноўлена ў святочнай практыцы, мае назву "фрай". Гэта — разнавіднасць балагана, сутнасць якога заключаецца ў наступным: на зямлі акрэсліваюць круг, які акаймляюць канатамі, і ў гэтым крузе выступаюць творчыя калектывы. Такая форма сцэнічнай пляцоўкі вельмі простая па рашэнні і выкананні. Акрамя таго, яна дае шырокія магчымасці для мізансцэнічнага рашэння і з'яўляецца ідэальнай з пункту гледжання глядацкага ўспрымання: у крузе ўсё ўсім бачна. Гледачы, якія размяшчаюцца за канатамі, маюць магчымасць не толькі назіраць дзеянне з розных ракурсаў, але і перамяшчацца па крузе па сваім жаданні. Выступленні розных калектываў, якія прыбываюць у фрай, звычайна непрацяглыя па часе, і таму наяўнасць глядацкіх месцаў пры гэтай пляцоўцы можна не прадугледжваць або можна паставіць па крузе адзін—два рады лавак ці крэслаў.

Асобную групу складаюць сцэнічныя пляцоўкі на вадзе. Іх асаблівасць заключаецца ў тым, што сцэна пакладзена на сваі, пазабіваныя ў дно паблізу або на некаторым аддаленні ад берага. Напрыклад, у Беларусі такая пляцоўка была выкарыстана ў Нясвіжы (1997 г., спектакль "Вадзяная феерыя") , у Расіі — плавучая сцэна з лебядзінымі крыламі-экранамі тэлепраекцыі на прадстаўленні "Чароўны свет балета" (г.Масква); плавучая сцэна — гітара на штогадовым фестывалі аўтарскай песні (г.Самара). У другім варыянце такой пляцоўкай могуць быць пантоны або баржы і цеплаходы, як,

напрыклад, на Першым міжнародным фестывалі беларускага фальклору ў г.Пінску. Дэкаратыўным афармленнем тут можа служыць прыродны ландшафт, але сама сцэна патрабуе драўлянага насцілу для выступлення калектываў і дэкаратыўных дэталяў, якія адлюстроўваюць вобраз свята.

На большасці сцэнічных пляцовак на адкрытым паветры (у адрозненне ад тэатра) не прадугледжваецца змена дэкарацый у час дзеі. Як правіла, дэкаратыўнае афармленне вырашаецца па прынцыпе адзінай устаноўкі, якая адлюстроўвае тэму і ідэю ўвасабляемага свята. Дэкарацыямі могуць служыць фасады замкаў (Нясвіж, Мір, Гродна), манастыроў, сучасных архітэктурных ансамбляў або ландшафтнае асяроддзе. Такія сцэны можна ўпрыгожыць дэкаратыўнымі дэталямі сімвалічна-вобразнага характару і фітадызайнам.

## Работа над планаваннем свята

У любым, нават невялікім па маштабе, свяце ўвасабленне творчай задумы мастака пачынаецца з распрацоўкі канчатковага плана прасторавага размяшчэння зон святочнага дзеяння. Найбольш просты спосаб ажыццяўлення гэтага віду эскізна-праектных работ наступны: на адным або некалькіх лістах ватманскай паперы мастак вычэрчвае ў агульных рысах карту свята ў выглядзе зверху. На гэтай карце ён адзначае ўсе зоны святочнага дзеяння (плошчу, парк, стадыён, вуліцы, скверы, раку, поле і інш.), схематычна вычэрчваючы архітэктурныя і ландшафтныя асаблівасці месцаў дзеяння. У кожнай зоне дзеяння размяшчаюцца апорныя пункты, вакол якіх будуць стыхійна або ў арганізаваным парадку фарміравацца будучыя мізансцэны свята. Кожны канкрэтны апорны пункт (сцэнічныя пляцоўкі, гандлёвыя рады кірмашу, выставы, атракцыёны і інш.) вычэрчваецца таксама ў агульным плане, без дэталізацыі. Створаная такім чынам картаплан свята, зацверджаная галоўным рэжысёрам і старшынёй аргкамітэта, з'яўляецца дакументам, на які арыентуюцца і

спасылаюцца ў сваёй рабоце супрацоўнікі ўсіх структурных падраздзяленняў арганізацыйнага камітэта па правядзенні свята.

Пасля стварэння карты-плана свята мастак робіць эскізы ўсёй прадукцыі дэкаратыўнага афармлення. На аснове гэтых эскізаў выпрацоўваюцца чарцяжы рабочага праекта, па якім вядуцца будаўніцтва буйных аб'ёмаў і выраб малых формаў мастацка-дэкаратыўнага афармлення.

Далейшы этап работы — кампаноўка і праверка размяшчэння дэкарацый на сцэнічных пляцоўках[1]. Вычэрчванне планіроўкі дэкарацый, іх размяшчэнне ў выглядзе зверху па сутнасці з'яўляюцца першым этапам манціроўкі дэкаратыўнага афармлення. Немалую ролю ў гэтай рабоце мае дакладнасць плана пляцоўкі. На плане ўказваюцца канструктыўныя асаблівасці сцэны, а таксама адзначаюцца месцы падключэння гукавой і светлавой апаратуры для таго, каб выпадкова не перакрыць іх дэкарацыямі.

Работа над планам сцэны здзяйсняецца з улікам размяшчэння апорных пунктаў дзеяння, месцаў, у якіх найбольш актыўна будуць іграць артысты.

Пры планіроўцы важна не толькі з дакладнасцю вызначыць усе памеры і месцы размяшчэння дэкарацый, але і магчымасць правільнага размяшчэння дапаможных устройстваў — рабочых станкоў і лесвіц, а таксама шляхоў эвакуацыі ўдзельнікаў святочнага дзеяння згодна з патрабаваннямі тэхнікі бяспекі.

Да работы над планам карысна далучыць мастака па святлу, які разглядвае планіроўку з пазіцый асвятлення дадзенай дзеі. Яго пажаданні часам патрабуюць частковых змен у кампазіцыі. Так, размяркоўваючы расстаноўку крыніц святла, ён можа папрасіць павялічыць якую-небудзь частку дэкарацый, каб схаваць за іх прыбор, або разгарнуць пэўную частку дэкарацый у той ці іншы бок, каб яны папалі ў зону дзеяння пражэктараў.

---

[1] *Пры* апісанні гэтага этапу работы мы выкарысталі матэрыялы з кнігі В.Базанава "Тэхніка і тэхналогія сцэны" (Л.: Искусство, 1976. – С. 184–203).

Для больш зручнага нанясення планіроўкі дэкарацый і хуткага вызначэння іх месцаразмяшчэння на план сцэны тонкімі лініямі наносіцца маштабная сетка. Гарызантальныя лініі пачынаюцца ад чырвонай лініі сцэны, а вертыкальныя — ад яе цэнтра. Перакрыжаванні ліній утвараюць квадраты з бакамі, роўнымі ім у натуральным памеры. Па восевай лініі робяцца адзнакі, адпавядаючыя размяшчэнню пэўных дэкарацыйных аб'ёмаў. Калі на свяце ў час дзеяння пэўныя дэталі дэкору будуць падымаць у паветра або апускаць, то на плане адзначаюцца месцы размяшчэння пад'ёмаў. Такія адзнакі робяцца па баках чарцяжа: кожны пад'ём (паветраныя шары або групы шарыкаў, гербы, сцягі і інш.) абазначаецца на тым баку сцэны, з якога ажыццяўляецца кіраванне ім.

Калі дзеянне адбываецца ў вячэрні або начны час, план сцэны павінен абавязкова ўключаць месцы размяшчэння светлавой апаратуры.

Пры наяўнасці перад сцэнічнай пляцоўкай глядацкіх месцаў у чарцяжы неабходна адзначыць крайнія месцы першага рада, пры дапамозе якіх вызначаюць бачнасць дэкарацый з боку глядачоў.

Найлепшым маштабам для плана сцэны з'яўляецца 1:20. На плане сцэны неабходна ўказаць назву свята, назву і месца размяшчэння пляцоўкі, яе асноўныя даныя — габарыты дэкаратыўных элементаў і інш.

Гатовы план сцэны, прыняты рэжысёрам, зацвярджаецца старшынёй аргкамітэта і пажарна-тэхнічнай камісіяй, якая складаецца з прадстаўнікоў органаў тэхнікі бяспекі і пажарнай аховы.

## Рабочыя чарцяжы

Рабочыя чарцяжы ўяўляюць эскізны (тэхнічны) праект, які адлюстроўвае прынцыповыя канструктыўныя рашэнні, агульнае ўяўленне аб устройстве і прынцыпах работы вырабаў, а таксама даныя аб іх назначэнні, асноўных параметрах і памерах.

Асноўная маса вырабаў паказваецца ў агульных відах, разрэзах, сячэннях і вузлах, якія даюць поўнае ўяўленне аб памерах і канструкцыі дэкарацый.

Ступень падрабязнасці чарцяжоў залежыць ад умоў, у якіх вырабляюцца дэкарацыі, і ад складанасці іх канструкцыі.

Напрыклад, калі ў тэхналогію вырабу, канкрэтную канструкцыю ўносяцца якія-небудзь змены або дадзены выраб дапускае некалькі канструктыўных варыянтаў, а таксама ў выпадку вырабу складаных дэкарацый — разборных арак, буйнагабарытных станкоў, лесвіц са складанай канфігурацыяй і іншага — майстэрням павінны быць прадстаўлены чарцяжы з поўнай канструктыўнай распрацоўкай аж да асобных дэталяў.

Для чарцяжоў дэкарацый устаноўлены маштаб 1:20. Асобныя вузлы, дэталі паказваюцца ў больш буйным выяўленні — ад 1:10 да натуральнай велічыні. Усе памеры на чарцяжах даюцца ў сантыметрах. Выключэнне складаюць вырабы з металу, для якіх памеры прадстаўляюцца па правілах маштабу машынабудаўнічага чарчэння ў міліметрах. Асобныя дэталі і зборныя комплексы паказваюцца ў двух ці трох праекцыях у залежнасці ад складанасці вырабу, з разрэзамі, сячэннямі, якія даюць дакладнае ўяўленне аб формах і памерах праектуемай дэкарацыі. Для дэкарацыі, складзенай з асобных частак, робіцца зборачны чарцёж, які ўказвае на размяшчэнне, спосабы змыкання або далучэння. Кожная частка маркіруецца нумарам, паведамляецца яе найменне. Маркіроўка на зборачным чарцяжы павінна адпавядаць маркіроўцы дэталяў або частак на іншых лістах.

Звычайна зборачны чарцёж даецца ў выглядзе зверху. Калі гэтай праекцыі недастаткова, выварочваюць фасад або разрэз па адной — двух восях. Зборачны чарцёж-план размяшчаюць у левым ніжнім вуглу ліста.

У правым верхнім вуглу ставіцца штамп, прадугледжваючы графы для назвы свята, святочнага дзеяння і прадстаўленай дэкарацыі. Гатовы чарцёж завярае сваім подпісам

мастак, а загадчык мастацка-пастановачнай часткі візіруе яго для выканання.

Аб'ёмна-каркасныя і станковыя дэкарацыі вычэрчваюцца не менш чым у двух праекцыях. Для простых станкоў, лесвіц і іншых аб'ёмных дэкарацый дастаткова габарытнага чарцяжа і тлумачальнага надпісу, дзе ўказваюцца адлегласць паміж нясучымі рамкамі, таўшчыня насцілу і (у асобных выпадках) сячэнне брускоў. Аб'ёмна-станковыя дэкарацыі ў выглядзе асобных дэкаратыўных комплексаў звычайна паказваюцца ў сабраным выглядзе.

Станкі, якія маюць складаную, крывалінейную форму, розныя ўхілы, паказваюць у плане і разрэзе. Для таго каб складаную канфігурацыю станка перанесці на падлогу майстэрні, план станка расчэрчваецца на квадраты.

## Тэхналогія апісання і каштарыс вырабаў

Рабочы чарцёж дае ўяўленне аб памерах вырабу і яго канструкцыі. Але перад тым, як пачаць яго вытворчасць, неабходна ўстанавіць, з якіх матэрыялаў і якім чынам ён павінен быць зроблены, апрацаваны, пафарбаваны.

Адказ на пытанні па тэхналогіі вырабу, спосабах апрацоўкі, імітацыі фактуры дае тэхналагічнае апісанне, якое складаецца загадчыкам мастацка-пастановачнай часткі і мастаком.

У тэхналагічным апісанні паказаны поўны пералік усіх прадметаў афармлення і кароткае апісанне тэхналогіі вырабу. Так, пры вырабе павільёна важна адзначыць, якой тканінай абцягваць сценкі — палатном, тарнай тканінай, байкай; якім чынам афарбоўваць абцяжку — клеем, анілінам; прымяняць трафарэт або цісненне і да т.п.

Таксама ў тэхналагічным апісанні неабходна адзначыць:

— найменне і кароткае апісанне вырабу, яго габарытныя даныя ў квадратных метрах;

— колькасць вырабаў;

— схематычны малюнак вырабу;

— тэхналогію вырабу (найменне асноўных матэрыялаў, якія пойдуць на падрыхтоўку вырабу, тэхналогію афарбоўкі і апрацоўкі).

Складанне тэхналагічнага апісання пачынаецца з апісання дэкарацый, іх аб'ёмаў, элементаў, агульных для ўсяго свята. Затым апісваюцца дэкарацыі, мэбля, бутафорыі і рэквізіт для кожнай сцэнічнай пляцоўкі, кожнага асобнага эпізоду, дзеі, што мае спецыфічныя рысы ў кожным канкрэтным свяце. На дробную бутафорыю і рэквізіт апісанне не робіцца. Іх пералік бярэцца з так званай выпіскі — спіса неабходнага рэквізіту, зробленага памочнікам рэжысёра.

Складаецца каштарыс (падлік кошту афармлення) на аснове рабочых чарцяжоў і тэхналагічнага апісання. Для гэтага загадчык мастацка-пастановачнай часткі павінен дакладна ведаць, якія прадметы афармлення будуць падабраны з запаснікаў тэатраў, Палацаў і Дамоў культуры, гарадскога склада мастацкага афармлення (калі такі ёсць), мастацкіх майстэрняў, якія прадметы неабходна вырабіць у пэўных арганізацыях, на прадпрыемствах, а якія набыць у гатовым выглядзе.

Кошт кожнага вырабу знаходзіцца ў прамой залежнасці ад умоў, у якіх ён вырабляецца. Адзін і той жа выраб у розных вытворчых умовах будзе мець розны кошт. Справа ў тым, што кошт вырабу любога прадмета складваецца з трох відаў затрат: кошту перапрацаваных матэрыялаў, зарплаты рабочых і накладных выдаткаў на зарплату. Чым буйней вытворчасць, тым вышэй узровень накладных выдаткаў; чым менш выраб паддаецца механічнай апрацоўцы і серыйнаму спосабу вытворчасці, тым больш затраты працы і вышэй кошт рабочай сілы. Такім чынам, адзінкавыя вырабы, заказаныя на буйным прамысловым прадпрыемстве, будуць каштаваць значна даражэй, чым зробленыя ў тэатральных (мастацкіх) майстэрнях. Таму да паслуг заводаў трэба звяртацца толькі ў

тых выпадках, калі канструкцыя або складаная тэхналогія не дазваляе выканаць работу сваімі сіламі.

Кошт рабочай сілы і накладныя выдаткі ўлічваюцца не ва ўсіх майстэрнях. У тых мясцінах, дзе мастацкія майстэрні або асобныя мастакі працуюць пры раённых ці гарадскіх Палацах, Дамах культуры і знаходзяцца на бюджэце, яны атрымліваюць зарплату ў выглядзе цвёрдых месячных акладаў. У гэтых выпадках каштарыс афармлення свята складваецца толькі з кошту матэрыялаў, расходаваных у працэсе вытворчасці. У майстэрнях, якія знаходзяцца на самастойным балансе (гаспадарчым разліку), дзе ўведзена здзельная аплата працы, прыходзіцца вызначаць працоўныя выдаткі, улічваючы велічыню заработнай платы, накладныя, цэхавыя і выдаткі па кіраўніцтву; падлік кошту рабочай сілы вядзецца ў аб'ёме чалавека-гадзін, неабходных для вырабу дадзенага заказу, або па спецыяльных нормах і расцэнках. Нормы і расцэнкі распрацоўваюцца як на асобныя вытворчыя аперацыі, так і на ўсе вырабы цалкам.

Для таго каб правільна вызначыць наменклатуру матэрыялаў, іх колькасць, выдаткі працы, неабходна ведаць не толькі памеры вырабу, але і ўсе тэхналагічныя працэсы, звязаныя з яго вырабам. Вось чаму пры складанні каштарыса карыстаюцца рабочымі чарцяжамі і тэхналагічным апісаннем.

Пры распрацоўцы нормаў выдаткаў найбольш дакладным з'яўляецца прамы падлік матэрыялаў па чарцяжах. Ведаючы канструкцыю дэкарацыі і тэхналогію яе вырабу, шляхам простага арыфметычнага падліку можна вылічыць, колькі і якіх матэрыялаў патрабуецца ў працэсе вытворчасці. Для палягчэння работы падлік вядзецца па нейкай адной частцы дэкарацыі або аднаму элементу канструкцыі, і атрыманы вынік памнажаецца на колькасць частак або элементаў, падобных па велічыні і канструкцыі. Так, пры падліку матэрыялаў на выраб станка дастаткова падлічыць кошт адной рамы, перамножыць атрыманае на агульную колькасць рам. Але не заўсёды і не ўсе матэрыялы вылічваюцца такім чынам. Па

чарцяжы можна вылічыць колькасць брускоў, петляў, нават цвікоў. Але як вызначыць колькасць іншых матэрыялаў (фарбы, паперы і інш.)? Для гэтага трэба даведачныя даныя. Пры падліку неабходна ведаць, што:

— дошкі адпускаюцца і ацэньваюцца ў кубічных метрах;

— фанерныя пакрыцці вылічваюцца спачатку ў квадратных метрах, а потым пераводзяцца ў лісты;

— усе тканіны, акрамя тэхнічных, незалежна ад іх шырыні маюць адну адзінку вымярэння — пагонны метр;

— папера, цвікі, клей, мука, фарба адпускаюцца ў кілаграмах;

— петлі вылічваюцца ў штуках.

Для вылічэння выдаткаў мяккіх дэкарацый неабходна ўлічваць спосаб крою тканіны і тое, што яны пры шыцці, афарбоўцы і вогнеахоўнай прапітцы даюць усадку.

Кошт матэрыялаў вызначаецца цаной за пэўную адзінку вымярэння. У каштарысе запіс матэрыялаў і іх кошт здзяйсняюцца наступным чынам. Спачатку запісваюцца найменне матэрыялу, затым адзінка яго вымярэння, потым колькасць, цана за адзінку і сума.

Для аналізу каштарыса і далейшай работы вельмі важна па кожным вырабе мець поўны кошт матэрыялу і кошт рабочай сілы, а таксама іх агульны кошт. Таму ў каштарысе павінны быць дакладна адлюстраваны гэтыя тры вынікі па кожнай пазіцыі. Для зручнасці накладныя выдаткі вылічваюцца не па асобных спецыяльнасцях, а па ўсёй суме зарплаты.

Гатовы каштарыс аналізуецца загадчыкам мастацка-пастановачнай часткі і мастаком. Аналіз каштарыса робіцца з пазіцый рэнтабельнасці і эканамічнасці выбранай тэхналогіі, выбраных матэрыялаў, найбольш поўнага выкарыстання матэрыялаў. Калі агульны вынік каштарыса перавышае адпушчаны на свята ліміт грошавых сродкаў, яго трэба перагледзець.

Скарачэнне каштарыса здзяйсняецца перш за ўсё за кошт выкарыстання больш танных матэрыялаў, частковага змянення тэхналогіі вырабу другарадных прадметаў, больш шы-

рокага прымянення падбору ўжо выкарыстаных раней матэрыялаў, а часам і за кошт адмовы ад некаторых прадметаў дэкарацыі, абсталявання або апаратуры. Але ніякая эканомія не можа быць апраўдана, калі будзе несці страты мастацкі бок свята.

Часам скарачэнне каштарыса адбываецца за кошт поўнага або частковага спонсарскага ўдзелу ў свяце пэўных арганізацый, якія бяруць на сябе выкананне часткі работ. Калінікалі прадпрыемствы за кошт унутраных рэзерваў выдзяляюць матэрыялы для правядзення работ, і ў гэтым выпадку аплачваецца толькі рабочая сіла.

Выпраўлены і ўдакладнены каштарыс падпісваецца загадчыкам мастацка-пастановачнай часткі, мастаком і бухгалтарам. Гэты каштарыс на выраб мастацкага афармлення з'яўляецца састаўной часткай зводнага, агульнага каштарыса, які адлюстроўвае ўсе выдаткі, звязаныя з падрыхтоўкай свята.

Зводны каштарыс падпісваецца дырэктарам і завяраецца старшынёй аргкамітэта свята, і з гэтага моманту ён набывае законную сілу і служыць дакументам для ўсіх службаў, занятых у падрыхтоўцы свята.

Загадчык пастановачнай часткі строга кантралюе выдаткі, звярае іх з сумамі, якія вызначаны каштарысам, рэгулюе ўсе выдаткі ў межах адпушчанай сумы.

## Работа над касцюмамі

Касцюм — важная частка сцэнаграфіі масавых свят і прадстаўленняў. У тэатралізаваных масавых відовішчах на адкрытым паветры акцёр у многіх выпадках знаходзіцца на вялікай адлегласці ад гледача, з прычыны гэтага міміка, нюансы жэстаў не заўсёды ўспрымаюцца. У той жа час кідкі, буйны, яркі па колеры касцюм здольны зрабіць бачнай для соцень і дзесяткаў тысяч гледачоў вобразную сістэму прадстаўлення.

Работа над мастацкім рашэннем касцюма пачынаецца з вызначэння тэмы дзеяння і звышзадачы пастаноўшчыкаў, а так-

сама прасторы, у якой разгортваецца святочная дзея. Парк, Палац культуры, стадыён, вуліца, плошча — кожная тэрытарыяльная зона дыктуе свае патрабаванні. Так, распрацоўваючы касцюмы для прадстаўлення на стадыёне, мастак павінен улічваць, што на полі падрабязна разглядзець асобнага чалавека практычна немагчыма і вопратка асобнага выканаўцы тут перастае быць касцюмам у сапраўдным сэнсе гэтага слова. Вобраз узнікае толькі ў з'яднанні іх у агульную карціну. Гэтая мазаічная цэласнасць валодае вялізным патэнцыялам пластычных трансфармацый. Магчымасці імгненных відазмяненняў вобраза часцей за ўсё забяспечваюцца канструкцыяй касцюма. Так, у адным з эпізодаў свята закрыцця XII Сусветнага фестывалю моладзі і студэнтаў у Маскве канструкцыя касцюмаў дала магчымасць усяго аднаму балетнаму калектыву тройчы паўстаць у новым вобразе. У пачатку па полі велічна "плылі" павы ў какошніках і блакітных сарафанах. Затым імгненна атрыбуты старажытнарускага касцюма знікалі і баярышні пераўтвараліся ў сучасных дзяўчат. Рытм іх танца падхопліваўся віхурам апісваючых кругі спадніц. А калі танец заканчваўся, дзяўчаты выпроствалі тканіны спадніц, і ўзнікаў буйны, яскравы малюнак. Поле пераўтваралася ў вялізны кветнік.

Але касцюм на стадыёне можа мець свой сумарны вобраз і без прымянення спецыяльных канструктыўных прыёмаў. Патэнцыяльная магчымасць такіх трансфармацый прадумваецца мастаком у колерах касцюма, яго дэталях, здольных у пэўныя моманты дзеі ствараць нечаканыя эфекты. Напрыклад, белыя пальчаткі ў касцюме масоўкі (прадстаўленне "Мір пераможа вайну") увогуле не прыцягвалі ўвагу да таго часу, пакуль выканаўцы разам не ўскідвалі рукі, якія трапяталі і літаральна ператвараліся ў чараду белых галубоў.

Свята на вуліцы сярод натоўпу патрабуе ад касцюма большай дэталізацыі, таму што глядач часта аказваецца ўдзельнікам святочнага дзеяння разам з выканаўцамі. Але і тут важныя буйны маштаб, яскравая каларыстычная гама,

якія забяспечваюць імгненны эфект. Касцюм павінен успрымацца ўсімі прысутнымі, а не толькі тымі, хто знаходзіцца ў першых радах.

На нетрадыцыйных сцэнічных пляцоўках (у парку, Палацы спорта, на плошчы і інш.), дзе гледачы знаходзяцца на значным аддаленні, персанаж ацэньваецца перш за ўсё па яго знешнім выглядзе, і ў такіх умовах вопратка акцёра вырашаецца як касцюм-вобраз, які канцэнтруе ў сабе сутнасць персанажа. Змястоўнай насычанасцю і характарам пластычнага рашэння касцюм-вобраз ушчыльную набліжаецца да лялькі. Ён да непазнавальнасці мяняе не толькі выгляд акцёра, але і характар яго ігры[1].

Падобныя касцюмы-вобразы на тэрыторыі Беларусі з'явіліся яшчэ ў старажытныя часы: касцюмы-маскі дзедапачынальніка, казы, каня, мядзведзя, жорава, чорта, смерці ў калядных гуртах, аформленыя наківілах акцёра-маскі ў прадстаўленнях кірмашовага тэатра, жывыя батлеі ў касцюмах-масках і інш. У цяперашні час творчыя здабыткі спадчыны нашых бацькоў і дзядоў атрымалі далейшае развіццё ў касцюмах-вобразах тэатралізаваных шэсцяў і карнавальных дзей, ляльках-кукерах у лялечных прадстаўленнях і інш.

Гісторыка-бытавыя касцюмы, насупраць, патрабуюць дэталёвай канкрэтызацыі ў адпаведнасці з эпохай, жанрам, стылем, і перш чым прыступіць да стварэння эскізаў касцюмаў, мастаку неабходна правесці стараннае вывучэнне дакументаў: музейных экспанатаў, карцін старых майстроў, літаратуры навуковай і фальклорна-этнаграфічнай, даследаванне тканін, характэрных для дадзенай эпохі.

Пры падрыхтоўцы любога свята перад арганізатарамі заўсёды паўстае праблема касцюміравання ўдзельнікаў, асабліва ў тых выпадках, калі ў праграме святкаванняў ёсць эпізоды гістарычнай, карнавальнай накіраванасці, масавыя відовішчы і прадстаўленні спартыўнага плана з выступлен-

[1] *Гл.: Художник* и зрелище: Сб.ст. – М.: Сов. художник, 1990. – С.34–35.

нямі гімнастаў і сцяганосцаў, дзе існуе неабходнасць апрануць сотні людзей.

Пачынаючы распрацоўваць праграму касцюміравання ўдзельнікаў, галоўны мастак сумесна з загадчыкамі пастановачнай часткі на аснове вывучэння зацверджанага сцэнарыя павінны дакладна высветліць наступныя пытанні:

1. Колькі чалавек трэба апрануць у кожным канкрэтным святочным дзеянні?

2. Якія канкрэтна і якога колеру касцюмы, абутак, панчохі, галаўныя ўборы патрэбны для матэрыяльнага забеспячэння святочнага дзеяння ў вызначаных мерапрыемствах?

3. Якія арганізацыі, установы, прыватныя асобы могуць садзейнічаць рашэнню пытання касцюміравання ўдзельнікаў?

У тым выпадку, калі ў аргкамітэта ёсць магчымасць пашырыць пэўную колькасць неабходных касцюмаў (гісторыкабытавыя, карнавальныя, спартыўныя, для галоўных дзеючых асоб), то галоўны мастак распрацоўвае эскізы касцюмаў для кожнага канкрэтнага персанажа і тыповыя эскізы для ўдзельнікаў масавых выступленняў і дзеянняў. "Звычайна мастак прыступае да работы над касцюмамі адразу пасля здачы эскізаў дэкарацый. Вобраз, знойдзены мастаком у эскізе, павінен задавальняць не толькі самога аўтара і быць прынятым рэжысёрам-пастаноўшчыкам, але і таго, каму гэты касцюм прызначаны, — акцёра. У працы над касцюмам мастаку прыходзіцца ўлічваць асаблівасці фігуры акцёра, яго індывідуальнасць, густы, яго асабістае бачанне дадзенага персанажа"[1].

Пры распрацоўцы эскізаў галоўны мастак павінен суадносіць на аснове кантрастнага прынцыпу колеры касцюмаў з колерамі архітэктурнага і ланшафтнага асяроддзя, дзе адбываецца дзеянне, каб яны не зліваліся, а набывалі яскравае, выразнае адценне, зручнае для ўспрымання гледачамі.

Падрыхтаваныя эскізы зацвярджаюцца галоўным рэжысёрам на агульным пасяджэнні аргкамітэта. Затым дырэктар

---

[1] *Базанов В.* Техника и технология сцены. – Л.:Искусство, 1976. – С.203–204.

або загадчык пастановачнай часткі дамаўляецца з пэўнымі арганізацыямі (майстэрнямі тэатральнага таварыства, быткамбінатамі, атэлье мод, кааператывамі і інш.) аб пашыве неабходных касцюмаў згодна выробленых эскізаў. На рахунак вызначанай арганізацыі пералічваюцца грашовыя сродкі і высвятляюцца тэрміны вырабу заказу, выкананне якіх кантралююць загадчык пастановачнай часткі і галоўны мастак.

У працэсе пашыву касцюмаў меркаванні мастака з'яўляюцца вызначальнымі. Яго прысутнасць неабходная на ўсіх этапах гэтага працэсу — ад зацвярджэння канкрэтных тканін, з якіх будуць выробляцца касцюмы, дэкаратыўных упрыгожванняў біжутэрыі і да канчатковых прымерак і прыёму касцюмаў. Напрыклад, на прымерках рашаюцца пытанні падгонкі касцюма па фігуры, адпаведнасць сілуэта эскізу і інш. На прымерках пажадана і прысутнасць касцюмераў-апранальшчыкаў, якія павінны пазнаёміцца з тэхнікай апранання касцюма, зручнасцю размяшчэння кручкоў і гузікаў, наяўнасцю з'ёмных дэталяў. Тут жа вызначаюцца размяшчэнне і спосабы мацавання ордэнаў, распазнавальных знакаў, нашывак, аксельбантаў, пагон, эпалетаў, аксамітных кашалькоў і іншых прадметаў касцюмнага рэквізіту.

У пераважнай большасці ў выніку абмежаваных матэрыяльных магчымасцей каштарыс свята не прадугледжвае выдаткаў на выраб касцюмаў. Пры гэтых абставінах пэўную частку касцюмаў, напрыклад гісторыка-бытавых, можна арэндаваць на пэўны час (звычайна 3—5 дзён) у касцюмерных прафесійных тэатраў і кінастудый.

Іншым спосабам забеспячэння касцюміравання свята можа быць запрашэнне да ўдзелу ў яго праграме тых творчых калектываў, у якіх ужо ёсць неабходныя касцюмы.

Карнавальныя касцюмы можна прапанаваць зрабіць самім удзельнікам. Для гэтага звычайна аб'яўляецца конкурс на выраб і абарону карнавальнага касцюма з выдачай пераможцам грашовых прэмій і каштоўных прызоў. У гэтым выпадку калектывам прадпрыемстваў, арганізацый, устаноў даецца

заданне аб падрыхтоўцы пэўнай колькасці карнавальных касцюмаў пэўнай тэматыкі, але многія касцюмы вырабляюць непасрэдныя ўдзельнікі карнавальных дзей з матэрыялу арганізацыі або ўласнага. Часам набыццё матэрыялаў для вырабу такіх касцюмаў прадугледжваецца ў каштарысе, а вырабляюць іх удзельнікі саматужным спосабам, што значна скарачае выдаткі агульнага каштарыса свята. Такая практыка даволі распаўсюджана, і яе вопыт мае сэнс выкарыстоўваць.

Калі ў аргкамітэта зусім адсутнічае магчымасць для пашыву або арэнды касцюмаў, то забеспячэнне імі ўдзельнікаў адбываецца на аснове падбору з запасных гардэробаў у касцюмерных клубаў, Дамоў і Палацаў культуры.

Пашытыя, арандаваныя або падабраныя ў гардэробах культасветустаноў касцюмы мэтазгодна перадаць у цэнтральную касцюмерную свята, якую неабходна стварыць пры пэўнай установе ці арганізацыі. Касцюмеры-апранальшчыкі забяспечваюць іх захаванасць і належны выгляд. У мэтах захавання касцюма месцы, якія найбольш часта забруджваюцца ад грыму, трэба падшыць белымі стужкамі тканіны. Каб пазбегнуць блытаніны, а таксама для зручнасці работы на ўсіх састаўных частках касцюма неабходна напісаць прозвішча выканаўца.

Наступны этап работы, які ажыццяўляецца памочнікамі рэжысёра пад кіраўніцтвам галоўнага мастака, — распрацоўка для касцюмераў выпіскі на касцюмы, абутак і галаўныя ўборы ўдзельнікаў свята. Гэтая выпіска адлюстроўвае назву свята, дзеючых асоб выканаўцаў, а таксама назвы і колеры касцюмаў, абутку і галаўных убораў, якія будуць атрымліваць удзельнікі свята. Распрацаваная выпіска зацвярджаецца галоўным рэжысёрам свята.

*Узор выпіскі*

*Касцюмы, абутак і галаўныя уборы для навагодняга свята*

| № п/п | Дзеючыя асобы і выканаўцы | Касцюм і яго памер | | Абутак і яго памер | | Галаўны убор і яго памер | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Дзед Мароз —М.П. | Кажух белы<br>Пояс чырвоны<br>Кашуля<br>Штаны белыя | 58/4<br><br>58/4<br>58/4 | Валенкі белыя | 43 | Шапка белага колеру | 57 |

Касцюмы ўдзельнікам выдаюцца ў арганізаваным парадку, за некалькі дзён да правядзення свята. Гэта неабходна дзеля таго, каб удзельнік мог "абжыць" касцюм, выпрацаваць стыль паводзін, дыктуемы касцюмам, набыць у ім адпаведнае творчае самаадчуванне. Асабліва гэта датычыцца гісторыка-бытавых, карнавальных і нацыянальных строяў. Да таго ж, калі касцюм бярэцца напракат або падбіраецца ў касцюмерных Палацаў культуры, удзельнік мае магчымасць падагнаць яго на сябе, зрабіць дробны рамонт, памыць, адпрасаваць. Атрымліваючы касцюм, удзельнік свята павінен даць касцюмеру распіску, у якой абавязваецца зберагчы яго і здаць у вызначаныя тэрміны ў касцюмерную, або здаць пашпарт ці іншы дакумент.

Напярэдадні свята, звычайна перад генеральнай рэпетыцыяй, у спецыяльна вызначаны час галоўны рэжысёр, мастак і касцюмеры праводзяць прагляд касцюмаў. Звычайна прагляды арганізоўваюць на канкрэтным месцы святочнага дзеяння (стадыён, плошча, парк і да т.п.). Пажадана, каб выканаўцы розных роляў на праглядах касцюмаў паказваліся не паасобку, а групамі. Справа ў тым, што асобны касцюм ва ўмовах архітэктурнага або ландшафтнага асяроддзя, паказаны самастойна, глядзіцца інакш, чым у агульным ансамблі. У групавым паказе найбольш вылучаюцца каларыстычныя адносіны

паміж касцюмамі, дэкарацыямі і асвятленнем. На агульным фоне якая-небудзь дэталь аднаго касцюма можа выглядаць надта назойлівай і засяроджваць увагу гледачоў, перашкаджаючы агульнаму ўспрыманню дзеі, або губляцца і не адлюстроўваць задачу мастака.

У выніку прагляду адзначаюцца недахопы касцюміравання, удзельнікам і касцюмерам робяцца заўвагі, на аснове якіх здзяйсняецца замена ці пераробка касцюмаў.

У час правядзення свята касцюмеры павінны быць у спецыяльна вызначаным месцы, каб у экстрэмальных сітуацыях прыйсці на дапамогу ўдзельнікам свята: зрабіць дробны бягучы рамонт касцюмаў, адпрасаваць іх, памагчы апрануцца і інш.

Вельмі важна прасачыць, каб адразу пасля завяршэння святочнага дзеяння выканаўцы здалі касцюмы (асабліва арэндаваныя ў іншых арганізацыях) у цэнтральную касцюмерную свята або непасрэдна касцюмеру на месцы святочнага дзеяння ў спецыяльна вызначаным для гэтай мэты памяшканні.

Практыка паказвае, што гэты працэс, з прычыны абыякавасці ўдзельнікаў ці непрадугледжанасці з боку арганізатараў, часта зацягваецца на доўгія тэрміны. У выніку арганізатары не маюць магчымасці своечасова здаць касцюмы ў арэндную арганізацыю і вымушаны несці дадатковыя страты за лішнія дні арэнды, што значна павялічвае агульны каштарыс свята.

Вырашэнне пытанняў здачы касцюмаў ускладаецца на памочніка або асістэнта рэжысёра і касцюмераў.

## Рэквізіт, бутафорыя, мэбля

Рэквізіт, бутафорыя, мэбля з'яўляюцца важнымі выразнымі сродкамі мастацка-дэкаратыўнага афармлення свята. Яны выкарыстоўваюцца ў разнастайных сцэнічных дзеях, спартыўных, гульнёвых і конкурсных праграмах, асобных атракцыёнах і гульнях. У тэатралізаваных шэсцях, прад-

стаўленнях і канцэртах рэквізіт, бутафорыя і мэбля дапамагаюць стварыць вобраз эпохі, удакладніць прыметы месца дзеяння, вылучыць асобныя рысы характару дзеючых асоб.

Слова «рэквізіт» паходзіць ад лацінскага requisitum, што азначае — "патрэбнае, неабходнае". Рэквізіт — гэта сукупнасць абсталявання і рэчаў, неабходных выканаўцам па ходу дзеяння. Часам рэквізіт з'яўляецца дапаўненнем да сцэнічнага касцюма (парасоны, кійкі, партфелі, упрыгожванні і інш.).

*Рэквізіт* падзяляецца на зыходны, жывы, касцюмны, асабісты і каштоўны.

Зыходным рэквізітам, гэта значыць рэквізітам, які ўжываюць або знішчаюць па ходу дзеяння, называюць ежу, напоі, тытунь, кветкі і інш.

У жывы рэквізіт уваходзяць жывёлы, птушкі, якія ўдзельнічаюць у свяце.

Да касцюмнага рэквізіту адносяцца аксэсуары касцюма (завушніцы, гадзіннікі, пацеркі, кольцы, парыкі і інш.).

Асабістым рэквізітам называюць прадметы, якія належаць выканаўцу.

Каштоўны рэквізіт — прадметы, выробленыя з каштоўных матэрыялаў, сапраўдныя аксэсуары якой-небудзь эпохі, прадметы, якія маюць мастацкую каштоўнасць.

*Бутафорыя* — несапраўдныя прадметы (скульптура, посуд, мэбля, дэталі касцюма і інш.), што ўжываюцца ў святах, тэатралізаваных прадстаўленнях, спартыўных і гульнёвых праграмах замест сапраўдных рэчаў. Электрычная бутафорыя — гэта прадметы бутафорыі, якія ўяўляюць сабой асвятляльную арматуру светлавых і святлоэфектыўных прыбораў (люстры, лямпачкі, вогнішчы, свечкі і інш.). Механічная бутафорыя — гэта прадметы, якія маюць механізм, што прыводзіць іх у рух.

Адказнасць за падрыхтоўку рэквізіту, бутафорыі і мэблі і іх выкарыстанне ў час свята ўскладаецца на спецыяльна вылучаных асоб — рэквізітараў, якія працуюць пад непасрэд-

ным кіраўніцтвам загадчыка пастановачнай часткі або дырэктара свята. У тых выпадках, калі ў каштарысе свята не прадугледжана аплата рэквізітара або няма такой магчымасці па розных прычынах, яго абавязкі ўскладаюцца на касцюмераў, асістэнтаў рэжысёраў, у спартыўных дзеях — на трэнераў або кіраўнікоў спартыўных калектываў.

Работа над падрыхтоўкай рэквізіту, бутафорыі і мэблі пачынаецца пасля канчатковага зацвярджэння сцэнарыя свята.

На пачатковым этапе асістэнты рэжысёраў асобных эпізодаў, зон дзеяння або фрагментаў на падставе аналізу сцэнарнай асновы робяць пералік рэчаў, якія будуць ужывацца ў свяце. Пры неабходнасці да гэтай работы далучаецца мастак, які распрацоўвае эскізы, чарцяжы і тэхналагічнае апісанне прадметаў рэквізіту, бутафорыі, мэблі.

Складзеная з пералікаў асобных зон дзеяння агульная выпіска на рэквізіт, бутафорыю і мэблю (з абавязковым падзелам па эпізодах ці зонах) зацвярджаецца галоўным рэжысёрам і перадаецца загадчыку пастановачнай часткі або дырэктару. Такая выпіска складаецца з некалькіх граф. У першай адзначаецца месца дзеі; у другой — персанажы і іх выканаўцы або назвы асобных калектываў; у трэцяй запісваюць рэчы, якія павінны быць на пляцоўцы дзеяння; у чацвёртай — рэчы, якія нарыхтоўваюць за межамі пляцоўкі або за кулісамі; у пятай — рэчы, якія выдаюць выканаўцам на рукі.

Усе пытанні, звязаныя з набыццём, арэндай, вырабам неабходных рэчаў, іх дастаўкай на рэпетыцыі і на святочныя дзеянні, а таксама са зборам пасля завяршэння свята, вырашаюцца на нарадах мастацка-пастановачнай часткі з удзелам мастака, рэжысёраў адпаведных дзей або іх асістэнтаў, а таксама загадчыка пастановачнай часткі.

На першым пасяджэнні мастацка-пастановачнай часткі вельмі важна вырашыць формы забеспячэння ўдзельнікаў свята неабходным рэквізітам, бутафорыяй, мэбляй, гэта значыць тым, што трэба набыць у магазіне ці арандаваць у адпаведных арганізацый, што вырабіць на мясцовых прадпрыем-

ствах і на якіх канкрэтна, што падабраць у касцюмерных або рэквізітарскіх цэхах мясцовых Палацаў культуры ці тэатрах, што можна падрыхтаваць сіламі саміх удзельнікаў той ці іншай святочнай дзеі. Гэтыя ўдакладненні неабходна зрабіць да складання канчатковага каштарыса свята, каб потым не ўзнікла цяжкасцей пры выкананні гэтага віду работ.

На гэтым жа пасяджэнні трэба высветліць, як працуюць рэчы ў свяце, напрыклад, якім чынам падымаецца і апускаецца крэсла лесавіка, як з'яўляюцца прадукты на чароўным абрусе, ці высоўваюцца шуфляды ў стале Кашчэя Бессмяротнага, а калі высоўваюцца, то якім чынам, і інш. Разглядаючы спартыўныя выступленні, трэба ўдакладніць, на аснове якога прынцыпу будзе адбывацца трансфармацыя прадметаў: парасоны або булавы ператвараюцца ў букеты кветак, шасты і палкі — у вялікія сцягі, абручы — у вымпелы, гімнастычныя лаўкі — у лёгкія металічныя лесвіцы і да т.п. Гэтыя даведкі неабходны не толькі для вытворчасці, але і для вызначэння кошту, таму што асаблівасці канструкцыі і тэхналогіі вырабу ўплываюць на затрату працы і колькасць матэрыялаў.

Пасля першых нарад складаецца каштарыс на набыццё, арэнду і выраб неабходнага рэквізіту, бутафорыі і мэблі, які перадаецца ў бухгалтэрыю свята.

У аргкамітэт свята дырэктар падае спіс арганізацый, якія могуць вырашыць пастаўленыя пытанні, дзе і размяшчаецца заказ пасля зацвярджэння каштарыса. Выраб, арэнда ці падбор і набыццё неабходных прадметаў адбываюцца пад кантролем загадчыка пастановачнай часткі або дырэктара свята. Падабраныя рэчы паказваюць рэжысёру і мастаку, якія выяўляюць, ці можна іх выкарыстоўваць у прадстаўленым выглядзе, што патрабуецца перарабіць або адрамантаваць.

Для абслугоўвання рэпетыцыйнага працэсу рэквізітар рыхтуецца загадзя, падбірае ўмоўны рэквізіт і ўмоўную мэблю. На гэтай стадыі падрыхтоўкі свята няма патрэбы ў выкарыстанні сапраўдных прадметаў, таму што яны ў час рэпетыцый могуць сапсавацца або страціць свой вонкавы выгляд ці тэх-

нічныя якасці. Таму, напрыклад, пры рэпетыцыях спартыўных фрагментаў сцяганосцам замест сцягаў выдаюцца толькі шасты; гімнасткам, якія выступаюць з гірляндамі, — дротавую аснову гірлянды. Што датычыцца сцэнічных баявых паядынкаў, то тут замест мячоў, шабляў і кінжалаў удзельнікі атрымліваюць адпаведныя сапраўдным прадметам драўляныя вырабы — палкі, дубіны і інш. У той жа час мэбля, якая выкарыстоўваецца на рэпетыцыях, павінна максімальна паходзіць на тую, што будзе на сцэне. Справа ў тым, што ў працэсе рэпетыцый акцёры прывыкаюць да формаў і памераў абыгрываемых імі прадметаў. І часта, прапрацаваўшы пэўны час з крэслам ці сталом, акцёр ужо не можа выкарыстоўваць іншую, спецыяльна выробленую мэблю. Яна раздражняе яго, выбівае са знойдзенага вобраза, парушае творчае самаадчуванне, здаецца нязручнай. Нярэдка акцёры і рэжысёры адмаўляюцца ад якіх-небудзь прадметаў у карысць тых, з якімі яны рэпеціравалі.

Да пачатку рэпетыцый рэквізітару трэба высветліць, якім транспартам неабходныя рэчы будуць дастаўлены на рэпетыцыі і пасля іх заканчэння — да месца іх захоўвання, а таксама, хто будзе займацца пагрузачнымі работамі.

Непасрэдна на рэпетыцыі трэба наладзіць цэнтралізаваную выдачу ўдзельнікам неабходных прадметаў. Адначасова неабходна ўлічваць, што гэты працэс кожны раз павінен адбывацца ў адным і тым жа месцы — там, дзе будзе знаходзіцца рэквізітарскі пункт непасрэдна на сцэне. Пасля кожнай рэпетыцыі выканаўцам (асабліва ўдзельнікам спартыўных выступленняў — гімнасткам, сцяганосцам) трэба абавязкова напамінаць аб здачы выкарыстанага на рэпетыцыі рэквізіту, бутафорыі. Часта здараецца так, што пастаноўшчыкі і кіраўнікі калектываў не надаюць належнай увагі гэтаму арганізацыйнаму моманту, і таму некаторыя ўдзельнікі забываюць свой рэквізіт. У выніку губляецца частка гірляндаў, шастоў, мячоў, парасонаў, жэрдак, кветак і арганізатары вымушаны шукаць дадатковыя сродкі для іх набыцця, што вы-

клікае незапланаваныя выдаткі і павялічвае агульны кошт свята. Таму пасля заканчэння рэпетыцыі трэба на некалькі хвілін затрымаць удзельнікаў, каб яны пад кіраўніцтвам трэнераў, настаўнікаў, асістэнтаў рэжысёраў здалі рэпетыцыйны рэквізіт.

На рэквізітара ўскладаюцца таксама абавязкі па дагляду жывёл і птушак, неабходных па ходу дзеі. Гэта работа ажыццяўляецца ім у садружнасці з трэнерамі спартыўных школ, прадстаўнікамі адпаведных аматарскіх аб'яднанняў і прыватнымі асобамі, запрошанымі да ўдзелу ў свяце. Колькасць прызначаемых рэпетыцый з жывёламі і птушкамі ў кожным канкрэтным свяце вызначаецца па-рознаму. Напрыклад, для конных груп, якія выконваюць нескладаныя дзеі, дастаткова двух—трох рэпетыцый, звычайна прагонных, і генеральнай. Для правядзення паказальных выступленняў коннікаў спачатку трэба наладзіць спецыяльныя рэпетыцыі, а затым ужо падрыхтаваны нумар праглядзець на прагонных рэпетыцыях або на генеральнай. Пры ўвядзенні ў структуру прадстаўленняў выступлення дрэсіраваных птушак і жывёл (мядзведзяў, малпаў, сабак, кошак і інш.) на рэпетыцыю можна запрасіць толькі іх гаспадароў, якім растлумачыць усе аспекты іх дзеяння, паказаць месцы выхаду, выступлення, эвакуацыі, а затым пад адпаведную фанаграму правесці прагон гэтых нумароў з удзелам гаспадароў птушак і жывёл. Запуск у паветра галубоў і іншых птушак трэба ажыццяўляць непасрэдна на свяце, растлумачыўшы іх гаспадарам на рэпетыцыі толькі характар дзеяння, яго месца і час. У гэтым выпадку непасрэдна на свяце запуск птушак у паветра з вызначанага месца і ў прызначаны час павінен пракантраляваць асістэнт рэжысёра, спецыяльна замацаваны за гэтым фрагментам святочнага дзеяння.

Арганізатарам неабходна ўлічваць, што да ўдзелу ў свяце дапускаюцца толькі тыя жывёлы і птушкі, якія знаходзяцца пад ветэрынарным кантролем, адпаведным чынам выдрэсіраваны і падрыхтаваны да дзеяння.

На рэпетыцыях, як і на свяце, для жывёл і птушак трэба адвесці асобнае месца, якое павінна знаходзіцца ў зоне іх дзеяння непасрэдна на свяце. Пры гэтым дзеля пазбягання розных непаразуменняў ні ў якім разе не трэба размяшчаць побач без шчыльнай агарожы сабак і кошак, кошак і птушак, нестэрылізаваных разнаполых жывёл і інш.

Жывёл перад пачаткам выступлення трэба непрацяглы час патрымаць на галодным пайку або даць узмоцненую фізічную нагрузку («абагнаць»), каб яны маглі апаражніць свае страўнікі. Гэта неабходна для таго, каб у час святочнага дзеяння ўсё тое, што змяшчаецца ў іх страўніках, жывёлы ў выніку ўзбуджанага стану не апаражнілі на пляцоўку. Такія выпадкі на свяце заўсёды выклікаюць незапланаваную рэакцыю гледачоў, што адмоўна адбіваецца на агульным ўспрыманні дзеі і часта перашкаджае яе далейшаму правядзенню, асабліва, калі пасля жывёл выступаюць харэаграфічныя і пластычныя групы, спартыўныя калектывы. Але калі ўсё ж такі на свяце такое “дзеянне” жывёл адбылося, арганізатарам на гэты выпадак трэба прадугледзець падрыхтоўку спецыяльных прыбіральшчыкаў з мятлой і рыдлёўкай, якія хутка выправяць казуснае здарэнне.

У склад рэквізіту, які падаецца на пляцоўку дзеяння або акцёрам на рукі, часам уваходзяць ежа, напоі, цыгарэты, посуд, папера, паветраныя шары і іншыя рэчы, якія ўжываюць або знішчаюць па ходзе дзеяння. Гэты рэквізіт, які называюць зыходным, павінен фінансавацца з каштарыса свята. У тым выпадку, калі поўнасцю фінансаваць гэты артыкул выдаткаў не ўяўляецца магчымым, частку рэквізіту, напрыклад паперу, цыгарэты, можна прапанаваць удзельнікам выкарыстаць з асабістых запасаў.

Зыходны рэквізіт падаецца выканаўцам у дзень свята. Пры гэтым неабходна ўлічваць, што паветраныя шары, метэаралагічныя зонды, лялькі на аснове шароў рэкамендуецца надзьмуць непасрэдна перад пачаткам свята літаральна за паўгадзіны—гадзіну да пачатку дзеяння. У адваротным вы-

падку яны могуць раней тэрміну здзьмухнуць, згубіць сілу пад'ёму і не ўзляцець у паветра. Ежа, пітво і іншае падаюцца выканаўцам непасрэдна ў час святочнага дзеяння або за некалькі хвілін да пачатку таго ці іншага фрагмента.

Увесь рэквізіт, акрамя зыходнага, а таксама бутафорыю неабходна выдаваць пад распіскі кіраўнікоў груп тэатралізацыі або асобных выканаўцаў. У гэтых распісках удзельнікі павінны пералічыць атрыманыя рэквізіт і бутафорыю і даць абавязацельствы аб вяртанні іх у вызначаны тэрмін (звычайна адразу пасля заканчэння свята). За своечасовай здачай рэквізіту павінны прасачыць асістэнты рэжысёра.

Пасля заканчэння свята галоўны рэжысёр, дырэктар свята, бухгалтар і рэквізітар складаюць акт спісання зыходнага рэквізіту, які быў выкарыстаны або знішчаны ў час правядзення святочных дзеянняў. Акт спісання рэквізіту зацвярджаецца старшынёй аргкамітэта.

*Узор акта на спісанне рэквізіту*

Зацвярджаю
Старшыня аргкамітэта
свята "Калядныя зоркі"
___________(прозвішча, імя, імя па бацьку)
(дата і подпіс)

*Акт*

Мы, дырэктар свята______________________________________, галоўны рэжысёр__________________, бухгалтар__________________ і рэквізітар__________________, склалі акт, у якім пацвярджаецца, што 7 студзеня 2003 г. на свяце "Калядныя зоркі" ў час правядзення святочных дзеянняў быў выкарыстаны і знішчаны наступны рэквізіт:

1.____________________________________________
(назва рэчы)

2.____________________________________________
(назва рэчы)

і г.д.

Усе пералічаныя рэчы належаць спісанню, аб чым і складзены гэты акт.

Прозвішчы, імя, імя па бацьку Подпісы
Дата

## Маскі і лялькі ў святочных дзеяннях

Лялька — традыцыйны сродак святочнай культуры многіх народаў свету, у тым ліку беларусаў. Яшчэ ў старажытныя часы лялькі ў якасці сімвалічных персанажаў удзельнічалі ў беларускіх народных святах каляндарнага цыкла. Так, на Каляды або ў Шчодры вечар сярод персанажаў каляднага гурту абавязковымі ўдзельнікамі былі лялькі — сімвалы ўрадлівасці: "каза" з рухомай сківіцай, "конь", "мядзведзь", "журавель", бытавы персанаж — лялька Сідорка сярод ражаных цыганоў; ва ўсходніх раёнах Беларусі на Масленіцу праводзілі рытуал спальвання лялькі-масленіцы, а на Купалле — абрад патаплення або спальвання сімвала смерці і холаду — лялькі Марэны, Марухі, Мары.

Лялькі ўсіх народаў на розных этапах свайго існавання ў старажытныя часы з'яўляліся сімвалічным адлюстраваннем пэўных паняццяў — дабра, зла, смеласці, ляноты, грубасці, прагнасці, яны сутыкаліся ў містэрыяльных лялечных прадстаўленнях, у іх дзеяннях заўсёды завастраліся міфалагічныя і жыццёвыя сітуацыі, што прыцягвала ўвагу гледачоў.

На сучасным этапе лялькі малых памераў і буйнагабарытныя лялькі шырока выкарыстоўваюцца ў святах. Назапашаны вопыт святочнай культуры народаў сусвету пераканаўча даказвае, што стварэнне лялькі — гэта складаны працэс, які патрабуе з самага пачатку высвятлення, асэнсавання і вырашэння разнастайных пытанняў творчага і тэхнічнага характару ва ўзаемасувязі.

Мастацкі вобраз лялькі заўсёды абумоўлены тэмай свята. Напрыклад, сімвалам Алімпіяды — 80 у Маскве стала медзведзяня. Таму, калі на свяце ўрачыстага закрыцця Алімпійскіх гульняў у фінале на поле стадыёна ў Лужніках выйшаў васьміметровы алімпійскі Мішка, гледачы былі вельмі ўражаны і сустрэлі яго воплескамі, а калі на рознакаляровых паветраных шарах ён паляцеў у неба, тысячы гледачоў уціралі слёзы, бо яны развіталіся не з медзведзянём, а ў

яго вобразе з самой Алімпіядай. Пры распрацоўцы мастацкага вобраза карнавалу ў г.Геленджык (Краснадарскі край) мастак А.В.Стрэльнікаў стварыў буйнагабарытную лялькуканструкцыю пад назвай "Смехар", вакол якой на стадыёне і будаваліся мізансцэны карнавальнага прадстаўлення. Гэты вялізны Смехар сустракаў людзей на стадыёне. Яго галава ў доктарскай шапачцы паварочвалася то ўправа, то ўлева, вочы падміргвалі, а рукі спрабавалі абняць усіх.

Мастак і інжынер прыдумалі для гэтай лялькі наступнае тэхнічнае рашэнне: галава лялькі была зманціравана на машыне з тэлескапічнай вышкай, рукі — на дзвюх машынах тыпу "механічная рука"; адзенне лялькі з улікам ветравой нагрузкі была зроблена са старых рыбацкіх сетак, пафарбаваных у розныя колеры. Гэта лялька стала заднікам сцэны, фонам для выступаючых, а таксама месцам, за якім пераапраналіся і канцэнтраваліся калектывы.

На свяце народных рамёстваў у г.п.Воранава Гродзенскай вобласці вобраз гаспадыні свята быў створаны пры дапамозе шасціметровай лялькі ў беларускім нацыянальным строі. У аснове гэтай канструкцыі быў драўляны слуп. Наверсе слупа, закапанага ў зямлю, быў замацаваны размалёваны пад твар дзяўчыны метровы ў дыяметры шар. У тканінах, што вядуць да рук, былі ўсталяваны двухметровыя жэрдкі, кожную з якіх рухалі па два чалавекі. У роце лялькі, які адкрываўся і зачыняўся, уманціравалі гучнагаварыцель, а ўнутры канструкцыі размясцілі радыёапаратуру. Нацыянальны строй лялькі вырабляўся з палатна, размаляванага беларускімі нацыянальнымі ўзорамі. Калі неабходна было прачытаць дыктарскі тэкст або ўключыць песню ў сольным выкананні ці зрабіць пэўную фізічную дзею, лялька пачынала гаварыць, спяваць, рабіць прывітальныя рухі рукой або магла пацiснуць руку камусьці з удзельнікаў, што стварала ўражвальны эфект. У тым жа Воранаве на адкрытым абласным свяце гульні "Карнавал весялосці" (2003) васьміметровая лялька ў беларускім нацыянальным строі, змайстраваная на аснове

аўтавышкі, з'яўлялася заднікам і дамінантай усяго святочнага дзеяння. Яна падымалася і апускалася, як бы танцуючы, і выклікала станоўчыя эмоцыі і адпаведную рэакцыю гледачоў.

Практыка паказвае, што стварэнне лялькі-сцэны — гэта адзін з перспектыўных напрамкаў асваення прасторы святочнага дзеяння.

Пры распрацоўцы буйнагабарытных лялек мастак абавязкова павінен улічваць асяроддзе, у якім лялька будзе дзейнічаць. З гэтага пункту гледжання цікавым прыкладам можа служыць лялька "Стары парк", якую распрацаваў мастак В.Фанштэйн для карнавалу будаўнікоў у парку "Сакольнікі" (г.Масква). Дзея адбывалася на плошчы, якую акружалі дрэвы. Сярод іх была старая ліпа вышынёй каля пятнаццаці метраў. Над ёй замацавалі трохметровы ў дыяметры паветраны шар, распісаны фарбамі як галава "Старога парку". З зялёнай тканіны былі зроблены галава і рукі парку. Рукі цягнуліся да далоняў — зялёных галін, прымацаваных да дзвюх дзесяціметровых жэрдак, кожную з якіх рухалі па тры чалавекі. Так старая ліпа была пераўтворана ў ляльку-вобраз старога парку "Сакольнікі", здольную гаварыць і жэстыкуляваць.

Вызначаючы форму і памеры буйнагабарытнай лялькі, мастак павінен улічваць ландшафтныя і архітэктурныя асаблівасці месца дзеі. Адна і тая ж канструкцыя ў розных умовах можа ўзмацніць або аслабіць успрыманне дзеі. Напрыклад, лялька-гаспадыня кірмашу на свяце "Мінск—87", пастаўленая на вялікай вольнай прасторы (каля Палаца спорту на праспекце імя П.Машэрава), была дамінантай мастацкага афармлення і глядзелася вельмі добра, прываблівала людзей. Усё гэта адбылося таму, што памеры лялькі былі суаднесены з памерамі асяроддзя. Але тая ж лялька, механічна перанесеная ў г.Светлагорск і пастаўленая на свяце горада (1989), у сціслай прасторы мясцовай плошчы на фоне двухпавярховага будынка выглядала недарэчна. Яна з'яўлялася лішнім элементам святочнага дэкору. Гэты прыклад пацвярджае, што

разлік суадносін памераў лялькі і памераў асяроддзя мае важнае значэнне.

Пошук і адбор матэрыялаў, з якіх лялька будзе выраблягца, адбываюцца ў кожным канкрэтным выпадку па-свойму. Але адным з асноўных крытэрыяў адбору, асабліва пры стварэнні дзеючай лялькі, з'яўляецца вага матэрыялу. Практыка паказвае, што цяжкавагавыя матэрыялы непрымальныя для ўжытку, таму што, па-першае, акцёрам цяжка працаваць у ляльках вялікай вагі, а па-другое, скарыстанне такіх матэрыялаў можа значна павялічыць кошт лялькі, што немалаважна пры складанні агульнага каштарыса свята. Многія мастакі рэкамендуюць рабіць пэўныя канструкцыі буйнагабарытных лялек на дротавай аснове. Прыкладам з'яўляецца "гідра контррэвалюцыі", зробленая ў г.Варонежы ў 1927 г. мастаком Фачыёлі для масавага карнавальнага прадстаўлення "Спальванне гідры контррэвалюцыі". Уся канструкцыя лялькі была размешчана на шаснаццаці грузавіках. "Гідра" мела шэсцьдзесят метраў у даўжыню, восем у шырыню і шэсць метраў у вышыню. Касцяк уяўляў дротавы каркас, абшыты рагожай, пафарбаванай у зялёны колер. Хвост быў зроблены з пружыністага дроту і таму завіваўся і дрыжэў. "Гідра" мела тры велізарныя галавы з зялёнымі вачыма, якія свяціліся і бесперапынна то адчыняліся, то зачыняліся[1].

Пры распрацоўцы дынамічнай буйнагабарытнай лялькі заўсёды неабходна загадзя вызначыць або вынайсці спосабы яе руху. Напрыклад, у час падрыхтоўкі XII Сусветнага фестывалю моладзі і студэнтаў у Маскве перад мастаком была пастаўлена задача зрабіць праект лялек-клоунаў вышынёй з пяціпавярховы дом, якія б хадзілі. У выніку творча-тэхнічнай распрацоўкі створаны лялькі, асновай якіх сталі надзьмутыя, запоўненыя геліем шары, адзін з якіх быў тварам лялькі, а другі — целам, апранутым у адпаведны касцюм. Ступнямі

---

[1] *Гл.: Малюченко Г.С.* Первые театральные опыты новой эпохи // У истоков: Сб.ст. – М.: [Б.и.], 1960. – С. 277–280.

ног лялькі сталі электракары, якімі кіравалі вадзіцелі. У Ізмайлаўскім парку (г.Масква) у навагоднім прадстаўленні "Неверагодныя прыгоды з краіны Веліканії" выходзіла лялька-велікан пяціметровай вышыні. Тэхнічнае рашэнне гэтай лялькі патрабавала інжынернага разліку, таму што корпус з галавой і рукамі павінен быў трымацца на "пераступаючых" нагах. Спатрэбіўся разлік пружын, моцы шарніраў і інш. Ляльку гэту вялі пяць чалавек, па чалавеку на кожную нагу і па аднаму — на кожную руку. Чалавек за спіной лялькі вёў трохкалёсную карэтку, якая падтрымлівала корпус, ён жа з дапамогай шаста кіраваў галавой. Лялька вельмі ўражвала маленькіх гледачоў: велікан хадзіў (адзін крок быў роўны шасці крокам чалавека), рухаў галавой, гаварыў"[1].

Тэхнічныя сродкі пры стварэнні буйнагабарытнай лялькі могуць быць самыя разнастайныя ў залежнасці ад зададзеных канкрэтных умоў.

На навагодніх святкаваннях у г.Хойнікі Гомельскай вобласці адной з дзеючых асоб стала дзесяціметровая Шчодра, спрадвечны персанаж беларускіх каляд, якая была зманціравана на аўтавышцы. Галавой Шчодры быў трохметровы ў дыяметры шар, які замацоўваўся над люлькай вышкі, аформленай пад каўнер лялькі. Яе рукамі былі два канаты, абцягнутыя бела-шэрай тканінай, такой жа, як і кажушок Шчодры — сама аўтавышка. Далоні лялькі былі выпілаваны з фанеры. Двое выканаўцаў пры дапамозе шастоў рухалі рукамі ў розных напрамках, а акцёр, які сядзеў у люльцы аўтавышкі, рухаў галавой лялькі. Акрамя таго, мантаж лялькі на аўтавышцы дазваляў ёй падымацца і апускацца.

У выніку такога арыгінальнага тэхнічнага рашэння значна павялічыліся магчымасці фізічных дзеянняў лялькі, і Шчодра магла вярцець галавой, падміргваць, гаварыць, апускацца і падаваць руку гледачам, што аказвала вялікае эмацыянальнае ўздзеянне.

---

[1] *Гл.: Фонштейн В.* Куклы театрализованного представления // Художник и зрелище: Сб. ст. – М.: Сов. художник, 1990. – С.44.

Цікавыя спосабы тэхнічнага рашэння буйной лялькі знойдзены ў г.Мінску. Так, на свяце горада “Мінск—87” у карнавальным шэсці ўдзельнічаў Змей-Гарыныч. Канструкцыя гэтай лялькі была пабудавана на аснове пажарнай машыны, на кабіне якой знаходзіліся тры галавы “змея”, а на кузаве — тулава. Пасткі галоў “змея” расчыняліся, і гэта дало магчымасць акцёрам, якія былі схаваны ў тулаве, зрабіць “змея” вогнедыхаючым: выканаўцы пры дапамозе дымавых шашак і вентылятараў выпускалі з пастак дым, а пры дапамозе лямпы-фарсункі — агонь.

Адной з каларытных буйных лялек на свяце “Мінск—88” быў “вадзяны жук”, тэхнічнае рашэнне якога вельмі простае: на машыну-палівалку замацавалі каркас, тканіны якога былі размаляваны ў адпаведны тон. Галава “жука” ляжала на кабіне машыны, і акцёр, схаваны ў “тулаве”, варочаў “вачыма” лялькі ў розныя бакі. Калі “жук” выходзіў на бегавую дарожку стадыёна, у загадзя вызначаныя моманты з-пад яго ляцелі струмені вады. У гэты час шафёр, мяняючы ціск у сістэме падачы вады, накіроўваў струмені на розныя адлегласці. Вада ляцела прама на гледачоў. І ў вясёлай, радаснай атмасферы карнавалу дзеянні-жарты “жука” выклікалі вялікае ажыўленне на трыбунах стадыёна, а гледачы на гэтае своеасаблівае віншаванне, жартоўнае “асвячэнне” вадой не крыўдзіліся, а, наадварот, смяяліся, добразычліва ўспрымаючы нечаканы жарт, дружна апладзіравалі цікавай, творчай знаходцы рэжысёра і мастака.

На сучасных святах не толькі буйныя, але і лялькі меншых памераў, распрацаваныя творцамі з вялікай фантазіяй, набываюць разнастайныя якасці: яны могуць тузацца, адкрываць рот, вярцець вачыма, рухаць вушамі і языком, надзімацца прама на вачах у захопленых гледачоў і, калі гэта неабходна, узрывацца, выкідваючы пры гэтым клубы дыму, дождж канфеці, серпанцін, нават прывітальныя лістоўкі.

Такім чынам, практыка прымянення ў святах лялек выяўляе паслядоўнасць этапаў работы:

— тэматычную накіраванасць лялькі і яе вобразнае рашэнне;
— асяроддзе, у якім лялька будзе дзейнічаць;
— форму і памеры лялькі;
— матэрыял, з якога лялька вырабляецца;
— спосаб дзеяння лялькі;
— інжынерныя разлікі канструкцыі;
— тэхналогію вырабу лялькі.

Стварэнне лялькі — гэта складаны працэс, які патрабуе ад мастака і інжынера фантазіі, выдумкі, кемлівасці, вызначэння спосабаў яе дынамічнага дзеяння, прыдумвання розных нечаканых эфектаў. Умелае спалучэнне традыцый і наватарства, зварот да новых выразных прыёмаў дзеяння і яго тэхнічнае забеспячэнне дадуць магчымасць пры дапамозе лялькі пераўтварыць святочнае асяроддзе, адыграць вялікую ролю ў актыўным уздзеянні на эмоцыі і розум тысяч людзей, аказаць на іх выхаваўчы ўплыў.

## Пастановачнае асвятленне свята

Мастацкае асвятленне свята — адзін з важнейшых кампанентаў у сістэме выразных сродкаў, які непасрэдна звязаны з выяўленчым адлюстраваннем ідэйна-тэматычнай задумы пастаноўкі.

У сучасных прадстаўленнях і святах на адкрытым паветры знаходзяць шырокае прымяненне розныя віды святлотэхнічнага абсталявання: пражэктары, праекцыйныя апараты статычнага і дынамічнага, мона- і поліэкраннага дзеяння з выкарыстаннем слайдаў, відэа- і кінастужкі, каляровамузычнага жывапісу, лазернай тэхнікі, а таксама розных піратэхнічных і светлавых эфектаў.

Сістэма пастановачнага асвятлення любой сцэнічнай пляцоўкі на свяце павінна ўключаць унутрысцэнічнае і вынасное абсталяванне.

Святлотэхнічнае абсталяванне ўнутранай сцэнічнай дзеі павінна забяспечыць верхняе асвятленне (пражэктары, пра-

екцыйныя прыборы, ультрафіялетавыя апраманяльнікі); бакавое асвятленне за кошт размяшчэння прыбораў на рознай вышыні ў партальных (бакавых) зонах злева і справа; ніжняе асвятленне (гарызантальная рампа), якое ўсталёўваецца на планшэце сцэны. У групу вынаснога святлотэхнічнага абсталявання, размешчанага за межамі сцэны, у глядзельнай зале, уваходзяць прыборы верхняга і бакавога асвятлення, якія трэба замацаваць на спецыяльных стойках рознай вышыні або на зманціраваных асвятляльных устаноўках; прыборы франтальнага або лабавога асвятлення (апаратура размяшчаецца за межамі глядзельнай залы). Прыборы праекцый на прасвет рэкамендуецца манціраваць за задняй часткай ар'ерсцэны.

Часам на святах для пастановачнага асвятлення сцэны ў якасці агульнага франтальнага асвятлення выкарыстоўваюць пражэктары, якія даюць агульнае рассеянае святло, а ўнутрысцэнічнае асвятленне забяспечваюць вынаснымі падсветамі.

Светлавыя сродкі дазваляюць ствараць на дэкарацыях, планшэце сцэны і ў глядзельнай зале разнастайныя светлавыя ўзоры, эфекты падаючага снегу, дажджу, рух аблокаў, усход і заход сонца, панарамы зорнага неба з месяцам. На паравых і дымных аблоках дэманструюць рознакаляровую дынаміку руху лазерных праменяў, а на дэкарацыях — каляровамузычны жывапіс і кіна-, відэа-, слайдпраекцыі. Але мастацкае ўздзеянне святла становіцца выяўленчым і выразным толькі ў тым выпадку, калі яно з'яўляецца адлюстраваннем вобразнай сістэмы дзеяння.

Яшчэ на стадыі эскізна-праектных работ галоўны мастак свята далучае да распрацоўкі пастановачнага асвятлення сцэны мастака па святлу.

Асновай для поўнага каларыстычнага малюнка святла з'яўляецца жывапісны эскіз. Аналізуючы сцэнарый святочнай дзеі і жывапісны эскіз, галоўны мастак і мастак па святлу загадзя плануюць асноўныя светлавыя пункты, вызначаюць

колькасць і характар светлавых праекцый і эфектаў, вымяраюць адлегласць ад месцаў размяшчэння апаратуры да асвятляемых аб'ектаў, а таксама вызначаюць, якія прыборы для пастановачнага асвятлення ёсць, а якія трэба набыць або ўзяць у арэнду.

Часам усе тэхнічныя і арганізацыйныя пытанні па асвятленні сцэны ўскладаюцца на спецыяльныя прыватныя арганізацыі, якія займаюцца рашэннем падобных задач. З імі заключаецца працоўнае пагадненне і вядзецца далейшая работа толькі ў творчым кірунку.

Але ў тым выпадку, калі сцэна асвятляецца ўласнымі сіламі, асвятляльнікі займаюцца набыццём неабходнай апаратуры, вырабам эфектных прыбораў, асвятляльнай бутафорыі і іншымі падрыхтоўчымі работамі.

Рэпетыцыя па ўстаноўцы святла адбываецца толькі тады, калі зроблены мантаж дэкаратыўнага афармлення. У адваротным выпадку рабіць светлавую рэпетыцыю бессэнсоўна, таму што "светлавая партытура знаходзіцца ў прамой залежнасці ад многіх дэталяў, якія ўздзейнічаюць на велічыню адлюстраванага святла, ступень паглынання светлавога патоку, танальную афарбоўку ўсяго афармлення"[1].

Першая светлавая рэпетыцыя звычайна адбываецца без выканаўцаў, але мастак і асвятляльнікі павінны ведаць галоўныя мізансцэнічныя пункты дзеяння і загадзя адзначыць дзялянкі сцэны, якія абыгрываюцца акцёрамі, у сваёй светлавой партытуры. Асвятленне сцэны — адна з найбольш складаных задач: мастаку па святлу, святлоаператару неабходна імкнуцца дасягнуць не толькі добрай бачнасці, але і павышэння выразнасці знешняга аблічча, што не заўсёды патрабуе ўзмоцненага асвятлення. У многіх выпадках сцэнічная выразнасць вобраза патрабуе прыцямнення фігуры або твара выканаўцы.

Для асвятлення аднаго або групы акцёраў карыстаюцца мясцовым святлом. Неабходна мець на ўвазе, што, высвеч-

[1] *Базанов В.* Техника и технология сцены. – Л.: Искусство, 1976. – С.213.

ваючы акцёра ўсімі прыборамі адначасова, можна пазбавіць яго вобраз выразнасці. Аднак нельга карыстацца і якім-небудзь адным прыборам, напрыклад вынасным пражэктарам: могуць з'явіцца цені і светлавая пляма на дэкарацыі.

Для раўнамернага асвятлення выканаўцаў часта карыстаюцца верхнім вынасным святлом, што не зусім правільна, таму што верхняе святло зацямняе вочы, падкрэслівае скулы, стварае правалы шчок. Калі прымяніць толькі рампу, то твар будзе выглядаць тоўстым і курносым. Пры адначасовым выкарыстанні сафітаў і рампы цені ад аднаго з прыбораў аслабляюцца дзеяннем іншых прыбораў.

Выбар прыёму асвятлення дэкарацый залежыць у першую чаргу ад якасцей і фактуры асвятляемых матэрыялаў: сукно нейтральнага, чорнага і цёмна-сіняга колераў можна прымяняць у сцэнічных дзеях, дзе галоўная ўвага засяроджваецца на асвятленні выключна артыста, дапамагаючы яму стварыць пэўны вобраз, адлюстраваць псіхалагічную нюансіроўку ролі, падкрэсліць яго міміку, жэст. Светлае сукно дзякуючы святлафільтру можна афарбаваць у розныя колеры, ствараючы агульную танальнасць карціны. У гэтым выпадку асабліва добра ўспрымаецца колер на сукне шэра-блакітнага, крэмавага і бэзавага колераў. Белы або светла-блакітны заднік, некалькі прыцямнёны ўверсе, можа служыць экранам для светлавых пейзажных дэкарацый, выкананых метадам праекцыі.

Для асвятлення плоскіх жывапісных дэкарацый, акрамя рассеянага белага святла, карыстаюцца каляровым асвятленнем, што не толькі ўзмацняе інтэнсіўнасць колеру выяў блакітнага неба, зеляніны лісця, але і забяспечвае рад простых пастановачных эфектаў: світанак, золак, вечар, ноч. Пры асвятленні рэльефных аплікацыйных дэталяў прымяняюць камбінаванае святло, выкарыстоўваюць бакавыя падсветы і пражэктары, таму што гледачы ўспрымаюць рэльеф толькі пры бакавым асвятленні.

Бакавое асвятленне, якое дае выразны святлацень і выяўляе рэльеф, шырока прымяняецца і для асвятлення

аб'ёмных дэталяў дэкарацый. У многіх выпадках для падкрэслівання ўзаемасувязі прадметаў у прасторы выкарыстоўваюць падсвет з тыльнага боку. Контражурнае святло, якое падае на асобныя прадметы афармлення, прыдае ім вялікую аб'ёмнасць. Тое ж святло, накіраванае на дзеючых асоб, стварае па контуры фігуры дадатковае асвятленне і прыдае ўсёй фігуры вялікую дынамічнасць і выразнасць[1].

Паколькі ва ўмовах падрыхтоўкі свята можна разлічваць на правядзенне толькі адной — дзвюх светлавых рэпетыцый, то рэжысёр і мастак павінны прыйсці на яе з дакладным разуменнем характару і задач асвятлення. Усіх асвятляльнікаў неабходна загадзя расставіць па месцах, у іх распараджэнні павінны быць неабходная апаратура, фільтры. Рэжысёр-пастаноўшчык зацвярджае вынікі манціроўкі святла. Знойдзенае святло дакладна фіксуецца на нумарах святочнай праграмы. У час генеральнай рэпетыцыі яно ўдакладняецца і запісваецца ў канчатковым варыянце ў агульную светлавую партытуру.

Запісы светлавой партытуры адлюстроўваюць наступныя асноўныя даныя: сцэнічная дзея (нумар, эпізод), рэпліка або сігнал на ўключэнне, аб'ект асвятлення, назва прыбора або светлавой праграмы, колер, накіраванасць і змяненне асвятлення (гл. узор).

*Узор*

*Светлавая партытура тэатралізаванага канцэрта "Калядныя зоркі"*

| № пп | Сцэнічная дзея (нумар, эпізод) | Рэпліка або сігнал на ўключэнне | Аб'ект асвятлення | Назва прыбора або светлавой праграмы і колер | | Накіраванасць і змяненне асвятлення |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Пралог | Указанне рэжысёра | Аван-сцэна | Пісталетны прамень | Белы | На калядную зорку (апарат №24) |
| 2 | Пралог | Калядная песня (фанаграма) | Аван-сцэна | "Снег" на зал і сцэну | Белы | У час фанаграмы калядная зорка іграе агнямі |

[1] *Гл.: Емельянов Е.* Технические средства клуба. – М.: Сов. Россия, 1979. – С.77.

## Выраб мастацка-дэкаратыўнага афармлення

Калектыў, які займаецца падрыхтоўкай і правядзеннем свята, — гэта заўсёды часовае ўтварэнне, якое не мае пастаяннай матэрыяльна-тэхнічнай базы. Таму адзін з завяршальных этапаў падрыхтоўкі свята — запуск мастацка-дэкаратыўнага афармлення ў вытворчасць — здзяйсняецца адначасова ў розных арганізацыях і ўстановах. Але ў любым выпадку зыходнымі данымі для вытворчасці з'яўляюцца рабочыя чарцяжы, тэхналагічнае апісанне і каштарыс.

Выраб мастацкага афармлення значна спрашчаецца, калі вырашэннем пастаўленых задач займаюцца вызначаныя для гэтых мэт прадпрыемствы. У практыцы даволі часта на іх рахунак пералічваюць сродкі з каштарыса свята, перадаюць чарцяжы і тэхналагічнае апісанне вырабаў (або іх робяць непасрэдна на вытворчасці), а мастаку застаецца толькі кантраляваць выраб дэкаратыўнага афармлення.

У выпадку, калі вырабам дэкарацый у поўным або частковым аб'ёме даводзіцца займацца ўласнымі сіламі, гэта значыць сіламі мастакоў культасветустаноў (якія знаходзяцца на бюджэце і аплата іх работы не здзяйсняецца з каштарыса свята), задача арганізатараў у пэўнай ступені ўскладняецца. Загадчык пастановачнай часткі складае пералік патрэбных матэрыялаў і ўказвае іх колькасць з наменклатуры, названай у каштарысе. Затым ён займаецца набыццём матэрыялаў. Але адбор тканін для дэкарацый і касцюмаў, мэблі, упрыгожванняў робіцца абавязкова паводле кансультацыі мастака.

Планаванне вырабу дэкарацый увязваецца з агульным графікам падрыхтоўкі свята, у якім самым важным звяном з'яўляюцца мантажныя, прагонныя і генеральныя рэпетыцыі. Да пачатку мантажных работ усе неабходныя дэкарацыі, светлавое і гукавое абсталяванне павінны быць гатовы.

Загадчык пастановачнай часткі пастаянна сочыць за выкананнем намечанага плана, прымае аператыўныя рашэнні ў выпадку затрымак і змен, якія ўзнікаюць па розных прычы-

нах. Перыядычна адказныя асобы збіраюцца на пасяджэнні аргкамітэта, дзе ўдакладняюцца тэрміны выканання заданняў, разбіраюцца пытанні, звязаныя з забеспячэннем, прыцягненнем дадатковых рэзерваў, арганізацыяй работ і інш.

## Святочны феерверк

Піратэхнічныя дзеянні з'яўляюцца аднымі з самых яскравых ў сістэме мастацкіх выразных сродкаў свята. Святлодынамічныя піратэхнічныя кампазіцыі з'яўляюцца як дадатковым элементам дэкору асобных святочных фрагментаў (тэатралізаванага шэсця, прадстаўлення, канцэрта, абрадава-рытуальных дзей, спартыўных і масава-гульнёвых праграм), так і самастойным дзеяннем. Распрацаваныя і здзейсненыя ў форме піратэхнічных спектакляў або звычайных дэкаратыўных феерверкаў карнавальнага тыпу, яны часта з'яўляюцца кульмінацыйнай часткай свята або яго фіналам.

Феерверк у Беларусі мае багатыя шматвяковыя традыцыі. Яшчэ ў 1650 г. беларускі шляхціц Казімір Семяновіч у сваёй кнізе "Вялікае мастацтва артылерыі", выдадзенай у г.Амстэрдаме, раскрываў вобразны сэнс і тэхналогію вырабу розных феерверачных фігур, выказваў практычныя рэкамендацыі па арганізацыі феерверкаў. Феерверкі XVII—XVIII стст., здзейсненыя ў Шклове, Нясвіжы, Полацку, Гродна і іншых гарадах, пераканаўча даказваюць, што феерверк дапамагае раскрываць сутнасць адзначаемай падзеі, ён адзін з магутных сродкаў педагагічнага і эмацыянальнага ўздзеяння.

На сучасным этапе беларускія феерверачныя традыцыі, адроджаныя на аснове піратэхнічных дзей мінулых стагоддзяў, былі ўвасоблены ў піратэхнічных спектаклях "Калядныя зоркі" (г.Мінск, 1992—1995 гг.), "Агні спадчыны" (г.Паставы, 1994—2003 гг.), "Вадзяная феерыя" (г.Нясвіж, 1998 г.), "Агні народаў сусвету" (г.Гродна, 2002 г.), "Вогненая сімфонія" (г.Калінкавічы, 2003 г.), "Карнавал весялосці" (г.п. Воранава, 2003 г.) і інш. Феерверкі сведчаць аб стварэнні сучаснай на-

цыянальнай школы феерверкаў, якая грунтуецца на культурна-гістарычнай спадчыне нашых продкаў.

Феерверк — гэта комплекс піратэхнічных вырабаў, складзеных у пэўную мастацкую кампазіцыю. Па форме ўвасаблення яны падзяляюцца на дэкаратыўныя і тэматычныя.

Дэкаратыўны феерверк — гэта мастацкая піратэхнічная кампазіцыя, якая аздабляе пэўныя святочныя дзеянні (шэсці, канцэрты, шоу, карнавалы, тэатралізаваныя прадстаўленні).

Тэматычны (тэатралізаваны) феерверк — мастацкі асэнсаваная вобразна сімвалічная піратэхнічная дзея, якая адлюстроўвае пэўную з'яву ў жыцці грамадства, асобы. У тэматычных феерверках разам з піратэхнічнымі і феерверачнымі вырабамі выкарыстоўваюць дадатковыя сродкі выразнасці — музыку, пластыку, слова, святло. Тэматычныя феерверкі будуюцца па законах драматургіі, маюць сваю тэму і ідэю, падзейны рад, сцэнарна-рэжысёрскі ход, кампазіцыйную пабудову і вобразнае рашэнне ў мастацка-дэкаратыўным і музычным афармленні. Тэматычныя феерверкі ў залежнасці ад выкарыстаных відаў мастацтва набываюць розныя жанравыя адценні: літаратурна-музычныя піратэхнічныя кампазіцыі, гукапіратэхнічныя, святлогукапіратэхнічныя і воднапіратэхнічныя спектаклі.

Работа над увасабленнем феерверку пачынаецца пасля зацвярджэння сцэнарыя. Асаблівасць работы па арганізацыі феерверку заключаецца ў тым, што яшчэ на этапе распрацоўкі сцэнарыя аўтары павінны ў яго закласці не толькі вобразна-сімвалічнае рашэнне, але і вызначыць, якія піратэхнічныя фігуры будуць адлюстроўваць падзейныя моманты. На эскізна-праектнай стадыі работы мастак і рэжысёр перш за ўсё распрацоўваюць прасторавае вырашэнне феерверачнай дзеі, улічваючы архітэктурна-ландшафтныя асаблівасці месца дзеяння. Так, узмацненню відовішчнасці феерверку можа садзейнічаць выкарыстанне ў якасці дадатковых пунктаў дзеяння розных архітэктурных пабудоў, скульптур,

сцэн, інжынерных збудаванняў і інш. Пры рабоце з эскізамі піратэхнічных фігур мастак вызначае колеры дэкаратыўных агнёў, а таксама памеры дэкаратыўных канструкцый. Велічыня іх залежыць ад адлегласці паміж месцам спальвання пірафігур і гледачамі, якія назіраюць вогненную дзею: чым большая адлегласць да гледачоў, тым большага памеру павінны быць пірафігуры.

Эскізна-праектная распрацоўка ажыццяўляецца мастаком у садружнасці з інжынерам-канструктарам і піратэхнікам. Разам з інжынерам мастак вызначае прынцып дзеяння складаных піратэхнічных канструкцый (домны, страляючыя танкі, рухомыя фігуры, лятучы дракон, кветкі, якія раскрываюцца і закрываюцца, і інш.), выпрацоўвае іх чарцяжы і тэхналагічнае апісанне. Піратэхнік у сваю чаргу вырашае, на якіх відах піратэхнічных вырабаў будзе здзяйсняцца дзеянне піратэхнічных фігур (фантаны, контурныя свечкі, форсы або з ажыццяўленнем камбінаванага спосабу ўжывання розных вырабаў).

Работы з феерверачнымі вырабамі належаць да катэгорыі выбуховых і вогненебяспечных. Таму пры планіроўцы прасторавага вырашэння месца дзеяння мастак і піратэхнікі павінны ўлічваць нарматывы адлегласцей, якія гарантуюць бяспеку гледачоў у час правядзення феерверку.

Распрацоўваючы прасторавае вырашэнне месца феерверачнай дзеі, мастак разам з піратэхнікам павінен вызначыць, а затым намаляваць або начарціць план гэтага месца з абазначэннем небяспечнай і бяспечнай зон, а таксама адзначыць месцы размяшчэння пажарнай машыны, машыны хуткай дапамогі і службы аховы парадку.

Усе напрацоўкі, зробленыя мастаком, інжынерам і піратэхнікам, зацвярджаюцца рэжысёрам, які разам з загадчыкам пастановачнай часткі складае графік падрыхтоўкі феерверку. У гэтым графіку неабходна вызначыць віды работ, тэрміны іх выканання і адказных за падрыхтоўку. У пераліку відаў работ неабходна прадугледзець наступнае:

— распрацоўку літаратурнага сцэнарыя;

— рэжысёрскі праект;

— запіс фанаграм або падрыхтоўку музычнага калектыву (народнага, сімфанічнага, духавога, эстраднага і іншых у залежнасці ад тэматыкі і жанру дзеі), які будзе суправаджаць феерверк;

— выраб піратэхнічных саставаў, элементаў і фігур;

— месца захавання і аховы феерверачных вырабаў;

— падрыхтоўку грузавога транспарту і суправаджальных для дастаўкі феерверачных вырабаў;

— падрыхтоўку брыгады рабочых для пагрузачна-разгрузачных работ і размяшчэння піратэхнічных фігур і ракетных павільёнаў;

— забеспячэнне аховы месца правядзення феерверку, мер супрацьпажарнай бяспекі, медыцынскага абслугоўвання (на выпадак няшчасных здарэнняў);

— вырашэнне пытанняў харчавання і размяшчэння піратэхнікаў-дэманстратараў і членаў пастановачнай групы;

— забеспячэнне перагаворнымі сродкамі рэжысёра, яго асістэнтаў, піратэхнікаў і супрацоўнікаў аховы парадку, пажарнай і медыцынскай службаў.

У працэсе вытворчасці мастак кантралюе выраб дэкарацый для феерверку, а загадчык пастановачнай часткі — усе астатнія віды работ.

Вытворчасцю піратэхнічных вырабаў займаюцца многія спецыялізаваныя фірмы і прадпрыемствы, але частка з іх не мае ліцэнзій на дэманстрацыю феерверкаў. Маладасведчаныя піратэхнікі такіх фірм не прытрымліваюцца існуючых правіл дэманстрацыі феерверку. Іншыя піратэхнічныя фірмы не маюць сваёй вытворчай базы, выкарыстоўваюць нізкаякасныя феерверачныя вырабы і кампраметуюць гэты від мастацкай дзейнасці.

Трэба звяртацца да паслуг міжнароднага саюза развіцця феерверачнага мастацтва “Спецэфект-плюс” (генеральны офіс у г.Мінску). Яго работнікі распрацоўваюць высокама-

стацкія феерверкі, маюць сваю вытворчую базу і карыстаюцца унікальнымі тэхналогіямі.

*Транспарціроўка феерверачных вырабаў.* Перавозіць феерверачныя вырабы і піратэхнічныя матэрыялы можна чыгуначным, водным, аўтамабільным, гужавым транспартам пры наяўнасці дазволу органаў Міністэрства ўнутраных спраў. Забараняецца перавозка вырабаў ручной паклажай у самалётах, мясцовых паяздах і багажом у пасажырскіх паяздах.

Перавозку вырабаў аўтамабільным транспартам павінны суправаджаць адказная асоба і ўзброеная ахова. Вадзіцель транспартнага сродку павінен прайсці тэхнічнае навучанне, медыцынскі агляд і мець пасведчанне на права перавозкі спецыяльных грузаў. Перавозка дазваляецца толькі ў спецыяльна абсталяваных транспартных сродках, якія адпавядаюць наступным патрабаванням:

— металічныя часткі кузава машыны павінны быць засцелены мяккім матэрыялам або абабіты дрэвам ці другім ізалюючым матэрыялам;

— выхлапная труба і глушыцель павінны быць справа ад радыятара і мець іскраахову;

— на транспартным сродку неабходна наяўнасць двух вогнетушыцеляў або скрыні з сухім пяском;

— злева ад кабіны трэба ўмацаваць чырвоны сцяжок;

— асобам, якія суправаджаюць груз, і вадзіцелям грузавікоў у час руху транспарту забараняецца курыць і мець пры сабе запальваючыя сродкі.

Пры міжгародніх перавозках пажадана, каб транспарт суправаджаў аўтамабіль ДАІ. У выпадку неабходнасці пры міжгародніх перавозках дапускаецца пакідаць транспарт, але абавязкова пад наглядам і не бліжэй чым за 200 м ад транспартнай магістралі і населеных пунктаў, прычым на машыне трэба выстаўляць аварыйны сігнал.

Пры перавозцы вырабаў аўтамабільным транспартам дапускаюцца наступныя скорасці:

— на тэрыторыі прадпрыемства — не болей 15 км/гадз.;

— па грунтавых і прасёлачных дарогах — не болей 30 км/гадз.;

— па бетоннай ці асфальтаванай шашы — не болей 60 км/гадз.

Па чыгунцы вырабы перавозяць у простым вагоне без абмежавання адлегласці і скорасці. Такія ж умовы існуюць і пры перавозцы вырабаў водным транспартам.

Перавозіць феерверачныя вырабы ручной паклажай можа піратэхнік або кіраўнік феерверку.

*Захаванне вырабаў.* Склады захавання піратэхнічных вырабаў па сваім прызначэнні падзяляюцца на пастаянныя і часовыя. Пастаянныя склады — гэта сховішчы, абсталяваныя стэлажамі і памостамі. Часовыя склады — гэта пляцоўкі або спецыяльна абсталяваны аўтамабіль. Склады захавання феерверачных вырабаў павінны быць прыняты камісіяй, якая складаецца з прадстаўнікоў адміністрацыі прадпрыемства, Дзяржпрамнагляду, Дзяржпажарнагляду, МУС.

Феерверачныя вырабы захоўваюцца ва ўпакоўцы ў неацяпляльных памяшканнях пры тэмпературы ад $+40^0$ да $-50^0$ С у адпаведнасці з указаным гарантыйным тэрмінам захоўвання канкрэтнага вырабу. Скрыні з вырабамі павінны быць укладзены ў штабелі па тыпах вырабаў з забеспячэннем вольнага праходу да кожнага тыпу вырабаў.

Колькасць штабеляў вызначаецца патрабаваннямі тэхналагічных апісанняў і інструкцый па эксплуатацыі на канкрэтны тып феерверачнага вырабу. У сховішчы на відным месцы павінны быць вывешаны нормы захавання вырабаў і інструкцыя па ахове працы і тэхніцы бяспекі, а таксама паказана планіроўка размяшчэння асобных відаў вырабаў.

Норма пераносу вырабаў адносіцца да першага класа і складае: для мужчын — 20 кг, для двух мужчын — да 50 кг, для жанчын — 5 кг. У памяшканні сховішча дазваляецца праводзіць работы, звязаныя толькі з прыёмам, выдачай і перавозкай феерверачных вырабаў.

Сховішча абсталёўваецца прыборамі вымярэння тэмпературы і вільгаці, а іх паказанні неабходна штодня фіксаваць у журнале. Тут жа павінен весціся журнал уліку феерверачных вырабаў. У сховішчы павінны быць сродкі пажаратушэння (два вогнетушыцелі, вядро з сухім пяском, рыдлёўка, багор).

Усе пастаянныя сховішчы павінны кругласутачна быць пад наглядам ваенізаванай аховы. Часовыя склады на аўтамабілях ахоўваюць асобы, якія суправаджаюць грузы, або кладаўшчык.

Калі ў мясцовасці, дзе адбываецца феерверк, няма сховішчаў, вырабы можна паставіць пад ахову ў асобны бокс пажарнай часткі або аддзела міліцыі.

*Тэхніка бяспекі і меры перасцярогі пры падрыхтоўцы і правядзенні феерверку.* Да правядзення работ з феерверачнымі вырабамі дапускаюцца асобы, якія азнаёмлены з тэхнічнымі характарыстыкамі, устройствамі і правіламі эксплуатацыі вырабаў, маюць пасведчанне на права правядзення і дэманстрацыі феерверкаў.

У час правядзення феерверку пры выкананні работ з піратэхнічнымі і феерверачнымі вырабамі забараняецца:

— карыстацца агнём на адлегласці не меней 25 м ад пускавой пляцоўкі і феерверачных вырабаў (акрамя феерверкаў, дзе ў якасці ўспламяняльніка ўжываецца стапінавы шнур);

— прысутнасць пабочных асоб;

— знаходжанне на феерверачнай пляцоўцы нецвярозых людзей;

— кідаць вырабы, цягнуць за правады электраўспламяняльнік або вогнеправодны шнур;

— пераносіць вырабы ў кішэні, пад вопраткай;

— насіць касцюмы з сінтэтычных матэрыялаў, электронныя гадзіннікі, залатыя і сярэбраныя вырабы і ўпрыгожванні;

— разбіраць вырабы і вымаць з іх састаўныя часткі, выпраўляць у іх пашкоджанні;

— здзяйсняць якія-небудзь дзеі з вырабамі, калі яны падключаны да электракрыніц;

— пераносіць, апускаць і вымаць вырабы са ствала марціры;

— пакідаць у ствале марціры або на пускавой пляцоўцы неспрацаваўшыя вырабы;

— выкарыстоўваць абсталяванне і марціры з увагнутасцямі, трэшчынамі і іншымі дэфектамі.

У выніку пажару для тушэння палаючых піратэхнічных і феерверачных вырабаў неабходна выкарыстоўваць пясок, пенныя, парашковыя і вуглекіслотныя вогнетушыцелі.

*Знішчэнне непрыгодных вырабаў.* Пры правядзенні феерверку неабходна весці назіранне за работай феерверачных вырабаў і фіксаваць анамальныя выпадкі спрацоўвання.

Феерверачныя вырабы, як і любыя вырабы серыйнай вытворчасці, у выніку падзення, няправільнай зборкі, прымянення ў працэсе вырабу дэфектных камплектуючых дэталяў падвергнуты анамальнай рабоце.

Асноўныя віды анамальнай работы вырабаў, якія могуць адбыцца ў час правядзення феерверку, наступныя:

— для наземных феерверачных вырабаў (фантанаў, кітайскіх колаў) — гэта разрыў корпуса і разлёт састаўных частак;

— для паркавых феерверачных вырабаў (рымскіх свечак, буракоў) — гэта разрыў корпуса і разлёт піраэлементаў у бакі, супрацьлеглыя асноўнаму напрамку;

— для вышынных феерверачных вырабаў (люсткугелі) — гэта спрацоўванне ў марціры, на траекторыі палёту, пры падзенні на зямлю, вяртанні на зямлю неспрацаваўшага люсткугеля — "чорны шар".

Усе пералічаныя анамаліі маюць свае прычыны і вынікі і павінны быць разгледжаны ў арганізацыях з прыняццем адпаведных мер па іх устараненні.

Пасля феерверку неабходна правесці агляд мясцовасці з мэтай збору буйных рэшткаў незгарэўшых піраэлементаў і знаходжання анамальна спрацаваўшых ці неспрацаваўшых вырабаў.

Для знішчэння непрыгодных вырабаў падбіраецца такая мясцовасць, дзе ёсць натуральныя перашкоды (яры, равы, лагчыны і да т.п.), якія абмяжоўваюць разлёт піратэхнічных вырабаў. Пры падборы такой мясцовасці трэба ўлічваць, што вакол яе не павінна быць будынкаў, ліній электраперадач і матэрыялаў, якія могуць загарэцца.

Для знішчэння вырабу прымяняюць спецыяльную тэрмітную шашку з электраўспламяняльнікам прамысловай вытворчасці. Шашку ўспламяняюць з укрыцця або з бяспечнай адлегласці.

Калі пры запуску выраб не выйшаў з марціры, знішчэнне адбываецца тэрмітнай шашкай, якую апускае на выраб адказная асоба ў акулярах, што ахоўваюць вочы. Марціры пры гэтым павінны быць заглыблены ў грунт на 1/3 ствала.

Неспрацаваўшыя піратэхнічныя элементы кладуць на загорнутую ў паперу тэрмітную шашку і знішчаюць шляхам успламянення шашкі.

*Правілы па падрыхтоўцы і дэманстрацыі феерверку.* Феерверк здзяйсняе арганізацыя, якая мае дазвол на яго правядзенне. Усе асобы, занятыя падрыхтоўкай і дэманстрацыяй феерверку, павінны быць праінструктаваны кіраўніком феерверку перад кожнай дэманстрацыяй аб мерах бяспекі пры рабоце з вырабамі.

Для атрымання дазволу на права дэманстрацыі феерверку прадпрыемства ці арганізацыя падае заяву ў мясцовыя органы ўлады з адначасовым уведамленнем органаў міліцыі і пажарнай аховы.

У заяве неабходна ўказаць:

— найменне арганізацыі;

— аб'ём феерверку, тэрмін правядзення, характар вырабаў;

— звесткі аб арганізацыі, якая праводзіць феерверк;

— да заявы дадаецца копія дазволу на права правядзення работ па дэманстрацыі феерверку.

Непасрэдна на месцы перад падрыхтоўкай і дэманстрацыяй феерверку кіраўнік абавязаны ўдакладніць з органамі міліцыі і пажарнай аховы месца, дату і час правядзення феер-

верку, парадак кароткатэрміновага захоўвання вырабаў, парадак знішчэння непрыгодных вырабаў, а таксама атрымаць пісьмовы дазвол на правядзенне феерверку.

Органы мясцовай улады сумесна з арганізацыяй абавязаны распрацаваць план па забеспячэнні мер аховы месца правядзення феерверку, мер супрацьпажарнай бяспекі і выдзеліць машыну хуткай дапамогі з абслуговым персаналам.

Месца дэманстрацыі феерверку размяшчаецца на бяспечнай адлегласці ад гледачоў.

На пляцоўках, з якіх выпускаюцца вырабы, павінен быць устаноўлены такі парадак, пры якім выключаліся б выпадкі пранікнення пабочных асоб і крадзяжу феерверачных вырабаў.

На пляцоўках, дзе адбываецца дэманстрацыя феерверку, забараняецца курыць, працаваць у нецвярозым стане, пакідаць феерверачныя вырабы без аховы.

Пасля заканчэння феерверку пляцоўку аглядаюць з мэтай збору неспрацаваўшых вырабаў і элементаў. Усе неспрацаваўшыя вырабы неабходна знішчыць у адпаведнасці з правіламі.

Ахова тэрыторыі пускавой пляцоўкі можа быць знята толькі пасля заканчэння ўсіх відаў работ са згоды кіраўніка феерверку. Пасля заканчэння феерверку складаюць акт аб яго правядзенні і выніках (у трох экземплярах). Акт падпісваюць:

— кіраўнік феерверку;

— адказная асоба мясцовых органаў улады;

— прадстаўнік арганізацыі — заказчыка феерверку.

На акце ставіцца пячатка мясцовых органаў улады або арганізацыі-заказчыка, і ён захоўваецца ў справах.

## Літаратура

*Базанов В.* Техника и технология сцены. —Л.: Искусство, 1976.

*Всесоюзная* школа молодых ученых и специалистов " Свет и музыка": Тез. докл. — Казань: КАИ, 1979.

*Галеев Б.* Театрализованные представления " Звук и свет" под открытым небом. — Казань: КАИ, 1991.

*Галеев Б.М.* Светомузыка в системе искусств. — Казань: КАИ, 1991.

*Генкин Д.М.* Массовые праздники — М.: Просвещение, 1975.

*Глан Б.М.* Праздник всегда с нами. — М.: СТД ,1988.

*Гуд П.А.* Огненная симфония. Из истории белорусских фейерверков. — Дзержинск: ПКФ " Кальвин", 1997.

*Домшлак М.* Архитектура старинного праздника // Декоративное искусство СССР. — 1965. — № 12.

*Захаржевская Р.* Костюм для сцены. — М.: Сов. Россия, 1973.

*Конович А.А.* Театрализованные праздники и обряды в СССР. — М.: Высшая школа, 1990.

*Крылов О.А.* Основы фейерверочного искусства. — М.: Россия,1996.

*Лившиц П., Темкин А.* Сценический грим и парик. — М.: Искусство, 1958.

*Мінск* святочны: Фотаальбом / Укл. В.Н. Іваноў. — Мн.: Беларусь, 1989.

*Немиро О.В.* В город пришел праздник. — Л.: Художник РСФСР, 1973.

*Немиро О.В.* Праздничный город. — Л.: Художник РСФСР, 1987.

*Силин А.Д.* Площади — наши палитры. — М.: [Б.и.], 1982.

*Режиссура* и организация массовых зрелищ: Хрестоматия / Сост., ред., автор введения В.Н.Айзенштадт. — Харьков: ХГИК, 1973.

*Художник* и зрелище: Сб.ст. — М.: Сов. художник, 1990.

*Шамшур В.В.* Празднества революции. — Мн.: Наука и техника, 1989.

## V. ГУКАВОЕ АФАРМЛЕННЕ СВЯТА

На пачатковым этапе падрыхтоўкі свята пасля афіцыйнага зацвярджэння сцэнарыя гукарэжысёр сумесна з галоўным рэжысёрам удакладняюць канчатковы варыянт прасторавага вырашэння, а таксама зоны дзеяння свята, у якіх існуе неабходнасць агучвання, гукаўзмацнення і гукаўзнаўлення; затым праводзяць абследаванне вызначаных зон (закрытыя і адкрытыя сцэнічныя пляцоўкі, плошчы, вуліцы, стадыёны, паркі і інш.), у час якога высвятляюць, дзе можна абысціся сродкамі мясцовай службы радыётрансляцыйнай сеткі, радыёвузла, а дзе неабходна ўсталяваць дадатковую апаратуру.

Пры вызначэнні выдаткаў на пастаноўку свята ўлічваюцца сумы, неабходныя для аплаты работы кампазітара, перапісчыка нот, арганізацый, якія выконваюць запіс на магнітныя або лічбавыя носьбіты, выраб шумавой і арэнду неабходнай гукаўзмацняльнай і гукаўзнаўляльнай апаратуры. На гэта трэба загадзя запланаваць грашовыя сродкі, каб усе віды работ былі выкананы своечасова.

Наступны этап работы гукарэжысёра — высвятленне з дырэктарам свята матэрыяльна-тэхнічных магчымасцей мясцовасці, дзе адбываюцца святочныя падзеі. Іншы раз, калі сцэнічныя і масава-гульнёвыя пляцоўкі невялікія па памеры, дастаткова абысціся апаратурай мясцовых радыёвузлоў і музычных ансамбляў, якія маюць добрую якасць і магутнасць гучання. Разам з тым, як паказвае практыка, у пераважнай большасці гарадоў Беларусі на сучасным этапе многія пляцоўкі на адкрытым паветры (плошчы, стадыёны, паркі і інш.), на жаль, аснашчаны нізкаякаснай гукаўзмацняльнай апаратурай і гучнагаварыцелямі, прызначанымі для радыётрансляцыі. У такіх выпадках можна заказаць у абласных ці гарадскіх радыёвузлах сувязі дарожную радыётрансляцыйную станцыю (радыёаўтобус), якая дазваляе стварыць больш якаснае гукаўзнаўленне і гукаўзмацненне магутнасцю 1—2 кВт або арэндаваць навейшыя гукавыя сістэмы.

За кожнай зонай гукаўзмацнення гукарэжысёру трэба замацаваць асобнага гукаапэратара, з якім і будзе працягвацца работа па вырашэнні патрабуемых пытанняў (распрацоўка гукавога афармлення, аб'ём гучання, спосабы гукаўзнаўлення).

Гукарэжысёр павінен улічваць наступныя характэрныя асаблівасці прымянення сістэм агучвання і гукаўзмацнення на адкрытым паветры:

1. Залежнасць выразнасці і гучнасці музычнай і моўнай інфармацыі ад надвор'я (вецер, дождж, туман) і блізка размешчаных крыніц шуму (транспарт, гуляючая публіка і інш.). Гукавую апаратуру трэба размяшчаць з улікам пастаяннай ружы вятроў, каб гук ляцеў па ветры. У адваротным выпадку вецер будзе "забівацца" ў дынамікі, што ў рэшце рэшт пашкодзіць успрыманню дзеі.

2. Ландшафтныя і архітэктурныя асаблівасці месца дзеяння.

Пры арганізацыі на адкрытым паветры сістэм агучвання неабходна ўлічваць і тое, што прамы гук, які ідзе са сцэны, хутка затухае, асабліва на частаце 2000—3000 Гц, што прыводзіць да скажэння ўспрымання моўнай і музычнай праграм.

Шкодныя для ўспрымання інтэнсіўныя гукі, адбітыя ад паверхні жыллёвых і вытворчых пабудоў, прыходзяць да гледача з вялікім спазненнем, што з'яўляецца дадатковай крыніцай шуму.

Таму на плошчы, вакол якой стаяць будынкі, або на стадыёне дынамікі трэба размяшчаць па крузе, каб гук раўнамерна распаўсюджваўся па месцы дзеяння, а на ландшафце (поле, узлессе, горка) іх трэба ўстанаўліваць у адным месцы, каб гук так званай "атакай" ляцеў на гледача. Але ў абодвух выпадках пляцоўка павінна быць абсталёвана дадатковай "падгучкай" ("прастрэлы"), каб артысты маглі адначасова з гледачамі чуць музычна-шумавое ці моўнае дзеянне і не "разысціся" з імі, што прывядзе да негатыўнага ўспрымання дзеі.

Страта гукавой інфармацыі можа ўзнікнуць па прычыне натуральнай перамены шчыльнасці асяроддзя, выкліканага перамяшчэннем паветраных мас, якія награваюць гледачоў (мяняецца напрамак руху гукавых хваль).

3. Зручнасць агляду дзеі. Гукавы цэнтр свята, дзе працуе гукаапературар, можна размясціць спераду, ззаду, збоку ад сцэнічнай ці масава-гульнёвай пляцоўкі, але так, каб тэхнічнаму выканаўцу быў выразна бачны пластычны малюнак дзеяння і каб у экстрэмальных сітуацыях ён своечасова змог зарыентавацца, хутка выправіць сваю ці чужую памылку. Ігнараванне гэтых важных аспектаў размяшчэння гукавой апаратуры можа прывесці да безлічы гукавых і пластычных накладак і непаразуменняў.

4. Лакалізацыя гукавога цэнтра. Месца работы гукатэхнікаў і дыктараў павінна быць абмежавана прасторай, куды пабочным асобам уваход забаронены. На адкрытым паветры на месцы радыёвузла свята трэба зрабіць лёгкую крытую пабудову, каб, па-першае, вецер не залятаў у мікрафоны і не ствараў перашкод у эфіры, па-другое, каб зберагчы апаратуру ад шкоднага ўздзеяння магчымага дажджу, снегу або туману, і, па-трэцяе, каб не чутна была ў эфіры рэакцыя гледачоў і артыстаў на дзею, што часта забруджвае эфір і шкодзіць паўнаце ўспрымання.

Асноўныя сістэмы агучвання адкрытай прасторы і гукафікацыі залаў тэатраў па асаблівасцях работы і размяшчэнні гучнагаварыцеляў можна ўмоўна падзяліць, як лічыць Я.Емяльянаў, на наступныя групы: сканцэнтраваныя (цэнтралізаваныя), разгрупаваныя (занальныя), размеркаваныя і комплексныя.

*Сканцэнтраваныя сістэмы агучвання і гукаўзмацнення* характарызуюцца канцэнтрацыяй выпраменьвальнікаў гуку ў зоне. Прыкладам можа служыць танцпляцоўка парка, якая мае звычайна форму акружнасці. Для трансляцыі музычных праграм выкарыстоўваюцца ў асноўным цэнтральная група гучнагаварыцеляў, змантаваная веерападобна і накіраваная

так, каб асноўная гукавая энергія ішла на танцуючых. Калі ж на пляцоўцы маецца невялікая эстрада, то выпраменьвальнікі гуку стараюцца расставіць унутры акустычнай ракавіны. У гэтым выпадку гукавая хваля можа распаўсюджвацца далёка за межы агароджанай зоны і быць крыніцай шуму для блізка размешчаных жылых кварталаў (асабліва позна вечарам).

Пры агучванні адкрытай эстрады або тэрыторыі летняга тэатра гучнагаварыцелі пажадана манціраваць на левым і правым баках сцэнічнай пляцоўкі, падвешваючы іх на ўзроўні 3—4 м адносна планшэта. Вось выпраменьванне гучнагаварыцеляў мэтазгодна накіраваць у бліжнюю, сярэднюю і аддаленую зоны, што забяспечвае “прывязку” зрокавага і слыхавога вобразаў, калі шырыня парталаў залы і адлегласць ад люстраў сцэны да першых радоў прыблізна роўныя.

Прымяненне сканцэнтраванай (цэнтралізаванай) сістэмы без прыняцця спецыяльных мер мае абмежаванні, выкліканыя магчымасцю самаўзбуджэння ўзмацняльнага комплексу пры вялікіх ўзроўнях гуку, што праяўляецца ў выглядзе “завывання” (нарастаючага па часе свісту на сярэдніх і нізкіх частотах). Прычынай гэтага з’яўляецца станоўчая акустычная адваротная сувязь паміж мікрафонам і гучнагаварыцелем, якія знаходзяцца непадалёк адзін ад аднаго (напрыклад, у прыпартальнай зоне). Устараніць самаўзбуджэнне ўзмацняльнай сістэмы магчыма пры правільным выбары дыяграм накіраванасці гучнагаварыцеляў і мікрафонаў, іх узаемнай арыентацыі.

Яшчэ адным недахопам падобных сістэм размяшчэння гучнагаварыцеляў з’яўляецца вялікая нераўнамернасць узроўню гукавога ціску на глядзельных месцах. Напрыклад, слухачы першых радоў, размешчаных блізка ад гучнагаварыцеляў левага і правага бакоў эстрады, будуць незадаволены значным павышэннем узроўню гукавога ціску, а слухачы апошніх радоў з прычыны моцнага затухання прамой гукавой хвалі і высокага ўзроўню знешніх шумаў ад навакольнай прасторы павінны напружваць слых.

Пры агучванні вялікіх тэрыторый паркаў, зон адпачынку, выстаў прымяненне магутных цэнтралізаваных сістэм гучнагаварыцеляў немэтазгодна з-за вялікага роскіду ўзроўняў гукавога ціску па ўсёй тэрыторыі і магчымасці з'яўлення гукавых перашкод у выглядзе рэха, якое прыходзіць ад аддаленых груп гучнагаварыцеляў да слухачоў з вялікім спазненнем, што значна памяншае выразнасць моўнай інфармацыі, перадаваемай па сістэме мясцовай трансляцыі.

*Разгрупаваныя сістэмы агучвання* характарызуюцца раўнамерным размеркаваннем гучнагаварыцеляў па ўсёй адкрытай прасторы ці па паверхні сцен залы. У парках, на вуліцах і плошчах пры размяшчэнні гучнагаварыцеляў з улікам адноснага перакрыцця бліжэйшых зон, калі трансліруемая праграма становіцца чутна адначасова ад некалькіх выпраменьвальнікаў, можна дасягнуць даволі добрай чутнасці слоў і музыкі на ўсёй тэрыторыі; пры гэтым адсутнічаюць і ўмовы ўзнікнення перашкод ад гукаў. Напрыклад, у гарадскім парку на магістральных алеях вялікай працягласці для сістэмы агучвання можна выкарыстаць слупы, што ўжываюцца для мацавання асвятляльных прыбораў, на якіх пажадана манціраваць гучнагаварыцелі парасоннага тыпу, каб накіраваць гук у зададзеную зону. Калі вышыня падвесу не перавышае 6м, то алея павінна быць не болей за 10—12 м (лепшую раўнамернасць гукавога поля забяспечвае шахматнае размяшчэнне гукагаварыцеляў).

Разгрупаваную сістэму прымяняць у глядзельных залах, а таксама на тэрыторыі адкрытых паркавых эстрад без партальных гучнагаварыцеляў непажадана па прычыне несупадзення, "разрыву" візуальнага і гукавога вобразаў, што асабліва адчувальна для гледачоў, якія займаюць бакавыя месцы паблізу ад гучнагаварыцеляў. Другі гукавы дэфект, магчымы ў гэтай сітуацыі, — прыход інтэнсіўнай гукавой энергіі ад гучнагаварыцеляў, размешчаных з тыльнага боку адносна слухача, — стварае ўмовы дыскамфорту.

*У размеркаваных сістэмах агучвання,* таксама як і ў сканцэнтраваных, гучнагаварыцелі роўнай магутнасці манціруюць "у ланцужок", на вызначанай адлегласці адзін ад аднаго. Адрозненне ў тым, што з дапамогай сканцэнтраванай сістэмы агучваюць не ўсю тэрыторыю, а толькі яе частку. Характэрным прыкладам можа служыць спосаб агучвання трыбун стадыёна, дзе гучнагаварыцелі манціруюць на стваравочай арэну бегавой дарожцы і накіроўваюць іх панелі ў бок сектараў з месцамі для гледачоў з загадзя разлічаным перакрыццём гукавых палёў. У гэтых умовах дасягаецца даволі добрая гучнасць аб'яў, перадаваемых гледачам (нават пры значным узроўні шуму трыбун).

*Комплексныя сістэмы агучвання і гукаўзмацнення* заснаваны на выкарыстанні асноўных пераваг разгледжаных метадаў размяшчэння выпраменьвальнікаў гуку на адкрытых тэрыторыях і ў глядзельных залах рознага прызначэння. Напрыклад, у зоне паркавай эстрады ці ў летнім тэатры асноўнае гучанне забяспечваецца пры дапамозе гукагаварыцеляў цэнтральнай зоны з боку сцэнічнай пляцоўкі, дадатковымі бакавымі, раўнамерна размеркаванымі па радах гукавымі калонкамі ("падгучка", ці "прастрэлы").

Комплексную сістэму агучвання і гукаўзмацнення неабходна прымяняць і пры падрыхтоўцы тэатралізаваных і масавых гімнастычных выступленняў на стадыёне. На многіх сучасных стадыёнах гукаўзмацненне, на жаль, мала прыстасавана для правядзення разнастайных тэатралізаваных дзей, таму што схема размяшчэння гучнагаварыцеляў разлічана галоўным чынам на перадачу інфармацыі гледачам, якія знаходзяцца на трыбунах стадыёна, а не на полі, дзе адбываецца дзея. У выніку на полі аказваюцца зоны, асабліва ў цэнтральнай частцы, куды гук амаль не даходзіць. Часта гук у некаторыя месцы даходзіць са скажэннем. Акрамя таго, не ўлічана, што гімнасты, якія выконваюць гімнастычныя практыкаванні (ці артысты, што выступаюць з харэаграфічнымі, цыркавымі і

іншымі нумарамі), самі паглынаюць вялікі працэнт сілы гучання.

На стадыёне ў Празе, дзе праводзяцца традыцыйныя масавыя гімнастычныя выступленні, у якіх адначасова ўдзельнічаюць да 30 000 чалавек, створана ўзорная сістэма радыёўзмацнення. З радыёстудыі ідуць тры каналы ўзмацнення: адзін — на трыбуны, другі — на поле, трэці — у раздзявальні і месцы, адведзеныя для папярэдняга пастраення ўдзельнікаў. На полі гук чуюць толькі ўдзельнікі выступлення.

Пры такой сістэме гук адначасова даходзіць да кожнага ўдзельніка, рэжысёр і кіраўнік свята пры неабходнасці могуць размаўляць з гімнастамі ў час выступлення і пры іх падрыхтоўцы да выхаду на поле.

Рэжысёр павінен памятаць, што, калі радыёўзмацненне не будзе старанна адрэгулявана і праверана, дабіцца сінхроннасці пры выкананні масавых гімнастычных практыкаванняў немагчыма.

Пасля выбару для патрэбнай зоны святочнага дзеяння адпаведнай сістэмы агучвання гукарэжысёр вызначае ўзроўні гукавога ціску, зыходзячы з магчымасці забеспячэння добрай чутнасці музычнай і моўнай інфармацыі. Найбольш аптымальны ўзровень гукавога ціску на адкрытым паветры ва ўмовах стадыёна, плошчы звычайна дасягае 96—110 дБ, для атрымання музычнага фону на ўсёй агульнай тэрыторыі парка, зоны адпачынку — 65—70 дБ.

*Запіс фанаграм* свята пачынаецца пасля вызначэння музычнага вобраза свята, а таксама адбору і складання паслядоўнасці гучання музычных нумароў, шумаў і нотных тэкстаў. Дакументам, па якім у працэсе рэпетыцый на свяце будуць працаваць гукарэжысёр і гукатэхнікі, з'яўляецца партытура музыкі і шумаў, якую складае галоўны рэжысёр пасля зацвярджэння сцэнарыя. У запісах партытуры фіксуюцца рэплікі, нумар, узровень гучнасці, моманты ўзмацнення або паслаблення гуку, размяшчэнне апаратаў і паслядоўнасць іх дзеяння. У працэсе работы над пастановай асобныя фрагмен-

ты партытуры музыкі і шумаў могуць змяняцца, набываць новыя рысы, але асноўная частка заўсёды застаецца нязменнай.

Сучасная гуказапісвальная апаратура дазваляе гукарэжысёру ствараць унікальны гуказапісвальны матэрыял, які будзе садзейнічаць высакаякаснаму гукаафармленню свята. Зразумела, што прафесійныя сістэмы каштуюць дорага. Аднак на рынку гуказапісвальнай апаратуры з'явіўся шэраг апаратаў, якія могуць замяніць нават і існуючыя міні-студыі. Прыкладам такой апаратуры з'яўляецца міні-дыск (МД). МД можна назваць рэвалюцыйным тэхнічным прарывам у запісу і мантажы музычна-гукавога матэрыялу. МД нават стварыў новы фармат у гуканосьбітах. Так на змену існуючай і рапаўсюджанай касеце прыйшоў маленькі дыск з магчымасцю запісу ў лічбавай форме. Цяжкасці запісу на МД зведзены да мінімуму. Калі, напрыклад, вядзецца запіс да свята, гукарэжысёр сустракаецца з мноствам праблем, як у кароткі час перарабіць запіс, па нейкіх прычынах не поўнасцю дароблены. З дапамогай шэрага функцый на МД за некалькі хвілін гукарэжысёр можа дадаць або выкрасліць пэўны музычны ці шумавы матэрыял. Пры гэтым якасць гуку не пагоршыцца. МД мае светлавое табло, дзе бачна, які фрагмент музычнага твора зараз працуе (кожнаму трэку можна даць асобнае імя). У МД існуе таксама функцыя перакіду трэкаў у любым кірунку і ў любое месца на дыску. Гэта робіцца, калі ў святочным дзеянні неабходна змяніць паслядоўнасць гукавых фрагментаў. Пошук трэкаў у МД за кошт яго лічбавага запісу зводзіцца да некалькіх секунд.

У многіх раённых цэнтрах і вёсках Беларусі дагэтуль карыстаюцца састарэлай гукавой апаратурай. Запіс фанаграм для такіх носьбітаў трэба рабіць у студыйных умовах на стужкавую плёнку з хуткасцю 19 мм/сек і 9 мм/сек. Падрыхтоўка двух экземпляраў плёнкі з рознай хуткасцю гукаўзнаўлення абумоўлена наступным: дарожная радыётрансляцыйная станцыя (ДРТС), якая часта становіцца цэнтраль-

ным пунктам гукаўзмацнення свята, па прычыне выпадковага або наўмыснага адключэння ад стацыянарнага электрасілкавання з мэтай пашкодзіць правядзенню свята, можа працаваць у самастойным рэжыме толькі на хуткасці 9 мм/сек. Таму арганізатарам неабходна прадугледзець і варыянт работы ДРТС у экстрэмальных умовах. Здзяйсняючы запіс фанаграм, патрэбны музычны ці шумавы фрагмент неабходна аддзяляць ракорднай плёнкай, каб у час рэпетыцый або святочнай дзеі гукааператару можна было б лёгка знайсці неабходны нумар і падрыхтаваць яго да выпуску ў эфір. У практыцы гукарэжысёрамі прынята кожную плёнку пачынаць ракордам зяленага ці сіняга колеру, а канец — чырвонага колеру. Гэта робіцца для таго, каб адразу распазнаць пачатак і канец запісу пры перамотцы і паставіць яго ў правільным кірунку. Касеты рэкамендуецца выкарыстоўваць у час запісу і гукаўзнаўлення радыёканцэртаў, што гучаць у эфіры доўгі час і не патрабуюць спынення. У тэатралізаваных дзеях, якія складаюцца з гатовых нумароў і ў якіх, зыходзячы з гэтага, гучанне фанаграм часта спыняецца, ужыванне касет непажадана, таму што на іх магнітнай плёнцы няма магчымасці аддзяліць ракордам нумары, у выніку чаго можна выпусціць у эфір не той музычны нумар і гэтым сапсаваць, пашкодзіць пластычную ці моўную дзею. Пераважны запіс дзвюх разнахуткасных фанаграм на стужкавых плёнках можна аргументаваць яшчэ дзвюма прычынамі: па-першае, гукааператару неабходна мець асобную плёнку для рэпетыцый і асобную для гукааднаўлення на свяце; па-другое, у час святочнага дзеяння па прычыне выпадковага разрыву адной плёнкі можна паставіць іншую і аднавіць музычную дзею.

Запісаны фрагмент фанаграмы павінен адпавядаць часу яго гучання на свяце. Часта гукарэжысёры, каб зберагчы і выкарыстаць фанаграму для іншых падобных свят, запісваюць музычныя і шумавыя нумары ў поўным аб'ёме. У гэтым выпадку ўзнаўленне фанаграмы неабходна рабіць з двух магнітафонаў, спачатку распланаваўшы музычныя нумары на

дзве магнітныя стужкі. Гэта дасць магчымасць, па-першае, пазбегнуць лішніх паўз у эфіры пры перамотцы плёнкі (зманціраванай на адной касеце ці бабіне ) у час, калі адзін поўны нумар трэба спыніць у пэўным месцы і знайсці другі, а па-другое, зберагчы поўны музычны твор для далейшай работы. Гукаўзнаўленне магнітнага запісу з двух магнітафонаў эфектыўна яшчэ і таму, што дае магчымасць у выпадку выхаду са строю аднаго працягваць выхад у эфір па другім апараце.

Фанаграмы свята трэба зберагаць у пакетах у вертыкальным становішчы і не дапускаць уздзеяння на іх моцных электронаў. Напрыклад, калі магнітную плёнку пакласці на працуючы тэлевізар, плёнка можа размагніціцца, а калі гэта адбудзецца ў святочны дзень, то свята будзе пад пагрозай адмены.

Гукааператар перад рэпетыцыямі і непасрэдна перад прадстаўленнем абавязаны праверыць якасць склейкі ракорднай і магнітнай плёнкі і ў выпадку раз'яднання іх пераклеіць, каб у час дзеі не ўзнікала непажаданых цяжкасцей з выпускам нумара ў эфір.

## Літаратура


*Емельянов Е.* Звукотехника в клубе. — М.: Сов. Россия, 1984.

*Емельянов Е.* Звукофикация театров и концертных залов. — М.: Искусство, 1989.

*Козюренко Ю.И.* Звукозапись с микрофона. — М.: Энергия, 1975.

*Мазо А.Я.* Магнитная лента. — М.: Энергия, 1975.

*Нисбет А.* Звуковая студия. Техника и методы использования. — М.: Связь, 1979.

*Сапожков М.А.* Звукофикация помещений. — М.: Связь, 1979.

*Урбанский Б.* Электроакустика в вопросах и ответах / Пер. с польск. — М.: Радио и связь, 1981.

## VI. ПРЫЗАВЫ ФОНД СВЯТА

Адзін з важных аспектаў падрыхтоўкі і правядзення свята — стварэнне прызавога фонду. Практыка паказвае, што ўжо на этапе стварэння сцэнарыя масава-гульнёвыя фрагменты або застаюцца за межамі ўвагі пастаноўшчыкаў святочнай дзеі, або распрацоўваюцца прыблізна. Распрацоўка ў сцэнарыі пераважна рытуальна-відовішчных формаў нават на пачатковым этапе прыводзіць да таго, што пры апісанні гульнёвых дзей адсутнічаюць не толькі пералік гульняў і забаў, але і іх тэматычная накіраванасць. Менавіта таму пры распрацоўцы арганізацыйна-вытворчага плана часта немагчыма здзейсніць сістэмны падыход у вырашэнні задач матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння гульнёвых дзей: пры складанні каштарыса рэжысёры не могуть дакладна абгрунтаваць колькасць прызоў, неабходных для правядзення рознага роду гульняў, і таму на іх набыццё ў большасці выпадкаў выдзяляюцца недастатковыя грашовыя сумы. У выніку масава-гульнёвая частка застаецца адным з самых слабых звёнаў святочных дзеянняў.

Для вырашэння творчых і арганізацыйных задач масава-гульнёвай часткі свята ў склад пастановачнай групы можна ўвесці адзінку рэжысёра масава-гульнёвых дзеянняў, і ў тым выпадку, калі гэты фрагмент у сцэнарыі недастаткова распрацаваны, ён павінен разам са сцэнарыстам і галоўным рэжысёрам удакладніць неабходны аспект святочнага дзеяння. Калі ж такую творчую адзінку не ўяўляецца магчымым увесці ў склад пастановачнай групы, то абавязкі рэжысёра масава-гульнёвых дзеянняў ускладаюцца на галоўнага рэжысёра свята або на аднаго з членаў пастановачнай групы па папярэдняй дамоўленасці з галоўным рэжысёрам.

Пры стварэнні прызавога фонду рэжысёру разам з загадчыкам пастановачнай часткі неабходна вырашыць шэраг задач.

1. Разлічыць у адпаведнасці з праграмай свята працягласць часу дзеяння кожнага гульнёвага віду і колькасць удзельнікаў, якіх неабходна ўзнагародзіць.

Падобны разлік з'яўляецца галоўным, асабліва пры ўвядзенні ў структуру свята доўгатэрміновых па дзеянні гандлёва-гульнёвых дзей (рознаварыянтныя латарэі, аўкцыёны, гандлёвыя атракцыёны), спартыўных гульняў і атракцыёнаў, розных конкурсаў і забаў.

Напрыклад, у сцэнарыі адзначана, што сельскагаспадарчая латарэя, у якой прызы разыгрываюцца адразу пасля набыцця латарэйных білетаў, праводзіцца з 14.00 да 18.00 гадзін.

Рэжысёр праводзіць разлік колькасці неабходных прызоў наступным чынам:

а) вызначае час дзеяння аднаго ўдзельніка, улічваючы яго падыход да барабана, пракручванне прызавога барабана і атрыманне прыза (практыка паказвае, што на гэта звычайна затрачваюцца 3 мінуты);

б) дзеліць звычайны час дзеяння латарэі 240 мінут (4 гадзіны) на час дзеяння аднаго ўдзельніка — 3 мінуты і атрымлівае лічбу 80, гэта значыць колькасць прызоў, неабходных для правядзення гэтай гандлёва-гульнёвай дзеі.

Падобным чынам робіцца разлік прызоў у спартыўных (рознага роду слупы, перахваты і інш.) і гандлёвых атракцыёнах.

Напрыклад, час дзеяння атракцыёна "Вараноўскі чыгун" павінен складаць 5 гадзін, а дзеянне аднаго ўдзельніка, згодна папярэдняга разліку, 1 мінута. Падзяліўшы 5 гадзін (300 мінут) на 1 мінуту, мы атрымалі лічбу 300, гэта значыць, колькасць прызоў, якія патрэбны для нармальнага функцыянавання атракцыёна.

У камандных гульнях разлік прызоў робіцца па колькасці ўдзельнікаў. Напрыклад, у перацягванні каната, дзе ўдзельнічаюць восем каманд па 10 чалавек, узнагароджваюцца толькі пераможцы. Такім чынам вызначаецца і колькасць патрабуемых прызоў — 10.

У індывідуальных конкурсах, турнірах і гульнях (адпаведна існуючай традыцыі) узнагароджваюцца пераможцы, а таксама актыўныя ўдзельнікі, колькасць якіх загадзя вызначаецца, і аплата прызоў закладваецца ў каштарыс. Напрыклад, у конкурсе выканаўцаў (гарманістаў, частушачнікаў і інш.) — першыя тры ці пяць лаўрэатаў; у конкурсе фальклорных, вакальна-інструментальных ансамбляў калектыў-пераможца можа быць узнагароджаны адным агульным прызам або агульным у сукупнасці з індывідуальным (па колькасці ўдзельнікаў); у турніры барцоў — адзін пераможца або фіналісты, а ў турніры "Грунвальд" прыз можа атрымаць удзельнік, які пераможа запар пяць удзельнікаў.

2. Вызначыць і скласці пералік прызоў адпаведна тэматычнай накіраванасці масава-гульнёвай дзеі.

На свяце кожная гульнёвая праграма ці асобныя масава-гульнёвыя дзеі павінны адлюстроўваць тэматычную накіраванасць адзначаемай падзеі. У гэтым жа напрамку пры стварэнні прызавога фонду павінны сканцэнтроўваць свае намаганні і арганізатары. Так, пераможцаў многаэтапнай эстафеты турыстаў рэкамендуецца ўзнагароджваць прадметамі турысцкай амуніцыі, удзельнікаў выстаўкі народных рамёстваў — вырабамі народных умельцаў, конкурсу музычных ансамбляў — музычнымі інструментамі. У беларускіх народных святах каляндарнага цыкла прызы павінны адпавядаць той пары года, у якой адбываецца свята, і яго сімволіцы. Так, на Гуканні вясны ўдзельнік будзе больш рады птушцы, выпечанай з цеста ці вырабленай з паперы, чым нейкай цаццы; на Купаллі — дэкаратыўнай папараць-кветцы ці вырабам народных майстроў з сімволікай свята і інш. Такім чынам, прызы, адпавядаючы тэматыцы свята, дапамогуць захаваць яго стылёвае адзінства.

Пры распрацоўцы прызавога фонду трэба ўлічваць і жанравую накіраванасць дзеі. Напрыклад, у разнастайных гульнёвых рыбалках (тураўская, пінская, браслаўская, перабродская, жырмунская), атракцыёнах "Не ляпніся ў лужыну",

“Воранаўскі чыгун” і іншых разам з каштоўнымі прызамі пажадана ўводзіць і жартоўныя ўзнагароды (старыя гумавыя галёшы, дзіравы тазік, пустую бутэльку, банку з-пад рыбных кансерваў і інш.); у жартоўным барцоўскім паядынку з ражаным “мядзведзем” пераможцу можна ўзнагародзіць жывым баранам, а пераможанага — чыгуном якой-небудзь кашы; у конкурсе на лепшую вуліцу лепшых гаспадароў адзначыць добрым падарункам, а жыхароў самай бруднай вуліцы — наборам венікаў і да т.п.

Твочы падыход пры складанні прызавога фонду, улік тэматычнай і жанравай накіраванасці гульняў садзейнічаюць стварэнню, захаванню і развіццю спецыфічнага гульнёвага комплексу кожнага канкрэтнага свята.

3. Выявіць адпаведнасць прызоў узроставаму саставу ўдельнікаў і складанасці выканання масава-гульнёвага дзеяння. Аналіз гульнёвых дзей разнастайных свят сведчыць, што ў час падвядзення вынікаў гульняў, забаў, конкурсаў і турніраў рытуал узнагароджвання даволі часта суправаджаецца дарэннем прызоў, якія не адпавядаюць узросту ўдзельнікаў. Можна назіраць, што за перамогу ў складанай, доўгатэрміновай гульні дарослым уручаюць нейкія дробязныя сувеніры (пераважна цацкі таннага кошту), што ў некаторых выпадках проста крыўдзіць людзей або выклікае іх незадаволенасць. Астатнія ўдзельнікі свята, пабачыўшы такое “заахвочванне”, часта страчваюць цікавасць да далейшага ўдзелу ў гульнях. Дзецям жа, наадварот, дараць прызы, якія не выклікаюць у іх асаблівай радасці — розны гаспадарчы інвентар і інш. Падобная практыка абумоўлена выпадковасцю падбору прызоў, які здзяйсняецца часта ў апошнюю хвіліну, і культарганізатару для рытуалу ўзнагароджвання выдаюцца абы-якія прызы або тое, што застаецца ў запасе. Таму рэжысёр масава-гульнёвых дзеянняў павінен разлічыць, якія менавіта прызы патрэбны адпаведна ўзросту ўдзельнікаў і складанасці гульнёвай дзеі. Гэта ў пэўнай ступені будзе са-

дзейнічаць арыентацыі людзей на ўдзел у гульнях, іх святочнаму настрою.

4. Стварыць запасны прызавы фонд.

На свяце даволі часта з прычыны вялікай актыўнасці ўдзельнікаў або няправільнага разліку агульнай колькасці прызоў ці з-за абыякавых адносін культарганізатараў (якія імкнуцца хутчэй скончыць гульнёвую дзею і вызваліць сябе для нейкіх іншых спраў) ствараюцца экстрэмальныя ўмовы — не хапае прызоў. На гэты выпадак і прадугледжваецца запасны прызавы фонд, які ў час правядзення свята знаходзіцца ў пэўным месцы і выдаецца па спецыяльным загадзе галоўнага рэжысёра.

Запасны прызавы фонд неабходна ствараць на аснове вызначэння дадатковай колькасці прызоў па кожнай гульнёвай праграме, конкурсу, атракцыёну, гульні, але ў значна меншым аб'ёме. Пры гэтым трэба пазбягаць выпадковасці ў падборы прызоў, а пры куплі прызоў для кожнай гульнёвай дзеі набываць іх на некалькі адзінак або дзесяткаў больш. Калі прызы запаснога фонду ці яго частка ў працэсе правядзення свята застаюцца нерэалізаванымі, то іх здаюць у загадзя вызначаную арганізацыю (гарадскі ці раённы аддзел культуры, Палац культуры і да т. п.) і захоўваюць да наступнага свята.

Фінансавае забеспячэнне прызавога фонду патрабуе даволі значных выдаткаў, таму з мэтай скарачэння незваротных выдаткаў пры вырашэнні задач фінансавання існуючая практыка вызначыла некалькі шляхоў.

1. Арганізацыя работы самаакупных гульнёвых дзей.

Некаторыя разнавіднасці гульнёвых формаў (латарэі, аўкцыёны, гандлёвыя і забаўляльныя атракцыёны) можна праводзіць, не ўтвараючы ў каштарысе свята незваротных выпадкаў. Але на пачатковым этапе падрыхтоўкі падобных гульнёвых формаў патрабуюцца пэўныя сродкі для набыцця прызоў. Дзеля гэтага па спецыяльным рашэнні аргкамітэта свята або мясцовых улад з бухгалтэрыі гарадскога ці раённага выканкама рэжысёру масава-гульнёвых дзеянняў або ар-

ганізатарам пэўных гульнёвых формаў для правядзення самаакупных забаў выдаецца пад іх асабістую адказнасць пэўная сума грошай, якія патрэбна вярнуць пасля заканчэння свята.

Арганізацыя самаакупных гульнёвых дзей — гэта даволі складаная справа, якая патрабуе дакладнага разліку па ўсіх пазіцыях, бо калі якая-небудзь забава або камерцыйнае дзеянне не выклікаюць зацікаўленасці ўдзельнікаў свята, то арганізатараў чакае фінансавы крах, і разлічвацца з бухгалтэрыяй ім давядзецца з уласных сродкаў.

Зыходным пунктам арганізацыі самаакупных гульнёвых дзей з'яўляецца іх шырокая рэклама ў сродках масавай інфармацыі. Аднача̀сова праводзяцца гутаркі з жыхарамі мясцовасці, а таксама папярэдні продаж білетаў, у выніку якога непасрэдна перад святам ужо бачна, рэнтабельна ці не наладжваць правядзенне запланаванай дзеі.

Паколькі некаторыя самаакупныя формы (латарэі, аўкцыёны) з'яўляюцца фінансавымі аперацыямі, то іх арганізацыя і правядзенне адбываюцца звычайна толькі пасля спецыяльнай пастановы мясцовага выканкама і ажыццяўляюцца пад кантролем фінансавых органаў.

Прапануем прыклад методыкі арганізацыі найбольш складанай самаакупнай святочнай гульнёвай формы — беспройгрышнай сельскагаспадарчай латарэі з разліку на дзве тысячы ўдзельнікаў. Гэтая латарэя з'яўляецца найбольш папулярнай і карыстаецца поспехам на разнажанравых святах Беларусі, у рамках якіх адбываецца кірмаш.

Арганізатары латарэі атрымліваюць у бухгалтэрыі мясцовага выканкама пазыку на пэўную суму грошай. Адпушчаную суму падзяляюць на дзве тысячы і такім чынам вызначаюць кошт аднаго білета. У выпадку, калі арганізатары латарэі праводзяць яе не на грамадскіх пачатках, а на платнай аснове, тады з адпушчанай сумы грошай аддзяляецца частка сродкаў для аплаты работы арганізатараў, а астатак дзеліцца на дзве тысячы, каб вызначыць кошт аднаго білета.

Усе білеты латарэі падзяляюцца на 20 серый (па 100 білетаў у кожнай серыі), такім чынам вызначаецца агульная сума выйгрышаў кожнай серыі.На гэтую суму закупляюцца прызы.

Прызавы фонд кожнай серыі трэба стварыць такім чынам, каб у ёй было некалькі каштоўных прызоў, цана якіх звычайна перавышае кошт аднаго білета, а астатнія — суцяшальныя. У якасці каштоўных прызоў могуць быць бычкі, парсючкі, авечкі, куры, гусі, качкі, козы, сельскагаспадарчы інвентар, а ў якасці суцяшальных — бульба, капуста, морква, буракі, яблыкі, грушы і да т.п.

Каб у кожнай серыі было больш каштоўных прызоў, што заўсёды выклікае павышаную зацікаўленасць удзельнікаў, набываць разыгрываемыя тавары неабходна ў мясцовых гаспадарках па сабекошту прадукцыі згодна папярэдняй дамоўленасці прадстаўнікоў выканкама або старшыні аргкамітэта свята з кіраўнікамі гаспадарак.

*Прыкладны разлік прызоў адной серыі*

| | |
|---|---|
| 1. Бычок (або парсючок, авечка) | — 1 адзінка |
| 2. Казляня | — 1 адзінка |
| 3. Гусі (куры, качкі, пеўні) | — 5 адзінак |
| 4. Кураня | — 10 адзінак |
| 5. Рыба свежая | — 5 пакетаў па 1 кг. |
| 6. Мёд | — 5 банак па 200 гр. |
| 7. Яблыкі | — 10 пакетаў па 1 кг. |
| 8. Морква | — 10 пакетаў па 1 кг. |
| 9. Бульба | — 30 пакетаў па 1 кг. |
| 10. Буракі | — 10 пакетаў па 1 кг. |
| 11. Малако | — 10 пакетаў па 1 л. |
| 12. Граблі | — 3 шт. |
| Разам | 100 прызоў |

Ажыццяўляючы падобным чынам набор тавараў, можна ствараць featuresтэматычныя серыі, напрыклад “дары леса”, “заалагічная”, “гаспадарчая”, “агародная”, “вадзяное царства” і інш. Наладжванне розыгрышу featuresтэматычных серый спрыяе павышанай зацікаўнасці людзей, што, урэшце, прыводзіць да поспеху гэтага камерцыйнага мерапрыемства. Часам правядзенне такіх латарэй суправаджаецца выступленнямі фальклорных калектываў, музычных ансамбляў, якія перад пачаткам розыгрышу кожнай серыі выконваюць песні, народныя музычныя творы адпаведнай тэматыкі, здзяйсняюць моўную рэкламу тавараў, а сам працэс розыгрышу прызоў суправаджаюць адпаведнай музыкай.

У працэсе правядзення латарэі ў прызавы барабан неабходна закладваць выйгрышныя білеты выключна па серыях, бо ў адваротным выпадку, калі будуць закладзены адразу ўсе білеты, можа адбыцца так, што каштоўныя прызы будуць атрыманы ўдзельнікамі ў пачатку розыгрышу, а астатнія страцяць цікавасць да ўдзелу ў гэтай гульнёвай форме. Таму да таго часу, пакуль усе білеты адной серыі не будуць разыграны, закладваць у барабан білеты наступнай серыі не рэкамендуецца. Серыі з найбольш каштоўнымі прызамі рэкамендуецца разыгрываць у самым канцы правядзення латарэі, каб удзельнікі былі больш заахвочаны ў набыцці білетаў, якія засталіся ад папярэдняга продажу.

2. Што тычыцца гандлёвых атракцыёнаў і народных забаў, то для ўзнагароджвання (за выкананне ўмоў удзелу ў іх) варта набыць недарагія прызы, таму што і кошт удзелу ў падобных формах павінен быць танным: гэта дасць магчымасць людзям з невялікімі матэрыяльнымі магчымасцямі паспытаць сваё шчасце. Як паказвае практыка, набыццё прызоў для правядзення гандлёвых атракцыёнаў і забаў трэба рабіць, зыходзячы з разліку 1:3. Звычайна на свяце на аднаго выйграўшага ўдзельніка ў сярэднім прыходзіцца па меншай меры па тры прайграўшых, а пры ўмове строгага выканання культарганізатарамі правілаў правядзення дзеі колькасць пройгрыш-

ных удзельнікаў атрымліваецца значна большай. Для заахвочвання ўдзельнікаў у пачатку і канцы работы атракцыёнаў рэкамендуецца разыгрываць больш дарагія прызы, а калі пачнецца масавы наплыў удзельнікаў — больш танныя, але час ад часу разыгрываць і каштоўныя прызы, каб падтрымліваць цікавасць да ўдзелу ў атракцыёне.

Для арганізацыі ўдзелу гледачоў у дзеянні атракцыёнаў неабходна наладзіць выпуск, а таксама папярэдні і бягучы продаж білетаў, завераных пячаткай фінансавых органаў або аддзела культуры ці Палаца культуры па ўзгадненні з фінансавымі органамі. Каб пазбегнуць махлярства з боку несумленных культарганізатараў, у час дзеяння атракцыёна трэба здзяйсняць кантроль за продажам білетаў або наладзіць цэнтралізаваны продаж білетаў з касы, культарганізатары будуць у гэтым выпадку толькі праводзіць гульнёвае дзеянне.

3. Запрашэнне на свята прафесійных груп культарганізатараў.

У апошнія гады на тэрыторыі Беларусі ствараюцца групы культарганізатараў, маючых ліцэнзіі на сваю дзейнасць, якія не толькі на святах, але і на штотыднёвых кірмашах прапануюць жыхарам платныя атракцыёны. У час святочных дзеянняў такія калектывы па папярэдняй дамоўленасці з арганізатарамі свята наладжваюць работу платных і бясплатных атракцыёнаў, у якіх разыгрываецца даволі многа прызоў.

Запрашэнне прафесійных груп культарганізатараў, якія знаходзяцца на самастойным балансе, дазваляе рашыць задачу фінансавання пэўнай часткі масава-гульнёвых дзей без фінансавых выдаткаў з боку аргкамітэта свята, што памяншае агульны кошт свята.

4. Сувязь аргкамітэта са спонсарскімі арганізацыямі.

У перыяд падрыхтоўкі свята адміністратар або камерцыйны дырэктар наладжвае кантакты з дзяржаўнымі, кааператыўнымі арганізацыямі, прыватнымі фірмамі і асобамі, якія прапануюць стаць спонсарамі свята. Гэтыя сувязі здзяйсня-

юцца, як правіла, на ўзаемавыгадных умовах: на аснове дагавораў арганізатары свята абавязваюцца ажыццявіць шырокую рэкламу розных аспектаў работы і тавараў спонсарскай арганізацыі, а яна, у сваю чаргу, выдзяляе пэўныя сродкі для набыцця сувеніраў або прапануе ў якасці прызоў тавары сваёй фірмы. Спонсарамі могуць выступаць не толькі дарослыя, але і дзіцячыя творчыя калектывы. Так, малюнкі ці вырабы народных рамёстваў, выкананыя вучнямі сярэдніх школ, школ мастацтваў, удзельнікамі мастацкіх гурткоў Палацаў дзяцей і моладзі, можна выкарыстаць у якасці прызоў падчас правядзення гульнёвых дзей у дзіцячай зоне свята.

5. Стварэнне незваротнага фонду.

Пры фінансаванні масавага свята трэба ўлічваць, што вартасць пэўнай часткі прызоў не вяртаецца ў касу свята, гэта значыць арганізатары нясуць прамыя выдаткі. Да такіх выдаткаў можна аднесці рознага роду падарункі і сувеніры гасцям свята і запрошаным калектывам, а таксама прызы, якія атрымліваюць удзельнікі розных конкурсаў, турніраў, спартыўных гульняў і гульнёвых праграм. На гэтую групу прызоў грошы вылучаюцца непасрэдна з каштарыса свята, таму рэжысёру і загадчыку пастановачнай часткі трэба пераканаўча абгрунтаваць неабходнасць набыцця тых ці іншых прызоў.

Пасля вырашэння ўсіх вышэйазначаных задач рэжысёр разам з загадчыкам пастановачнай часткі складае агульны пералік прызавога фонду, які зацвярджаецца галоўным рэжысёрам і перадаецца ў бухгалтэрыю свята.

Набыццём прызоў займаецца давераная асоба, назначаная дырэктарам свята. Пасля іх набыцця прызы прымае рэквізітар, бутафор або касцюмер. У выпадку, калі такія адзінкі ў каштарысе не прадугледжаны, прыём прызоў можа здзяйсняць любая давераная асоба, якая дае распіску аб адказнасці за прынятыя каштоўнасці з пералікам усіх адзінак прызавога фонду і іх кошту.

За некалькі дзён да пачатку або ў дзень правядзення свята рэжысёр падзяляе прызы, вызначаныя для кожнай канкрэтнай масава-гульнёвай дзеі, і перадае іх пад распіску культарганізатарам.

Пасля папярэдніх рэпетыцый і непасрэдна перад пачаткам святочнага дзеяння рэжысёр ставіць перад культарганізатарамі не толькі творчыя, але і тэхнічныя задачы.

1. Абавязковасць выканання вызначаных разлікам тэрмінаў работы, таму што менавіта гэта з'яўляецца неабходнай умовай працягласці свята ў часе і падтрымання яго тэмпарытму.

2. Беражлівасць у адносінах да прызоў.

Пасля завяршэння свята бухгалтар, галоўны рэжысёр, рэжысёр масава-гульнёвых дзей і культарганізатары складаюць і падпісваюць акт спісання прызоў незваротнага фонду, выкарыстаных у свяце. Гэты акт зацвярджаецца дырэктарам свята.

# VII. РЭКЛАМА СВЯТА

Рэклама — гэта від дзейнасці, мэтай якой з'яўляецца рэалізацыя грамадскіх, сацыяльных і іншых задач шляхам распаўсюджвання інфармацыі. Рэкламная інфармацыя фарміруецца такім чынам, каб уздзейнічаць на масавую або індывідуальную свядомасць, выклікаючы зададзеную рэакцыю выбранай сацыяльнай аўдыторыі.

Рэклама — адзін з важных аспектаў дзейнасці аргкамітэта ў падрыхтоўцы жыхароў мясцовасці да ўспрымання і актыўнага ўдзелу ў святочных дзеяннях. Рэклама свята складаецца з комплексу разнастайных мерапрыемстваў інфармацыйнай і творчай накіраванасці і рэалізуецца па розных каналах.

1. За пэўны час (месяц ці два) да правядзення свята сродкі масавай інфармацыі (прэса, радыё, тэлебачанне) даюць шэраг артыкулаў, інтэрв'ю, перадач аб будучым святе і калектывах, якія будуць на ім выступаюць.

У гэты перыяд у мясцовых клубах, Дамах і Палацах культуры мэтазгодна правесці серыю тэматычных вечароў, вусных часопісаў, якія б адлюстроўвалі накіраванасць будучага свята. Напрыклад, калі рыхтуецца свята бальнага танца, можна арганізаваць вечары, прысвечаныя гісторыі паходжання і развіцця асобных танцаў — вальса, факстрота, танга і іншых; пры падрыхтоўцы свята камернай, духавой ці эстраднай музыкі гледачам можна прапанаваць вечары-партрэты беларускіх і замежных кампазітараў — прапагандыстаў музыкі — або вусныя часопісы, прысвечаныя музычным інструментам; пры арганізацыі народнага свята, на клубных вечарах удзельнікаў можна зацікавіць віктарынамі і гульнёвымі праграмамі, якія адлюстроўваюць традыцыі правядзення канкрэтнага каляндарнага свята перад святам Перамогі або Днём незалежнасці Беларусі можна наладзіць сустрэчы з ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны і інш.

З гэтымі ж мэтамі за тыдзень—два да свята ў адпаведнасці з накіраванасцю будучай дзеі можна арганізаваць фестываль мастацтва, разнастайныя конкурсы (выканаўцаў прыпевак, гумару, патрыятычнай песні і інш.), пераможцы якіх будуць выступаць на свяце. Калі ёсць магчымасць, то запрошаным творчым калектывам з іншых раёнаў можна прапанаваць прыняць удзел у тыдні культуры на вёсцы, дзе яны выступяць са сваімі канцэртнымі праграмамі і запросяць жыхароў на свята.

2. Адной з формаў рэкламы з'яўляецца ўдзел жыхароў у падрыхтоўцы святочных дзей. Так, рэпетыцыі мастацкай самадзейнасці, выраб карнавальных касцюмаў, твораў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, трэніроўкі спартыўных калектываў нясуць у сабе пэўны інфармацыйны зарад. Вельмі важна, каб арганізатары даводзілі да ведама ўсіх удзельнікаў, што, дзе і ў які час будзе адбывацца, а ўдзельнікі, у сваю чаргу, маглі данесці гэтыя весткі да жыхароў наваколля.

3. За два—тры дні да пачатку свята арганізатары наладжваюць выпуск друкаванай прадукцыі (афішы, запрашальныя білеты, праграмы, буклеты). У афішы ўказваюцца месца і час правядзення свята, яго поўная праграма і склад пастановачнай групы. Афіша павінна быць яркай, запамінальнай, выкананай у рознакаляровых тонах. Афішы свята звычайна размяшчаюць на рэкламных тумбах і шчытах. Але, як паказвае практыка, выкарыстанне толькі гэтага сродку дастаўкі друкаванай інфармацыі да гледача не заўсёды эфектыўнае, таму што сярод мноства розных аб'яў і плакатаў афіша свята бывае непрыметнай. Зыходзячы з гэтага, для друкаванай прадукцыі свята трэба адшукаць такое месца, з якога б яна прыцягвала да сябе ўвагу жыхароў, напрыклад на вітрынах магазінаў, універсамаў, рэстаранаў, кафе, бараў і інш. Акрамя таго, эфектыўным сродкам інфармавання з'яўляецца размяшчэнне афіш на бакавым шкле гарадскога транспарту (метро, трамваі, тралейбусы, аўтобусы), плаўсродках (цеплаходы, ка-

тэры), што час ад часу засяроджвае ўвагу жыхароў на рэкламе свята.

4. Напярэдадні свята неабходна праводзіць папярэдні продаж білетаў разнастайных камерцыйных дзей (відовішчаў, атракцыёнаў, латарэй), што ў пэўнай ступені будзе спрыяць папулярызацыі святочных мерапрыемстваў і далучэнню жыхароў мясцовасці да актыўнага ўдзелу ў свяце.

5. Выпуск напярэдадні свята апошняга нумара мясцовай газеты можа адлюстраваць усю праграму святочных дзеянняў з тлумачэннем, што, дзе і калі будзе адбывацца. Гэта акажа жыхарам і гасцям свята вялікую дапамогу ў інфармаванасці аб будучых святочных падзеях, у выніку чаго кожны чалавек у адпаведнасці са сваім густам, інтарэсам, зацікаўленасцю зможа выбраць для наведвання тое ці іншае мерапрыемства і спланаваць асабістую праграму ўдзелу ў свяце.

6. Значную дапамогу ў рэкламе свята могуць аказаць работнікі гандлю шляхам выпуску напярэдадні свята ў продаж разнастайных тавараў са святочнай сімволікай, цэлафанавых пакетаў, вымпелаў, значкоў і інш.

7. Непасрэдна ў дзень свята эфектыўна ўздзейнічае на людзей тэатралізаваная рэклама, якая ажыццяўляецца ў розных святах у адметных формах. Так, у беларускіх народных святах каляндарнага цыкла (Каляды, Масленіца, Гуканне вясны, Вялікдзень, Юр'я, Сёмуха, Купалле, Дажынкі) тэатралізаванай рэкламай з'яўляюцца абходы фальклорнымі калектывамі ці групамі ражаных падворкаў вёскі, горада, у час якіх удзельнікі гуртоў віншуюць людзей са святам і запрашаюць на яго дзеі; у свяце песні — гэта так званы "зорны выхад" творчых калектываў, якія з песнямі ідуць з розных канцоў горада, вёскі да месца правядзення фестывалю. У музычным свяце такую ролю можа выконваць народны, духавы ці эстрадны аркестр, які на трамвайнай платформе, аўтамашыне ці рачным трамвайчыку, абклееным афішай, у пэўных месцах спыняецца, дае невялікі канцэрт і запрашае ўсіх на свята. Тэатралізаваная рэклама ўвасабляецца і ў форме разнастайных

шэсцяў па населеным пункце карнавальных, конных, спартыўных кавалькад і да т.п.

Такім чынам, комплекс рэкламных мерапрыемстваў не толькі інфармуе жыхароў аб свяце, але і мае арыентацыйную накіраванасць, стварае святочны настрой.

*Арганізацыя работы прэс-цэнтра.* За некалькі месяцаў або тыдняў да пачатку свята адміністратар аргкамітэта дамаўляецца з прадстаўнікамі мясцовых сродкаў масавай інфармацыі аб публікацыі цыкла артыкулаў і правядзенні радыё-, тэлеперадач аб будучым свяце. Зместам артыкулаў і перадач можа быць інтэрв'ю з членамі пастановачнай групы, аргкамітэта, з якіх жыхары могуць даведацца, што новага і цікавага будзе ў свяце, аб яго гісторыі, традыцыях.

Напярэдадні свята прадстаўнікоў прэс-цэнтра пажадана запрасіць на асобныя рэпетыцыі з тым, каб яны маглі пазнаёміцца з рознымі фрагментамі свята, будучай дзеяй. На гэтых рэпетыцыях, асабліва на генеральнай, фотакарэспандэнты, відэа- і кінааператары будуць мець магчымасць зняць на плёнку ў пажаданых ракурсах тыя фрагменты дзеі, на якіх у час прадстаўлення работа аператараў на сцэнічнай пляцоўцы забараняецца, каб не перашкаджаць гледачу.

За некалькі дзён да свята або ў дзень святкавання аргкамітэт збірае прадстаўнікоў прэс-цэнтра, якія будуць акрэдытаваны на свяце. У час гэтай сустрэчы яны атрымліваюць поўную інфармацыю аб тым, што будзе адбывацца на свяце. Галоўны рэжысёр на аснове сцэнарыя расказвае аб мастацкіх рысах будучай дзеі, найбольш цікавых момантах і мізансцэнах, вобразным рашэнні, падказвае, на што трэба звярнуць асаблівую ўвагу, адлюстроўваючы свята ў фота-, відэа- і кінаматэрыялах. Акрэдытаваным карэспандэнтам можна прапанаваць правесці з гледачамі і ўдзельнікамі свята экспрэс-інтэрв'ю, а яго вынікі апублікаваць у газеце або паказаць у відэа- і кінастужках. Адным са шляхоў заахвочвання да работы акрэдытаваных карэспандэнтаў можа стаць аб'яўлены аргкамітэтам конкурс рэпартажаў аб свяце, пера-

можцы якога будуць узнагароджаны прызамі і каштоўнымі падарункамі. Аб эфектыўнасці такіх конкурсаў сведчыць плённая работа ў гэтым кірунку мінскіх камерцыйных фірмаў "Экспафорум", "Мінскі кірмаш", аргкамітэта міжнароднага свята народнай музыкі "Звіняць цымбалы і гармонік" (г.Паставы).

Для работы прэс-цэнтра на свяце павінна быць спецыяльна абсталяванае памяшканне або палатка з тэлефонам, дзе карэспандэнты могуць адпачыць, абмяняцца ўражаннямі аб прагледжаным дзеянні.

Такім чынам, рознабаковая дзейнасць аргкамітэта па рэкламе свята дапаможа своечасова праінфармаваць жыхароў мясцовасці аб будучым дзеянні, зацікавіць, заахвоціць і далучыць іх да канкрэтнага ўдзелу ў святочных акцыях, а таксама садзейнічаць з'яўленню аб'ектыўнай інфармацыі аб свяце, якое адбылося.

*Узор*

*Дагавор*
*на распрацоўку эскізаў друкаванай прадукцыі*
*(фестываль нацыянальных культур)*

*Мінск* *16 лістапада 200 ... г.*

1. Агульныя палажэнні

Рэспубліканскі цэнтр нацыянальных культур Міністэрства культуры і друку Рэспублікі Беларусь, далей Цэнтр, дзейнічаючы на падставе Статута, у асобе дырэктара... з аднаго боку, і мастак... далей Мастак, з другога боку, заключылі дадзены дагавор аб наступным.

2. Прадмет дагавора

2.1. Цэнтр даручае, а Мастак выконвае эскізную распрацоўку наступных работ:

— эмблемы фестывалю;

— плаката памерам 45х60 см і яго арыгінал-макет;

— спецыяльнага бланка;

— канверта;

— вокладкі для праграмы;

— запрашэння;

— дыплома;

— папкі;

— буклета.

2.2. Тэрмін выканання работы — 30 лістапада 200 … г.

3. Парадак здачы і прыёму работ

3.1. Мастак да 23 лістапада 200 … г. падае на зацвярджэнне аргкамітэта фестывалю варыянты эскізаў вышэйназваных работ.

3.2. У выпадку нязгоды аргкамітэта з прапанаванымі варыянтамі эскізаў Мастак у 5-дзённы тэрмін павінен улічыць усе заўвагі і перад выкананнем арыгіналаў макетаў зацвердзіць на пасяджэнні аргкамітэта канчатковы варыянт.

4. Адказнасць бакоў і парадак разліку

4.1. Пры згодзе аргкамітэта з прапанаванымі эскізамі, Цэнтр выплачвае Мастаку (указаць суму) рублёў.

4.2. Пры адмоўным стаўленні да заўваг аргкамітэта і адказу Мастака ў перапрацоўцы эскізаў Цэнтр выплачвае яму 25% названай сумы, прычым эскізы застаюцца ў Цэнтры з правам іх далейшага выкарыстання.

Дагавор складзены ў двух экземплярах для двух бакоў і сапраўдны да 5 снежня 200 … г.

5. Юрыдычныя адрасы бакоў

| | |
|---|---|
| Рэспубліканскі цэнтр<br>нацыянальных культур<br>220030, г. Мінск,<br>вул. Я.Купалы, 21 | Мастак<br>Маршак Веніямін Самуілавіч |
| Подпіс _______________ | Подпіс __________________ |

Пасля распрацоўкі эскізаў друкаванай прадукцыі складаецца акт аб іх прыёмцы, які з'яўляецца падставай для закрыцця работ.

# VIII. АРГАНІЗАЦЫЯ СВЯТОЧНАГА КІРМАШУ

## Састаў дырэкцыі кірмашу

Для арганізацыі святочнага кірмашу пры аргкаміцеце свята ўтвараецца дырэкцыя, у якую ўваходзяць прадстаўнікі гандлёвых арганізацый, грамадскага харчавання, сферы абслугоўвання, органаў культуры і спорту. На сваіх пасяджэннях дырэкцыя кірмашу распрацоўвае план падрыхтоўкі святочнага гандлю і яго культурную праграму.

Паколькі кірмаш у Беларусі заўсёды быў з'явай інтэрнацыянальнай, то на сучасныя святочныя таргі (асабліва ў памежных раёнах) можна запрасіць гандлюючыя арганізацыі з суседніх раёнаў бліжняга замежжа і вызначыць для іх асобнае месца. У зоне харчовых тавараў можна было б наладзіць работу беларускай карчмы, украінскага шынка, рускага тракціра, польскай кавярні, каўказскай шашлычнай, сярэднеазіяцкай чайханы, малдаўскага віннага склепа і інш. Усе гандлёвыя пункты (кіёскі, палаткі, магазіны) павінны быць аздоблены элементамі мастацка-дэкаратыўнага афармлення, што садзейнічае больш эстэтычнаму ўспрыманню дзеі. Гандляроў неабходна апрануць у святочныя народныя строі, што надае таргам нацыянальны каларыт. Арганізатарам трэба ведаць, што традыцыйна беларускі святочны гандаль быў дробнарознічным. Таму асаблівую ўвагу належыць звярнуць на падрыхтоўку гандляроў-каробачнікаў, якія сваімі дзеяннямі ствараюць непасрэдную, жывую, гульнёвую атмасферу святочнага кірмашу.

## Патрабаванні да месца правядзення кірмашу

Выбар месца для размяшчэння і будаўніцтва аб'ектаў святочнага кірмашу (прадуктовых палатак, кіёскаў і іншых дробнарознічных гандлёвых пунктаў, а таксама баз для харчовых прадуктаў) узгадняецца з мясцовымі органамі

санітарнага нагляду. Памеры тэрыторыі кірмашу ўстанаўліваюцца з улікам колькасці насельніцтва, якія будуць карыстацца таргамі. Кірмаш размяшчаюць з такім разлікам, каб да яго былі добрыя пад'язныя дарогі; яго плошчу фарміруюць з улікам сцёку вады. Кірмаш павінен размяшчацца на адлегласці не меней за 1,5 км ад месца збору смецця і не меней за 500 м ад прамысловых прадпрыемстваў і складоў, у якіх вытворчасць звязана з выдзяленнем пылу і пахаў, а таксама іншых аб'ектаў, якія могуць быць прычынай забруджвання тэрыторыі кірмашу.

Кірмашовую плошчу падзяляюць на дзве часткі — гандлёвую і абслуговую. У гандлёвай частцы ў адпаведнасці з відамі гандлю вылучаюць асобныя дзялянкі для:

а) гандлю харчовымі прадуктамі ў закрытых памяшканнях (магазіны, павільёны, ларкі і інш.);

б) гандлю харчовымі прадуктамі са сталоў, размешчаных радамі па роду прадуктаў (рыбныя, мучныя, малочныя, садавіна, гародніна і інш.);

в) гандлю харчовымі прадуктамі з вазоў і аўтамашын;

г) продажу хатніх жывёл;

д) прамысловых тавараў;

ж) вырабаў народных рамёстваў;

з) таргоў птушкай;

і) прадпрыемстваў культурна-бытавога абслугоўвання (медпункт, цырульня, майстэрня па рамонту абутку).

*Санітарна-медыцынскія патрабаванні.* Продаж харчовых прадуктаў на кірмашы дазваляецца толькі пасля праверкі іх у адпаведнасці з устаноўленымі правіламі ветэрынарна-санітарнай экспертызы.

На сучасных кірмашах пры продажы халодных і гарачых страў звычайна ўжываецца посуд разавага карыстання, выраблены з пластмасы. Кошт гэтага посуду, як правіла, уваходзіць у кошт страў, а часам аднаразавы посуд прадаецца і асобна. Але ў тых выпадках, калі на святочным гандлі ўжываюць металічны і фарфора-фаянсавы посуд, то на

кірмашы неабходна ўсталяваць мыйныя перасоўныя памяшканні для мыцця лыжак, відэльцаў і іншага інвентару з устройствам мыйных металічных ваннаў. Гандлёвыя пункты прадуктаў харчавання павінны быць забяспечаны ў дастатковай колькасці мылам, ручнікамі і шчоткамі для мыцця рук. У тых выпадках, калі гандаль праводзіцца некалькі дзён, кірмаш павінен быць далучаны да водаправода і каналізацыі, што дае магчымасць абсталяваць цёплыя прамыўныя прыбіральні з умывальнікамі. Калі каналізацыя адсутнічае, то можа быць дазволена ўстройства перасоўных прыбіральняў. Месца размяшчэння ўмывальнікаў пры адсутнасці каналізацыі ўзгадняецца з мясцовымі органамі санітарнага нагляду. На кірмашах, далучаных да водаправода, робяць водаправодныя калонкі, а таксама пітныя фантанчыкі ў тых месцах, дзе мясцовымі органамі санітарнага нагляду дазваляецца выкарыстанне сырой вады для піцця. У адваротным выпадку арганізатары павінны павялічыць аб'ём гандлю фруктовымі напіткамі, сокамі, мінеральнай вадой, квасам і інш .

На кірмашах, дзе тавар падвозяць аўтамабільным транспартам, устанаўліваюць металічныя зборнікі з крышкамі для збору смецця ёмкасцю 50 л. Для дробнага смецця ўстанаўліваюць урны. Тэрыторыю кірмашу ачышчаюць да пачатку гандлю і пасля яго заканчэння. У цёплую пару года абавязкова паліваюць вадой. Бягучую ўборку праводзяць на працягу ўсяго рабочага дня. Вываз смецця ў час таргоў не дазваляецца.

З пачатку таргоў трэба правесці санітарнае абследаванне аб'ектаў дробнарознічнага гандлю. Санітарны ўрач або яго памочнік правярае выкананне агульных санітарных патрабаванняў, абавязковых для харчовых прадпрыемстваў, правілы асабістай гігіены, парадак захавання прадуктаў, іх якасць і інш.

У цёплую пару года на кірмашах забараняецца продаж харчовых прадуктаў, якія хутка псуюцца.

## Гандлёва-гульнёвыя дзеі

Адметная асаблівасць традыцыйнага беларускага святочнага гандлю — разнастайныя гандлёва-гульнёвыя дзеі. Таму на аднаўленне і захаванне нацыянальнай культурна-гістарычнай спадчыны дырэкцыя кірмашу павінна звярнуць вялікую ўвагу. Так, у зоне продажу хатніх жывёл можна наладзіць сельскагаспадарчую латарэю з розыгрышам бычкоў, парсючкоў, авечак і інш.; у зоне продажу птушак — птушыны аўкцыён; у месцы, дзе прадаецца рыба, — гандлёвыя атракцыёны “Міёрскі павук”, “Палеская рыбалка”, “Рыбная латарэя”; у радах гародніны і садавіны — мінскую латарэю “Па спісу”, “Воранаўскі чыгун”, валожынскую забаву “Не ляпніся ў лужу”; у зоне цацак — “Дзіцячую рыбалку”, “Івацэвіцкую рулетку”; у зоне продажу кандытарскіх вырабаў — атракцыён “Пастаўскі пернік”, латарэю цукерак у форме гульні “Цот — лішка”; на кніжным гандлі — кніжную латарэю і да т.п. Арганізацыя гульнёвых формаў гандлю дае магчымасць уцягнуць у дзею значную колькасць людзей, садзейнічае іх актывізацыі, стварае жыццярадасны настрой у гледачоў.

Адной з галоўных задач пры ўвасабленні гульнёвых формаў гандлю з’яўляюцца захаванне ў структуры кірмашу традыцыйных беларускіх гандлёвых атракцыёнаў і стварэнне на гэтай аснове новых гандлёва-гульнёвых формаўтварэнняў.

Гандлёвыя атракцыёны як адна з найцікавейшых формаў гандлёва-гульнёвага дзеяння ўзніклі на кірмашах Беларусі ў канцы XIX ст. Галоўнай мэтай арганізацыі гандлёвых атракцыёнаў была рэалізацыя тавару сродкамі гульні. Шырокай папулярызацыі гэтых гульнёвых дзей садзейнічала менавіта тое, што яны былі не толькі формай набыцця тавару, але і ператварыліся ў своеасаблівую форму адпачынку, дзе людзі маглі паўдзельнічаць у імправізавана-гульнёвым дзеянні.

У сучаснай кірмашовай культуры гандлёвыя атракцыёны сталі адметнай рысай беларускіх кірмашоў, іх этнічна-спецыфічнай асаблівасцю. Пачынаючы з 80-х гг. XX ст. яны

былі адроджаны ва ўсіх рэгіёнах Беларусі. Змест і задачы гандлёвых атракцыёнаў вельмі простыя і зразумелыя, удзел у іх не патрабуе спецыяльнай падрыхтоўкі, і таму яны і сёння карыстаюцца велізарным поспехам.

Арганізацыйныя аспекты і методыку правядзення гульнёвых атракцыёнаў лёгка зразумець і асвоіць з ніжэйпрапанаваных апісанняў іх зместу і канструкцыйных асаблівасцей.

*Палеская рыбалка.* Гэтую форму гадлёва-гульнёвага дзеяння ў старадаўнія часы ладзілі на кірмашах Пінска, Століна , Турава, Жыткавіч, Кажан-Гарадка.

У драўляны чан з вадой запускалі жывую рыбу. Удзельнікі, заплаціўшы пэўную суму грошай (заўсёды невялікую), рыхтаваліся да рыбалкі. Адначасова ў атракцыёне маглі ўдзельнічаць да двух дзесяткаў чалавек. У час гульні ім дазвалялася або стаяць з краю чана, або залазіць ў чан, але лавіць рыбу яны павінны былі толькі голымі рукамі.

Па свістку арганізатара атракцыёна гульцы пачыналі лавіць рыбу. Тэрмін — 5 секунд, якія ўсе гледачы лічылі хорам. Каб злавіць рыбіну за гэты кароткі час, трэба праявіць кемлівасць, рашучасць , сілу і хуткасць. Усё, што зловіш, — тваё! Некаторыя гульцы стваралі своеасаблівыя саюзы: адзін з іх залазіў у чан і гнаў рыбу ў другі канец, а астатнія выцягвалі яе з вады і ўжо затым дзялілі паміж сабой.

Гэты атракцыён і раней, і цяпер збірае мноства людзей (гледачоў і ўдзельнікаў). Смех, рогат, разнастайныя рэплікі-парады, жарты заўсёды суправаджаюць дзеянне гэтага атракцыёна.

Чан для "Палескай рыбалкі" ўяўляе прамавугольную канструкцыю з дрэва даўжынёй 10 м, шырынёй 1,5 м і вышынёй 1,0 м. Спачатку гэтыя чаны рабілі на драўляных стыках і загадзя запаўнялі вадой, каб шчыліны разбухлі і не прапускалі ваду, а непасрэдна ў час свята ваду ў чане замянялі. Гэтая канструкцыя ў старыя часы на кірмашах стаяла два — чаты-

ры тыдні, і выраблялі яе звычайна з драўляных дошак або цэлых слупоў. У наш час з мэтай захавання сухога дрэва, якое затым можна выкарыстаць на іншыя патрэбы, на дно драўлянай канструкцыі ўкладваюць поліэтыленавую плёнку, каб чан не прапускаў ваду.

*Жырмунская рыбалка* — кірмашовы гандлёвы атракцыён, які ладзілі ў вёсцы Жырмуны Воранаўскага раёна і які быў адноўлены ў 80-я гг. мінулага стагоддзя ў парку гарадскога пасёлка Воранава на раённым кірмашы свята народных рамёстваў. Арганізатары гэтай дзеі сродкамі гульні рэалізуюць рыбу, вырашчаную ў сваёй гаспадарцы. Дзякуючы арыгінальнай адметнасці гульнёвага зместу, гэты атракцыён напаўняе святочныя дзеянні Воранаўшчыны непаўторным каларытам. Атракцыён "Жырмунская рыбалка" мае прынцыповыя адрозненні ад "Палескай рыбалкі".

На агароджанай плотам з вярбы пляцоўцы стаіць канструкцыя драўлянага чана, які запоўнены вадой і жывой рыбай. Гульцы, заплаціўшы грошы за ўдзел, заходзяць на пляцоўку і становяцца ў трох кроках ад чана. Арганізатары на твар кожнага ўдзельніка надзяваюць маску з бяросты. Па камандзе распарадчыка атракцыёна ўдзельнікі павінны тры разы павярнуцца вакол сябе, падысці да чана і пачаць лоўлю рыбы рукамі. Час дзеяння адной групы ўдзельнікаў, пачынаючы ад каманды распарадчыка да фіналу лоўлі, 15 секунд.

Чан для "Жырмунскай рыбалкі" — гэта прамавугольная канструкцыя з негабляваных дошак, якія знутры пакрыты толем або поліэтыленавай плёнкай. Памеры чана: даўжыня — 10 м, шырыня — 1,5 м, вышыня — 0,8 м.

*Парабродская рыбалка* — старадаўні кірмашовы гандлёвы атракцыён у мястэчку Пераброддзе Дзісненскага павета (цяпер Міёрскі раён), які быў адроджаны ў 1983 г. на свяце 350-годдзя Міёраў.

Месца дзеяння атракцыёна мае наступнае дэкаратыўнае афармленне: частка возера на мелкаводным месцы каля берага агароджана рыбацкімі сеткамі. Частка берага агароджана плотам і мае ўваходную браму, перад якой прадаюцца білеты жадаючым паспытаць сваё шчасце. У атракцыёне адначасова могуць прымаць удзел да 30 чалавек (пераважна падлеткі, маладыя хлопцы, мужчыны).

Па камандзе арганізатара гульцы заходзяць у возера і, трымаючы дзвюма рукамі сачок-падхватнічак, на працягу адной мінуты імкнуцца падчапіць рыбу, якая ў вялікай колькасці плавае ў агароджы. Але злавіць рыбіну прапанаваным чынам — справа даволі нялёгкая з-за вельмі вузкай гарлавіны сачка-падхватнічка. Той, хто не злавіў ніводнай рыбіны, выбывае з гульні або за дадатковыя грошы працягвае спаборніцтва. Рыба, якая трапіла ў сачок, застаецца ў гульца.

Як паказала статыстычная справаздача аб правядзенні свята, прысвечанага 350-годдзю Міёраў, у гэтым атракцыёне прынялі ўдзел 608 чалавек, што сведчыць аб мэтазгоднасці яго арганізацыі.

*Павук* — гандлёвы атракцыён, які з'яўляўся адметнай асаблівасцю гандлёва-гульнёвых кірмашовых дзей асобных раёнаў Віцебшчыны, і сёння прыцягвае да сябе шматлікіх удзельнікаў і гледачоў.

На канцы бервяна (даўжынёй 8—10 м), ачышчанага ад кары і пад нахілам укапанага над вадой, замацоўваўся кошык з некалькімі буйнымі рыбінамі. Гулец, заплаціўшы вызначаную суму грошай за ўдзел у атракцыёне, павінен быў прайсці па бервяне, змазаным воскам, дастаць кошык з рыбай і вярнуцца назад. І калі ўдзельнік не звальваўся ў ваду, рыбу пакідалі яму ў якасці прыза. Больш складаны варыянт гэтага атракцыёна існаваў у Міёры і мястэчку Перабродздзе Дзісненскага павета.

У запоўненую вадой яму памерам 12х16м і глыбінёй 1,5—2 м укапвалі змазанае вашчынай дзевяціметровае бервяно. Да

яго канца, якое ўзнімалася над вадой, вяроўкай замацоўвалі рыбацкую прынаду пад назвай “павук”. Гэты “павук” ляжаў на дне штучнага вадаёма, які кішэў рыбай. Патрабавалася прайсці па бервяне, узяць з “павука” рыбы і вярнуцца назад. Перамагчы ў гэтым атракцыёне ўдавалася далёка не ўсім.

Атракцыён уяўляў гульнёвае дзеянне, якое давала магчымасць удзельнікам праявіць спрыт, кемлівасць, у незвычайнай форме рэалізаваць тавар і зацікавіць, далучыць пакупніка да свайго гандлёвага рада.

*Браслаўская рыбалка* — гандлёва-гульнёвае дзеянне, якое праводзілася раней і праводзіцца зараз у форме змагання двух удзельнікаў.

На гандлёвай плошчы ўсталёўваліся дзве велізарныя драўляныя бочкі, запоўненыя вадой і азёрнай рыбай. Двое гульцоў, заплаціўшы грошы за ўдзел, надзявалі на твары маскі і па камандзе арганізатара спрабавалі рукамі выцягнуць рыбу з бочкі. Каму раней гэта ўдавалася, той лічыўся пераможцам і атрымліваў рыбу. У час гэтага дзеяння гледачы паміж сабой біліся аб заклад, хто з удзельнікаў першым злові́ць рыбу. Па існуючай традыцыі кожны выйграўшы заклад павінен заплаціць гульцу і гаспадару атракцыёна кошт удзелу ў гэтай забаве. Такім чынам, гэты своеасаблівы рыбны таталізатар заахвочваў многіх людзей, для якіх рыбалка станавілася відовішчам, магчымасцю паказаць свой спрыт, а таксама вызначыцца сярод астатніх удзельнікаў сваёй прадбачлівасцю.

“Браслаўская рыбалка” прыносіла даволі значныя прыбыткі арганізатарам, якія імкнуліся наладжваць шматгадзінныя змаганні паміж жыхарамі розных вёсак, а той, хто перамагаў трох сапернікаў запар, атрымліваў падарунак.

*Не ляпніся ў лужыну* — гандлёвы атракцыён, які праводзілі звычайна на Спас. На Валожыншчыне ён быў вядомы яшчэ да Вялікай Айчыннай вайны.

На агароджанай плотам пляцоўцы на козлах памерам 7х1 м стаялі некалькі начовак з вадой. На паверхні вады плавалі велізарныя прыгожыя смачныя яблыкі. Начоўкі былі так замацаваны на козлах, што лёгка пераварочваліся.

Гулец, заплаціўшы невялікую суму, выходзіў на пляцоўку і адмерваў ад начовак 10 крокаў. Затым яму завязвалі вочы. Падняўшы рукі па камандзе арганізатара, гулец павінен быў тры разы павярнуцца вакол сябе, зрабіць 10 крокаў і рэзка апусціць рукі. Калі рукі пападалі на яблык, гулец атрымліваў яго ў якасці прыза, а калі няўдала кранаў начоўкі — з іх на ўдзельніка вылівалася вада, што выклікала рогат і кпіны гледачоў. Калі ж гулец пайшоў не ў тым напрамку, ён выбываў з гульні, страціўшы грошы. Пустыя начоўкі зноў запаўняліся вадой, і гульня працягвалася.

Выйграць у гэтым атракцыёне на Валожыншчыне лічылася справай ганаровай. Існавала традыцыя: на Спас хлопец дарыў сваёй дзяўчыне (каханай ці сяброўцы) яблык з атракцыёна “Не ляпніся ў лужыну”.

У 1984 г. на першым народным кірмашы Мінскай вобласці ў Валожыне гэтая гульня мела вялікі поспех і хутка распаўсюдзілася па ўсёй Беларусі.

*Воранаўскі чыгун*. Гадлёвы кірмашовы атракцыён “Чыгун” ладзілі на кірмашах Воранаўшчыны яшчэ да Вялікай Айчыннай вайны, і ў ім разыгрывалі самыя разнастайныя прызы.

Канструкцыя атракцыёна ўяўляла чатырохвугольны фанерны макет печы, у якой на падстаўцы стаяў чыгун з прызам. Гулец, заплаціўшы грошы за ўдзел, адыходзіў на 10 крокаў ад печкі і станавіўся да яе тварам. Уладар або арганізатар атракцыёна завязваў гульцу вочы хусткай і даваў у рукі вілкі. Па камандзе арганізатара гулец павінен быў тры разы павярнуцца вакол сябе, зрабіць 10 крокаў, засунуць вілкі ў печку і выцягнуць чыгунок. Калі гэта ўдавалася, ён атрымліваў прыз, што знаходзіўся ў чыгуне, а калі не, то выбываў з гульні.

Гледачы маглі падказваць гульцу, што рабіць, у якім напрамку крочыць, і таму заўсёды вакол гэтага атракцыёна гучалі харавыя падказкі, лямант і рогат. Вельмі часта гульцы ў час трохкратнага пераварочвання вакол сябе гублялі арыентацыю ў прасторы і ішлі з вілкамі ў руках на гледачоў, што выклікала іх бурную рэакцыю.

Зараз атракцыён "Воранаўскі чыгун" ладзяць на розных кірмашах і святах па ўсёй Беларусі.

*Чыгуны*. Гандлёвы атракцыён "Чыгуны" да 1917 г. быў адметнай асаблівасцю кірмашоў у вёсцы Падневічы (цяпер Валожынскі раён), мястэчках Івянец і Ракаў. Гэты атракцыён меў цікавы і даволі складаны гульнёвы змест і карыстаўся папулярнасцю як у мужчын, так і ў жанчын.

На адлегласці 6—7 м адзін ад аднаго ў зямлю забівалі два драўляныя шасты вышынёй 2,5 м, на якіх праз кожныя 10 см забівалі цвікі. Паверх шастоў ускладалі шасці-, сяміметровы шост, і вышыню знаходжання гэтага шаста можна было мяняць шляхам апускання яго на цвікі вертыкальных шастоў.

На гарызантальны шост на адлегласці 50 см адзін ад аднаго прывязвалі вяроўкамі чыгуны, а ўнізе (на зямлі ля аднаго вертыкальнага шаста) клалі прызы (невялікую бочачку мёду ці што іншае).

Гулец, які плаціў за ўдзел у атракцыёне невялікія грошы, станавіўся ля аднаго з вертыкальных шастоў, на галаву яму надзявалі вялізны чыгун так, каб чалавек мог бачыць толькі зямлю ля сваіх ног. Трэба было змейкай ісці ад аднаго шаста да другога (дзе ляжалі на зямлі прызы) і па гэтай дарозе не зачапіць ніводны з чыгуноў, што віселі над галавой. Калі правілы гульні выконваліся, удзельніка чакаў прыз. Але перамагчы ў гэтым атракцыёне было даволі складана, і часцей за ўсё пад звон закранутых чыгуноў і рогат гледачоў удзельнік выбываў з гульні.

*Палеская рыбная латарэя.* Латарэя-рыбалка была адной з папулярных кірмашовых дзей Століншчыны, якую ладзілі ў 20—30-я гг. XX ст.

У вялізных бочках ці драўляных чанах або проста на рацэ Гарынь на ваду пускалі паплаўкі — кавалачкі дрэва, у якіх з двух бакоў замацоўвалі загнутыя ў пятлю цвікі. Да ніжняй пятлі паплаўка прывязвалі вяроўку або леску (з такім разлікам, каб яна дасягала дна ракі або драўлянай канструкцыі), а да свабоднага канца вяроўкі прымацоўвалі прыз. У латарэі-рыбалцы на 50—60 паплаўках знаходзіліся нябачныя ўдзельнікам разнастайныя прызы. Разам з каштоўнымі былі і жартоўныя: пляшка гарэлкі, рваны бот, нягодны хамут, кансервавая банка, дзіравы тазік, маленькая плотачка ці салёная цюлька і інш.

Гулец, заплаціўшы грошы, атрымліваў вуду і за адну хвіліну павінен быў выцягнуць выбраны паплавок. Ну, а які прыз — гэта каму як пашанцуе.

Як сведчыць інфарматар, латарэя мела вялікі поспех. За адну хвіліну надзвычай мала камусьці ўдавалася здабыць прыз, што прымушала ахвотнікаў па некалькі разоў удзельнічаць у латарэі, а гэта — прамая матэрыяльная мэтазгоднасць правядзення гандлёвага дзеяння.

Разам з тым латарэя-рыбалка з'яўлялася сапраўдным відовішчам, збіраліся шмат людзей, якія рабілі разнастайныя парады гульцам, радаваліся іх поспехам ці жартавалі з іх няўдалай рыбалкі.

*Латарэя-рулетка.* Да Вялікай Айчыннай вайны на кірмашах Пружанскага і Івацэвіцкага раёнаў Брэсцкай вобласці штогод ладзілі латарэю-рулетку, у якой разыгрывалі кандытарскія вырабы ці разнастайныя рэчы. Гэтыя латарэі ў кожнай мясцовасці мелі свае асаблівасці.

Пружанская латарэя-рулетка ўяўляла гарызантальны паўтараметровы драўляны круглы шчыт, які круцілі па ходу сонца ці наадварот. Па акружнасці шчыта змяшчаліся прызы.

У цэнтры знаходзілася свабодна замацаваная драўляная рыба з загнутым цвіком у роце. Гулец плаціў грошы за ўдзел у латарэі, сам раскручваў шчыт у адзін бок, а рыбу — у другі, прычым загадзя ён клаў грошы каля выбранай ім рэчы. Калі па заканчэнні руху круга рыба чаплялася цвічком за цвік выбранай гульцом рэчы, то ён забіраў прыз і грошы, а калі не, то грошы пераходзілі ва ўласнасць гаспадара латарэі.

У Івацэвіцкім раёне вертыкальны драўляны шчыт быў двухметровы. Па вялікім знешнім крузе набівалася восем цвікоў, да якіх чапляліся кандытарскія вырабы. Ад цвікоў да цэнтра круга вялі намаляваныя крэйдай прамыя лініі, а вызначала прызы фанерная рука, якая была сціснутая ў кулак з выцягнутым уперад указальным пальцам. Удзельнік латарэі, заплаціўшы загадзя грошы ў дамоўленай суме, раскручваў фанерную руку, і калі яна спынялася дакладна на любой з ліній, атрымліваў у падарунак кандытарскі выраб, які быў падвешаны да цвіка гэтай лініі.

*Сельскагаспадарчая латарэя.* На кірмашах у Століне да Вялікай Айчыннай вайны велізарную цікавасць удзельнікаў штогодніх святочных таргоў выклікала бяспройгрышная сельскагаспадарчая латарэя. Тут разыгрываліся каштоўныя прызы (бычкі, парсючкі, бараны, пеўні, куры, гусі) і суцяшальныя (морква, бульба, яблыкі, грушы і інш.).

Месцам правядзення латарэі з'яўляўся парк або луг каля ракі Гарынь. Латарэйную пляцоўку агароджвалі плотам, рабілі ўваходную браму, каля якой ставілі стол з латарэйным барабанам. Непасрэдна на пляцоўцы рабілі выстаўку тых тавараў, якія разыгрывалі ў латарэі. Асобна стаялі хатнія жывёлы, птушкі, ляжала гародніна, садавіна. А гледачы цісналіся да плота, разглядаючы, што там яшчэ засталося, ці варта пайграць у латарэю, паспытаць сваё шчасце, удачу.

Удзельнік плаціў грошы і апускаў руку ў вялізны латарэйны барабан, які перад гэтым сам раскручваў. Выцягваў за-

кручаную паперку-білецік, разгортваў і бачыў напісаны там прыз: ці бычок, ці морква — як пашанцуе...

Свой прыз гулец павінен сам забіраць з латарэйнай пляцоўкі. Часта гэта ператваралася ў відовішча, калі "шчаслівец" ганяўся па пляцоўцы за пеўнем, гуссю ці бараном, што выклікала жывы водгук у прысутных і жаданне паўдзельнічаць у латарэі.

У некаторых мясцінах Беларусі сельскагаспадарчая латарэя набыла форму латарэі-алегры, дзе розыгрыш прызоў праводзіцца адразу пасля набыцця білета. Ёсць раёны, дзе загадзя рэалізуюць білеты на права ўдзелу ў латарэі, а ўжо затым на свяце ўдзельнікі, прад'явіўшы пэўны квіток, запускаюць руку ў латарэйны барабан.

Сельскагаспадарчая латарэя, як паказвае практыка, заўсёды з'яўляецца адным з яскравых і запамінальных святочных дзеянняў, якое вызначаецца высокім эмацыянальным напалам і масавасцю ўдзелу.

## Культурная праграма кірмашу

У сучаснай святочнай культуры Беларусі ніводны юбілей ці свята горада, ніводная ўрачыстасць гарадскога, абласнога, тым больш рэспубліканскага маштабу не абыходзяцца без святочнага гандлю з відовішчамі і забавамі.

Захоўваючы старадаўнія беларускія традыцыі правядзення кірмашоў, сучасным арганізатарам трэба імкнуцца да таго, каб усе кірмашовыя дзеі былі прасякнуты элементамі спаборніцтва. У нашы дні кірмашовая дырэкцыя многіх раёнаў Рэспублікі Беларусь працягвае развіваць гэтую традыцыю: на конкурснай аснове работнікі дзяржаўнага і кааператыўнага гандлю змагаюцца за лепшае мастацкае афармленне свайго павільёна, рэкламу і продаж тавараў; калгасы і прыватныя асобы арганізоўваюць конкурсныя выстаўкі з продажам сельскагаспадарчай прадукцыі; кожны сельсавет — выставупродаж вырабаў народных рамёстваў; сельскі клуб змагаецца

за лепшы калектыў мастацкай самадзейнасці, а таксама выканаўцаў прыпевак, гумарыста, гарманіста ці інструментальны ансамбль.

Культурная праграма кірмашовага свята павінна складацца з наступнага: тэатралізаванае адкрыццё; работа гандлёвых выстаў і творчых экспазіцый; фестываль мастацтваў; спартыўныя спаборніцтвы; конкурсы народнай музыкі і асобных выканаўцаў; кірмашовыя атракцыёны; гульні і забавы; дзіцячая зона; урачыстае закрыццё кірмашу з падвядзеннем яго вынікаў і тэатралізаваным фіналам.

У час правядзення кірмашу яго тэрыторыя падзяляецца на відовішчную, масава-гульнёвую, спартыўную і дзіцячую зоны дзеяння.

***Відовішчная зона дзеяння.*** Структура праграмы можа быць складзена з фестывалю фальклорнага мастацтва, выступленняў прафесіянальных творчых калектываў, народных вандроўных груп, конкурсаў народных інструментальных ансамбляў, выканаўцаў прыпевак, гумару і інш.

Пры арганізацыі відовішчаў трэба ўлічваць, што з'явы кірмашовага тэатра павінны перш за ўсё адлюстроўваць і развіваць беларускія фальклорныя традыцыі, у выніку чаго пазагандлёвая частка кірмашу набудзе адметныя нацыянальныя асаблівасці.

Вызначаючы прасторавае вырашэнне кірмашу, неабходна асаблівую ўвагу звяртаць на галоўную сцэнічную канструкцыю, дзе будуць адбывацца цэнтральныя відовішчныя мерапрыемствы. Дзеля гэтага трэба пабудаваць эстрадную пляцоўку вышынёй не меней за 1,2 м, каб гледачам было зручна назіраць прапанаваную дзею. Гэта пляцоўка можа быць стацыянарнай або часовай (на аснове платформаў грузавікоў). Разам з тым трэба памятаць, што раней на беларускіх кірмашах не было сцэнічных падмосткаў і артысты працавалі сярод гледачоў, у прамым кантакце з імі. Таму ў зоне відовішчных дзей для вандроўных артыстычных груп, перасоўных музычных ансамбляў, маленькіх цыркавых калекты-

ваў можна зрабіць фрай (адзін ці некалькі): акрэслены на зямлі канатамі ці вяроўкамі круг дыяметрам 13 м, дзе вызначаныя калектывы будуць выступаць. Канцэрты ў фраі, як паказвае практыка, з'яўляюцца моцным сродкам эстэтычнага і эмацыянальнага ўздзеяння таму, што ў гэтых умовах у значнай ступені сціраецца мяжа паміж гледачамі і артыстамі, што павышае эфектыўнасць успрымання прапануемай дзеі.

**У *масава-гульнёвай зоне*** кірмашу мы рэкамендуем наладзіць работу гарадка традыцыйных кірмашовых забаў, дзе кожны чалавек зможа праявіць свае здольнасці, паказаць сілу і спрыт.

Методыка арганізацыі і правядзення народных забаў прапануецца ў ніжэйпрыведзеных апісаннях.

*Слуп-кола.* Гэтую забаву, якую ладзілі на кірмашах Віцебшчыны, патрабавала ад удзельнікаў значнай фізічнай сілы і спрыту, таму ў ёй прымалі ўдзел пераважна маладыя хлопцы і мужчыны.

Для падрыхтоўкі атракцыёна выбіралі дрэва з роўным ствалом даўжынёй прыблізна 15 м, якое напярэдадні апрацоўвалі: здымалі кару і націралі ствол воскам.

На вяршыні слупа замацоўвалі ў гарызантальным становішчы кола ад воза, да якога прывязвалі на вяроўках разнастайныя прызы: боты, гармонік і інш. Слуп укапвалі ў зямлю. Удзельнік атракцыёна павінен быў залезці на слуп і зняць адзін з прызоў. Узлезці па слізкім слупе задача не з лёгкіх і патрабуе значных намаганняў гульца, каб перамагчы.

Гэты атракцыён быў адроджаны ў Міёрах у 1983 г. на свяце 350-годдзя горада.

*Палескі прызавы слуп.* Атракцыён быў падобны да віцебскага слупа-кола, але меў свае канструктыўныя і тэхнічныя асаблівасці.

Для гэтага атракцыёна выбіралася раўнаствольнае дрэва не менш чым 16 м. З дрэва здымалі кару, укапвалі ў зямлю, на

канцы ўбівалі тоўсты паўтараметровай даўжыні металічны драб, да якога мацавалі ў вертыкальным становішчы кола ад воза з прызамі. Удзельнік павінен быў залезці на верх слупа, стаць на калені ці на ногі, ухапіўшыся за прут і варочаючы кола, выбраць і адвязаць любы з прызоў.

Задача гульца была надзвычайна складанай, тым не менш гэты атракцыён карыстаўся вялікай папулярнасцю, знаходзілася нямала ахвотнікаў паказаць смеласць, сілу, рашучасць і дабыць каштоўны прыз для сябе ці сваёй каханай.

Гэты атракцыён быў вернуты з забыцця ў верасні 1982 г. у гарадскім пасёлку Жыткавічы Гомельскай вобласці на I Рэспубліканскім кірмашы.

*Гродзенскі слуп-падкавырка.* Атракцыён зафіксаваны ў многіх месцах Гродзеншчыны, з'яўляецца унікальнай забавай, якая вылучаецца з усіх прызавых слупоў беларускай зямлі арыгінальнасцю тэхнічнага вырашэння і гульнёвага зместу.

У зямлю на адлегласці 4 м укапвалі два ачышчаныя ад кары слупы памерамі адпаведна 5 м і 15 м. У вяршынях слупоў прарэзвалі пазы (5х5 см), праз якія прапускалі вяроўку даўжынёй 35 м. Над пазамі ў бярвёны забівалі цвікі, якія скручвалі дугападобна, каб вяроўка не звалілася на зямлю, а вольна праходзіла праз вяршыні слупоў. Адзін канец вяроўкі навязвалі на цвік, забіты на вышыні 1 м, а за другі канец вяроўкі прывязвалі прыз.

Вядучы, перабіраючы рукамі вяроўку, дастаўляў прыз да вяршыні вялікага слупа і прапаноўваў удзельнікам свята выпрабаваць сваю сілу і спрыт — дастаць прыз.

Гулец пачынаў лезці па вялікім слупе. Калі ён не дабіраўся да вяршыні, а спыняўся недзе пасярэдзіне, арганізатар трохі прыспускаў прыз, які ўжо вісеў амаль над галавой гульца. Гэта часта давала ўдзельніку дадатковыя сілы, і ён імкнуўся забрацца вышэй і вышэй, услед за прызам, які падымаўся, натуральна, патроху ўверх.

Такім чынам, адбывалася своеасаблівая гульня паміж гульцом і вядучым, у выніку якой удзельнік або даставаў прыз, або пад рогат і кпіны прысутных спускаўся ўніз. Калі ж у атракцыёне ўдзельнічалі дзеці, прыз вісеў не надта высока і заўсёды аддаваўся ў падарунак смеламу дзіцяці.

Гродзенскі слуп-падкавырка, упершыню адроджаны ў парку Скідаля на кірмашы 1982 г., вельмі хутка распаўсюдзіўся па ўсёй вобласці і стаў адметнай гульнёвай асаблівасцю свят Гродзеншчыны.

*Турнір "Кароль курка"*. У сярэдзіне XVIII ст. у Слуцку і Нясвіжы па загадзе князя Радзівіла ладзілі турніры стральцоў "Кароль курка", на якіх павінны былі выступаць усе дарослыя мужчыны горада, а пераможцы атрымлівалі прызы.

На аснове гэтых гістарычных падзей культурнага жыцця старажытнага беларускага горада студэнты кафедры рэжысуры свят Мінскага інстытута культуры ў 1981 г. аднавілі дадзенае спартыўнае змаганне ў Манькавіцкім парку горада Століна. Захаваўшы змест старажытнага спаборніцтва, забава набыла новыя мастацкія рысы.

На вялікім драўляным шчыце памерам 2,5 х 16 м праз кожныя 50 см на цвік падвешвалі рознакаляровыя шарыкі, да якіх на вяровачках замацоўвалі розныя прызы. Гулец, заплаціўшы грошы за ўдзел, станавіўся на лінію стральбы, якая знаходзілася на адлегласці 25 м ад драўлянага шчыта, і атрымліваў арбалет ці лук. Патрабавалася з аднаго выстралу папасці ў паветраны шарык і атрымаць упаўшы на зямлю прыз. Гэты атракцыён карыстаецца вялікім поспехам, таму што дае магчымасць кожнаму жадаючаму паказаць сваю меткасць, вызначыцца сярод астатніх удзельнікаў.

*Грунвальд.* На аснове старажытнай народнай забавы, у якой два ўдзельнікі імкнуліся спіхнуць адзін аднаго з бервяна, студэнты кафедры рэжысуры свят Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры прыдумалі новы атракцыён.

На драўляных слупах, укапаных у зямлю на 1,5 м, замацоўваецца ў гарызантальным становішчы пяціметровае бервяно, да якога з двух бакоў прыстаўлены лесвіцы.

На бервяно з бакоў узбіраюцца два "рыцары". У аднаго з іх на галаве шлем формы воіна Вялікага княства Літоўскага, а ў левай руцэ шчыт з выявай Пагоні. У другога — амуніцыя крыжаносца. У правай руцэ абодва рыцары трымаюць сетку з вялікім надзьмутым дзіцячым мячом. Задача гульцоў: абараняючыся шчытом, збіць мячом шлем з галавы саперніка або яго самога з бервяна. Гулец, які пераможа пецярых сапернікаў запар, атрымлівае прыз.

Гэты атракцыён зараз карыстаецца вялікім поспехам, асабліва сярод падлеткаў.

*Турнір рыцараў.* Атракцыён ладзяць на вадзе і ў ім удзельнічаюць дзве каманды весляроў і два "рыцары".

На карме кожнай з дзвюх лодак робяць метровае ўзвышэнне, на якое становіцца рыцар у шлеме і плашчы. У руцэ ён трымае трохметровую дзіду, на канцы якой прыбіты драўляны квадрат памерам 10 х 10 см.

Весляры выводзяць лодкі на цэнтр акваторыі і паступова пачынаюць зბліжацца. У задачу рыцараў уваходзіць спіхнуць дзідай саперніка з лодачнага ўзвышэння ў ваду.

У гэтым атракцыёне, які ўяўляе сабой яскравае відовішча, могуць прымаць удзел каманды.

Разам з традыцыйнымі забавамі ў масава-гульнёвай зоне кірмашу можна правесці фестываль культарганізатараў раёна ці горада, дзе ўдзельнікі могуць выступаць з разнастайнымі гульнёвымі праграмамі. Як паказвае практыка, так званае "гульнёвае поле", дзе адначасова выступаюць дзесяткі арганізатараў розных гульняў, часта з'яўляецца адным з самых яркіх і запамінальных фрагментаў культурнай праграмы, таму што дае магчымасць сотням людзей прыняць удзел у прапанаваным гульнёвым дзеянні.

***Спартыўная зона.*** Абавязковай часткай сучаснага беларускага кірмашу з'яўляецца спартыўная праграма. Папулярнасцю карыстаюцца тут традыцыйныя спартыўныя забавы беларусаў: турнір асілкаў, а таксама барцоў — прадстаўнікоў розных вёсак, барацьба з ражаным мядзведзем, выпрабаванні скакавых і рысістых парод коней. Разам з тым на кірмашах звычайна праводзяць і сучасныя спартыўныя гульні.

Паколькі на раённых ці рэгіянальных кірмашах прысутнічае большасць насельніцтва мясцовасці, спартсмены выкарыстоўваюць гэтую сітуацыю для папулярызацыі розных відаў спорту. Ладзяць фіналы раённых спаборніцтваў па барацьбе, футболе, валейболе, шахматах, шашках, перацягванні каната, а ў асобных месцах па найбольш папулярным відзе спорту — веславанні (Скідал), конным спорце (Вілейка, Шуміліна, Гродна, Воранава) і інш. На некаторых кірмашах паказальныя выступленні праводзяць баксёры, фехтавальшчыкі, майстры баявых адзінаборстваў, майстры гімнастыкі, культурысты. Людзі розных узроставых катэгорый удзельнічаюць у старажытных і сучасных забавах: вызначэнне "караля курка" (стральба з арбалета, вінтоўкі, паляўнічая стральба), лепшага лучніка ў стральбе са спартыўнага лука, спаборніцтва на лепшага кольцакідальніка, самага спрытнага канатаходца, які ідзе па тонкай жэрдцы, самага дужага ў атракцыёне "Сіламер". Спартыўныя праграмы на кірмашы сталі дзейсным сродкам актывізацыі ўдзельнікаў свята, садзейнічаюць вырашэнню праблемы фізічнага выхавання чалавека, уносяць дынамізм у святочны штогодні гандаль.

***Дзіцячая зона.*** Аналіз развіцця сучасных кірмашоў Беларусі сведчыць, што ў іх актыўна ўдзельнічаюць людзі розных узростаў. Таму на святочным гандлі арганізатары шмат увагі надаюць дзецям, спецыяльна для якіх ладзяць гульнёвыя зоны, дзе выступаюць дзіцячыя калектывы мастацкай самадзейнасці школ, Дамоў і Палацаў культуры, Дамоў юнацтва, культарганізатары праводзяць разнастайныя сюжэтна-

гульнёвыя праграмы для дзяцей, вялікую цікавасць уяўляюць і сучасныя дзіцячыя пацехі. Паспрабуйце адгадаць імя жывога пеўня, якое напісана на паперцы, прывязанай да яго лапкі? Адгадаеце — ваш певень.

А вось дзіцячая рыбалка. За двухметровай чатырохграннай шырмай стаіць скамарох. За невялікую плату дзіця атрымлівае вудачку, закідвае за шырму — і выцягвае прыз (які чапляе яму ўдзельнік, што сядзіць за шырмай).

А ў другім месцы бацька з маці і дзецьмі становяцца на шалі, і калі іх вага будзе складаць, напрыклад 160 кг 300 г, яны заслугоўваюць прыз (падарунак).

На дзіцячых пляцоўках амаль заўсёды арганізоўваюцца выстаўка-продаж дзіцячых вырабаў, майстроў малюнка і лепкі, конкурсы юных канструктараў, паказальныя выступленні клубаў службовага сабакаводства, спаборніцтвы авія- і суднамадэлістаў і інш. Гульнёвая дзіцячая пляцоўка — адметная асаблівасць сучаснага беларускага кірмашу — дазваляе з маленства далучаць дзяцей да нацыянальнай культуры, выхоўваць у іх павагу і любоў да спадчыны бацькоў і дзядоў.

Такім чынам, кірмаш, вырашаны ў творчым і арганізацыйным плане як поліфункцыянальная з'ява, зможа адначасова задаволіць матэрыяльныя, эстэтычныя і фізічныя запатрабаванні чалавека, з'явіцца сродкам эмацыянальнай разрадкі, актывізацыі ўдзельнікаў свята.

## Літаратура

*Архіў* ІМЭФ АН Беларусі. Ф. 8. Воп. 12. Спр. 41.

*Басько В.* Пакровы на Магілёўшчыне. — Мн.: БелІПК, 1993.

*Гуд П.А.* Традыцыйнае і новае ў сучасных беларускіх восеньскіх святах // Весці Акадэміі навук БССР. Сер. грамад. навук. — 1986. — № 6.

*Гуд П.А.* Народныя забавы беларусаў як сродак стварэння сучаснага гульнёвага комплексу ў парку. — Мн.: Мін-ва культуры РБ, 1995.

*Гуд П., Гуд Н.* Беларускі кірмаш. — Мн.: Полымя, 1996.

*Жук В.* Кірмаш, або Латарэя, у якой выйграюць усе // Беларусь. — 1983. — № 2.

*Жук В.* Кирмаш // Трезвость и культура. — 1987. — № 1.

*Козловский И.* Зельвенская ярмарка // Неман. — 1968. — № 5.

*Устинюк В.* Кирмаш// Вокруг света. — 1983. — № 9.

# IX. АРГАНІЗАЦЫЯ АБСЛУГОЎВАННЯ ГАСЦЕЙ, АФІЦЫЙНЫХ ДЭЛЕГАЦЫЙ І ТВОРЧЫХ КАЛЕКТЫВАЎ

## Размяшчэнне запрошаных гасцей і калектываў

У перадсвяточныя дні напярэдадні вялікіх урачыстасцей у гарадах і вёсках узнікаюць складанасці з размяшчэннем людзей, таму што ў гэты перыяд атэлі звычайна перапоўнены.

Адміністратар або дырэктар свята ці вызначаны для вырашэння праблем засялення людзей член аргкамітэта павінен загадзя (за 1—3 месяцы да пачатку ўрачыстасцей) дамовіцца з гасцінічнай гаспадаркай горада (раёна) аб размяшчэнні на вызначаны тэрмін у пэўных атэлях усіх прыбываючых гасцей, а таксама ўдзельнікаў, якія заняты ў правядзенні свята.

Распрацоўваючы план размяшчэння ўдзельнікаў свята, спачатку трэба сабраць папярэднюю інфармацыю па гэтым пытанні.

1. Якія дэлегацыі, з якіх краін і абласцей прыбываюць на свята, іх агульная колькасць, мужчынскі і жаночы склад дэлегацый, сацыяльны і прафесійны статус удзельнікаў. Гэтую інфармацыю можна ўзяць з дасье на творчыя калектывы і дэлегацыі гасцей, якія распрацоўваюцца ў аргкамітэце.

2. Якія гасцініцы могуць прыняць людзей на вызначаны перыяд і якую колькасць, кошт пражывання на аднаго чалавека і агульны кошт іх утрымання. Калі атэльная гаспадарка не ў стане задаволіць неабходныя патрэбы ў гэтым плане або каштарыс не вытрымлівае выдаткаў на размяшчэнне гасцей, адміністратару свята трэба звярнуць увагу на інтэрнаты вышэйшых і сярэдніх навучальных устаноў, прадпрыемстваў, арганізацый. Справа ў тым, што амаль пры кожным інтэрнаце маюцца гасцінічныя комплексы або пакоі, таму частку дэлегацый можна размясціць і тут. У інтэрнатах (пры дамоўленасці з кіраўніцтвам арганізацыі) дэлегацыі гасцей можна размясціць не толькі ў гасцінічных пакоях і комплек-

сах, а і ў пакоях навучэнцаў, студэнтаў, рабочых. Гэта нязцяжка зрабіць, напрыклад, у той час, калі навучэнцы або студэнты знаходзяцца на зімовых ці летніх канікулах. У іншыя тэрміны або ў экстрэмальных сітуацыях адміністрацыя можа дамовіцца з пражываючымі ў інтэрнаце людзьмі аб іх кароткатэрміновым перасяленні ў іншыя ўжо заселеныя пакоі, а на вызваленыя месцы размясціць гасцей.

Умовы пражывання ў інтэрнаце могуць быць больш простыя і менш камфартабельныя, чым у атэлі, але гэта, па-першае, дазволіць станоўча вырашыць пастаўленую праблему, а па-другое, выдаткі на размяшчэнне будуць значна меншымі, чым у атэлях.

У некаторых выпадках арганізатары свят практыкуюць размяшчэнне запрошаных удзельнікаў свята ў турыстычных лагерах, санаторыях і дамах адпачынку. Для гэтага набываюць на неабходны тэрмін патрэбную колькасць пуцёвак, што адразу можа вырашыць як праблему размяшчэння, так і харчавання.

Сабраўшы папярэднюю інфармацыю, адміністратар разам з дырэктарам свята распрацоўваюць план размяшчэння ўдзельнікаў і зацвярджаюць яго ў старшыні аргкамітэта. Затым здзяйсняецца дагавор з адміністрацыяй атэляў або прадпрыемстваў ці навучальных устаноў, дзе маюцца інтэрнаты, і пералічваюцца на іх рахунак грошы за пражыванне ўдзельнікаў свята на вызначаны перыяд.

Позняй вясной або ранняй восенню (калі надвор'е не халоднае) удзельнікаў свята можна размясціць у дзіцячых летніках, якія ў гэты час яшчэ або ўжо не працуюць. Харчаванне ўдзельнікаў можна наладзіць непасрэдна ў летніку або ў бліжэйшых пунктах грамадскага харчавання.

У летні перыяд дапамогу ў вырашэнні праблемы размяшчэння гасцей можа аказаць спорткамітэт або турысцкая арганізацыя. У гэтым выпадку ў вызначанай арганізацыі згодна дамоўленасці неабходна арэндаваць турысцкія палаткі з драўлянай падстаўкай, спальныя мяшкі і пасцельныя рэчы (падушкі, прасціны, коўдры і інш.). У маляўнічым месцы

(у лесе, на беразе возера, ракі) будуюць палатачны гарадок, што дае магчымасць сабраць усе дэлегацыі ў адным месцы. Да палатачнага гарадка трэба правесці часовую лінію электраперадач, зрабіць (згодна з санітарнымі правіламі) калодзеж або наладзіць штодзённы прывоз свежай вады. Харчаванне ўдзельнікаў на гэтым часовым жылым аб'екце можа адбывацца па спецыяльным графіку падвозу людзей на аўтобусах да пэўнага пункта грамадскага харчавання. Або наладжваецца работа паходнай кухні, якую можна арандаваць у вайсковым падраздзяленні. Такі ж палатачны гарадок мэтазгодна паставіць непадалёку ад здраўніц, дзе і будуць харчавацца людзі.

Вечарам у такіх палатачных гарадках можна арганізаваць разнастайныя культурныя мерапрыемствы (кастры дружбы, прагляд кінафільмаў на адкрытым паветры, сустрэчы з цікавымі людзьмі, песенныя фестывалі, спартыўныя спаборніцтвы і інш.).

Пабудова палатачнага гарадка дасць магчымасць у час правядзення свята вырашыць многія задачы: размяшчэння і харчавання людзей, арганізацыі вольнага часу, своечасовага збору на рэпетыцыі і інш.

У раённых цэнтрах, дзе гасцініцы невялікія па колькасці месцаў, адной са своеасаблівых формаў размяшчэння людзей можа з'явіцца арганізацыя перадсвяточнага фестывалю мастацтваў, так званыя тыдні культуры на вёсцы. У гэтым выпадку па спецыяльным графіку запрошаныя на свята калектывы ў перадсвяточныя дні даюць канцэрты ў загадзя вызначаных вёсках. Тут яны харчуюцца ў мясцовай сталовай, а на начлег размяшчаюцца ў мясцовай гасцініцы, інтэрнаце, школе або па хатах жыхароў. Усе гэтыя пытанні трэба раней узгадніць з кіраўнікамі мясцовага сельсавета ці гаспадаркі. Канцэрты ў вёсках можна даваць бясплатныя. У гэтым выпадку выдаткі на ўтрыманне гасцей бярэ на сябе гаспадарка.

Часам такія канцэрты адбываюцца на платнай аснове з папярэднім продажам білетаў. Адной з формаў распаўсюджвання білетаў можа быць прамы разлік гледачоў

праз касу, другой — пастанова сельскага сходу аб агульным праглядзе канцэрта з утрыманнем яго кошту ў канцы месяца з зарплаты работнікаў гаспадаркі або выплаты кошту канцэрта са сродкаў гаспадаркі, запланаваных на культмасавую работу. Частка грошай пералічваецца на рахунак творчага калектыву, а частка — у бухгалтэрыю гаспадаркі за ежу і жыллё. Размяшчэнне ўдзельнікаў творчых калектываў на начлег па хатах можа здзяйсняцца як на грамадскіх пачатках па дамоўленасці з асобнымі гаспадарамі, так і на платнай аснове за кошт гаспадаркі, якая прымае калектыў. Плата за начлег у такіх выпадках адбываецца па дамоўленасці бакоў.

У падобным варыянце размяшчэння ўдзельнікі творчага калектыву днём маюць магчымасць прыбыць на рэпетыцыю свята ў раённы цэнтр, а вечарам працягваць сваю гастрольную паездку, але ўжо ў іншай гаспадарцы. Такая практыка даволі распаўсюджана ў многіх раёнах краіны, дзе набыты пэўны вопыт у гэтым плане паказвае, што арганізацыя перадсвяточнага тыдня культуры на вёсцы дапамагае вырашыць пры падрыхтоўцы свята поліфункцыянальныя задачы, спрыяе якаснаму правядзенню святочнай дзеі.

Пры засяленні членаў замежных дэлегацый у атэль неабходна ўлічваць перш за ўсё ўзаемаадносіны прадстаўнікоў розных нацыянальнасцей. Каб пазбегнуць канфліктных сітуацый, не рэкамендуецца размяшчаць на адным паверсе прадстаўнікоў ваюючых паміж сабой дзяржаў.

Звесткі аб размяшчэнні калектываў і асобных гасцей даводзяцца да ведама кіраўнікоў груп: калі госці павінны засяліцца (хто і ў які нумар), а калі пакінуць месца пражывання. Часам куратару аддаюць толькі агульны пералік месцаў пражывання, а ўжо сам працэс рассялення адбываецца пры непасрэдным удзеле кіраўніка дэлегацыі. Але ў любым выпадку куратар нясе адказнасць за размяшчэнне сваёй дэлегацыі: згодна прадстаўленага яму плана ён забяспечвае сустрэчу дэлегацыі, суправаджае яе да месца размяшчэння і дапамагае рассяліць людзей, вырашаючы пры гэтым розныя пытанні.

## Харчаванне ўдзельнікаў свята

Свята запамінаецца не толькі ўражаннямі ад убачаных відовішчаў і разнастайных масава-гульнёвых дзей, але і тым, што людзі елі і пілі ў гэтыя святочныя дні. Таму арганізацыя харчавання з'яўляецца важным праблемным аспектам святочных дзеянняў.

Практыка паказвае, што на сучасных святах Беларусі работнікі грамадскага харчавання, супрацоўнікі прыватных фірмаў не заўсёды надаюць дастатковую ўвагу гэтым пытанням.

Таму дырэктару свята як яго галоўнаму каардынатару сумесна з арганізацыямі харчгандлю і прадпрыемствамі грамадскага харчавання неабходна вырашыць наступныя задачы.

1. Забеспячэнне кожнай зоны дзеяння свята сваім пунктам харчавання.

Пасля азнаямлення са сцэнарным планам і прынцыпам прасторавага вырашэння свята адказныя за харчаванне ўдзельнікаў павінны скласці план размяшчэння пунктаў харчавання, які неабходна ўдакладніць з галоўным рэжысёрам і галоўным мастаком. Напрыклад, у зоне кірмашу можна паставіць кіёскі з халоднымі і гарачымі стравамі, у відовішчнай зоне — з прахаладжальнымі напіткамі і бутэрбродамі, у дзіцячай зоне — наладзіць продаж з латкоў марожанага, кандытарскіх вырабаў, напояў або работу кафэ "Ласунак" у форме лёгкіх павільёнаў са столікамі. Арганізатарам, зыходзячы з уліку мяркуемага прытоку людзей, трэба разлічыць неабходную колькасць пунктаў харчавання, каб не ствараць вялікую чаргу, што часта выклікае незадаволенасць удзельнікаў, псуе ім настрой і перашкаджае эфектыўнаму ўспрыманню святочных дзей.

2. Разлік тэрміну работы пунктаў харчавання.

На многіх святах можна назіраць такую сітуацыю, калі пункты харчавання працуюць толькі першую палову дня, а

вечарам, калі адбываецца масавы прыток людзей на святочныя мерапрыемствы, кіёскі і прылаўкі ўжо пустыя, што не спрыяе задавальненню матэрыяльных патрэб удзельнікаў і павышэнню іх святочнага настрою.

Зыходзячы з гэтага, дырэктару свята неабходна прасачыць, каб адказныя супрацоўнікі прадпрыемстваў грамадскага харчавання, па-першае, распрацавалі двухзменны графік работы прадаўцоў, а па-другое, разлічылі аб'ём і асартымент прадуктаў, неабходных на час іх работы (з улікам мяркуемай колькасці наведвальнікаў). Рашэнне гэтых задач дасць магчымасць арганізаваць бесперапынны гандаль, атрымаць большы даход ад рэалізацыі выстаўленых харчовых тавараў і, галоўнае, задаволіць патрэбы насельніцтва.

3. Аднаўленне культурна-бытавых традыцый беларусаў.

У Беларусі імклівымі тэмпамі ідзе працэс стварэння новай святочнай культуры, заснаванай перш за ўсё на народных традыцыях. Амаль ва ўсіх раёнах краіны адроджаны беларускія народныя святы каляндарнага цыкла. Але дагэтуль адным з самых вострых пытанняў застаецца захаванне і аднаўленне нашых спрадвечных культурна-бытавых традыцый. Якія Каляды без куцці, каўбас і іншых мясных страў, Масленіца без варэнікаў, галушак і бліноў, Гуканне вясны без выпечаных з цеста птушак і інш.? Але чамусьці ў народных святах каляндарнага тыпу гэтыя тыповыя беларускія святочныя стравы замянілі каўказскі шашлык, шаурма, плоў і кандытарскія вырабы сучаснага гатунку. Гэта разбурае цэласнасць народных свят, знішчае іх адметныя асаблівасці, нацыянальную спецыфіку і культурна-бытавую этнатрадыцыю.

Таму арганізатарам пры ўвасабленні народных свят асаблівую ўвагу трэба надаваць распрацоўцы рэцэптуры, вырабу і продажу абрадавых і святочных страў.

На некаторых святах продаж страў набывае гульнёвы характар: конкурс хатніх гаспадынь, якія прадстаўляюць на выставу нацыянальнай кухні вырабы свайго гатунку; конкурс прафесійных кухараў, якія на вачах у гледачоў змагаюцца за

якасць і хуткасць прыгатавання розных страў (выпечка дранікаў, бліноў і інш.). Можна арганізаваць аўкцыён асобных беларускіх страў (смажанага парсючка, дзічыны, кумпякоў і інш.), пачынаючы аўкцыённыя таргі ад цаны сабекошту прадукцыі. На раённых святах часам наладжваюць выставу-продаж святочных страў з дэгустацыяй. На гэтай выставе ўдзельнічаюць прадстаўнікі розных вёсак, прычым адны стравы, напрыклад самаробныя каўбасы, удзельнікі з усіх паселішчаў выстаўляюць на адным стале, другія стравы — на другім стале, што дае магчымасць выявіць лепшых майстроў нацыянальнай кухні па кожнай канкрэтнай страве і выклікае вялікую зацікаўленасць ва ўсіх удзельнікаў свята. Формы гандлю могуць быць розныя, але галоўнае, каб на кожнам народным святе быў на прылаўках свой спецыфічны набор традыцыйных страў, якія б спрыялі замацаванню беларускіх народных звычаяў.

Удзельнікі свята і госці, якія жывуць у гасцініцы, забяспечваюцца трохразовым харчаваннем — снеданнем, абедам і вячэрай. Але абеды і вячэры могуць быць арганізаваны і ў іншых пунктах грамадскага харчавання. Для своечасовай арганізацыі харчавання адміністрацыя рэстарана, кафэ, сталовай павінна загадзя ведаць тэрмін і рэжым работы, колькасць удзельнікаў свята. Сумесна з арганізатарамі свята адміністрацыя пункта харчавання вызначае час наведвання рэстарана, кафэ, сталовай, кошт дзённага рацыёну і парадак разліку. Меню ў гэтым выпадку складаюць загадзя і ўдакладняюць з заказчыкам, прычым часам прапануюць варыянты снеданняў, абедаў, вячэр.

Неабходнасць адначасовага абслугоўвання вялікай колькасці людзей патрабуе хуткасці і дакладнасці работы афіцыянтаў. Таму ў гэтыя дні пераглядаюць графік выхаду на работу абслуговага персаналу з тым, каб забяспечыць максімальную прысутнасць работнікаў у перыяд снедання і абеду.

Найбольш зручна працаваць афіцыянтам, калі за кожным удзельнікам дэлегацыі замацавана пэўнае месца за сталом, а сталы сервіраваны загадзя. Да снедання, напрыклад, у адпаведнасці з заказам ставяць кубак для чая або кавы, падстаўку для яек, разеткі з джэмам, кісламалочныя прадукты. Для паскарэння абслугоўвання на стол можна падаваць чай у чайніках з разлікам на тое, што госці самі будуць наліваць гэты напітак. Хлеб таксама наразаюць загадзя і ўкладваюць на талеркі або хлебніцы, ставяць на сталы і накрываюць сурвэткай.

Садзейнічаюць пашырэнню абслугоўвання дадатковыя раздачы ў зале.

Арганізацыя харчавання па безнаяўным разліку ўдзельнікаў прадугледжвае выдачу кніжак з разменнымі талонамі, раздзеленымі перфаратарам на часткі: снеданне, абед, вячэра. Калі харчаванне ўдзельнікаў мерапрыемстваў адбываецца за наяўны разлік, то афіцыянт робіць разлік у звычайным парадку.

Для абслугоўвання існуе і такая мера, як папярэдняе азнаямленне спажыўцоў з меню снеданняў, абедаў, вячэр. Меню раскладваюць на сталах. Наведвальнікі могуць адзначыць у іх стравы, якія яны жадаюць заказаць на заўтра. Метрдатэль абагульняе заказы і перадае іх загадчыку вытворчасці, што скарачае час харчавання.

*Асаблівасці арганізацыі харчавання замежных гасцей.* Прадстаўнікі аргкамітэта не пазней чым за месяц да пачатку свята заключаюць дагавор з арганізацыяй грамадскага харчавання (упраўленне, трэст, камбінат) на абслугоўванне замежных дэлегацый, у якім указваюць інтэрвалы абслугоўвання, умовы і парадак разліку за харчаванне. У далейшым прадпрыемствам за пяць дзён да пачатку абслугоўвання арганізатары свята прадстаўляюць графік прыбыцця замежных гасцей з указаннем краіны, з якой яны прыбываюць, колькасці ўдзельнікаў дэлегацыі, даты прыбыцця і працягласці знаходжання (у тым ліку дзяцей і гасцей, якія карыстаюцца

дыетычным харчаваннем), колькасці асоб, якія суправаджаюць групу і для якіх таксама неабходна арганізаваць харчаванне, відаў прадстаўляемага харчавання (снеданне, абед, вячэра), даты і часу першага і апошняга абслугоўвання.

Арганізаванае харчаванне замежных гасцей праводзіцца ў асобных залах або за спецыяльна выдзеленымі сталамі ў агульнай зале. Калі абслугоўванне здзяйсняецца на працягу некалькіх дзён, то рэкамендуецца замацоўваць за замежнымі гасцямі пастаянныя месцы ў зале. Пры арганізацыі харчавання прадстаўнікоў розных краін у адной зале на сталы варта ўстанавіць флажкі гэтых краін.

Рэкамендуюцца наступныя арыенціровачныя інтэрвалы прыёму ежы: снеданне — з 8.00 да 10.00 гадзін, абед — з 12.00 да 15.00 гадзін, вячэра — з 17.00 да 20.00 гадзін.

Частка творчых і аматарскіх калектываў, асобных выканаўцаў прыязджаюць на свята толькі на адзін дзень, іх таксама неабходна забяспечыць харчаваннем. З гэтай мэтай дырэкцыя свята заключае дагавор з адміністрацыяй пункта грамадскага харчавання, вызначае меню комплексных абедаў, вячэр, распрацоўвае графік наведвання калектывамі рэстарана, кафэ ці сталовай, дзе яны будуць харчавацца. Куратары груп у адпаведнасці з графікам дастаўляюць калектывы ў пункты харчавання.

У многіх раёнах маецца наступная практыка: для харчавання калектываў, прыбыўшых на адзін дзень, выдзяляюць адзін пункт харчавання, які закрываецца на гэты перыяд для вольнага наведвання і абслугоўвае толькі ўдзельнікаў свята. Гэта вельмі зручна ў арганізацыйным плане, таму што даецца магчымасць, па-першае, адразу ў адным месцы накарміць людзей, па-другое, у выпадку якіх-небудзь напрадбачаных абставін хутка замяніць тэрмін харчавання калектываў, памяняць іх месцамі, па-трэцяе, не парушаць работу іншых пунктаў харчавання, звярнуць іх намаганні на абслугоўванне святочных мерапрыемстваў.

У некаторых раёнах для паляпшэння ўмоў харчавання практыкуюць далучэнне да частковага або поўнага спонсарства мясцовыя сельскія гаспадаркі, якія бясплатна або на ўмовах аплаты па сабекошце прадукцыі ці па зніжанай цане прадстаўляюць частку прадуктаў рэстаранам, кафэ. У той жа час кафэ і рэстараны таксама могуць пайсці на частковае спонсарства, выставіўшы рахунак за абслугу, прыгатаванне страў не па сваіх расцэнках, а па расцэнках сталовай II катэгорыі. Гэта значна памяншае выдаткі на харчаванне ўдзельнікаў і дазваляе зрабіць яго больш якасным.

Для членаў пастановачнай групы, якія ў дзень урачыстасцей заняты правядзеннем запланаваных дзей свята і не маюць часу наведаць пункт харчавання, па дамоўленасці з адміністрацыяй рэстарана яго супрацоўнікі дастаўляюць абеды ў штабную палатку, якая размяшчаецца звычайна каля гукаўзмацняльнага цэнтра.

## Распрацоўка культурнай праграмы для гасцей

У наш час у Беларусі праводзіцца шмат традыцыйных святочных дзей вялікага маштабу, на якія часта запрашаюць з замежных краін і абласцей сваёй краіны афіцыйныя дэлегацыі, грамадскія арганізацыі, мастацкія і спартыўныя калектывы.

Як правіла, многія з гасцей упершыню прыбываюць у мясціны, дзе адзначаецца святочная падзея, таму аргкамітэту, акрамя вырашэння пытанняў размяшчэння і харчавання запрошаных, неабходна распрацаваць культурную праграму для кожнай канкрэтнай дэлегацыі ў час наведвання горада, раёна. Пры складанні праграм неабходна ўлічваць прафесійны, сацыяльны ўзровень дэлегацыі, яе інтарэсы і пажаданні. Асобныя раздзелы культурнай праграмы можна скарэкціраваць пасля першай сустрэчы з гасцямі, але ў агульным плане праграма застаецца нязменнай.

Культурная праграма — гэта комплекс мерапрыемстваў, мэта якіх — знаёмства гасцей з рознымі аспектамі матэрыяльнага і культурнага жыцця жыхароў пэўнай мясцовасці. Стварэнне плана культурнай праграмы і яе ўвасабленне дазваляюць мэтанакіравана, змястоўна і цікава арганізаваць вольны час гасцей у дні іх знаходжання ў гэтай мясцовасці.

Змест культурнай праграмы для ўдзельнікаў свята значна адрозніваецца ад агульнай праграмы свята тым, што ў яго ўключаны не толькі пералік святочных дзей, але і мерапрыемствы, у якіх вырашаюцца арганізацыйныя пытанні (работа аўтатранспарту, час і месца харчавання ўдзельнікаў, час правядзення рэпетыцый), а таксама культурна-масавыя дзеі, якія наладжваюць спецыяльна для ганаровых гасцей, прыбыўшых творчых калектываў, дэлегацый.

Культурная праграма, якая адлюстроўвае ўсе аспекты знаходжання дэлегацый і асобных прадстаўнікоў у дні святкавання, з'яўляецца асноўным дакументам, па якім працуюць куратары груп. Усе мерапрыемствы культурнай праграмы фінансуюцца са сродкаў, адпушчаных на правядзенне свята. Частка мерапрыемстваў можа быць наладжана на спонсарскіх ці грамадскіх пачатках, а частка — як дадатковая паслуга, якая аплачваецца самімі ўдзельнікамі. Культурная праграма распрацоўваецца ў ніжэйпералічаных кірунках.

1. Пазнавальна-інфармацыйны напрамак.

Каб пазнаёміць гасцей з мясцовасцю, дзе адбываецца свята, варта арганізаваць аўтобусныя, пешаходныя або водныя экскурсіі, у час правядзення якіх экскурсавод раскрывае гасцям гісторыю горада і этымалогію яго назвы, паказвае архітэктурныя пабудовы розных стагоддзяў, помнікі дзеячам навукі, культуры і мастацтва, наведвае разам з імі мемарыяльныя комплексы, выставачныя залы, паркі і інш. Калі такую маштабную экскурсію немагчыма арганізаваць, можна абмежавацца экскурсіяй у мясцовы краязнаўчы музей або праглядзець дакументальны кінафільм ці відэафільм аб горадзе, раёне. Але ў любым выпадку гасцей абавязкова трэба

азнаёміць з гісторыяй краю, каб яны мелі аб ім пэўнае ўяўленне. Такую ж пазнавальную інфармацыю госці могуць атрымаць у час правядзення афіцыйнай сустрэчы з кіраўнікамі горада ці раёна, дзе адбываецца свята.

2. Прафесійны напрамак.

Для ўдзельнікаў дэлегацый мэтазгодна арганізаваць з улікам іх прафесійных інтарэсаў сустрэчы з дзеячамі працы, навукі, культуры, мастацтва, спорту. Гасцям было б цікава наведаць аднапрофільныя арганізацыі, прадпрыемствы, установы. Разам з тым можна наладзіць правядзенне круглых сталоў, прафесійных канферэнцый з шырокім абменам думкамі, вопытам работы.

3. Адпачынкавы напрамак.

На святах удзельнікі творчых і аматарскіх калектываў жадаюць не толькі дэманстраваць сваё майстэрства, але і змястоўна праводзіць свой адпачынак, пазнаючы адметныя асаблівасці культурнага жыцця таго краю, куды яны прыехалі.

З гэтай мэтай ім можна прапанаваць шэраг відовішчных, масава-гульнёвых мерапрыемстваў, якія б адлюстроўвалі мясцовую спецыфіку. У пералік такіх мерапрыемстваў можна ўключыць прагляд спектакляў мясцовых тэатраў, канцэртаў творчых калектываў, спаборніцтваў па нацыянальных відах спорту. Варта наладзіць удзел гасцей у вечарах адпачынку, дзе пазнаёміць іх з нацыянальнымі танцамі, мясцовымі гульнямі і забавамі.

У культурнай праграме жыццё прыбыўшага калектыву павінна быць адлюстравана пагадзінна на кожны дзень свята. За кожнай дэлегацыяй трэба замацаваць куратара, які будзе суправаджаць гасцей на ўсе мерапрыемствы.

## Афіцыйны і неафіцыйны прыём гасцей[1]

У наш час на святах многіх гарадоў Беларусі прысутнічаюць ганаровыя госці і творчыя дэлегацыі з краін блізкага і далёкага замежжа, для якіх наладжваюць афіцыйныя або неафіцыйныя прыёмы. Гістарычна склалася так, што прыёмы іграюць важную ролю ў развіцці дзелавых кантактаў. Неабходна падкрэсліць, што асноўным зместам прыёмаў з'яўляюцца не застоллі і дэгустацыя напояў. Прыёмы носяць дзелавы характар, яны праводзяцца з мэтай паглыблення і пашырэння кантактаў, атрымання патрэбнай інфармацыі ў неафіцыйных абставінах.

Сустрэчы з прадстаўнікамі іншых краін садзейнічаюць пашырэнню культурных сувязей з замежнымі дзяржавамі, росту зносін людзей розных краін на ўсіх узроўнях.

Прыёмам, а таксама банкетам з поўным ці частковым абслугоўваннем называюць збор запрошаных асоб (звычайна афіцыйных) у гонар якой-небудзь падзеі. Афіцыйныя прыёмы наладжваюць з нагоды нацыянальных, дзяржаўных свят, фестываляў розных відаў мастацтваў, юбілейных дат гарадоў, адкрыцця і закрыцця міжнародных выстаў, кірмашоў, навуковых канферэнцый, якія праводзяцца ў рамках свята, і інш.

Прыёмы ў гонар або з удзелам афіцыйных замежных прадстаўнікоў звычайна называюць дыпламатычнымі. Яны дазваляюць праявіць ветлівасць, павагу і гасціннасць у адносінах да асобных людзей, членаў замежных прадстаўніцтваў, дзеячаў навукі, культуры і мастацтва, а таксама розных афіцыйных арганізацый. Прыёмы падзяляюцца на дзённыя і вячэрнія, прыёмы з рассаджваннем і без рассаджвання за сталом.

Да *дзённых прыёмаў* адносяць прыёмы тыпу "бакал шампанскага", "бакал віна", "снеданне".

[1] Матэрыял выкладзены з улікам міжнародных правіл афіцыйных і неафіцыйных прыёмаў гасцей.

1. “Бакал шампанскага” пачынаецца а 12.00 і працягваецца да 13.00 гадзін. Прычынай для арганізацыі такога прыёму можа быць гадавіна нацыянальнага свята, прыбыццё дэлегацыі пэўнай краіны, адкрыццё фестывалю, выставы. На прыёме гасцям падаюць шампанскае, падсмажаныя арэшкі, шакалад, а калі-нікалі і невялікія пірожныя, бутэрброды. Напіткі і закускі разносяць афіцыянты. Гэты від прыёму займае мала часу і не патрабуе вялікай падрыхтоўкі. Прыём адбываецца стоячы.

Аналагічным з’яўляецца прыём тыпу “бакал віна”, з той толькі розніцай, што тут гасцям падаюць віно, канапэ, тарталеткі, фрукты. Назва ў дадзеным выпадку падкрэслівае своеасаблівы характар прыёму.

2. “Барбэкю” наладжваюць на адкрытым паветры ў летні час, звычайна ў нядзелю. Прыём барбэкю не носіць афіцыйны характар. Сталы і крэслы размяшчаюць у тых месцах, дзе зручна сядзець. У цэнтры сталоў ставяць кветкі звычайна ў гліняных гаршках. Калі барбэкю наладжваюць вечарам, уся прастора, дзе будзе адбывацца прыём, павінна быць ярка асветлена, каб кухар бачыў, як гатуецца страва, а госці не спатыкаліся, пераходзячы з месца на месца. Цудоўны эфект у гэтым выпадку даюць яркія промні пражэктараў, накіраваных на лісце дрэў, контурная або аб’ёмная падсветка дрэў, а таксама гірлянды каляровых агнёў і свечы, закрытыя шклом ад ветру. Летнім вечарам асабліва добра запальваць свечы з цытранэлай, пах якой адганяе насякомых.

Гасцям падаюць смажанае мяса, прыгатаванае як шашлык або на рашотках (свініну, сасіскі), дзічыну (галоўная страва), а таксама іншае частаванне: напіткі — віно, піва, газіраваная вада. У спякоту лепш за ўсё падаваць гарбату, каву. Можна прапанаваць і кактэйлі, да якіх дадаць некалькі талерачак з падсмажанымі арэхамі і чыпсамі, на маленькім стале нядрэнна паставіць больш розных прыпраў (соус, кетчуп, гарчыца і інш.). Пры халодным надвор’і за 20—30 мінут да таго, як шашлык ці іншае мяса будзе гатовае, гасцям можна прапана-

ваць гарачы працёрты суп. Само мяса падаецца звычайна з рознымі таматнымі соусамі. Да яго дадаецца адварная ці печаная гародніна.

3. Снеданне наладжваюць паміж 12 і 15 гадзінамі, звычайна з 12 да 13 гадзін. Меню снедання складаецца з улікам існуючых у краіне традыцый з адной—двух страў халоднай закускі, адной гарачай рыбнай стравы, адной гарачай мясной стравы і дэсерту (фрукты, цукеркі і інш.). Па агульнапрынятых правілах да халоднай закускі прапануюць гарэлку або настойкі, да рыбных страў — сухое белае віно (ахаладжанае), да мясных — чырвонае віно пакаёвай тэмпературы, а да дэсерту — шампанскае. Падаваць на снеданне першыя стравы (супы) не прынята, хаця падача іх не будзе з'яўляцца памылкай.

Перад снеданнем падаецца кактэйль (сухое віно, сокі), а ў час снедання — мінеральная вада, іншы раз сокі. Пасля снедання прапануецца кава або гарбата.

Пасля таго як усе госці паелі, гаспадар і гаспадыня першымі ўстаюць з-за стала і прапануюць гасцям перайсці ў іншы зал, дзе падаецца кава. Працягласць снедання — 1—1,5 гадзіны (прыкладна 45—60 мінут за сталом і 15—30 мінут за кавай). Ініцыятыва завяршэння снедання належыць гаспадару прыёму.

*Вячэрнія прыёмы.*

1. Прыёмы тыпу "кактэйль" або тыпу "фуршэт" наладжваюцца пасля 17 і да 20 гадзін і працягваюцца дзве гадзіны. На фуршэце асноўным прыборам сервіроўкі з'яўляецца відэлец. Вакол няма крэслаў. Арганізоўваюць такі банкет звычайна ў выпадках, калі за кароткі час (1—1,5 гадзіны) неабходна абслужыць вялікую колькасць гасцей і пасадзіць за стол усіх не з'яўляецца магчымым. Частаванне — халодныя закускі, кандытарскія вырабы і фрукты. Часам падаюць таксама гарачыя закускі. Частаванне не павінна быць багатым, пышным.

На прыёмах такога тыпу спіртныя напіткі выстаўляюць на століках або наліваюць у бакалы, якія разносяць афіцыянты.

У канцы прыёму могуць быць пададзены шампанскае, а затым кава.

Прыёмы тыпу "кактэйль" або тыпу "фуршэт" праводзяць стоячы. Удзельнікі банкету вольныя выбіраць месца ў зале, па асабістым жаданні выбіраюць сабе стравы і напіткі (гэта значыць абслугоўваюць сябе самі). Падыходзяць да сталоў, набіраюць у свае талеркі закускі і адыходзяць, каб даць магчымасць падысці да іх іншым гасцям. У некаторых выпадках для сталых удзельнікаў банкету ў зале размяшчаюць некалькі крэслаў. Асаблівасцю банкету тыпу "фуршэт" з'яўляецца тое, што ён можа быць арганізаваны як на афіцыйных, так і на неафіцыйных прыёмах, паводзіны тут дэмакратычныя, і кожны ўдзельнік можа пакінуць банкет у любы зручны для яго час.

У вялікім памяшканні можна накрыць некалькі сталоў "а ля фуршэт" (за кожным па 6—8 чалавек). Пасля халоднай закускі падаюць запечаную ежу (жульены). Можна таксама падаваць гарачыя сасіскі, маленькія катлеты. Пасля гарачай закускі гасцей частуюць дэсертам — фруктамі, жэле, марожаным. У канцы прыёму падаюць каву. Прыходзячы на такі прыём, трэба перш за ўсё адшукаць гаспадара і гаспадыню, павітацца з імі.

2. Абед лічыцца найбольш ганаровым відам прыёму і праводзіцца ў 19.00—21.00 гадзіну. Сталы ставяць літарай "П" ці "Т". Ганаровае месца — тварам да ўваходных дзвярэй або да вокнаў, якія выходзяць на вуліцу. Меню абеду — адна—дзве халодныя закускі, суп, адна гарачая рыбная страва, адна гарачая мясная страва, дэсерт. Перад абедам гасцям прапануюць кактэйлі. Пасля абеду ў гасцінай падаецца кава або гарбата. Меню абеду ад меню снедання адрозніваецца тым, што пасля халоднай закускі падаецца суп. Да супу — херас (падаваць неабавязкова). У час абеду да закускі, гарачых страў і дэсерту падаюць такія ж спіртныя напіткі, як і ў час снедання. Да кавы падаюць каньяк або лікёр. Абед працягваецца 2—2,5 гадзіны, пры гэтым за сталом прыкладна 50—60 мінут, астатні час у гасцінай.

3. Вячэра пачынаецца з 21.00 гадзіны і пазней. Меню вячэры і спіртныя напіткі тыя ж, што і на абедзе, выключаючы суп.

4. Разнавіднасцямі прыёмаў з'яўляюцца кінасеансы, музычныя і літаратурныя вечары, вечары дружбы, спартыўныя гульні. Пералічаныя мерапрыемствы, як правіла, суправаджаюцца лёгкім частаваннем.

5. Абед-буфет прадугледжвае вольнае рассаджванне за невялікімі столікамі па 4—6 чалавек. Там, як і на фуршэтным прыёме, накрываюць сталы з закускамі, маюцца буфеты з напіткамі. Госці не сядзяць за агульным сталом. Падышоўшы да стала буфетнай стойкі, які знаходзіцца каля сцяны або ў сярэдзіне пакоя, яны набіраюць закускі і па сваім жаданні сядаюць за адзін са столікаў. Госці могуць размяшчацца на канапах, у крэслах, стараючыся сесці з тымі людзьмі, з якімі ім патрэбна пагаварыць. Віно, кактэйлі і іншыя спіртныя напіткі выстаўляюць на буфетных стойках, за якімі стаяць афіцыянты. Такога роду прыём часта арганізуюць пасля канцэрта, прагляду фільма, у перапынку танцавальнага вечара. Абед-буфет менш афіцыйны, чым абед.

6. Прэзентацыя наладжваецца з нагоды прадстаўлення новай кнігі, спектакля, выставы, аўтарскага вечара і інш. Яна садзейнічае замацаванню старых і завязванню новых сувязей. На прэзентацыю запрашаюць пэўную колькасць гасцей, звычайна не больш за 100. Накрываюць сталы, на якіх кладуць картачкі з прозвішчамі асоб, для якіх прадугледжаны адпаведныя месцы. На прэзентацыі ўсё значна прасцей, чым на афіцыйных прыёмах. Галоўная мэта — зносіны людзей паміж сабой, новыя знаёмствы, устанаўленне кантактаў і дзелавых сувязей. У праграму прэзентацыі можа быць уключана прэс-канферэнцыя, якая звычайна суправаджаецца выступленнямі артыстаў.

*Арганізацыя прыёму.* Любы прыём павінен быць загадзя старанна падрыхтаваны. У падрыхтоўку прыёму ўваходзяць: выбар віду прыёму, складанне спіса запрошаных асоб, рас-

сылка запрашэнняў, складанне плана пасадкі гасцей за сталом, складанне меню, сервіроўка стала і абслугоўванне ўдзельнікаў прыёму, падрыхтоўка тостаў або прамоў, складанне плана правядзення прыёму, яго культурнай праграмы.

У міжнароднай практыцы набольш урачыстымі і ганаровымі лічацца вячэрнія віды прыёмаў, імі, як правіла, завяршаецца неафіцыйная частка пэўнай падзеі ў святочным жыцці дзяржавы, рэгіёна ці горада.

Прыступаючы да арганізацыі прыёму гасцей, дэталёвы план увасаблення банкету ці іншых відаў прыёму трэба распачынаць прыблізна за месяц да яго правядзення і прызначыць адказных за выкананне кожнага з пунктаў плана. Такі план складаецца з дзвюх частак: інфармацыі аб месцы правядзення прыёму і рабочага плана арганізацыі прыёму.

Папярэдняя інфармацыя аб прыёме павінна высветліць наступнае:

1. Адзначаемую падзею, мэту і задачы прыёму.
2. Дату і час правядзення прыёму.
3. Установу, дзе будзе адбывацца прыём (рэстаран, кафэ, бар і інш.), а таксама колькасць гасцей, якіх яны могуць прыняць (максімум і мінімум).
4. Асобу, якая афармляе заказ.
5. Склад гасцей (пол, узрост, нацыянальнасць, прафесія).
6. Узроставыя абмежаванні прыёму.
7. Кошт абслугоўвання.
8. Выдаткі на аднаго чалавека.
9. Паслугі, якія ўключаюцца ў кошт.
10. Форму аплаты (наяўнымі, у крэдыт).
11. Спіс запрошаных ганаровых гасцей.
12. Стравы, якія ўключае меню.
13. Час, на які можна зрабіць заказ.

*Размяшчэнне заказу, правы і абавязкі заказчыка.* Правільнае афармленне заказу ў многім залежыць ад таго, наколькі своечасова і падрабязна прадуманы і ўдакладнены ўсе ўмовы правядзення банкету паміж яго заказчыкам і

адміністрацыяй рэстарана. Практыка паказвае, што арганізацыя банкету праходзіць найбольш паспяхова, калі заяву на яго правядзенне прымае метрдатэль, той, хто будзе непасрэдна кіраваць абслугоўваннем.

Перш чым прыняць заказ, метрдатэль абавязаны азнаёміць заказчыка з залай, дзе будзе адбывацца банкет, і ўдакладніць з ім план расстаноўкі сталоў. Пры гэтым агаворваюцца такія пытанні, як месцы ганаровых гасцей або план размяшчэння гасцей за кожным сталом паасобку, удакладняецца, ці будзе пададзены аперытыў, ці патрэбныя кветкі для ўпрыгожвання стала, музычнае суправаджэнне і месца для танцаў. Адначасова заказчык знаёміцца з правіламі работы прадпрыемства, парадкам абслугоўвання, а таксама магчымымі стратамі.

Адміністрацыя прадпрыемства не мае права ўстанаўліваць мінімальны кошт заказу, а таксама прапанаваць заказчыку прымусовы асартымент страў, напіткаў, кандытарскіх вырабаў і інш.

Пры афармленні заказу ўдакладняюцца дата, час пачатку і заканчэння, месца правядзення ўрачыстасці, прыкладнае меню і папярэдні кошт заказу.

Пасля папярэдняга ўдакладнення заказчык уносіць у касу аванс у памеры 50% кошту заказу на аснове выпісанага бухгалтэрыяй прыходнага ордэра і атрымлівае квітанцыю.

У далейшым не пазней чым за два дні да пачатку ўрачыстасці метрдатэль сумесна з заказчыкам афармляе заказ-рахунак. У выпадку памяншэння заказу на гарачыя стравы, напіткі і іншыя вырабы заказчыку вяртаюцца грошы ў памеры кошту тавару па рознічных цэнах. Па жаданні заказчыка на гэтую ж суму можа быць адпушчана іншая прадукцыя.

У рэстаране можа быць музычнае суправаджэнне ўрачыстасці ў звычайным парадку, аднак пры правядзенні тэматычных вечароў адміністрацыя прадпрыемства павінна прадугледзець у дамове з канцэртнай арганізацыяй магчымасць змены праграмы музычнага ансамбля.

Заказчык мае права адмовіцца ад усяго заказу не пазней чым за суткі да абслугоўвання.

Калі не ўсе ўдзельнікі банкету змогуць з'явіцца на ўрачыстасць, то заказчыку па пісьмовай заяве, пададзенай не пазней чым за 4 гадзіны да пачатку абслугоўвання, могуць вярнуць грошы ў памеры кошту заказу, які прыходзіцца ў сярэднім на аднаго госця.

Пры заяве заказчыка аб памяншэнні колькасці ўдзельнікаў урачыстасці непасрэдна перад пачаткам абслугоўвання яму могуць быць аддадзены грошы ў памеры кошту заказу на гарачыя стравы, напіткі і кандытарскія вырабы. Вяртаюцца грошы на падставе пісьмовай заявы па расходным ордэры. Аднак у гэтым выпадку заказчык абавязаны вярнуць рэстарану кошт (па рознічных цэнах) прыгатавання прадукцыі, якая не магла быць рэалізавана. На тую прадукцыю, якая не магла быць рэалізавана, складаецца акт. У акт не ўключаюцца напіткі, а таксама ўключаныя ў заказ-рахунак, не пададзеныя на стол гарачыя стравы, кандытарскія вырабы.

Кошт нерэалізаванай і ўключанай у акт прадукцыі пакрываецца з сумы, унесенай заказчыкам у плату за абслугоўванне ўрачыстасці.

Заказчыку не дазваляецца далучаць пабочных асоб да прыгатавання страў. Ён павінен знаходзіцца на прадпрыемстве грамадскага харчавання да заканчэння ўрачыстасці. Заказчык абавязан вярнуць грошы за разбітую і сапсаваную пасуду і прыборы па віне ўдзельнікаў банкету. Пры гэтым выпісваецца рахунак на падставе існуючых прэйскурантаў.

*Складанне спіса запрошаных і рассылка запрашэнняў.* Складанне спіса запрошаных — важнейшы момант арганізацыі прыёму, і таму гэтая справа даручаецца адказнай асобе. Складальнік спіса перш за ўсё павінен вызначыць агульную колькасць гасцей, якіх мяркуецца запрасіць на прыём. Гэтая колькасць не павінна перавышаць нармальных магчымасцей абслугоўвання і памяшкання, дзе будзе адбывацца прыём.

Пры гэтым неабходна ўлічыць пэўны працэнт гасцей, якія па розных прычынах не змогуць або адмовяцца быць на прыёме.

У спіс гасцей з замежных краін перш за ўсё ўключаюцца прадстаўнікі афіцыйных улад, дыпламатычнага корпуса, грамадскіх і творчых арганізацый.

Запрашэнні на прыём накіроўваюцца на друкаваным бланку. Імя, прозвішча запрошанага і яго пасада пішуцца ад рукі або на машынцы. Для прыёмаў з нагоды нацыянальнага свята або ў гонар якога-небудзь дзяржаўнага дзеяча, дэлегацыі заказваюцца спецыяльныя бланкі, на якіх указана, па якой прычыне праводзіцца прыём.

Жонкам асобных запрашэнняў не дасылаюць, а ў запрашэннях мужчынам указваюць, што яны запрашаюцца з супругамі. Запрашэнні заўсёды пішуцца з ужываннем слоў "маем гонар запрасіць".

У запрашэнні ўказваюцца, якога роду адбудзецца прыём (кактэйль, фуршэт, абед, вячэра), і час, месца, дзе ён адбудзецца.

Рассылка запрашэнняў загадзя дазваляе, не парушаючы правіл прыстойнасці, запрасіць замест адмовіўшыхся іншых гасцей. Калі некаторыя запрошаныя адмовяцца ў апошні момант, іх месцы за сталом могуць заняць супрацоўнікі сваёй установы.

Загадзя разасланыя запрашэнні даюць больш шансаў мець на прыёме тых асоб, прысутнасць якіх пажадана. Трэба пазбягаць запрашэння ў дзень прыёму (за выключэннем выпадкаў, калі яны праводзяцца экспромтам, аб чым неабходна папярэдзіць запрошаных), такое запрашэнне ў большасці выпадкаў выклікае крыўду запрашаемага, які вырашае, што хтонебудзь адмовіўся прыйсці і таму яго запрасілі.

Чым вышэй афіцыйны статус асобы, якая арганізуе прыём, тым раней адпраўляецца адказ на яго запрашэнне.

Калі ў запрашэнні ўказваецца нумар тэлефона, адказ можа быць дадзены па тэлефоне.

Па меры паступлення адказаў ад запрошаных рассаджванне ўдакладняецца. Напярэдадні прыёму складаецца агульны спіс удзельнікаў снедання, абеду, вячэры ў парадку пратакольнага старшынства.

*Рассаджванне ў аўтамашыне.* Даволі часта на свята госці прыбываюць паветраным і чыгуначным транспартам. У такіх выпадках іх неабходна сустрэць на аўтамабілі, замацаваным за госцем. Гэтым транспартам ён будзе карыстацца на працягу ўсяго знаходжання ў месцы правядзення святкаванняў. Пры руху на аўтамашыне трэба ўлічваць, што тут ганаровым лічыцца задняе месца справа. Затым ідзе задняе месца злева і, нарэшце, пярэдняе месца побач з шафёрам. Гэта месца, калі на свята прыбываюць госці з замежжа, часцей за ўсё займае перакладчык. У выпадку, калі машыну вядзе сам гаспадар, то самым ганаровым лічыцца месца побач з ім, затым задняе месца справа і потым задняе месца злева. У час экскурсій госць, як правіла, займае месца побач з вадзіцелем, каб мець добры агляд, а экскурсавод размяшчаецца ззаду.

Госці садзяцца першымі і выходзяць першымі.

*Сустрэча гасцей.* Арганізацыя сустрэчы гасцей, якія прыбываюць на прыём, мае прынцыпова важнае значэнне. У час сустрэчы госці павінны адчуць ветлівасць, гасціннасць, сардэчнасць гаспадароў, іх уважлівасць.

У зале для прыёму і збору гасцей, які называецца аванзалай, ставяць крэслы, накрытыя абрусам, круглы столік, на які кладуць цыгарэты (у пачках або цыгарэтніцах), запалкі, папяльнічкі, ставяць кандэлябры з запаленымі свечкамі. Памяшканне звычайна ўпрыгожваюць свежымі кветкамі ў кошыках або ў вазах. Гасцей сустракаюць гаспадар з гаспадыняю, якія вітаюцца, падаючы руку, абменьваюцца з імі парай—другой фраз, запрашаюць у аванзалу. Гаспадар займае гасцей непрацяглымі размовамі і пакідае іх, каб сустрэць зноў прыбыўшых.

Напрыклад, на міжнародным свяце народнай музыкі "Звіняць цымбалы і гармонік", які штогод адбываецца ў г.Паставы, гасцей каля ўваходу сустракаюць дзяўчаты ў беларускіх нацыянальных строях. Яны падносяць гасцям маленькія букецікі кветак і запрашаюць у аванзалу, дзе іх пад акампанемент ансамбля старажытнай музыкі сустракаюць гаспадыня з гаспадаром. На Свяце нацыянальных культур Беларусі ў г.Гродна на афіцыйны прыём мэра горада запрашаюцца паслы замежных пасольстваў, афіцыйныя асобы з краін СНД і кіраўнікі нацыянальных дыяспар Беларусі. Прыём гасцей адбываецца ў новым замку, тут гасцей пасля ўваходу сустракаюць ваяры ў баявых даспехах часоў Вялікага княства Літоўскага. Яны прымаюць запрашэнні і, раскрываючы скрыжаваныя пікі, прапускаюць гасцей у замак, дзе пад музыку ансамбля старадаўняй музыкі або пад фанаграму старажытнабеларускай музыкі іх сустракаюць гаспадар з гаспадыняй.

Выкарыстанне музыкі ў час сустрэчы дазваляе, па-першае, стварыць святочны настрой прыёму і, па-другое, яшчэ раз адчуць атмасферу свята і яго тэматычную накіраванасць.

Для азнаямлення гасцей з іх месцамі за банкетным сталом у аванзале на відным месцы ставяць невялікі макет асноўнага стала, на якім размяшчаюць картачкі з указаннем прозвішчаў, імён, імён па бацьку запрошаных гасцей ў тым парадку, які адпавядае іх месцам за банкетным сталом.

Калі банкет праводзіцца адначасова ў некалькіх залах, у кожным з якіх па некалькі сталоў, рэкамендуецца іншая сістэма папярэдняга азнаямлення гасцей з іх месцамі.

У аванзале на стэндзе вывешваюць план-схему размяшчэння банкетных залаў, сталоў у кожным з іх і нумары месцаў. Побач вывешваюць спіс удзельнікаў прыёму з указаннем прозвішчаў, імён, імён па бацьку, нумары заказаў або іх назвы, нумары сталоў і месцаў.

Перад запрашэннем гасцей у банкетную залу ім прапануюць напіткі. У якасці напіткаў могуць быць сокі, безалка-

гольныя напіткі, віна-водачныя вырабы. Лепшымі сокамі для гэтых мэт лічаць лімонны, грэйпфрутавы, таматны, вінаградны (з несалодкіх сартоў вінаграда) і інш. Віна-водачнымі аперытывамі з'яўляюцца вермут, шампанскае (сухое, паўсухое), белае або чырвонае віно, а таксама каньяк і гарэлка.

Аперытывы падаюць гасцям на падносах, пакрытых сурвэткамі. Часта да аперытываў у залу падаюць нарэзаныя лімоны, масліны, міндаль і інш.

Спазніўшыхся гасцей прынята чакаць не больш за 15 мінут. Калі госць, нарэшце, прыбывае, яму прапануюць прайсці ў гасцінную; ён просіць у гаспадароў прабачэнне за спазненне. Госцю, што затрымаўся, прапануюць тую страву, якая да моманту яго прыбыцця пададзена астатнім удзельнікам прыёму.

Пры складанні рабочага плана і сцэнарыя правядзення прыёму ў яго праграме неабходна прадугледзець уключэнне відовішчнай і забаўляльнай частак. Дзеля гэтага арганізатары загадзя дамаўляюцца з пэўнымі творчымі калектывамі (прафесійнымі, самадзейнымі), асобнымі выканаўцамі або з музычным ансамблем рэстарана аб правядзенні тэматычнага канцэрта, які б падкрэсліваў падзею, што адзначаецца на прыёме.

Напрыклад, на Свяце нацыянальных культур Беларусі ў г.Гродна ў час прыёму, які наладжваўся мэрам горада для замежных гасцей і кіраўнікоў нацыянальных дыяспар у час застолля перад гасцямі выступалі прафесійныя і самадзейныя калектывы горада, якія раскрывалі своеасаблівы творчы летапіс гродзенскай зямлі, выклікаючы пачуццё павагі і захаплення ва ўдзельнікаў прыёму. На міжнародным свяце народный музыкі "Звіняць цымбалы і гармонік" у г.Паставы на прыёме выступалі ансамбль старадаўняй музыкі, фальклорны калектыў і асобныя выканаўцы, падкрэсліваючы сваімі выступленнямі тэматычную накіраванасць свята.

Калі прыём адбываецца ў час калядных свят, то мэтазгодным тут можа быць прыход калядоўшчыкаў ці іншых адпаведных персанажаў свята. Яны ў песнях, карагодах, танцах вітаюць удзельнікаў банкету, зычаць ім здароўя, шчасця.

Для кожнага канкрэтнага прыёму можна прыдумаць шэраг цікавых відовішчных дзей.

Забаўляльная частка прыёму звычайна складаецца з танцавальнай праграмы і забаў. У танцавальнай праграме побач з сучаснымі танцамі можна наладзіць і развучыць народнабытавы танец (польку, падэспань, кракавяк, рэчаньку і інш.), каб замежныя госці павезлі са свята і своеасаблівы ўспамін.

У асобных месцах культурная праграма завяршаецца феерверкам. Гэта старадаўняя беларуская гарадская традыцыя завяршэння балявання і застолляў мае многа прыхільнікаў. У час такога феерверку пад старадаўнюю мелодыю гледачы назіраюць, як круцяцца рознакаляровыя піратэхнічныя млыны, успыхваюць зоркі і фантаны, у неба ўзлятаюць агні салюту.

Падобнае завяршэнне прыёму заўсёды аказвае на прысутных уражвальны эфект, выклікае захапленне, моцныя пачуцці.

*Рассаджванне за сталом на прыёме.* На прыёмах (тыпу "снеданне", "абед", "вячэра") госці рассаджваюцца за сталом у адпаведнасці з іх рангам і ў парадку пратакольнага старшынства.

Яшчэ да рассылкі запрашэнняў трэба мець дакладнае ўяўленне аб тым, на якіх месцах будуць сядзець госці. Арганізатары загадзя складаюць прыкладны план рассаджвання і пры неабходнасці ўносяць у яго папраўкі. Важна, каб ніводны ўдзельнік прыёму не сядзеў спіной да ганаровых гасцей.

Для абазначэння месцаў за сталом друкуюцца рассадачныя картачкі, дзе прозвішчы ўсіх гасцей пішуць ад рукі або друкуюць.

Перад прыходам гасцей у аванзале на спецыяльным століку выстаўляецца план рассаджвання, дзе кожнае месца за сталом абазначаецца карткай. План кладуць на стол пад шкло. На плане ўваход у банкетную залу абазначаецца стрэлкай.

Запрашэнне на прыём звяраюць з планам рассаджвання, удакладняюць прозвішчы суседзяў злева і справа.

На афіцыйных снеданнях або абедах жанчын саджаюць сярод мужчын у залежнасці ад іх рангу або калі яны прысутнічаюць на прыёме ў якасці жонак, то ў адпаведнасці з рангам мужа. Муж жанчыны, якая займае афіцыйнае становішча, садзіцца сярод мужчын у адпаведнасці з рангам жонкі, калі займаемае ім становішча (тытул, званне і інш.) не дае яму права на больш ганаровае месца.

Месцы за сталом дзеляцца на больш ганаровыя і менш ганаровыя. Самае ганаровае месца — справа ад гаспадыні (на прыёме з удзелам жанчын) і справа ад гаспадара (на мужчынскім прыёме). Далей ідуць месцы злева ад гаспадыні і злева ад гаспадара. Па меры аддалення ад гаспадыні і гаспадара месцы становяцца менш ганаровымі. Галоўнае правіла рассаджвання — на самых ганаровых месцах сядзяць самыя ганаровыя госці. Пры рассаджванні за сталом прытрымліваюцца наступных правіл:

1. Першымі справа і злева ад гаспадыні сядзяць прадстаўнікі мужчынскага полу, гаспадара акружаюць дамы.

2. Пры адсутнасці жанчын першым лічыцца месца справа ад гаспадара, другім — месца злева ад яго.

3. Госця высокага рангу можна пасадзіць насупраць гаспадара, і ў гэтым выпадку другім будзе месца справа ад гаспадара дома.

4. Пры рассаджванні ўдзельнікаў прыёму неабходна ўлічваць веданне моў гасцямі, якія сядзяць побач.

5. На снеданні, абедзе і вячэры магчыма размяшчэнне адной дэлегацыі насупраць другой.

6. Ганаровым лічыцца месца насупраць уваходных дзвярэй.

7. Мужа ніколі не саджаюць побач з жонкай, а жанчыну побач з жанчынай.

8. Двух іншаземцаў з адной краіны таксама не садзяць побач.

9. Апошнія месцы за сталом займаюць супрацоўнікі сваёй установы, але не жанчыны.

Гаспадар прапануе руку першай даме (гэта значыць жанчыне, якой хочуць аказаць асобы гонар) і першым праходзіць у сталовую. Ганаровы госць прапануе руку гаспадыні дома, і яны ўваходзяць апошнімі.

Госці займаюць свае месцы пасля таго, як сядзе гаспадыня.

Калі прыём неафіцыйны, дамам не прынята прапаноўваць руку. У гэтым выпадку гаспадыня суправаджае жанчын у сталовую, а гаспадар — мужчын.

У канцы стала (а калі стол вельмі доўгі, то пасярэдзіне) па абодва бакі ад гаспадыні — ганаровыя месцы.

За круглым сталом гаспадары сядзяць насупраць. Калі частаванне праводзіцца ў кафэ, рэстаране або залах атэля, гасцей рассаджваюць іншым чынам. Лепшымі месцамі лічацца тыя, дзе сядзяць спіной да сцяны, мужчыны садзяцца не побач са сваімі дамамі, а насупраць. Гаспадар павінен паклапаціцца аб тым, каб кожны мужчына загадзя ведаў, якую даму ён павядзе да стала. Такога этыкету прытрымліваюцца толькі на банкетах. Арганізатары свята стараюцца стварыць прыемную атмасфру і рассадзіць запрошаных так, каб побач аказаліся людзі з агульнымі інтарэсамі. Дзяцей трэба садзіць за асобны стол. Гэта зручней і для іх, і для дарослых. Калі дзяцей мала, іх садзяць побач з бацькамі. А ўвогуле дзяцей лепей не браць з сабой, а даручыць іх нагляд суседзям ці знаёмым.

Той, хто частуе ў рэстаране, загадзя заказаўшы стол, павінен пайсці заплаціць па рахунку да заканчэння ўрачыстасці. Каля стала гэта рабіць не рэкамендуецца. Часам рахунак прыносіць на падносе афіцыянт, а той, хто частуе,

кладзе грошы на паднос. Але самае зручнае — заплаціць за ўсё наперад пры заказе.

Калі ўсіх гасцей нельга размясціць у адным пакоі, то для больш маладых ставяць стол у іншым пакоі. Незалежна ад свайго ўзросту гаспадары заўсёды застаюцца з больш сталымі гасцямі.

*Тосты.* Звычай гаварыць здравіцы ідзе з глыбіні вякоў. Амаль у кожнай культуры складвалася свая традыцыя. Гэтыя звычаі паступова ператварыліся ў сённяшнія тосты — пажаданні любві, здароўя, дружбы, дабрабыту і шчасця.

Слова "тост" узнікла ў XVII ст. у Англіі, дзе існавалі звычаі кідаць у бакал з напіткам кавалачак падсалоджанага хлеба — тоста, які плаваў на паверхні.

У час прамоў і тостаў недапушчальна размаўляць, наліваць віно, есці.

На афіцыйных прыёмах прамовы і тосты выказваюцца пасля дэсерту, калі наліта шампанскае. На іншых прыёмах — праз 10—15 мінут пасля пачатага прыёму.

У апошні час прамовамі і тостамі абменьваюцца ў самым пачатку прыёму.

Ніводны прыём, як афіцыйны, так і неафіцыйны, не абыходзіцца без тостаў. У пачатку банкету госці заслухоўваюць тост яго арганізатара ці гаспадара, у якім ён гаворыць аб падзеі, што сабрала людзей у гэтай зале, можа коратка падвесці асноўныя вынікі свята, фестывалю, пажадаць усім здароўя, шчасця. У адказ госці выказваюць удзячнасць гаспадарам за прыём, за арганізацыю сустрэчы ў гонар пэўнай падзеі.

Характар тоста, яго змест і стыль залежаць ад узроўню, на якім праводзіцца прыём, і ад падзей, з нагоды якіх яго наладжваюць. Галоўнае ў тосце — сардэчнасць. Тост павінен быць вобразным, яркім, запамінальным. Аднак злоўжываць за сталом доўгім, працяглым тостам не варта, каб не стамляць гасцей. Чым карацей тост, тым ён лепей.

Тост неабходна падрыхтаваць загадзя. Калі вы хочаце паказаць усім сваё аратарскае майстэрства, можна трошкі ўпрыгожыць ваша выступленне нейкім успамінам, пахвалой, жартам. У любым выпадку тост павінен мець непасрэдныя адносіны да падзеі, паводле якой арганізаваны прыём.

На афіцыйных прыёмах, як правіла, слова прысутным дае гаспадар або спецыяльна абраны для гэтай мэты тамада. Ён папярэджвае некалькімі фразамі кожнае выступленне, а ў канцы прыёму сам прамаўляе здравіцу.

Калі прыём неафіцыйны, тост можа прапанаваць любы з удзельнікаў, як толькі будзе пададзена віно або шампанскае. Свой бакал неабавязкова дапіваць да канца. Пасля кожнага тоста можна адпіваць невялікі глыток з тым, каб аднаго бакала ці чаркі хапіла на некалькі разоў.

Мужчына, за якога падымаюць тост, застаецца сядзець і не п'е разам з іншымі. Замест гэтага ён потым падымаецца і п'е за здароўе тых, хто сказаў у яго адрас цёплыя словы. Калі прапанавалі выпіць за жанчыну, яна таксама можа адказаць тостам.

Паколькі на прыёмах часта бываюць замежныя госці, то веданне тостаў на роднай мове гасцей можа вам дапамагчы завязаць кантакт.

На афіцыйных снеданнях, абедах, прыёмах не прынята чокацца. Калі чокаюцца, то мужчына трымае сваю чарку ніжэй чаркі жанчыны.

У многіх раёнах Беларусі на афіцыйных і неафіцыйных прыёмах арганізатары аднаўляюць старажытныя традыцыі беларускага шляхецкага застолля. Згодна гэтай традыцыі гаспадар, абвясціўшы першую здравіцу ў гонар галоўнага госця, затым па чарзе і ў пэўным парадку перадае тост кожнаму з прысутных. Такія тосты ў закрытых памяшканнях суправаджаюцца музычнымі прывітаннямі інструментальных ансамбляў. Гэта значна ўпрыгожвае тосты і надае адметную асаблівасць і каларыт усяму застоллю. Падобныя тосты на прыёмах, якія адбываюцца на адкрытым паветры (Воранава,

Паставы, Гродна), суправаджаюцца піратэхнічнымі дзеямі. Пасля кожнага тоста гучыць выстрал з маленькай гарматы або ў паветра ўзлятаюць рознакаляровыя ракеты, што вельмі ўражвае прысутных.

Часам святочная падзея, з нагоды якой арганізоўваюць прыём (нараджэнне новага свята, прэзентацыя, выставы кнігі, аўтарскі вечар і інш.), адзначаецца ўпершыню. У многіх мясцінах стала традыцыяй адным з фрагментаў прыёму рабіць вынас торта, упрыгожанага свечкамі.

Існуе своеасаблівы рытуал віншавання. Перад падачай дэсерту метрдатэль або афіцыянт у асобным памяшканні запальвае свечкі на торце. Пасля тоста ў гонар гасцей афіцыянт заносіць торт у зал. У зале памяншаюць святло, пакідаючы толькі кантрольнае асвятленне. Торт ставіцца на фарфоравую або мельхіёравую талерку. У паўцёмным памяшканні прыгожа аформлены з запаленымі свечкамі торт стварае ўрачысты настрой. Метрдатэль віншуе гаспадара прыёму і ўручае яму спецыяльнае прыстасаванне для гашэння свечак. Каб свечкі хутка не таялі, іх папярэдне кладуць у халадзільнік. Пры падачы на стол на запаленыя свечкі часам надзяваюць фарфоравыя капсулы з пружынкай, якія засцерагаюць вочы ад яркага полымя свечкі.

Калі-нікалі ўнясенне торта адбываецца праз "дарогу" бенгальскіх агней (якія ў руках трымаюць афіцыянты), што аказвае эстэтычна-эмацыянальнае ўздзеянне на прысутных.

У некаторых раёнах на прыёмах згодна старадаўняга беларускага рытуалу гаспадар у фінале застолля (пасля сваёй прамовы) прапануе ўсім гасцям калектыўны тост — пажаданне. Пачынаючы з галоўнага госця, усе астатнія, якія сядзяць па ходу сонца, па чарзе дадаюць адно ці некалькі слоў пажадання да тоста гаспадара. Такім чынам, усе прысутныя, нават тыя, якія раней не прамаўлялі тосты, выказваюць сваю добразычлівасць і ўдзячнасць гаспадарам, якія сабралі іх у гэтай зале.

У беларусаў, як і ў іншых народаў, захавалася традыцыя развітальнага тоста з гасцямі, што ўжо пакінулі залу і збіраюцца ад'язджаць. Гэты тост атрымаў назву "аглаблёвы", "страмянны", "пасашковы", "на адну і другую нагу" і інш. Перад пасадкай у транспарт дзяўчына падносіць гасцям на падносе чаркі са спіртным напіткам і невялікую закуску. Гаспадар жадае гасцям шчаслівай дарогі.

*Падарункі і сувеніры.* На разнастайных святах, фестывалях гасцям падносяць кветкі ў знак пашаны і ўдзячнасці за ўдзел у тым ці іншым мерапрыемстве.

Падрыхтоўваючы кветкі, неабходна памятаць, што яны ў некаторых краінах маюць пэўнае значэнне, і няправільна складзены букет можа вас паставіць у непрыемнае становішча. Напрыклад, у Германіі вогненна-чырвоныя ружы — знак палымянага кахання, іх прынята дарыць толькі вельмі блізкім людзям. У Мексіцы і іншых краінах Лацінскай Амерыкі чырвоны колер, наадварот, колер крыві і смерці, таму сваім замежным гасцям з тых краін лепш дарыць белыя кветкі. У Кітаі, як і ў Турцыі, не любяць спалучэння белага і сіняга колераў, а букеты, складзеныя з кветак розных адценняў у спалучэнні з дэкаратыўнай зелянінай, карыстаюцца вялікай папулярнасцю.

У цэлым неабходна падкрэсліць, што ва ўсіх выпадках кветкі з'яўляюцца прыемным падарункам, асабліва калі яны падабраныя з густам. Што тычыцца рэчавых падарункаў, то іх выбар у многім залежыць ад характару вашых узаемаадносін. Так, кіраўнікам дэлегацыі можна падарыць нешта такое, што нагадвала б пра Беларусь, — твор мясцовага мастака, вырабы прыкладнога дэкаратыўнага мастацтва, народных рамёстваў, іншым членам дэлегацыі ў якасці падарунка можна прэзентаваць кнігі мясцовых аўтараў, мастацкія альбомы. Даволі часта дараць гасцям на святах сувенірны набор у цэлафанавых пакетах са святочнай сімволікай, у які ўваходзяць афіша, праграма і буклет свята, памятны медаль, зроблены

майстрамі ганчарнага промыслу, кніга аб горадзе, дзе адбываецца свята.

Асабістыя рэчы дараць толькі вельмі блізкім людзям. Выбіраючы падарунак, неабходна падумаць і аб яго кошце. Атрымаўшы дарагі падарунак, госць з замежнай краіны можа адчуць сябе абавязаным зрабіць падарунак у адказ.

Важна ўмець не толькі рабіць падарункі, але і прымаць іх. Калі вы самі прымаеце падарунак, памятайце, што спачатку трэба аддзячыць таго, хто дарыць, затым разгарнуць пакет, паглядзець, што ў ім, яшчэ раз аддзячыць за ўвагу.

Усе падарункі незалежна ад іх матэрыяльнай каштоўнасці трэба прымаць з аднолькавай удзячнасцю.

*Заканчэнне прыёму.* У канцы застолля ўслед за арганізатарам банкету госці ўстаюць, мужчына пры гэтым дапамагае даме, якая сядзіць ад яго справа, выйсці з-за стала.

Заключны этап прыёму — гэта провады гасцей. Іх арганізацыя мае не меншае значэнне, чым арганізацыя прыёму. У час провадаў таксама аказваюць адпаведную ўвагу гасцям.

Гаспадар прыёму праводзіць гасцей да таго месца, дзе ён іх сустракаў. Пры развітанні аказвае ім такія ж знакі ўвагі, як і пры сустрэчы. Калі ж прыём быў мнагалюдным, то гаспадар праводзіць толькі ганаровых гасцей, а астатніх гасцей праводзяць сустракаўшыя іх асобы.

У час провадаў мэтазгодна наладзіць хуткую падачу транспарту для гасцей, дзеля чаго ў канцы прыёму дыспетчар руху загадзя папярэджвае вадзіцеляў. Калі ёсць магчымасць, па мікрафоне да пад'езда, дзе адбываецца прыём, выклікаюць пэўныя аўтамабілі, аўтобусы.

Провады гасцей можна аздобіць музычным афармленнем. Музычны калектыў, які сустракаў гасцей або іграў на прыёме, на развітанне можа выконваць гімн ці песню аб свяце, на якім былі госці, або мелодыю той краіны, адкуль прыбыў госць.

## Літаратура

*Пост Эмили.* Этикет. — М., 1966.

*Усов В.П.* Организация обслуживания в ресторане. — Мн., 1990.

*Хлопова Т.И., Лебедева М.М.* Протокол и этикет для деловых людей. — М., 1995.

# Х. РАБОТА ДАПАМОЖНЫХ СЛУЖБАЎ СВЯТА

## Транспартная служба

Арганізацыяй работы службовага транспарту свята павінна займацца спецыяльна вызначаная асоба — дыспетчар транспартнага руху. Калі па розных прычынах вылучыць такую пасаду ў складзе аргкамітэта немагчыма, то яго задачы могуць быць уведзены ў функцыянальныя абавязкі адміністратара або загадчыка пастановачнай часткі ці дырэктара свята. На папярэднім этапе падрыхтоўкі святочных дзеянняў дыспетчар транспартнага руху дэталёва знаёміцца са сцэнарным планам свята, а затым вызначае сумесна з галоўным рэжысёрам і дырэктарам, у якіх фрагментах свята існуе патрэба забеспячэння работы грузавога і пасажырскага аўтатранспарту. Пры гэтым удакладняецца, якія маркі машын і ў якой колькасці патрэбны для правядзення пагрузачна-разгрузачных, мантажных работ, падвозу ўдзельнікаў творчых калектываў і асобных выканаўцаў на рэпетыцыі і ў час святочных дзей. У далейшым дыспетчар транспартнага руху, кіруючыся рабочым планам падрыхтоўкі свята, графікам правядзення рэпетыцый і праграмай святочных мерапрыемстваў, складае папярэдні графік транспартнага руху на свяце. У гэтым графіку ён адзначае, куды, калі і ў які тэрмін павінен быць пададзены транспарт, яго колькасць і маркі аўтамашын, а таксама, які транспарт можа быць прадстаўлены на грамадскіх або спонсарскіх пачатках з ліку мясцовых транспартных сродкаў (машыны выканкама, аддзела культуры, камунгаса, арганізацый, прадпрыемстваў, устаноў), а які неабходна заказаць на мясцовай аўтабазе.

Папярэдні графік разглядаецца на пасяджэнні аргкамітэта, у яго ўносяцца папраўкі, дапаўненні, у выпадку неабходнасці ў каштарысе свята прадугледжваюцца транспартныя выдаткі.

На падставе зацверджанага аргкамітэтам свята графіка транспартнага руху дыспетчар здзяйсняе сувязь з арганізацыямі-пастаўшчыкамі транспарту і ад імя аргкамітэта ці ўстановы, якая па яго даручэнні ажыццяўляе фінансавыя разлікі па гэтым пытанні, выстаўляе заяўкі на аўтатранспарт.

Дыспетчар пастаянна кантралюе работу транспарту. Ён загадзя звязваецца па тэлефоне з аўтабазамі, прадпрыемствамі, арганізацыямі, установамі, фіксуе своечасовае прыбыццё аўтамашын, а па заканчэнні выкананых работ завярае пуцявыя лісты шафёраў.

У мэтах своечасовай падачы транспарту дыспетчар загадзя паведамляе ў арганізацыю аб часе прыбыцця машыны з указаннем яе маркі і нумара з тым, каб гэтую транспартную адзінку мог сустрэць прадстаўнік арганізацыі, які ў далейшым будзе курыраваць яе работу. У другім выпадку з шафёрам па маршруце можа быць накіраваны прадстаўнік адной са службаў.

Вызначаючы тэрміны работы аўтатранспарту, дыспетчар павінен прадугледжваць у графіку яго работы перапынкі на харчаванне шафёраў (снеданне, абед, вячэра), а таксама іх адпачынак.

Дыспетчару неабходна прасачыць за тым, каб у дні падрыхтоўкі і правядзення свята за пастановачнай групай быў замацаваны транспарт для экстранных патрэб (дастаўка на пляцоўкі дзеяння творчых калектываў і асобных выканаўцаў, рабочых брыгад, перамяшчэнне па зонах дзеяння членаў аргкамітэта, адказных за выкананне тэрмінова пастаўленых задач і інш.).

Сваю работу дыспетчар здзяйсняе ў цеснай сувязі з памочнікам галоўнага рэжысёра і дырэктарам свята, а таксама службай бяспекі дарожнага руху, разам з якімі ўдакладняюцца і вырашаюцца многія арганізацыйныя пытанні.

## Служба бяспекі дарожнага руху

У час правядзення свят, на якія звычайна з'язджаюцца не толькі жыхары наваколля, але і шматлікія госці і дэлегацыі, творчыя калектывы з іншых раёнаў, гарадоў, пэўныя зоны святочнага дзеяння становяцца месцам збору вялікай колькасці людзей.

Вырашэнне комплексу пытанняў бяспекі дарожнага руху ўскладаецца на мясцовую службу ДАІ, супрацоўнікам якой неабходна каардынаваць сваю работу з дыспетчарам транспартнага руху свята.

У кожным канкрэтным свяце перад службай ДАІ могуць быць пастаўлены спецыфічныя задачы, але найбольш характэрнымі для любога свята і абавязковымі для выканання з'яўляюцца ніжэйпералічаныя.

*Сустрэча гасцей.* На свята часта прыязджаюць на сваім аўтатранспарце госці і творчыя калектывы з іншых гарадоў, абласцей, краін. Вадзіцелі аўтатранспартных сродкаў, як правіла, не ведаюць планіроўку населенага пункта або дрэнна ў ёй арыентуюцца. Таму неабходна арганізаваць сустрэчу гасцей на мяжы горада, мястэчка, з тым каб растлумачыць ім далейшы шлях або наладзіць суправаджэнне да загадзя вызначанага месца. Часта такая сустрэча праводзіцца разам з прадстаўнікамі мясцовай адміністрацыі, культработнікамі, творчымі калектывамі і набывае часам тэатралізаваны характар: гасцей сустракаюць з хлебам-соллю, прывітальнымі прамовамі і песнямі, кветкамі, што стварае ў прыбыўшых святочны настрой.

Для таго каб арганізаваць сустрэчу за мяжой населенага пункта, работнікі ДАІ дамаўляюцца з аўтаінспектарамі, якія знаходзяцца на дзяжурных пастах па маршруце руху транспарту, аб тым, каб яны рэгулярна паведамлямі ў штаб свята або ў ДАІ аб часе праходжання пэўнай машыны. Гэта дае магчымасць, па-першае, дакладна ведаць, дзе на дадзены момант знаходзіцца дэлегацыя, па-другое, прыблізна вылічыць,

калі яна прыбудзе да мяжы горада, па-трэцяе, своечасова даставіць да месца сустрэчы прадстаўнікоў адміністрацыі і творчыя калектывы, якія маюць дастаткова часу для падрыхтоўкі і правядзення самога рытуалу сустрэчы. У некаторых мясцінах існуе і такая практыка: калі на свята едуць госці з замежжа, адміністрацыя месца яго правядзення дамаўляецца з выканкамамі іншых раёнаў аб папярэдняй сустрэчы гасцей і іх суправаджэнні работнікамі мясцовых ДАІ на пэўных участках маршруту па тэрыторыі гэтай мясцовасці. Такая форма сустрэчы пакідае ў гасцей вельмі прыемнае ўражанне, яны адчуваюць гасціннасць і клопат гаспадароў. Разам з тым гаспадары свята будуць упэўнены, што з іх гасцямі па дарозе не здарыцца ніякіх непаразуменняў, непрыемных выпадкаў, здарэнняў.

*Рух транспарту на свяце.* Месцам правядзення свят амаль заўсёды становяцца плошчы і вуліцы населенага пункта, а яны, як вядома, прызначаны для руху транспарту. Каб дапамагчы правядзенню свят і ў той жа час не парушыць работу жыццёва важных транспартных артэрый горада, мястэчка, мясцовыя ўлады павінны прыняць наступныя меры:

— аддаць распараджэнне аб перакрыцці пастамі ДАІ вуліц, праспектаў, плошчаў, на якіх будзе адбывацца святочнае дзеянне, і закрыцці праезду па іх усіх відаў транспарту, акрамя службовага;

— для гарадскіх і міжгародных аўтобусаў, а таксама для грузавога, прыватнага транспарту распрацаваць спецыяльныя аб'язныя маршруты, каб не паралізаваць жыццё населенага пункта;

— кожная адзінка службовага аўтатранспарту (аўтобусы з творчымі калектывамі і дэлегацыямі гасцей, машыны з рабочымі брыгадамі, аўтафургоны з прамысловымі, сельскагаспадарчымі і харчовымі таварамі, конныя павозкі з вырабамі народных умельцаў, машыны гукаўзмацнення і інш.), якая працуе ў зоне дзеяння свята, павінна мець спецыяльны пропуск. Гэты пропуск, эскіз якога распрацоўваецца мастаком або

тэкст якога складаецца дырэктарам свята, друкуюць, завяраюць пячаткай ДАІ або пячаткай выканкама, аддзела культуры і прымацоўваюць на ветравое шкло аўтамабіля. Калі па розных прычынах няма магчымасці ці часу вырабіць такі пропуск, то ім, па дамоўленасці з ДАІ, можа служыць афіша свята, замацаваная на ветравым ці бакавым шкле службовага аўтатранспарту.

*Арганізацыя работы аўтавакзала свята.*

На свята прыязджаюць многа людзей з навакольных мясцін і суседніх раёнаў на прыватным транспарце. Дзеля мэтанакіраванай арганізацыі бяспекі руху, каб пазбегнуць аўтамабільных затораў, мэтазгодна на тэрміны святкавання вызначыць у населеным пункце спецыяльнае месца для аўтавакзала свята, улічваючы мяркуемы прыток машын. Калі ў населеным пункце маленькія па памеры плошчы, то тэрыторыю мясцовага аўтавакзала можна размясціць за яго межамі. Напрыклад, у г.Скідалі Гродзенскай вобласці ў час правядзення абласнога кірмашу (1984) аўтавакзал свята размясцілі на полі, куды прыбылі некалькі тысяч аўтамабіляў.

Аўтавакзал свята неабходна падзяліць на ўчасткі для службовага і прыватнага транспарту. Шлях да аўтавакзала трэба забяспечыць спецыяльнымі паказальнікамі, а месца яго размяшчэння аформіць уваходнай брамай, акантаваць. Тут жа можна паставіць пост ДАІ, які і знаходзіцца на дзяжурстве ў населеным пункце і павінен накіроўваць на аўтавакзал свята як прыватны, так і службовы транспарт (які мае права праезду па тэрыторыі свята толькі ў выпадку патрэбы).

Наладжванне работы аўтавакзала свята дасць магчымасць у любым выпадку, калі існуе неабходнасць, адшукаць тую ці іншую машыну, а таксама паставіць аўтатранспарт пад нагляд ДАІ і работнікаў міліцыі.

Калі існуе магчымасць, на аўтавакзале рэкамендуецца паставіць гукаўзмацняльную апаратуру для таго, каб можна было папярэдзіць вадзіцеля пэўнай машыны аб неабходнасці яго прыбыцця для далейшай работы ў пэўнае месца. Пры ад-

сутнасці такой магчымасці падобнае апавяшчэнне здзяйсняецца рассыльнымі кур'ерамі. Дарэчы, у час свята вадзіцелі службовага транспарту, каб не стварыць праблем featureзнага характару, пастаянна знаходзяцца каля машын.

*Суправаджэнне.* На свяце павінна быць забяспечана суправаджэнне машынамі ДАІ аўтакалон службовага транспарту, тэатралізаваных і святочных шэсцяў удзельнікаў свята.

Калі адбываецца феерверк, то работнікі ДАІ павінны загадзя распрацаваць маршрут руху аўтамабіля з выбуховымі і піратэхнічнымі сродкамі па вуліцах населенага пункта. Гэты аўтамабіль неабходна сустрэць за межамі горада, мястэчка, вёскі, суправадзіць машынай ДАІ да месца мантажу піратэхнічных фігур, а ў дзень правядзення феерверку — да месца ўвасаблення піратэхнічнай дзеі. Усе арганізацыйныя моманты гэтага суправаджэння (час, маршрут, месца) удакладняюцца з членамі аргкамітэта, адказнымі за правядзенне мерапрыемства.

Меры бяспекі руху, якія неабходна прыняць у час падрыхтоўкі і правядзення свята, дадуць магчымасць у арганізаваным парадку вырашыць розныя транспартныя праблемы, пазбегнуць блытаніны пры перамяшчэнні творчых і гаспадарчых груп, забяспечыць парадак і ахову жыцця ўдзельнікам свята.

## Служба аховы парадку

Дзеючымі нарматыўнымі актамі на транспарце на органы ўнутраных спраў ускладзены абавязкі па забеспячэнні грамадскага парадку і бяспекі пры правядзенні масавага мерапрыемства. Масавыя мерапрыемствы праводзяцца не на тэрыторыі аператыўнага абслугоўвання аддзялення ўнутраных спраў на транспарце (АУСТ). Прыбыццё і ад'езд удзельнікаў ажыццяўляюцца іншы раз чыгуначным транспартам. У сувязі з гэтым на аб'ектах павялічваецца паток пасажыраў ускладняецца аператыўная абстаноўка.

Тэрыторыя вакзалаў, станцый, іншых транспартных аб'ектаў мае свае граніцы і маштабы. Лесвіцы, уваходы, вагоны цягнікоў і іншае разлічаны на вызначаную прапускную здольнасць і часам не могуць адразу прыняць і прапусціць усіх жадаючых. У такіх абставінах складаюцца перадумовы для здзяйснення правапарушэнняў. Пры гэтым узнікае рэальная пагроза для жыцця і здароўя грамадзян, знішчаецца ці пашкоджваецца дзяржаўная, грамадская і прыватная маёмасць, спыняецца рух цягнікоў, выходзяць са строю ці разбураюцца асобныя аб'екты. У гэтых умовах перад службамі і падраздзяленнямі ўнутраных спраў ставіцца адзіная мэта — забяспечыць грамадскі парадак і бяспеку, аказаць першую дапамогу пацярпелым і арганізаваць іх выратаванне.

У падрыхтоўчы перыяд кіраўнік транспартнага органа, атрымаўшы інфармацыю аб маючым адбыцца масавым мерапрыемстве, пасля ўдакладнення месца, часу, прыкладнай колькасці ўдзельнікаў і іншых дэталяў прымае рашэнне аб назначэнні адказных, а таксама вызначае колькасць сіл і сродкаў забеспячэння грамадскага парадку. Адказныя, кіраўнік аддзялення ўнутраных спраў, разглядаючы рэальныя аператыўныя абставіны правядзення масавага мерапрыемства, вырашаюць, работнікі якіх службаў і ў якой колькасці будуць дзейнічаць.

Арганізацыйнай асновай узаемадзеяння службаў і падраздзяленняў па ахове грамадскага парадку з'яўляецца план. Калі свята праводзіцца на значным аддаленні ад чыгуначнай дарогі і галоўнай задачай з'яўляецца забеспячэнне грамадскага парадку ў час прыбыцця і ад'езду ўдзельнікаў, то, як правіла, план не складаецца, а загадам начальніка органа ўнутраных спраў ствараюцца дадатковыя пасадачныя групы і групы суправаджэння цягнікоў. Пры неабходнасці рэгулявання руху пасажыраў на подступах да чыгуначнага вакзала ці станцыі ствараюцца міліцэйскія ланцужкі.

У складаным становішчы аператыўных абставін і маштабнасці праводзімага масавага мерапрыемства ў распрацоўваемых планах вызначаюцца:

— месца, час, мэта правядзення масавага мерапрыемства, прыкладная колькасць удзельнікаў;

— участак ачаплення;

— рэжым работы чыгуначнага транспарту і іншых чыгуначных аб'ектаў;

— сілы і сродкі, іх расстаноўка (аддзяленне ўнутраных спраў, дабрачынныя грамадскія дружыны, рэзерв і інш.), парадак узаемадзеяння;

— распрацоўка абавязкаў нарадаў у залежнасці ад месца нясення службы;

— выкарыстоўванне тэхнічных сродкаў, розных загарод, аўтамотатранспарту;

— арганізацыя сувязі паміж узаемадзеючымі суб'ектамі і штабам.

Па прычыне таго, што ў ахове грамадскага парадку прымаюць удзел шматлікія службы і падраздзяленні аддзела ўнутраных спраў, узнікае неабходнасць у іх узгодненай рабоце. Дасягнуць гэтага можна, калі кіраванне ўзаемадзеючымі суб'ектамі здзяйсняецца аператыўна і з адзінага цэнтра. З гэтай мэтай ствараецца аператыўны штаб, якім кіруе начальнік АУС ці адзін з яго намеснікаў. У састаў штаба ў якасці яго членаў уваходзяць кіраўнікі службаў і падраздзяленняў ці іх намеснікі, якія з'яўляюцца адказнымі за пэўныя зоны. У саставе аператыўнага штаба ўтвараюць групы, якія займаюцца аховай грамадскага парадку, разборам спраў з затрыманымі, пажарнай аховай, інфармацыяй і сувяззю.

На начальніка штаба як асноўнага кіруючага суб'екта ўскладзена арганізацыя ўзаемадзеяння ўсіх службаў і падраздзяленняў. Група арганізацыі грамадскага парадку забяспечвае ўзаемадзеянне паміж асабовым саставам, які нясе службу ў сектарах, зонах; недапушчэнне на тэрыторыю ачаплення

пабочных грамадзян; пропуск да месца правядзення масавага мерапрыемства ўдзельнікаў, запрошаных гасцей і гледачоў.

Работнікі аператыўных службаў у час падрыхтоўкі і правядзення масавага мерапрыемства групамі па 2—3 чалавекі забяспечваюць прыкрыццё месцаў канцэнтрацыі асоб, ад якіх можна чакаць правапарушэнні, прымяняюць да іх адпаведныя меры ўздзеяння.

Для здзяйснення належнай сувязі паміж узаемадзеючымі суб'ектамі выкарыстоўваюцца радыёстанцыі, тэлефоны, гучнагаварыцелі, бесперабойную работу якіх абавязаны забяспечыць адказны за сувязь член штаба. У падрыхтоўчы перыяд у яго задачу ўваходзіць распрацоўка схем сувязі аператыўнага штаба з падначаленымі службамі і падраздзяленнямі, дзяжурнай часткай, тэрытарыяльнымі органамі ўнутраных спраў і іншымі структурамі.

Асабовы састаў аддзела ўнутраных спраў не пазней чым за суткі да пачатку свята праходзіць інструктаж, у ходзе якога ўсіх яго членаў знаёмяць з асаблівасцямі праводзімага мерапрыемства, аператыўных абставін, спосабамі дзеяння пры іх змяненні. Устанаўліваюцца прыкладны пачатак і завяршэнне часу работы кожнай групы, спосабы сувязі з дзяжурнай часткай і кіраўніцтвам, вызначаецца матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне, удакладняюцца старшыя груп і асобы, якія здзяйсняюць кантроль.

Прыкладна за 1—2 гадзіны да прыбыцця асноўных удзельнікаў свята праводзіцца паўторны інструктаж, у якім асобам, што прымаюць удзел у ахове парадку, паведамляюць аб змяненнях у аператыўных абставінах, у расстаноўцы сіл і сродкаў.

Калі выканаўчы этап у арганізацыі ўзаемадзеяння службаў і падраздзяленняў тэрытарыяльных аддзяленняў унутраных спраў заканчваецца пасля завяршэння масавага мерапрыемства, то ў аддзяленні ўнутраных спраў на транспарце гэты этап працягваецца да моманту ад'езду асноўных мас пасажыраў за межы абслугоўваемых участкаў. У мэтах забеспячэння

грамадзянскага парадку сярод пасажыраў узнікае неабходнасць іх разгрупавання на прыступках да аб'екта чыгуначнага транспарту. Гэта дасягаецца з дапамогай спецыяльных міліцэйскіх ланцужкоў, якія ўтвараюць калідоры для калон ад'язджаючых.

Кіруючымі суб'ектамі ўзаемадзеяння службаў і падраздзяленняў у міліцэйскіх ланцужках з'яўляюцца старшыя нарадаў, якія нясуць усю адказнасць за забеспячэнне грамадскага парадку.

На платформах і ў цягніках сярод ад'язджаючых працуюць супрацоўнікі пасадачных груп і груп суправаджэння.

Выканаўчы этап па арганізацыі ўзаемадзеяння службаў і падраздзяленняў у міліцэйскіх ланцужках заканчваецца з адыходам апошняга цягніка з удзельнікамі масавага мерапрыемства, а груп суправаджэння — пасля вяртання асабовага саставу з паездкі. Таму заключны перыяд арганізацыі ўзаемадзеяння службаў і падраздзяленняў АУС і АУСТ у ахове грамадскага парадку пры правядзенні масавага мерапрыемства заканчваецца, як правіла, толькі на наступны дзень, калі падводзяцца вынікі работы, дзе даецца ацэнка дзейнасці ўсіх суб'ектаў, уносяцца канкрэтныя прапановы па далейшым удасканальванні іх арганізацыі.

## Служба пажарнай аховы

Пытаннямі пажарнай бяспекі на свяце займаюцца адказныя супрацоўнікі мясцовай пажарнай аховы. У перыяд падрыхтоўкі свята яны праводзяць шэраг прафілактычных супрацьпажарных мерапрыемстваў з мэтай папярэджвання пажару.

Інспектар пажарнай аховы напярэдадні мантажу часовых электрычных ліній свята, электраасвятляльнай і гукаўзмацняльнай апаратуры павінен правесці гутарку або даць парады тэхнічным работнікам і пракантраляваць выкананне мерапрыемстваў супрацьпажарнай бяспекі.

Каб пазбегнуць пашкоджання ізаляцыі правадоў і каротка-га замыкання, не дазваляецца:

— завязваць правады ў вузлы, скручваць, закрываць шчы-тамі, прапускаць іх праз сценку і перагародкі без дадатковай ізаляцыі фарфоравымі чашкамі і эбанітавымі трубкамі, карыстацца непрыгоднымі выключацелямі, замалёўваць і бяліць шнуры і правады;

— вешаць што-небудзь на шнуры і правады, прымацоўваць іх да газавых і вадаправодных труб, батарэй сістэмы ацяплення;

— дапускаць сутыкненне электрычных правадоў з тэлефоннымі і радыётрансляцыйнымі, тэлеантэнамі, галінамі дрэў, дахамі пабудоў;

— выкарыстоўваць у якасці праваднiка электрычнага току тэлефонныя або радыёправады.

На сучасных святочных кірмашах, асабліва ў халодную пару года, работнікі гандлю ўжываюць электрычныя пліткі або электрапечкі для прыгатавання гарачых страў, напіткаў (гарбаты, кавы). Іх неабходна папярэдзіць пра наступныя правілы пажарнай бяспекі:

— награвальныя прыборы можна ўсталёўваць толькі на падстаўкі, выраблены з незгаральных матэрыялаў дастатковай таўшчыні;

— забараняецца пакідаць без нагляду ўключаныя прыборы;

— забараняецца ўключаць у адну разетку адначасова некалькі прыбораў;

— неабходна назіраць за шчыльнасцю кантактаў у месцах далучэння прыбораў да вілкі, паміж сабой і інш.

Пры мантажы электраасвятляльнай апаратуры трэба прасачыць, каб у пражэктарах розных тыпаў, якія маюць стацыянарны белы свет, устаўлялі пры неабходнасці рознакаляровыя застаўкі, выраблены выключна са шкла. Выкарыстанне сінтэтычных заставак не рэкамендуецца.

Асаблівую ўвагу прадстаўнікі пажарнай аховы і члены пастановачнай групы павінны ўдзяліць святочным фрагмен-

там, звязаным з вогненным дзеяннем. Пастаноўшчыкам трэба ведаць, што ў падобных фрагментах не павінны ўдзельнічаць дзеці. Вогненныя дзеі даручаюцца толькі дарослым.

На святочных мерапрыемствах, якія ажыццяўляюцца ў вячэрні час (святлопіратэхнічныя спектаклі, мітынгі-рэквіемы, сустрэчы на месцах былых партызанскіх атрадаў і інш.), арганізатары выкарыстоўваюць свечкі, каскі з палаючым агнём. Пры ўжыванні гэтых атрыбутаў святочнага дзеяння трэба памятаць, што нельга замацоўваць расплаўленым воскам свечкі на стале, дошках, папяросных і запалкавых пачках, таму што свечка пры дагаранні можа быць прычынай пажару. Свечкі трэба ставіць на металічныя падсвечнікі або талеркі і інш. Пры выкарыстанні палаючых паходняў не рэкамендуецца ўжываць тэрмітныя саставы, таму што пры гарэнні выдзяляецца вялікая колькасць дыму, што будзе перашкаджаць як удзельнікам, так і гледачам. Напрыклад, на ўрачыстым адкрыцці ў г. Мінску алімпійскага футбольнага турніру XX Алімпійскіх гульняў (1980) знакаміты беларускі барэц А.Мядзведзь з цяжкасцю змог занесці да вогненнай чашы факел, які, хаця і гарэў прыгожым чырвоным колерам, але распаўсюджваў велізарны дымны шлейф, што ахутваў спартсмена. Мы раім арганізатарам для факелаў выкарыстоўваць кардонныя трубкі даўжынёй 50 см і дыяметрам 8 см, якія трэба шчыльна акруціць шнурам і прамачыць стэарынам. Такія факелы даюць даволі чыстае полымя і палаюць на працягу 30—40 мінут. Яны вельмі зручныя яшчэ і таму, што не баяцца ветру і дажджу, а загасіць іх лёгка шляхам перакрыцця доступу паветра (акунуць у шклянку з вадой або пакруціць некалькі разоў па зямлі).

Салдацкія каскі з палаючым агнём рыхтуюць наступным чынам. У каску насыпаюць пясок ці зямлю, утрамбоўваюць, і на гэтую пракладку ставяць металічную талерку. У талерку рэкамендуецца пакласці некалькі кавалкаў або жменю сухога спірту, які пры згаранні дае роўнае, чыстае полымя. Калі гэтых мер не прыняць, то пры гарэнні каска моцна разагрэецца,

і яе немагчыма ўтрымаць у руках. У выніку палаючая каска можа ўпасці і стаць прычынай пажару або пашкодзіць праўдзенню ці ўспрыманню дзеі.

На многіх святах запальваюць кастры, без якіх не праводзяцца многія абрадава-рытуальныя або відовішчныя дзеі (напрыклад, вогнішчы на Каляды, Масленіцу, Гуканне вясны, Юр'я, Сёмуху, Купалле, кастры дружбы на інтэрнацыянальных святах і ў дзіцячых летніках і інш.). Святочныя кастры ў мэтах пажарнай бяспекі трэба размяшчаць на значнай адлегласці ад лініі электраперадач, пабудоў, лясных масіваў. Вельмі прыгожа глядзяцца кастры на вадзе, пабудаваныя на стацыянарных ці рухомых плытах. У горадзе, дзе на свяце прысутнічае вялікая колькасць людзей, кастры павінны мець агароджу, якую звычайна робяць з металічных канструкцый, а ў лесе пляцоўку для кастра можна акаймаваць земляным ровам.

З наступленнем навагодніх святкаванняў у кожнай мясцовасці на цэнтральнай плошчы ўпрыгожваюць ёлку, прытрымліваючыся наступных правіл супрацьпажарнай бяспекі: ёлку заўсёды ставяць на ўстойлівую падстаўку; упрыгожваюць яе толькі заводскай электрагірляндай; у электраправадоў не павінна быць аголеных месцаў; электрычную сетку забяспечваюць надзейнай абаронай — заводскімі электразасцерагальнікамі. Калі ў электраправодцы з'явіцца іскрэнне ці адбудзецца нагрэў правадоў, яе трэба адключыць, пакуль не будзе выяўлена прычына. На навагодніх святах свечкі, бенгальскія агні, хлапушкі неабходна прымяняць на адлегласці не менш за 5 м ад ёлкі. Вельмі небяспечныя вынікі могуць быць, калі ў не апрацаваныя спецсаставам карнавальныя касцюмы будуць апрануты людзі, асабліва дзеці.

Прамачыць марлю і вату саставам можна самім. Для гэтага ўжываюць водныя растворы наступнага саставу (па масе): дыямоній фасфат — 9 %, сернакіслы амоній — 6 %, керасінавы кантакт — 2%, вада — 83%.

На адну вагавую частку ваты бяруць 10—15 вагавых частак раствору, нагрэтага да тэмпературы 20—30°. Вату ў растворы вытрымліваюць 2—5 мінут да поўнага змочвання. Затым яе выціскаюць і сушаць пры тэмпературы не вышэй за 50°.

Эфектыўным сродкам эстэтычнага і эмацыянальнага ўздзеяння на свяце з'яўляюцца піратэхнічныя вырабы розных відаў — дымавыя і выбуховыя шашкі, сігнальныя і асвятляльныя ракеты, сігнальныя міны, фантаны, мастацкія феерверачныя кампазіцыі і інш.

Пры выкарыстанні піратэхнічных сродкаў трэба выконваць ніжэйпералічаныя супрацьпажарныя правілы:

— месца правядзення піратэхнічных дзей павінна знаходзіцца на значнай адлегласці ад гледача — не меней за 50—100 м;

— кідок выбуховых шашак трэба рабіць убок ад лініі руху на адлегласці не меней за 30 м з тым разлікам, каб выканаўца пластычнай дзеі ў момант выбуху знаходзіўся на адлегласці не меней за 5 м;

— пры выстралах з ракетніц удзельнікаў групы ракетнай дзеі неабходна размясціць за заслонай (шчыт, радыёаўтобус);

— сігнальныя міны, выкарыстанне якіх у вялікай колькасці дае эфект шматпавярховага салюту, трэба ўстанаўліваць за земляной, жалезнай, бетоннай заслонай або на вялікай адлегласці ад гледачоў (150—300 м), таму што ракеты пры выхадзе з сігнальнай міны могуць паляцець не вертыкальна, а пад нахілам, і гэта можа з'явіцца прычынай пажару або няшчаснага здарэння;

— пры планіроўцы піратэхнічнай дзеі і размяшчэнні ракетных павільёнаў арганізатары павінны ўлічваць пастаянную ружу вятроў і разлічваць на аснове метэаралагічных прагнозаў магчымыя адхіленні ў руху паветраных мас. Калі на працягу дня мяняюцца напрамак і хуткасць ветру, арганізатары павінны перапланаваць (у залежнасці ад мясцовых умоў) месца размяшчэння і кірунак выхаду ў паветра рознага тыпу ракет. У мэтах пажарнай бяспекі катэгарычна забараня-

еца запускаць ракеты ў бок пабудоў, лясоў і інш. Ігнараванне гэтага правіла можа прывесці да пажару. Напрыклад, пры святкаванні 350-годдзя г.Міёры ў Віцебскай вобласці адзін з піратэхнікаў у час салюту ажыццявіў запуск ракет па ветры. У выніку некалькі асвятляльных ракет на парашутах спланіравалі ў бок драўляных пабудоў, адна з іх трапіла на дах хаты, якая загарэлася, і хаця пажар хутка ліквідавалі, святочны настрой быў істотна сапсаваны;

— улік напрамку і сілы ветру — гэта адзін з важных аспектаў падрыхтоўкі піратэхнічнай дзеі і супрацьпажарнай бяспекі;

— піратэхнічныя ўстаноўкі і вырабы паветранай дзеі (марціры розных калібраў, сігнальныя міны, ракеты, піратэхнічныя патроны) трэба размяшчаць па вертыкальнай лініі;

— на месцы правядзення феерверку неабходна паставіць на баявы пост нарад пажарнай аховы.

Своечасовае прыняцце прафілактычных і ахоўных мер пажарнай бяспекі будзе спрыяць захаванню здароўя і жыцця людзей, матэрыяльных каштоўнасцей, садзейнічаць эфектыўнасці эмацыянальнага і эстэтычнага ўспрымання свята.

## Медыцынская служба

Экстранная медыцынская дапамога на свяце ажыццяўляецца спецыяльнай службай, якую ўзначальвае галоўны ўрач мясцовай бальніцы. У час падрыхтоўкі і правядзення свята гэтай службе неабходна вырашыць наступныя задачы:

— вызначыць персанал для абслугоўвання пры штабе медыцынскага пункта свята, супрацоўнікі якога (урач, медыцынская сястра) аказваюць гасцям і ўдзельнікам свята медыцынскую дапамогу пры раптоўным захворванні, абвастрэнні хранічнага працэсу або траўмы). Для медыцынскага пункта трэба пры штабе выдзеліць спецыяльны пакой, дзе павінны знаходзіцца кушэтка і лекавыя сродкі. У практыцы свята могуць сустракацца выпадкі гвалтоўнай смерці (нанясенне ран

халоднай, вогнестрэльнай зброяй, сціскание шыі пятлёй або рукамі і да т.п.). У гэтым выпадку разам з аказаннем пацярпеўшаму першай медыцынскай дапамогі і тэрміновым выклікам брыгады хуткай дапамогі на месца здарэння супрацоўнікі медыцынскага пункта павінны паведаміць у аддзяленне міліцыі аб выкліку, звязаным з падзеяй крымінальнага характару. Медыцынскі персанал, які аказвае хуткую дапамогу, абавязаны ў сваю чаргу тэрмінова інфармаваць аператыўную частку станцыі і адказнага дзяжурнага аддзялення міліцыі аб смяротным выпадку;

— выдзеліць для кожнай зоны святочнага дзеяння паходную аптэчку з лекавымі і перавязачнымі сродкамі першай дапамогі. Паходныя аптэчкі выдаюцца пад адказнасць рэжысёраў зон дзеяння свята;

— назначыць для аказання тэрміновай хуткай дапамогі на свяце дзяжурных мнагапрофільнай спецыялізаванай лінейнай брыгады. Машыны хуткай дапамогі ўвесь святочны дзень павінны знаходзіцца ў загадзя вызначаным месцы (звычайна побач або непадалёку ад радыёаўтобуса ці гукаўзмацняльнага цэнтра), аб чым інфармуюцца ўсе члены аргкамітэта і супрацоўнікі творчых, тэхнічных і гаспадарчых груп. Брыгада спецыялізаванай хуткай дапамогі мае права дастаўляць хворых і пастрадаўшых непасрэдна ў аддзяленне рэанімацыі, палаты інтэнсіўнай тэрапіі або ў спецыяльныя цэнтры (супрацьінфарктныя, таксікалагічныя і да т.п.), абмінаючы прыёмны пакой. Стацыянар у гэтым выпадку загадзя апавяшчаецца праз аператыўны аддзел станцыі аб паступленні найбольш цяжкахворых.

Згодна з палажэннем аб гарадской станцыі хуткай медыцынскай дапамогі хворых і пастрадаўшых, дастаўленых машынамі хуткай дапамогі, павінны неадказна прыняць у прыёмным аддзяленні стацыянараў незалежна ад наяўнасці свабодных месцаў.

## ЗАКЛЮЧЭННЕ

У дапаможніку асэнсоўваецца вопыт арганізацыі свят, найбольш распаўсюджаных на тэрыторыі нашай краіны. Яны ўзніклі ў асяроддзі народа, і правядзенне іх становіцца традыцыйным. Сапраўднае тэатралізаванае свята нараджаецца толькі тады, калі яно цікава людзям, дапамагае зрабіць жыццё больш разнастайным. Далучэнне культурнай самадзейнасці мас да арганізацыі адпачынку дае багацейшыя магчымасці для развіцця святочнай актыўнасці ўсіх груп насельніцтва, асабліва моладзі. Настаў час ацэньваць любое тэатралізаванае свята не толькі па мастацкім узроўні, масавасці ахопу, але і па масавасці падрыхтоўкі.

На тэрыторыі Беларусі ў гэтым кірунку назапашаны пэўны вопыт. Але дагэтуль у значнай частцы раёнаў існуе практыка, калі на рэжысёра ўскладаюць увесь цяжар арганізацыйнай падрыхтоўкі свята. Гэта негатыўная практыка павінна быць перагледжана карэнным чынам. Сучасны вопыт святочнай культуры пераканаўча даказвае, што для паспяховага правядзення свята на ўсіх этапах дзейнасці ў перыяд падрыхтоўкі трэба падключаць людзей розных прафесій, прадстаўнікоў розных груп насельніцтва, арганізацыі, прадпрыемствы, установы.

Арганізацыя свята — гэта складаны і мнагагранны працэс, у якім не можа быць дробязей. Любое з невыкананых запланаваных заданняў можа знізіць мастацкую якасць свята, яго эстэтычнае, эмацыянальнае і педагагічнае ўздзеянне. Таму арганізатарам пры падрыхтоўцы святочных дзей трэба імкнуцца да вырашэння пастаўленых задач.

Вельмі важным з'яўляецца падвядзенне вынікаў свята на самым высокім узроўні, з прынцыповым разборам яго праблемных аспектаў. Гэта неабходна для таго, каб у далейшым замацаваць творчыя і арганізацыйныя знаходкі і выправіць выяўленыя пралікі і недахопы.

Літаратура

*Административная* деятельность ОВД: Лекции по особенной части. — Мн.: [Б.и.], 1997.

*Круглов В.А.* Организация взаимодействия в ОВД на транспорте: Учеб. пособие. — Мн.: [Б.и.], 1944.

*Круглов В.А.* Организация и тактика деятельности ОВД в особых условиях/ МВД РБ, Акад. милиции. — Мн., 1988.

*Лазарев В.В.* Правовые основы обеспечения общественного порядка. — М.: [Б.и.], 1987.

*Основы* административной деятельности ОВД: Учеб. пособие. — М.: [Б.и.], 1974.

Вучэбны дапаможнік «Тэхналогія стварэння свята» садзейнічае абуджэнню творчай фантазіі арганізатараў, узбагачэнню іх вопытам і ведамі падрыхтоўкі і правядзення святочных дзей і стварэння на гэтай аснове цэласнай сістэмы арганізацыі разнастайных свят.

Аўтар будзе ўдзячны ўсім за выказаныя меркаванні і прапановы ў адносінах да рашэння тых ці іншых праблем арганізацыі святочнага дзеяння.

## ЗМЕСТ

**Прадмова** .............................................................. 3
**І. Пачатковы этап падрыхтоўкі да свята** .................... 6
**ІІ. Арганізацыйны камітэт па падрыхтоўцы свята** ...... 9
Склад аргкамітэта і яго структурных падраздзяленняў ..... 9
Функцыянальныя абавязкі членаў аргкамітэта..................... 11
Пастановачная група свята ............................................ 12
Абавязкі членаў творчай групы ..................................... 21
Мастацка-пастановачная частка свята ............................ 23
Упраўленне па матэрыяльна-тэхнічным забеспячэнні... 28
Арганізацыйны аддзел ................................................. 36
Бухгалтэрыя свята ...................................................... 42
Арганізацыйна-вытворчы аналіз сцэнарыя свята ............ 45
Творчае забеспячэнне свята ........................................ 46
Матэрыяльна-тэхнічнае і арганізацыйнае забеспячэнне. 50
Фінансаванне свята ..................................................... 55
Агульныя звесткі аб рабоце штаба аргкамітэта ............. 57
**ІІІ. Стварэнне перадсвяточнай атмасферы** ................. 61
Інфармацыйныя мерапрыемствы ..................................... 61
Агульнаарганізацыйныя мерапрыемствы ........................ 62
Вытворча-конкурсныя мерапрыемствы ........................... 63
Мерапрыемствы мастацкай і мастацка-конкурснай накіраванасці ........................................................................ 64
**IV. Арганізацыйныя і вытворчыя аспекты архітэктурна-дэкаратыўнага афармлення свята** .................... 66
Генеральны план дэкарыравання свята ........................... 66
Сцэнічныя пляцоўкі і іх віды ......................................... 71
Работа над планаваннем свята........................................ 75
Рабочыя чарцяжы ........................................................ 77
Тэхналогія апісання і каштарыс вырабаў ....................... 79
Работа над касцюмамі ................................................. 83
Рэквізіт, бутафорыя, мэбля ........................................... 90
Маскі і лялькі ў святочных дзеяннях ............................ 98
Пастановачнае асвятленне свята .................................. 104

Выраб мастацка-дэкаратыўнага афармлення .................. 109
Святочны феерверк .............................................. 110
**V. Гукавое афармленне свята** ................................ 121
**VI. Прызавы фонд свята** ....................................... 131
**VII. Рэклама свята** ............................................... 142
**VIII. Арганізацыя святочнага кірмашу** ..................... 149
Састаў дырэкцыі кірмашу ......................................... 149
Патрабаванні да месца правядзення кірмашу .................. 149
Гандлёва-гульнёвыя дзеі ......................................... 152
Культурная праграма кірмашу ................................... 161
**IX.Арганізацыя абслугоўвання гасцей, афіцыйных дэлегацый і творчых калектываў** ........................ 170
Размяшчэнне запрошаных гасцей і калектываў ................ 170
Харчаванне ўдзельнікаў свята .................................. 174
Распрацоўка культурнай праграмы для гасцей ................ 179
Афіцыйны і неафіцыйны прыём гасцей ........................ 182
**X. Работа дапаможных службаў свята** ........................ 203
Транспартная служба ............................................... 203
Служба бяспекі дарожнага руху ................................. 205
Служба аховы парадку .............................................. 208
Служба пажарнай аховы ............................................ 212
Медыцынская служба ................................................ 217
Заключэнне ............................................................ 220

*Вучэбнае выданне*

**Гуд** Пётр Адамавіч

**ТЭХНАЛОГІЯ СТВАРЭННЯ СВЯТА**

*Вучэбны дапаможнік*
*Выданне другое, стэрэатыпнае*

Рэдактары І.В.Смяян, Л.Ц.Спірыдонава
Камп'ютэрная вёрстка Л.М.Саўчук

Падпісана ў друк 30.01. 2008 г. Фармат 60x84 $^1/_{16}$.
Папера пісчая № 2. Ум. друк. арк. 13,0. Ул.-выд. арк. 11,2.
Тыраж 300 экз. Заказ 30.

Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў
220001, Мінск, вул. Рабкораўская, 17.
Ліцэнзія № 02330/0131818 ад 2.06.2006 г.

Надрукавана на рызографе
Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў
220001, Мінск, вул. Рабкораўская, 17.



**Гуд Пётр Адамавіч,** загадчык кафедры рэжысуры абрадаў і свят Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў, прафесар, кандыдат гістарычных навук, лаўрэат міжнародных фестываляў і конкурсаў, рэжысёр, сцэнарыст, этнограф, фалькларыст.

Стваральнік навукова-педагагічнай школы ў галіне свят, унікальнай спецыялізацыі "рэжысура народнага свята". Аўтар звыш 60 навуковых, навукова-метадычных і навукова-папулярных публікацый.

Рэжысёр больш за 400 творчых работ. Адзін з ініцыятараў і аўтараў адраджэння ў Беларусі народных свят: Каляды, Гуканне вясны, Юр'я, Вялікдзень, Купалле, Спас, Дажынкі, Багач, Пакровы і інш.

Ім распрацаваны новыя формаўтварэнні ў святочнай культуры Беларусі: свята духавой музыкі, гукапіратэхнічныя спектаклі на тэрыторыі мемарыяльных комплексаў, свята вёскі, юбілеі гарадоў, свята лесу, кірмаш, свята гульні "Карнавал весялосці", свята народных рамёстваў, свята бульбы, Усебеларускі фестываль народнага гумару, Усебеларускі фестываль нацыянальных культур, міжнароднае свята народнай музыкі "Звіняць цымбалы і гармонік" і інш.

Мастацкі кіраўнік, аўтар сцэнарыяў і галоўны рэжысёр шэрага свят у Расіі, Літве, Латвіі, Украіне, Арменіі, Абхазіі, Казахстане, Польшчы.

ISBN 985679834-5

9 789856 798347